СВЯТОЕ ЕВАНГЕЛЛЕ

ПРАБЛЕМЫ ПЕРАКЛАДУ НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ

СВЯТОЕ ЕВАНГЕЛЛЕ І ПРАБЛЕМЫ ПЕРАКЛАДУ НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ

МАТЭРЫЯЛЫ
навукова-практычнай канферэнцыі
па абмеркаванні перакладу Святога Евангелля
на сучасную беларускую літаратурную мову

Мінскі касцёл Святога Сымона і Святой Алены
13 снежня 2008 г.

МІНСК
Рымска-Каталіцкая парафія
Святога Сымона і Святой Алены
2010

УДК 27-247
ББК 86.37
С25

Пад рэдакцыяй:

ксяндза-дэкана, пробашча Мінскага касцёла Святога Сымона і Святой Алены, кандыдата гістарычных навук, магістра тэалогіі — *У. Завальнюка*;

загадчыка кафедры гісторыі беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктара філалагічных навук, прафесара — *М. Прыгодзіча*.

С25 **Святое Евангелле** і праблемы перакладу на беларускую мову: Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі па абмеркаванні перакладу Святога Евангелля на сучасную беларускую літаратурную мову. / Пад рэд. У. Завальнюка, М. Прыгодзіча. — Мінск : Рымска-Каталіцкая парафія Святога Сымона і Святой Алены, 2010. — 344 с.
ISBN 978-985-6652-43-4.

У выданні змешчаны матэрыялы канферэнцыі па абмеркаванні перакладу Евангелля і некаторых малітоўных тэкстаў на сучасную беларускую літаратурную мову, а таксама кнігі У. Завальнюка «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі», якая з'яўлялася кірункам, метадычным дапаможнікам групе філолагаў пры рабоце над тэкстам Евангелля. Кніга адрасуецца ўсім, хто праз высокую культуру сучаснай беларускай мовы будзе шукаць шлях да Святога Пісання.

УДК 27-247
ББК 86.37

ISBN 978-985-6652-43-4

© Рымска-Каталіцкая парафія Святога Сымона і Святой Алены, 2010

ЗМЕСТ

ЗВАРОТ ПРОБАШЧА Мінскага касцёла Св. Сымона і Св. Алены да Яго Эміненцыі Кардынала Казіміра . . 6

МАТЭРЫЯЛЫ ПЕРЫЯДЫЧНАГА ДРУКУ 15

Чэчат А. В. Пра Слова Божае па-беларуску (Наша слова. — 2008, 10 снежня, с. 3; Літаратура і мастацтва. — 2009, 9 студзеня, с. 6) 15

Дзіско У. А. Скарбонка духоўнасці (Звязда. — 2008, 23 снежня, с. 5) 18

Мальдзіс А. І. Крок да лепшага разумення (Голас Радзімы. — 2008, 26 снежня, с. 3) 21

Анісім А. М. Кніга для душы (Новы час. — 2009, 20 лютага, с. 16) 25

ВЫСТУПЛЕННІ НА КАНФЕРЭНЦЫІ. РЭЦЭНЗІІ. ВОДЗЫВЫ. АРТЫКУЛЫ 27

Цяўлоўскі М. Д. Выступленне 27

Васючэнка П. В. Выступленне 30

Прыгодзіч М. Р. Роднай мове ў набажэнстве быць! . . 33

Клышка А. К. Выступленне 36

Чайка Н. У. Кніга для ўсіх хрысціян 44

Мальдзіс А. І. Выступленне 46

Лукашанец А. А. Выступленне 50

Цыхун Г. А. Выступленне 53

Воюш І. Д. Хрысціянства і нацыянальная мова: праблемы дачыненняў у моладзевым асяродку 57

Ермаловіч В. В. Выступленне 61

Родаў Г. П. Выступленне 63

Войцік В. В. Выступленне 66

Лявошык М. М. Водзыў 68
Бурбоўская А. У. Выступленне 71
Дземідовіч Г. П. Выступленне 74
Шавыркін М. М. Выступленне 76
Люковіч Т. У. Выступленне 78
Рустамава Г. А. Выступленне 79
Язерская С. А. Водзыў 81
Мароз В. К. Водзыў 83
Валочка Г. М., Зелянко В. У. Культуралагічны патэнцыял біблейскіх тэкстаў і моўных адзінак. Водзыў 87
Харанека С. С. Рэцэнзія 94
Некрашэвіч-Кароткая Ж. В. Рэцэнзія 99
Невідомская М. А. Святое Пісанне ў школе 106
Мельнікаў Ю. С. Водзыў на пераклад Евангелля (Мн., 2007) 111
Раманцэвіч К. В. Вялікі дзякуй! 114
Содаль У. І. І яму сугучны Багушэвічаў зоў 118
Пашкоў Г. П. Гучы Евангелле на роднай мове! 120
Мазур І. А. Слова ў падтрымку пробашча 123
Ціханчук А. В. Водзыў 125
Гажэўская Т. С. Водзыў 129
Раманцэвіч В. К. Выступленне 133

Кніга У. Завальнюка. «РОДНАЯ МОВА Ў ДУХОЎНЫМ ЖЫЦЦІ БЕЛАРУСІ» (Мн., 2008) 147
Зварот да чытачоў 149
Настаў час павярнуцца абліччам да мовы беларускай 149
Разважанні над малітвай «Ойча наш» і іншымі малітоўнымі тэкстамі 162
Ойча наш 162
Вітана будзь, Марыя 169
Верую ў Бога 177
Пра дакладнасць ужывання слова 193
Узнёслая беларушчына ці запазычаная трасянка . . 195
Аб адзіным Евангеллі для беларусаў 221
Слова пра ўласныя асабовыя імёны 223
Зробім гістарычны экскурс 226

Біблія ў Беларусі 226
Неацэнная спадчына Скарыны 227
Параўнанне ўласных імён у розных выданнях Евангелля 230
Дадаткі 242
Дадатак 1. Мова — душа народа 242
Дадатак 2. Уласныя імёны, якія ўжываюцца ў Новым Запавеце 259
Дадатак 3. Спіс скарачэнняў 280
Дадатак 4. Геаграфічныя назвы, населеныя пункты, якія ўпамінаюцца ў Новым Запавеце 283
Дадатак 5. Кароткі тлумачальны слоўнік 304
Дадатак 6. Арфаграфічны слоўнік 324
Дадатак 7. Словы і звароты ветлівасці 328
Выкарыстаная літаратура 334
Лемцюгова В. П. Водзыў пра кнігу кс. Уладыслава Завальнюка «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» 337
Мальдзіс А. І. Рэцэнзія пра кнігу кс. Уладыслава Завальнюка «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» 339
Анкета 342

Рымска-Каталіцкая
парафія г. Мінска

Касцёл
сьв. Сымона і сьв. Алены

Roman Catholic
parochia in Minsk

Ecclesia
s. Simonis et s. Helenae

Старшыні Канферэнцыі біскупаў
лакальнага Касцёла ў Беларусі
Яго Эміненцыі Кардыналу Казіміру

Ваша Эміненцыя!

На святарскім сходзе ў дзень скупення 22 кастрычніка 2002 г. у Мінскай Архікатэдры Вы паведамілі, што ў беларускім варыянце малітвы **«Ойча наш»** прадугледжваецца змена, а менавіта, слова **«грахі»** замяняецца на **«правіны»**. Была агучана такая просьба: калі хто мае прапановы ці пажаданні, можа звярнуцца да Канферэнцыі Біскупаў да 1 снежня, бо ўжо 12 снежня ў Гродне адбудзецца пасяджэнне.

У духу пакоры і паслухмянасці асмелюся звярнуцца да так Высокага сходу Біскупаў з канкрэтнымі прапановамі. Тым больш, гэта мой маральны абавязак, бо ў свой час, з 1989 года з ласкі Божай і бласлаўлення Вашага і Архібіскупа Тадэвуша Кандрусевіча, я стаяў ля першавытокаў перакладаў і выданняў на беларускай мове і нёс поўную адказнасць як маральную, так і духоўную за пераклады тэкстаў, малітваў, рэлігій-

ных (святых) кніг. Жыву гэтым і цяпер, і таму для мяне неабыякава, што і як робіцца ў гэтай галіне.

Дазвольце, калі ласка, прадставіць свае думкі ў двух аспектах:

а) гістарычная матывацыя перакладаў і ўплыў на пераклады;

б) граматычна-тэрміналагічнае абгрунтаванне перакладу.

Гістарычная матывацыя перакладаў і ўплыў на пераклад

Ваша Эміненцыя, Вы добра ведаеце, як і некаторыя біскупы, пра першапачаткі станаўлення касцельналітургічнай мовы ў святынях Беларусі. Ведаеце, як мною ў 1986—87 гг. быў падрыхтаваны першы малітоўнік на польскай мове для духоўных патрэб людзей у Беларусі і выдадзены з апрабацыяй Касцёла ў Варшаве.

Два першыя выданні па 10 тыс. экзэмпляраў **«Szukam Ciebie Panie»** надрукаваны ў Варшаве, усе разышліся ў Польшчы, трэцяе і чацвёртае выданні ў 1990—95 гг. *(30 тыс. экземпляраў)* былі надрукаваны ў Мінску. Разам з гэтым вялася праца над першымі беларускімі тэкстамі. Вось некаторыя з іх: «Катэхізм» для дарослых, «Катэхізм» для дзяцей, «Літаніі», «Ружанец», «Жывы Ружанец» на польскай і беларускай мовах, «Навэнны», малітоўнікі, а таксама студыйныя тэксты рытуалаў *(Сакраманты, пасвячэнні і бласлаўенствы, абрад пахаванняў)*, Імшал, Евангеліяр *(А-Б-В)*, Новы Запавет, Малітва верных на кожны дзень Літургічнага года, спеўнік, кнігі і брашуры — усяго разам 38 апрацаваных пазіцый.

У 90-я гады шаноўны Біскуп, а цяпер Архібіскуп і Мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч, паблаславіў мяне на гэтую працу і заахвоціў падрыхтаваць **«Ordo Missae»** на трох мовах (беларускай, польскай і рускай), і адначасова прызначыў адказным у выдавецкай працы для ўсяго Касцёла ў Беларусі з правам цэнзара.

Гэта было вельмі адказнае назначэнне, бо беларуская мова, на вялікі жаль, за ўсю сваю гісторыю не была поўнасцю ўключана ў касцельную мову, а літургічнай ніколі не была і актыўна не ўжывалася ані святарамі, ані вернікамі, яе зрабілі папросту мужыцкай. Таму першаступэнні касцельнай тэрміналогіі — **гэта праца для ўсяго пакалення духавенства ўсіх рэгіёнаў краіны, і распачаць яе трэба як найхутчэй.**

Ваша Эміненцыя паклікаў мяне і даручыў арганізаваць літургічную камісію, узначаліць і кіраваць ёю і паблаславіў на плённую працу. Я наколькі мог выконваў сумленна даверанаяе мне абавязкі на працягу некалькіх гадоў. Але, паводле Вашага загаду, вымушаны быў адысці, пакінуць распачатую справу на паўдарозе не таму, што не хацеў працаваць, але такім было Ваша рашэнне пасля маёй прапановы абнавіць склад камісіі больш моцнымі спецыялістамі. Усе мы ведаем сённяшні прапольскі накірунак літургічнай камісіі перакладаў.

За перыяд з 1989 па 2002 гады пра станаўленне касцельна-літургічнай тэрміналогіі беларускай мовы ў Касцёле Беларусі можна многа расказаць ці напісаць, але цяпер не пра гэта.

Дазвольце затрымацца на некаторых праблемах і прызадумацца над імі, тым больш, што гэта мой абавязак — прызнацца ў многіх, дапушчаных мною, тэр-

міналагічных адхіленнях, дзе я адчуваю сябе вінаватым і якія *(адхіленні)*, на жаль, ніхто не асмельваецца выправіць. У свой час вельмі многа ўздзейнічалі на першыя пераклады розныя ўплывовыя людзі як свецкія, так і духоўныя, і шырокае кола іх аднадумцаў, называць імёны лічу, што няма патрэбы. Вельмі ваяўніча крытыкавалася многае ў перакладзеных тэкстах, пра ўсё гэта добра ведае Архібіскуп Тадэвуш.

У першых перакладах прысутнічаў дух беларускай літаратурнай мовы, пасля быў адыход, ціск, пасля зноў перамены. У тыя 90-я гады ўсё, што беларускае, успрымалася ў касцёле крытычна і ў штыкі як святарамі, так і вернікамі прапольскай арыентацыі *(падобна як і сёння ў Гродзенскай дыяцэзіі, дзе толькі ў адным-другім касцёле служыцца Святая Імша на беларускай мове)*. І зразумела, бо гэта была і ёсць своеасаблівая самаабарона старэйшага пакалення, вымучанага атэізмам, бо менавіта на польскай мове гэтае пакаленне захавала традыцыі Касцёла і веры ад пераследу ў савецкія часы, і трэба, каб для гэтых людзей была Святая Імша і набажэнствы на польскай мове. Але нельга забывацца, што падрастаюць новыя пакаленні, з'яўляюцца новыя гарады і вёскі-пасяленні, старэйшыя людзі, на вялікі жаль, адыходзяць, а польскіх школ усяго некалькі ў Беларусі.

Межы Беларусі de jure і de facto гавораць пра гістарычныя абрысы **дзяржаўнасці**, народа і мовы, тым больш у святынях, і тут выйграе толькі Касцёл, дзе людзі прывыкаюць да цудоўнай беларускай мовы.

На сённяшні дзень ніхто не скажа аб Праваслаўнай Царкве ў Беларусі, што яна прабеларуская, за выключэннем тых храмаў, дзе набажэнства і Слова Божае гучыць на беларускай мове.

Мала хто скажа, што Касцёл у Беларусі прабеларускі, а толькі польскі, за выключэннем тых святыняў, дзе набажэнства і Слова Божае, няхай нават побач з польскім, але гучыць на беларускай мове, падобна як у Літве, Латвіі, Расіі, Украіне.

Напрыклад, у Расіі Рымска-Каталіцкі Касцёл-Царковь поўнасцю ўспрыняты народам, за выключэннем праваслаўных іерархаў, якія супраціўляюцца і ставяць перашкоды. Але за што? За так званы «празелітызм», але ўжо ніхто ва ўсёй Расіі не папракае Касцёл польскай экспансіяй, паланізацыяй, і ў гэтым выйграў толькі Касцёл, які ўзяў за аснову чыстую рускую мову. А Беларусь?!

Улетку падчас размовы з айцамі-францысканцамі (палякамі) з выдавецтва святога Фамы Аквінскага, што ў Маскве, на прапанову супрацоўніцтва быў пачуты вось які адказ у адрас беларускай мовы: «Вы не будзеце прызнаны да таго часу, пакуль не ачысціце беларускую мову ад польскага ўплыву, як мы ў свой час у Касцёле ў Расіі прынялі рускую мову без польскай тэрміналогіі, якая рабіла свой уплыў».

Балюча глядзець ці слухаць, як ксёндз, перакладаючы адразу тэкст з польскага рытуалу, хрысціць ці вянчае па-беларуску, перакручваючы сэнс і словы, — гэта знявага людзей і аўтарытэту Касцёла. Падобная сітуацыя і ў час пахаванняў і іншых набажэнстваў. Большасць святароў ужываюць проста рускую мову, бо лягчэй. У цэнтральнай частцы Беларусі, Баранавічах і навакольлі, сёстры вучаць дзяцей маліцца і спяваць толькі па-руску. Апрацаваныя ў нашай парафіі студыйныя літургічныя тэксты зроблены не на злосць каму-небудзь, а з вялікага духоўнага голаду хрысціянскай літаратуры. Лічу за святы абавязак карыстацца

ў набажэнствах і душпастырскіх паслугах граматычна правільнай мовай народа, тым больш у гарадах Беларусі, ці сталіцы, шануючы годнасць людзей, бо цяпер усё больш адукаваных вернікаў бяруць удзел у набажэнствах.

Не так даўно наведвалі Мінск два дэканы з Гродзенскай дыяцэзіі. Святары звярнуліся да нас з просьбай, кажучы: «У нашай дыяцэзіі няма ні ў адным касцёле Імшы на беларускай мове, акрамя толькі што Гродзенскай катэдры, ды і там родная мова гучыць толькі адзін раз на тыдзень на адной Імшы ў нядзелю. Нас не разумее моладзь, не разумеюць дзеці, у касцёл ходзіць у асноўным старэйшае пакаленне, а што ж будзе далей? Таму просім вас, дайце нам хоць якія-небудзь кнігі на беларускай мове...».

Ваша Эміненцыя, на мой погляд, не па слоўку трэба правіць тэрміналогію літургічных тэкстаў, а склікаць усебеларускую камісію з усіх дыяцэзій, падключыць філолагаў з кафедраў беларускай мовы навучальных устаноў і выправіць адначасова гэтыя 15—35 слоў, а не паціху рэгулярна змяняць слоўцы. Дазвольце сказаць Высокаму сходу Біскупаў, што Грэка-Каталіцкая Царква ў Беларусі, яе святары вельмі зацікаўлены ў адзінай літургічнай тэрміналогіі.

У час Першага Міжнароднага 4-дзённага семінара хрысціянскіх лідэраў, які праходзіў у касцёле Св. Сымона і Св. Алены ў Мінску 8 лістапада 2002 г., адбылася прыватная размова з Архімандрытам Сяргеем Гаекам па гэтым пытанні. На заканчэнне размовы Архімандрыт Сяргей сказаў: «Мы поўнасцю адкрыты і гатовы да супрацоўніцтва і згодны ўдзельнічаць у Літургічнай Камісіі, у гэтай святой справе беларускага народа, мы хочам адналітнай літургічна-моўнай

еднасці. Перадай гэтыя мае словы Яго Эміненцыі Кардыналу Казіміру». Калі б Усебеларуская Літургічная Камісія разам з Грэка-Каталіцкай дайшла да тэрміналагічнай еднасці маладой беларускай касцельнай мовы, тады можна было б прапанаваць далучыцца да гэтай камісіі і Праваслаўнай Царкве *(каб перад праваслаўнымі быць ужо аднаго духу, а не дэманстраваць свае нязгоды)*.

У Мінску была магчымасць і нагода паразмаўляць з адным праваслаўным святаром, было некалькі размоў з галоўным рэдактарам выдавецтва праваслаўнай духоўнай літаратуры пры Мітраполіі спадаром Леанідам Качанкам і сакратаром Беларускай Біблійнай Камісіі, доктарам філалагічных навук прафесарам Іванам Аляксеевічам Чаротам наконт таго, як яны глядзяць на адналітнасць беларускай мовы ў храмах Беларусі, Царкве і Касцёле. Быў атрыманы станоўчы адказ, ёсць шанец на далейшыя сустрэчы і дыялог. Асабліва цёпла і з надзеяй выказваецца галоўны рэдактар Л. Качанка, ён глыбока веруючы беларус і разумна ставіцца да гэтага набалелага пытання. «Калі так станецца, тады перад Богам і Беларусяй я выканаў свой абавязак,» — кажа спадар Леанід. Пра гэтыя сустрэчы і вынікі размоў, калі будзе зацікаўленасць, пры нагодзе магу больш падрабязна расказаць. *(N.B. Перадаю Вам кнігу праф. І. А. Чарота* «Беларуская мова і Царква», *якую я атрымаў ад яго)*.

На вялікі жаль, з-за неадукаванасці і неразумення сярод людзей трывае такая думка, што набажэнствы на чыстай польскай мове — гэта для каталікоў-палякаў, а на беларускай мове — для беларусаў. Трэба аднойчы падысці смела да гэтага набалелага за 12 гадоў

пытання-праблемы, бо так ці інакш, падводзячы беларускую тэрміналогію пад польскі варыянт, мы не заахвоцілі людзей *(прапольска настроеных)* да беларускай Святой Імшы, набажэнстваў, не палюбілі яны і не прынялі нават моўна спольшчаных набажэнстваў і Святой Імшы. І вельмі шкада, што няма да цяперашняга часу загаду *(odgórnie)* ардынарыяў, каб ва ўсіх касцёлах Беларусі служылася Імша Святая на беларускай мове, па гэтай прычыне маем непаразуменні ў парафіях і партызанскія пераклады літургічных тэкстаў кожнага рэгіёна Беларусі. **Гонар гонарам, а служыць Богу павінны ўсе не толькі сэрцам спяваючы, але і розумам успрымаючы.**

Тады трэба, не азіраючыся назад *(што ж скажуць палякі-каталікі)*, увесці адну *(ці наколькі магчыма набліжаныя паміж сабою Рыма-Каталікі, Грэка-Каталікі, Праваслаўныя)* беларускую тэрміналогію на ўсёй беларускай прасторы з удзелам грэка-каталікоў і праваслаўных, і няхай будзе двухмоўе: адна чыста польская, а другая чыста беларуская. Калі кожны святар спакойна растлумачыць у сваім касцёле, царкве праблему і неабходнасць роднай беларускай мовы ў набажэнствах і абрадах, людзі, напэўна, зразумеюць, паслухаюць і падпарадкуюцца. Не такія тут ужо засталіся вялікія перамены ці дапаўненні, трэба толькі захацець. Часовыя пераклады і тэрміналогія трымаюцца толькі ў касцёлах, але па-за святынямі, у народным асяроддзі, як на пахаваннях, на могілках, асвячэнні кватэры, у час калядных наведванняў, не здаюць экзамен. Таму святары карыстаюцца хутчэй рускай мовай, а не беларускай, бо па-руску даступней сказаць «Господь Бог, благодать, Таинства» і іншыя тэрміны...

**На аснове ўсяго сказанага,
дазвольце выказаць наступныя прапановы:**

1. Склікаць дзеючую Літургічную Камісію і вырашыць сумесна, ці згодна яна на такі крок новых, патрэбных рэформаў.
2. Стварыць камітэт для арганізацыі Усебеларускай Літургічнай Камісіі нашых дыяцэзій і рэгіёнаў.
3. Запрасіць і выслухаць прапановы:
   - філолагаў з кафедраў беларускай мовы;
   - грэка-каталіцкі бок на чале з Архімандрытам Сяргеем Гаекам;
   - прадстаўнікоў братняй Праваслаўнай Царквы;
   - запрасіць прадстаўнікоў пратэстанцкіх як Цэркваў, так і кіраўнікоў выдавецтваў.

Шчыра дзякую за ўвагу.
З сыноўскай пакорай і павагай
ксёндз УЛАДЫСЛАЎ ЗАВАЛЬНЮК,
пробашч Мінскага касцёла Святых Сымона і Алены

МАТЭРЫЯЛЫ ПЕРЫЯДЫЧНАГА ДРУКУ

ЧЭЧАТ Алесь Віктаравіч,

выкладчык беларускай мовы і літаратуры лінгвагуманітарнага каледжа МДЛУ

Слова Божае па-беларуску

Рымска-Каталіцкая парафія Мінскага касцёла Святога Сымона і Святой Алены парадавала беларускіх хрысціян-вернікаў выданнем дзвюх кніг. На беларускай мове выйшлі Евангелле і «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі». Аўтарам апошняй з'яўляецца Уладыслаў Завальнюк — ксёндз-дэкан, пробашч Мінскага касцёла Святога Сымона і Святой Алены, кандыдат гістарычных навук, магістр тэалогіі.

Названая кніга Новага Запавету — Евангелле — гэта ўжо другое выданне, дапрацаванае калектывам дасведчаных перакладчыкаў пад кіраўніцтвам пробашча. Першае выйшла ў свет у 1997 годзе. У адрозненне ад першага, у другім выданні да кожнай з чатырох частак ёсць прадмова, у якой падаецца жыццеапісанне кожнага з аўтараў-евангелістаў: Святога Матфея, Святога Марка, Святога Лукі і Святога Іаана, іх узаемасувязь з Сынам Божым Ісусам Хрыстом. Паведамляецца пра мэту, месца, час напісання і інш. Можна

сказаць, што прадмовы да частак Евангелля з'яўляюцца своеасаблівымі ўводзінамі ў эпоху зараджэння хрысціянства, рыхтуюць чытача да свядомага ўспрымання Святога Пісання.

Асобна трэба сказаць пра мову Кнігі — чыстую, выразную, зразумелую. Кожнае слова на месцы, адпавядае сучаснай беларускай літаратурнай мове, яе правапісу. Тэксты новага Евангелля — гэта ўзор канфесіянальнай літаратуры. Можна адзначыць традыцыйны падзел тэкстаў на часткі — мікратэксты са своеасаблівай структурай сказаў, у якіх адсутнічае ўскосная мова, азначэнні, як правіла, часцей за ўсё стаяць пасля азначаемых слоў, пры простай мове адсутнічае двукоссе і інш. Усё зроблена ў адпаведнасці з кананічнымі патрабаваннямі. Вызначаецца новае Евангелле яшчэ і тым, што ўпершыню ў гісторыі каталіцкай духоўнай літаратуры ўласныя імёны і геаграфічныя назвы ўжыты так, як прынята ў Беларусі.

Такім чынам, новае выданне Евангелля будзе з'яўляцца настольнай кнігай не толькі для католікаў, але і для прадстаўнікоў любой хрысціянскай канфесіі. Адзначым, што прызначэнне новага выдання — не выдзяляць адну канфесію сярод іншых, а яднаць, выхоўваць беларускую супольнасць у цэлым. Гэта канструктыўны, па-хрысціянску прымірэнчы крок, у гэтым новае выданне Евангелля мае найвялікшае значэнне.

Вялікай ухвалы заслугоўвае кніга святара Уладыслава Завальнюка «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі». Яна даўно чаканая і патрэбная. Эпіграфам аўтар абраў словы: «Мы нічога не сцвярджаем, мы просім парады ў вучоных, гатовых дапамагчы нам».

У прадмове «Настаў час павярнуцца абліччам да мовы беларускай» аўтар акрэслівае асноўныя праблемы

хрысціянскага набажэнства на Беларусі, якое адчувае вялікі ўплыў як з боку Польшчы, так і Расіі. А нам варта быць беларусамі, актыўна ўводзіць у набажэнства нашу цудоўную родную літаратурную мову, фарміраваць свой беларускі канфесіянальны стыль.

Кніга лёгка чытаецца, мова выразная. Аналізуючы царкоўную лексіку Новага Запавету ранейшых выданняў, уласныя імёны, аўтар звяртаецца да фундаментальных навуковых даследаванняў у беларускім мовазнаўстве, разнастайных слоўнікаў, аўтарытэтнай энцыклапедычнай літаратуры, даведнікаў.

У кнізе маецца некалькі цікавых дадаткаў: артыкул «Мова — душа народа»; уласныя імёны, якія ўжываюцца ў Новым Запавеце; спіс скарачэнняў, геаграфічныя назвы, населеныя пункты, якія ўпамінаюцца ў Новым Запавеце; кароткі тлумачальны слоўнік; арфаграфічны слоўнік; словы і звароты ветлівасці. І, безумоўна, як і ў кожным грунтоўным даследаванні, спіс выкарыстанай літаратуры. Рэцэнзентамі кнігі з'яўляюцца аўтарытэтныя беларускія вучоныя, дактары філалагічных навук, прафесары В. Лемцюгова і А. Мальдзіс.

Як выкладчык роднай мовы і літаратуры бяруся сцвярджаць, што выданні вышэй названых кніг Каталіцкай Царквы вельмі патрэбны ў пазакласнай выхаваўчай рабоце з навучэнцамі, на ўроках беларускай мовы і літаратуры. Кнігі стануць незаменнымі дапаможнікамі для настаўнікаў нядзельных школ пры храмах, таму павінны быць выдадзены вялікім тыражом і даступны кожнаму беларусу.

«Літаратура і мастацтва», № 1—2
ад 9 студзеня 2009 г., с. 6;

«Наша слова», № 50 ад 10 снежня 2008 г., с. 3

ДЗІСКО Уладзімір Антонавіч,

ветэран педагагічнай працы,
настаўнік-метадыст
вышэйшай катэгорыі

Скарбонка духоўнасці

З трапяткім хваляваннем, глыбока ўсведамляючы адказнасць за свае словы, думкі, меркаванні з нагоды аднаўлення і прачытання кнігі ксяндза Уладыслава Завальнюка «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі», асмельваюся падзяліцца сваімі меркаваннямі па змесце названай кнігі. Лічу, што сам факт яе з'яўлення — ужо з'ява выключнай важнасці і вялікай каштоўнасці для жыхароў нашай незалежнай краіны, якія цікавяцца месцам і роляй касцёла і царквы ў сённяшнім грамадстве, станам духоўнага жыцця, перспектывай духоўнага выхавання.

Кніга напісана на цудоўнай літаратурнай мове — даходліва, шчыра, зацікаўлена, аргументавана, асабліва артыкул «Мова — душа народа». Адчуваецца, што перш чым вынесці свае словы і выкласці думкі на суд чытачоў, аўтар шмат дзе быў, многае пабачыў, пранёс праз уласнае сэрца і адчуў вялікую патрэбу публічна запрасіць да размовы і абмеркавання тых пытанняў, якія даўно наспелі, і ў першую чаргу да вучоных-мовазнаўцаў для выпрацоўкі нацыянальнай беларускай тэрміналогіі. І зноў-такі з удзячнасцю хочацца сказаць, што першы крок у гэтым кірунку зрабіў Каталіцкі Касцёл Беларусі ў асобе ксяндза Уладыслава Завальнюка сваёю кнігай, якая, не пабаюся гэтага слова, цалкам магла б стаць дысерта-

цыяй па лінгвістыцы (беларусістыцы). Тут даходліва, пераканаўча, аргументавана ўсё выкладзена на практычную патрэбу ўсіх тых, хто хоча далучыцца да мудрасці і вечных каштоўнасцяў Святога Пісання, аб чым аўтар гаворыць у звароце-прадмове да кнігі: «Настаў час павярнуцца абліччам да мовы беларускай». Залатыя словы — словы ад шчырага сэрца, душы, пакліканыя на волю.

Сапраўды, кнігу стварыў надзвычай таленавіты аўтар, тонкі знаўца патрэбаў простага і шчырага ў сваіх духоўных пошуках чалавека. І стварыў у даступнай форме, у пяшчотнай манеры, звяртаючыся як роўны да роўнага, каб людзі не толькі зразумелі Боскае Слова, але і паверылі ў яго. Тут і аргументаваныя каментарыі да адпаведных выразаў і тэкстаў, падмацаваныя прыкладамі і вытрымкамі з розных крыніц, і пераканасці да ўжывання пэўных слоў, пададзены слоўнік імён, якія ўпамінаюцца ў Новым Запавеце. З рэкамендацыямі, якія з іх найбольш падыходзяць да беларускай мовы, а таксама тлумачальны і арфаграфічны слоўнікі, мадэлі моўнага этыкету і надзвычай багаты пералік выкарыстанай літаратуры. Словам, зроблена вялікая, патрэбная і адказная работа, дастойная самай высокай ацэнкі.

Што ж да маёй ацэнкі кнігі, тых тлумачэнняў і каментарыяў, якія вынес на суд чытачоў ксёндз Уладыслаў Завальнюк, то я цалкам падтрымліваю і згодны далучыцца да словаў афіцыйных рэцэнзентаў — спадарыні В. Лемцюговай і спадара А. Мальдзіса. Я свядома не раблю ніякіх асаблівых заўваг да перакладу Евангелля, бо лічу, што пераклад рабіў вельмі кваліфікаваны калектыў пад кіраўніцтвам знаўцы сваёй справы.

Мова перакладу Святога Евангелля літаратурная, выразная, чыстая, зразумелая, у выніку чаго змест Кнігі ўспрымаецца дастаткова лёгка. Кананічна вытрымана кожная частка, кожная структурная адзінка. Не парушана пунктуацыйнае афармленне тэксту. Рыхтуюць да ўспрыняцця Святога Пісання і ўступныя артыкулы да ўсіх чатырох частак Евангелля.

Закончыць свае запісы хачу цудоўнымі словамі ксяндза Уладыслава Завальнюка: «Калі ты любіш па-сапраўднаму сваю Бацькаўшчыну, гэтае дрэва свайго жыцця і народа свайго, тады і па-сапраўднаму беражы і цані родную мову, гэтыя плады, якімі карыстаешся, каб жыць шчасліва».

«Звязда» (№ 242), 23 снежня 2008, с. 5

МАЛЬДЗІС Адам Іосіфавіч,

доктар філалагічных навук,
прафесар

Крок да лепшага разумення

У нарадзе, якая прайшла ў Мінскім касцёле святых Сымона і Алены і была прысвечана стану сучаснай царкоўнай мовы, прынялі ўдзел навукоўцы-лінгвісты, філолагі, перакладчыкі і вернікі.

Уявіце сабе, шаноўныя чытачы, такую сітуацыю: у сям'і, класе або іншай групе людзей — усе хрысціяне, усе звяртаюцца да Святога Пісання, але адначасова яны прадстаўляюць розныя канфесіі. Большасць — праваслаўныя, але ёсць католікі, пратэстанцы ці ўніяты. Гэта — адзін з вынікаў таго, што Беларусь знаходзіцца на памежжы двух велізарных грамадска-культурных рэгіёнаў — усходняга (праваслаўна-візантыйскага) і заходняга (каталіцка-пратэстанцкага). Адсюль і рэлігійная разнастайнасць, магчымасць (прыкладаў таму многа) плённага сінтэзу.

І вось браты, аднакласнікі ці калегі бяруцца голасна чытаць беларускае Евангелле, якое сёння ёсць і ў праваслаўных (тэкст кананічны ці набліжаны да такога), і ў католікаў (адрозных тэкстаў тут некалькі), і ва ўніятаў (тыя ж кнігі, што ў католікаў), і ў пратэстанцаў (толькі ў пераважнай большасці яны карыстаюцца рускім перакладам). Адзін называе Бога Гасподзь ці Госпад, другі — Пан. Адзін кажа «Ісус», другі — па-польску «Езус». Адзін віншуе: «З Божым Нараджэннем!», другі — «З Раждаством Хрысто-

вым», а трэці ўвогуле па-язычніцку — «З Калядамі!». І такі разнабой — ненармальная з'ява, бо ён аслабляе грамадскую супольнасць, нацыю ў цэлым. У іншых краінах усе хрысціянскія канфесіі карыстаюцца адзіным або набліжанымі тэкстамі Евангелля.

Такі ж першы крок да паразумення зроблены і ў Беларусі. Пад рэдакцыяй ксяндза-магістра тэалогіі і кандыдата гістарычных навук, пробашча касцёла Святых Сымона і Алены ў Мінску Уладыслава Завальнюка нядаўна выйшла чарговае беларускае Евангелле пакуль толькі «для ўнутраных патрэб» сваёй парафіі. У ім мы ўжо чытаем і *Гасподзь*, і *Ісус*, і многае іншае, што збліжае дзве вядучыя канфесіі Беларусі.

Напярэдадні каталіцкага Нараджэння Хрыстова ў Чырвоным касцёле сабраліся вучоныя, тэолагі, прадстаўнікі грамадскасці, каб абмеркаваць стан беларускай царкоўнай мовы. Яны высока ацанілі зробленае ксяндзом Завальнюком. Усяго пад яго кіраўніцтвам, падлічыў старшыня Прафесарскага клуба пры касцёле (а ў ім за 60 чалавек) Міхаіл Цяўлоўскі, выдадзена каля 50 кніжак. Большасць з іх — на беларускай мове.

— Сама я праваслаўная, — пачала дыскусію пасля ўступнага слова айца Уладыслава мовазнавец і педагог Валянціна Раманцэвіч, — але з ахвотай працавала над каталіцкім выданнем, бо адчувала, што яно будзе яднаць як нацыю, так і сем'і. Дарэчы, у мяне адзін дзед быў праваслаўны, а другі — католік. І муж быў католікам. Што ж нам дзяліць? Вера ў нас адна — хрысціянская.

— Гэта нялёгкая справа — дабіцца, каб пераклад быў і дакладны з тэалагічнага боку, і гучаў па-беларуску, — працягнуў гаворку аўтар беларускага «Буквара», які вытрымаў ужо каля 40 выданняў, знаўца

грэчаскай мовы Анатоль Клышка. У новым перакладзе Евангелля многа ўдалых слоў-наватвораў. Напрыклад, вернік, дабраславёны і гэтак далей.

Зроблены першы, можна прама сказаць, гістарычны крок. І тут важна не націскаць, не прыспешваць падзеі, таму што мы маем справу з шматвяковымі традыцыямі, — перасцерагаў доктар філалагічных навук прафесар Генадзь Цыхун. — Праваслаўны тэкст Евангелля ўзыходзіць да грэчаскай першакрыніцы, а каталіцкі — да лацінскай. Адсюль і розная лексіка, скажам, манастыр у праваслаўных і кляштар у каталікаў. У нас не павінна быць ілюзій, што мы хутка дасягнем поўнага адзінства кананічных тэкстаў. Тут патрэбны ўзаемаразуменне і цярплівасць, выкарыстанне вопыту іншых славянскіх народаў. Рознаварыянтнасць на першым этапе збліжэння дапушчальная. Калі мова жыве, яна не можа быць занадта нармалізаванай.

Старшыня беларускага Біблейскага таварыства Герман Родаў расказаў аб рабоце Сінадальнай камісіі па перакладзе пры Беларускім Экзархаце. Яна падрыхтавала ўжо і выдала па-беларуску праваслаўнае Евангелле і цяпер працуе над перакладам Дзеянняў Апосталаў. Біблейскае таварыства, — падкрэсліў Герман Родаў, педагог пратэстанцкага вызнання, — можа з часам стаць аб'яднальным для ўсіх хрысціянскіх канфесій.

У дыскусіі прынялі ўдзел навукоўцы з Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, выкладчыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і Мінскага лінгвістычнага ўніверсітэта, работнікі выдавецтваў і рэдакцый газет, простыя вернікі. Яны далі высокую ацэнку перакладу Евангелля, а таксама новай кнізе Уладыслава Заваль-

нюка «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі», якая можа служыць дапаможнікам для перакладчыкаў, выкладчыкаў, студэнтаў.

Падвёў вынікі абмеркавання дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар філалагічных навук, старшыня славістаў Аляксандр Лукашанец:

— Мы атрымалі дасканалы пераклад Евангелля, які можа ў перспектыве стаць адзіным для ўсіх канфесій, у стане, як кажуць, легчы на душу і тым, хто прыходзіць у касцёл, і тым, хто моліцца ў царкве. Ён вызначаецца добрай мовай, узнёслы і адначасова дакладны з пункту гледжання анамастыкі. Шлях жа ў будучыню — спачатку дабіцца або хоць наблізіцца да адзінства ўнутры саміх католікаў, а потым стварыць больш агульную, міжканфесійную тэрміналагічна-лексічную камісію.

На нарадзе таксама гаварылася аб стварэнні інфармацыйна-бібліяграфічнай базы звестак. Многія праблемы, якія абмяркоўваліся дыскутантамі нібыта ўпершыню, на самай справе ўжо не раз узнімаліся ў друку. Але, на жаль, шматлікія публікацыі, у тым ліку і «Голасу Радзімы», засталіся незаўважанымі.

«Голас Радзімы» № 48 ад 26 снежня 2008 г.

АНІСІМ Алена Мікалаеўна,

старшыня Мінскай гарадской арганізацыі ГА «Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны»

Кнігі для душы

Трымаю ў руках дзве кнігі: «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» і Евангелле на беларускай мове. Чытаю і лаўлю сябе на думцы, наколькі не хапала мне такой літаратуры на роднай мове. І як чалавеку, што не цураецца хрысціянскага вучэння, і як дыпламаванаму філолагу.

Цяжка меркаваць, ці магла б такая літаратура на беларускай мове, з'явіўшыся ў савецкі час, істотна паўплываць на светапогляд беларуса, загнанага ў атэістычны калектыўны дом. Відаць, многае, калі не ўсё, залежала б ад тых традыцый, якія захоўваліся ў кожнай канкрэтнай сям'і. Калі бацькі і дзяды трымаліся веры, выхоўвалі маладзейшых у духу павагі да ўсяго роднага, нацыянальнага, то і кнігі духоўныя на роднай мове былі б на пачэсным месцы. Сёння ж можна радавацца хаця б такому стану рэчаў, што шчырая вера ў хрысціянскае вучэнне становіцца фактам асабістага выбару і не пераследуецца ў такой ступені, як гэта было ў нядаўнім мінулым.

Я здзіўляюся тытанічнай і скрупулёзнай працы, якую здзейсніў ксёндз Уладыслаў Завальнюк. Чытаючы «Родную мову ў духоўным жыцці Беларусі», я нібы далучаюся да самага патаемнага і ўзвышальнага працэсу — да працы над Словам. Тое, як падае ксёндз Уладыслаў Завальнюк тлумачэнне слоў, як ён аргументуе свой выбар на карысць таго ці іншага тэрміна, з'яўляецца добрым прыкладам для кожнага — быць

акуратным, абачлівым са словам. Такому чалавеку верыш, з такім духоўным настаўнікам спакойна і ўпэўнена будзеш крочыць па жыцці.

Мне, выхаванай у сям'і вясковых настаўнікаў на прыкладах кніжных герояў, не было дадзена магчымасці рана пазнаеміцца з хрысціянскім вучэннем. Савецкія педагогі маглі быць выключна атэістамі, яны не мелі права афішаваць свае хрысціянскія погляды. Але, дзякуй Богу, многія настаўнікі і ў той час таемна хрысцілі сваіх дзяцей, не маючы магчымасці адкрыта наведваць храм. Мабыць, таму, нягледзячы на ўвесь запал атэістычнай прапаганды, большасць грамадства прытрымлівалася хрысціянскіх запаведзяў і не зраклася веры бацькоў. Аднак, многія жыццёвыя сітуацыі лягчэй перажыць, засвоіўшы з дзяцінства пастулаты хрысціянскага вучэння на роднай мове. Я мяркую, калі ў школьным узросце знаёміць дзяцей з тэкстамі Святога Пісання (найперш Евангелля) па-беларуску, гэта паспрыяе выхаванню ў моладзі гуманістычнага светапогляду і патрыятычных пачуццяў.

Я паглыбляюся ў тэкст Евангелля і нібы вяртаюся да самага пачатку жыцця чалавечага, калі многае з ужо спазнанага становіцца зразумелым, ясным і простым. Сваё адчуванне ад прачытання магу параўнаць з тым станам, які настае пасля глытка чыстай крынічнай вады ў спякотны дзень. Душа ўбірае ў сябе роднае Слова, якое было ў пачатку. Чыстая, зразумелая, простая без выкрунтасаў мова, з сапраўднымі формамі імёнаў святых, а не спрошчанымі ці адаптаванымі.

Дзякуй шчыры сапраўднаму падзвіжніку ў духоўным адраджэнні беларусаў, ксяндзу Уладыславу Завальнюку за выдатны прыклад служэння свай справе, за бясцэнны дар — кнігу на дарагой для кожнага беларуса мове.

«Новы час» ад 20 лютага 2009 г., с. 16

ВЫСТУПЛЕННІ НА КАНФЕРЭНЦЫІ. РЭЦЭНЗІІ. ВОДЗЫВЫ. АРТЫКУЛЫ

ЦЯЎЛОЎСКІ Міхаіл Дамінікавіч,

заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь, акадэмік трох Міжнародных акадэмій, доктар тэхнічных навук, прафесар

Я знаю ксендза Владислава с 1994 года. С той поры он у меня как духовный наставник и я все время иду вместе с ним. Мне хотелось бы сегодня высказать критику в отношении деятельности ксендза Владислава Завальнюка, но критику не в советском, извращенном, изуродованном, а в цивилизованном понимании. Критика — это греческое слово «оценка», то есть оценить деятельность уважаемого ксендза Владислава Завальнюка.

Этот костел, где сейчас мы находимся, изуродованный до неузнаваемости, в котором сохранились только очертания, — их не удалось, к счастью уничтожить, — он возродил, возродил в храме литургические обряды и богослужения и одновременно с этим он в этом храме создал крупнейший, уникальнейший как в Беларуси, так и, я бы сказал, в мире научно-исследовательский и культурный центр христианской культуры. В этом храме работает профессорский христианский клуб, в состав которого входят ведущие ученые различных направлений: это и языковеды, и правоведы, и медики, и технические работники, и доктора

технических наук. Сегодня в этом храме объединяются научные кадры с высшей аттестацией докторов наук, кандидатов наук больше, чем в каком-нибудь научном академическом центре или в ВУЗе. Эти кадры, эти силы позволяют ксендзу Владиславу проводить огромную работу, которая направлена **на возрождение духовности**, нравственности и христианской культуры белорусского народа. Вот в этой связи мне хотелось бы низко поклониться Вам, уважаемый ксендз Владислав, за Ваш огромнейший труд, за подвиг, который Вы совершили в этом деле.

Мне посчастливилось быть на защите Вашей кандидатской диссертации. Там действительно с позиции мужественного, самоотверженного, опытного специалиста Вы дали состояние Католического Костела в годы разнузданного воинствующего атеизма. Такой оценки никто никогда в мире еще не давал. Я думаю, что наступит время, когда Ваша диссертация будет издана книгой так, как издана сегодня эта книга «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі».

Мне хотелось бы сказать еще об одной прекрасной работе уважаемого ксендза Владислава, это — «Костелы царской России». Это уникальнейшее произведение. Я знаком с этим произведением, я читал ее рукопись. Уникальность произведения в том, что оно впервые появляется на свет. Там излагается вся информация, которая доступна была не только ксендзу Владиславу Завальнюку, но и широкой научной общественности.

Два слова о книге «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі». Я очень благодарен, что ксендз Владислав дал эту книгу нам в семью, потому что у нас в семье состоялась тоже своя научная конференция по обсуждению этой книги. Мы собирались три семьи по вечерам и читали эту книгу и устанавливали истину, как надо правиль-

но приветствовать друг друга: «Хвала Ісусу Хрысту» или «Слава Иисусу Христу», «Христос воскрес» и т. д.

Уникальность этой книги в мужественном, героическом, смелом и в то же время чрезвычайно корректном, чрезвычайно покорном письме на имя Его Эминенции кардинала Казимира Свентэка. Вы, ксендз Владислав, впервые единственный человек правильно, мужественно смогли поставить вопрос о том, чтобы в Беларуси, в белорусских католических храмах, велось служение на белорусском языке. И вот эта Ваша книга «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» — это достойный вклад в огромное дело, которое позволяет уйти от партизанских переводов и перейти к такой лексике, к такой терминологии, которая приемлема не только для христиан-католиков, но и для всех христианских конфессий Беларуси. Ее могут использовать и православные, и греко-католики и католики.

Еще раз огромное Вам спасибо, ксендз Владислав, за Ваш уникальный труд, за книгу «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі», за новое издание книги Святого Писания, текст которого воспринимается очень легко, потому что, как уже здесь говорили, каждое слово, каждая грамматическая форма тщательно выверены, приведены в соответствие с современным белорусским литературным языком, который изучают в школе. И в благодарность за Вашу душпастырскую работу, за Вашу неутомимую духовную работу, за Вашу научную, культурную, самую многогранную деятельность я преподношу Вам эту книгу, которую написал Адам Мицкевич в знак создания Вами библиотеки имени Адама Мицкевича. Считаю, что в Беларуси, и не только в Беларуси, Вы являетесь не только образцом для подражания, но тем человеком, который может увлечь за собой большие массы людей разных вероисповеданий.

ВАСЮЧЭНКА Пётр Васільевіч,

загадчык кафедры
беларускай мовы і літаратуры
УА «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны
універсітэт», кандыдат
філалагічных навук, дацэнт

У духоўным жыцці Беларусі Біблія — Кніга кніг — адыгрывала вядучую ролю яшчэ ў эпоху ранняга Сярэднявечча, за часамі хрысціянізацыі нашай краіны. У 1517 годзе Францыск Скарына распачаў сваю падзвіжніцкую працу па перакладзе Бібліі на мову люду паспалітага. У свядомасці першадрукара Біблія як абсалютная каштоўнасць спалучалася з іншай святыняй — нацыянальнай мовай.

Скарына быў першым, але далёка не апошнім у чарадзе асветнікаў, якія імкнуліся падараваць беларускаму народу Біблію на яго мове. Але драма ў тым, што, нягледзячы на ўсе высілкі, вернікі Беларусі дагэтуль не маюць поўнага і кананізаванага перакладу Бібліі на сучасную беларускую мову.

І ў гэтай сувязі кніга Уладыслава Завальнюка бачыцца сапраўдным прарывам, які набліжае беларусаў да іх духоўнай патрэбы — мець Біблію на роднай мове.

Аўтар з поўнай перакананасцю даводзіць пастулат, змест якога вынесены ім у загаловак кнігі: мова — духоўнае багацце народа.

Падзяляю пафас стваральніка кнігі, перакананага ў тым, што тэкст сучаснай Бібліі павінен выконвацца на прыгожай, нарматыўна гарманізаванай літаратурнай мове. Разам з тым ён бачыць складанасці, звязаныя з фарміраваннем рэлігійнай і канфесійнай лексікі. Таму Вы, паважаны ксёндз Уладыслаў, востра ставіце

актуальныя моўныя пытанні, без вырашэння якіх няпроста стварыць кананічны тэкст беларускамоўнай Бібліі. На некаторыя пытанні аўтар знаходзіць адказ самастойна, іншыя ж адрасуе самаму шырокаму колу спецыялістаў, у першую чаргу лінгвістам.

І гэта лагічна, бо далёка не ўсе лексічныя пытанні можна развязаць пры дапамозе слоўнікаў, бо слоўнікі закліканы фіксаваць ужо існуючыя ў моўным і літаратурным працэсе адзінкі, а развіваць мову — справа літаратараў, перакладчыкаў.

Пры вырашэнні спрэчных моўных пытанняў патрэбна, на маю думку, шукаць гармоніі паміж ужо існуючай моўнай канфесійнай традыцыяй і агульналітаратурнай мовай.

Варта часам кіравацца і моўнай інтуіцыяй, густам. У выбары паміж словамі *Благавешчанне* і *Дабравешчанне* (с. 163) не толькі моўная практыка, але і інтуіцыя падказваюць мне перавагу слова *Дабравешчанне*.

Аўтар вельмі слушна аддае перавагу словам з высокага пласта лексікі, але пры гэтым варта даваяраць і эстэтыцы народнай мовы, у стыхіі якой ёсць словы дастаткова апрабаваныя і мілагучныя для таго, каб быць уведзенымі ў кананічны тэкст. Да такіх, на маю думку, належыць і слова *валачобнікі* (с. 170)

Лічу, што лінгвісты сапраўды павінны паспрыяць у пошуку адказаў на пытанні, якія так лагічна ставіце Вы, паважаны ксёндз Уладыслаў.

Значным крокам на шляху стварэння Святога Пісьма на беларускай мове бачыцца мне другое выданне Евангелля (Мінск, 2007). (Першае выданне было здзейснена ў 1997 годзе). Вядома, каб быць кананізаваным, гэты тэкст павінен прайсці шэраг апрабацый,

і пачатак гэтаму працэсу паклалі ўжо Вы, паважаны ксёндз, калі наладзілі грамадскае абмеркаванне перакладзенага тэксту Евангелля ў рэпрэзентатыўным коле мовазнаўцаў, літаратараў, перакладчыкаў. Магчыма, пры далейшым абмеркаванні варта ўзняць пытанне пра мэтазгоднасць адвольнага падзелу кананічнага тэксту на падраздзелы. Можа быць, варта вярнуцца да традыцыйнай архітэктонікі тэксту.

Пажадаем плёну высакароднай ініцыятыве ксяндза-пробашча Уладыслава Завальнюка і здзяйснення яго запаветнай мары — каб Слова Божае ўвайшло ў кожную беларускую сям'ю на нашай роднай мове!

ПРЫГОДЗІЧ Мікалай Рыгоравіч,

загадчык кафедры гісторыі беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар

Роднай мове ў набажэнстве быць!

Рэлігійна-асветніцкая і патрыятычна-культурніцкая дзейнасць кандыдата гістарычных навук, магістра тэалогіі Уладыслава Завальнюка добра вядома як у асяроддзі навукоўцаў, так і ўсіх прыхільнікаў і аматараў роднага слова. Падрыхтаваная ім кніга-зварот «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» (Мінск, 2008; 182 с.) з'яўляецца яскравым пацвярджэннем яго шматгадовых намаганняў па ўвядзенні ў набажэнства беларускай мовы. І няма сумнення, што ўсхваляваны голас ксяндза-дэкана пробашча Мінскага касцёла Святога Сымона і Святой Алены будзе ўрэшце пачуты аўтарытэтнымі духоўнымі лідэрамі ўсіх веравызнанняў Беларусі.

Аўтарам кнігі тактоўна і навукова абгрунтавана, з прыцягненнем значнага лінгвістычнага матэрыялу прааналізаваны выразы з малітвы «Ойча наш» і некаторых малітоўных тэкстаў, што выкарыстоўваюцца не толькі ў набажэнстве, але і ў паўсядзённым духоўным жыцці вернікаў-хрысціян. Для разважанняў Уладыслава Завальнюка ўласціва тонкае разуменне розных адценняў слова, семантыка-стылістычнай і дэрывацыйнай валентнасці яго ў адносінах да кантэкстуальнага акружэння. Пераважная большасць прапаноў аўтара можа быць прынята як аснова для стварэння тлу-

мачальна-тэрміналагічнага слоўніка рэлігійнай лексікі, які б задавальняў патрэбы ўсіх прадстаўнікоў хрысціянскага веравучэння ў Беларусі. Гэта такія словы і выразы, *як Гасподзь, Дзева Марыя, прышэсце, Ісус Хрыстос, Гасподзь з вамі* і інш. Нельга не пагадзіцца і з большасцю разважанняў Уладыслава Завальнюка ў раздзеле «Узнёслая беларушчына, ці запазычаная трасянка».

З другога боку, ёсць выпадкі, калі думкі аўтара, яго лексічныя паралелі выклікаюць пытанні. Скажам, слова *вернік (верніца)* больш дастасоўваецца да граматычнага ладу беларускай мовы, чым *веруючы* (беларуская мова імкнецца пазбягаць утварэнняў на *-учы, -ючы*). Несумненна, пэўны паралелізм характэрны назвам *кафедра* і *катэдра*, і з гэтым трэба лічыцца, паколькі ў навуковай літаратуры ўжо склалася традыцыя ўжывання гэтых лексем у дачыненні да праваслаўнай і каталіцкай цэркваў. Тое ж можна сказаць і ў дачыненні да такіх слоў, як *манастыр* і *кляштар*, *парафія* і *прыход*, *пілігрым* і *паломнік* і інш., хоць пісьмовая і вусная практыка апошніх гадоў паступова сціраюць грані семантычных разыходжанняў у гэтых парах, пакуль яшчэ адрозных.

Пры выпрацоўцы адзінай тэрміналогіі трэба мець на ўвазе традыцыйнасць ужывання тых ці іншых слоў і словазлучэнняў у паўсядзённай практыцы вернікаў на працягу многіх стагоддзяў. Так, словы *Благавешчанне* і *Дабравешчанне* многімі разглядаюцца ледзь не як антыподы (кампанент *благ- (благо)* → *благой* нібыта мае ў беларусаў адмоўную канатацыю). Але, мяркую, гэта не так. Зыходная (адмоўная) семантыка гэтага кампанента ў наш час уяўляецца другаснай, не асноўнай, а на першы план выходзіць *благо*

(як *дабро*, *добрае*). Таму *Благавешчанне* мае поўнае права на агульналітаратурны ўжытак.

Пэўныя думкі выклікаюць развагі аб словах *труна*, *магіла*, *пахавальня*, *гроб*. Магчыма, лепш было б узяць нейтральнае *дамавіна*, якое эмацыйна і дэрывацыйна звязваецца з коранем-паняццем *дом*. Несумненнае права на агульны ўжытак маюць словы *цар*, *ялей*, *язычніцтва*, *яўрэі*, *царква*, *хрышчэнне*, *трысціна*, *укрыжаванне*.

Што датычыцца ўласных імёнаў і геаграфічных назваў, то ўсе яны павінны падпарадкоўвацца адзіным нормам беларускай літаратурнай мовы, якія даўно апрабіраваны і істотных пярэчанняў не выклікаюць.

Ідэю і намаганні Уладыслава Завальнюка цалкам падтрымліваю і ўхваляю. Дай Бог Вам сілы і неспатольнай энергіі на шляху яднання беларусаў-хрысціян вакол Царквы і роднай мовы!

КЛЫШКА Анатоль Канстанцінавіч,

празаік, крытык, перакладчык, педагог

Χάιρε! Χάιρετε!

Гэта я знарок прывітаўся з вамі па-грэчаску вітаннем першых хрысціян:

Радуйся! Радуйцеся!

У Евангеллі 365 разоў сустракаецца слова радавацца. Як бы знарок на штодзень даецца нам гэтае слова. Сёння мы асабліва можам парадавацца гэтаму дню з ласкі вельмі шаноўнага святара Уладыслава Завальнюка. Упершыню вынесены на абмеркаванне найбольш значныя лексічныя пытанні, звязаныя з перакладам Новага Запавету на беларускую мову.

Можа не ўсё ўдасца на гэты раз здзейсніць. Але нездарма ў цывілізаваным свеце ўжо ўсталявалася: праз кожныя 30 гадоў рабіць новы пераклад Евангелля. І я спадзяюся, што за 30 гадоў мы будзем мець адзінае Евангелле і для каталікоў, і для праваслаўных.

Цяпер тут ёсць пэўныя праблемы. Скажам, хоць бы такія: для перакладу бярэцца грэчаскі тэкст (у праваслаўных) і лацінскі (у католікаў).

І тут вельмі важна, каб тэкст беларускага Евангелля не быў, з аднаго боку, зрусіфікаваны, а, з другога боку, спаланізаваны, што мы бачым сёння нават у напісанні: Ісус і Езус. А каб пісалася так, як праз стагоддзі гучала і чулася ў нашай мове: Ісус. Як у Скарыны.

Мне здаецца, нашым католікам варта глядзець наперад, у будучыню. Калі ў першыя пасляваенныя гады ў былой Заходняй Беларусі сярод католікаў яшчэ жыла ў набажэнстве польская мова, а ва Усходняй — яе

помніла старэйшае пакаленне, то сёння касцёл, дбаючы аб усё новых і новых верніках, павінен бачыць, што польская мова (хіба апрача пэўнай часткі гродзенцаў) ужо адышла, насельніцтва яе не ведае. Таму яна цяпер не апірышча касцёла ў Беларусі. Трэба дбаць пра вернікаў-беларусаў, якія хай і гавораць часам на трасянцы, але родная іх мова беларуская.

Вы, паважаны ксёндз Уладыслаў, правільна ўсвядомілі, што будучыня касцёла за беларускай моваю, а таму і найпершая мэта — даць літургічныя тэксты на беларускай мове. І ў гэтым кірунку ўжо зроблены небывалы крок наперад. Вялікі дзякуй Вам ад усіх нас за гэта!

Можа дзе каму напачатку здасца нязвычным, але хутка ўсвядоміцца.

Згадваю хоць бы блізкі мне горад Чэрвень, дзе яшчэ дзесяць гадоў назад у касцёле гучала польская мова, а сёння парафіяне звяртаюцца да Бога на роднай беларускай мове. І я, праваслаўны, кажу: «Хвала Ісусу!».

Ці трэба казаць тут, што пераклад Новага Запавету — гэта не пераклад мастацкага твора; нам патрэбны як мага найбліжэйшы, амаль даслоўны пераклад, з незвычайнаю ўвагаю да кожнага слова, як слова дакумента... Бо часам тое, што можа здацца цяпер неістотным, пасля можа аказацца даволі важным.

Мне, напрыклад, вельмі рупіць, што ў ранейшых перакладах не звернута належная ўвага на адметнае ўжыванне слоў *уваскрос* і *быў уваскрошаны* ў адносінах да Ісуса Хрыста...

Памятайма, як раней здавалася некаторым вучоным нелагічным стварэнне расліннага свету да стварэння сонца.

А цяпер адкрылася вучоным і гэтае жыватворнае святло, якое было перш за ўсё.

І таму пры новых перакладах нам трэба яшчэ і яшчэ раз зверыцца і задумацца над перадачаю тых ці іншых мясцін тэксту Святога Пісання.

Прыемна, як сёння вельмі плённа працуюць над старажытнымі рукапісамі Новага Запавету аўтарытэтныя вучоныя ў Германіі. Да вайны там таксама найбольш грунтоўна вывучаліся старажытныя тэксты. Толькі ў часе вайны зактывізавалася праца ў ЗША. Цяпер цэнтр зноў перамясціўся ў Германію. І дзякуючы яму мы маем выдатныя штутгарцкія выданні Новага Запавету на старагрэчаскай мове.

Сапраўды, нам трэба дамовіцца адносна шмат чаго і перш адносна іменаслова.

Вядома, крыху зайздросна бачыць замест Іаан у англічаніна яго роднае *Джон* ці ў француза — *Жан*. І ў нас пайшлі ваганні Лука і Лукаш (як у Васіля Сёмухі) і г. д.

Я. Станкевіч у сваёй Бібліі ў гэтым кірунку пайшоў найдалей. І замест слова Госпад ужывае *Спадар*.

Як тут знайсці патрэбную мяжу?

Напэўна, калі б беларуская мова не была гвалтам выгнана яшчэ ў пазамінулым стагоддзі з царквы, натуральна замацоўваўся б наш іменаслоў.

Уявіце, калі Беларусь апынулася ў Расійскай імперыі, у нас тады 38 адсоткаў насельніцтва былі каталікі, 39 — уніяты, 10 адсоткаў складалі іудзеі і толькі 6,5 адсотка — праваслаўныя.

І вось 122 гады (да 1917 г.), калі беларуская мова не проста прыгняталася, як польская, фінская, грузінская. Яна да 1905 года апынулася пад забаронаю. Ёй адмаўлялі ў самабытнасці (друкаваліся толькі фальклорныя матэрыялы).

А пасля савецкі час.

Магутны ўсплёск беларусізацыі. Наша рэспубліка першаю ў СССР ліквідавала непісьменнасць.

А пасля русіфікацыя.

Прабачце, я як бы крыху адхіліўся ад тэмы. Але ж гэта напамін пра тыя прычыны, чаму не зрабілі ранейшыя пакаленні беларусаў да нас тое, што трэба зрабіць нам. А мы ж — старажытная хрысціянская краіна. Згадайма: Полацкая епархія заснавана ў 992 годзе, Маскоўская — у 1742 годзе — на 750 гадоў пазней!

Працуючы цяпер над перакладам Новага Запавету з грэчаскай мовы, я моцна перажываў, як быць з перадачаю грэчаскага іменаслова, бо нашы ж імёны адтуль. І як не раздражніць вялікую колькасць вернікаў?

І стала вельмі лёгка, калі вырашыў — грэчаскі тэкст Евангелля, а, значыць, і грэчаскі іменаслоў у Рэйхлінавым чытанні паводле візантыйскай традыцыі, без агляду на рускую ці польскую мовы.

Думаю, на дадзеным этапе гэта найбольш мэтазгодна.

Дык значыць: Лука, Іаан і так далей.

І таму я не разумею, чаму тут адстойваецца для Евангелля **Анна**, а ўжо для ўнутранага беларускага ўжытку пакідаецца імя **Ганна**.

У кнізе ёсць спасылка на «Слоўнік асабовых уласных імён» Судніка. Але ж я помню, як грунтоўна крытыкавалася яго першае выданне ў часопісе «Полымя» (рэцэнзія Вячаслава Чамярыцкага). Сумняваюся, што змог гэты мовазнаўца перапрацаваць сваю кнігу.

А вось «Слоўнік асабовых імёнаў (беларускарускі і руска-беларускі)» Уладзіміра Сарокі, рэкамендаваны вучоным саветам Навукова-даследчага інстытута дакументазнаўства і архіўнай справы і адрасаваны работнікам ЗАГСаў, пашпартных аддзелаў міліцыі, юры-

дычных службаў і г. д., (Мн. «Тэсей», 2000) не ўспамінаецца. А якраз там даецца адзінае напісанне **Ганна**.

Тое, што ў рускай мове амаль няма фрыкатыўнага гука [г] і там пішуць **Анна** зусім не падстава адмаўляцца ад **Ганны**.

Паглядзіце ў грэчаскі арыгінал. І **прарочыца**, Фануілава дачка, і **першасвятар**, цесць Каіафы, носяць тое ж імя **Ганна** (з **Г**). У Старым Запавеце на іўрыце таксама ёсць у гэтым імі гук [г] у адрозненне, скажам, ад выбухнога ***г*** (гімэл) або ад ***х*** (хэт). Толькі на іўрыце не Ганна, а Ганам (без двайнога **нн** і з іншым націскам), так што ніякіх падстаў адбіраць [г] у нашай Ганны не выпадае. У яе выразнае грэчаскае паходжанне. І пісаць трэба **Ганна**.

А цяпер адносна слова **Госпад** (а не Гасподзь).

За гэта стаяць шэсць склонаў: родны, давальны, вінавальны, творны, месны і клічны: Госпада, Госпаду, Госпада, Госпадам, (аб) Госпадзе, (о) Госпадзе! Усе яны просяць на ганаровы пасад назоўнага склону слова **Госпад**.

Ці трэба згадваць, што гісторыя гэтага слова сягае далёкіх часоў, і прыйшло яно з стараславянскай і царкоўна-славянскай моў разам з словамі Хрысціянскай рэлігіі (прарок, грэх і інш.).

Але, на жаль, не вельмі дакладна гаворыцца пра ўплыў стараславяншчыны на беларускую мову.

А трэба якраз падкрэсліць, што літаратурная мова беларускай нацыі складвался без таго ўплыву стараславянскай і царкоўнаславянскай моў, які зазнала руская мова, дзе ў пэўны час нават пачалі на стараславянскі лад утвараць словы, якіх не было ў стараславянскай (драгаценный і інш.). А напрыклад, словы *волот* і *колокол* дзеля надання ўзвышанасці ў рускай

мове перараблялiся ў *влат, клакол* (пра гэта добра пісаў наш мовазнавец Алесь Каўрус).

Слова Госпад — адна з назваў Бога ў хрысціянскай рэлігіі — неад'емнае ад перакладаў Новага Запавету. А іх, беларускіх перакладаў, у адным мінулым, дваццатым стагоддзі, дзякаваць Богу, было ўжо з дзесятак!

І тут не магу не адзначыць такую падзею, як пераклад Евангелля ксяндзом Уладзіславам Чарняўскім. Ён якраз усюды ўжывае слова Госпад і ў назоўным склоне.

Аднак беларуская жывая народная і літаратурная мовы ўсё ж аддаюць перавагу слову Бог. Цікава, што ў двухтомным «Фразеалагічным слоўніку беларускай мовы» І. Я. Лепешава вы не знойдзеце ніводнага фразеалагізма з словам Госпад, затое ўбачыце больш за 80 — са словам Бог.

І ў гэтым відочная розніца між беларускай і рускай мовамі. Калі ў рускай мове ёсць фразеалагізмы толькі з словам *Господь* або ёсць паралельныя фразеалагізмы, дзе *Господь* і *Бог* узаемна заменлівыя, то ў беларускай мове ганаруе толькі слова *Бог* з рознымі суфіксальнымі пашанотамі — *Божачка, Божухна,* з рознымі прыметнікамі і інш.

А цяпер пра іншыя словаўжыванні.

Распяць ці **ўкрыжаваць**?

Толькі **ўкрыжаваць, укрыжаванне**. Гэта шчасце, што ў нашай мове ёсць дакладны адпаведнік слову грэчаскай мовы з коранем *крыж*. Бо распяць можна і брызент, скуру і г. д.

А ўкрыжаванне было найганебнейшай смерцю паводле ўсходніх прымхаў. Смерць адрывала чалавека ад зямлі. Ногі асуджанага на 60—90 сантыметраў адстаялі ад зямлі.

Благаслаўлёны і **дабраславёны**.

Мне здаецца, толькі *дабраславёны*. Разгарніце руска-беларускія слоўнікі. За слова *добра*, як адпаведнік рускаму **благо** сведчаць дзесяткі прыкладаў. Ды і само слова **Дабра**весце.

Вернік ці **веруючы**?

Вядома, *вернік*. Дзеепрыметнікі цяперашняга часу ў беларускай мове не ў пашане. І назоўнікі ад іх — таксама.

Словы **яўрэі**, **іудзеі**, а не **жыды**.

На цяперашні час варты толькі такія ўжыванні.

Але я хачу сказаць, што слова *жыды* было раней, да савецкага часу, зусім натуральным, без ніякай пагарды і здзеку да яе носьбітаў. Так, як у польскай мове. (Там акурат **е́врей** мае крыўдлівае адценне).

Дык вось толькі ў часы русіфікацыі перанеслася з рускай мовы негатыўнае значэнне на слова *жыд* і ў нашу мову.

Успомнім вядомую брашуру «Жыды на Беларусі», якую напісаў яўрэй Змітрок Бядуля і якая выдадзена ў Мінскай друкарні яўрэя Грынблата. Гэта бацька нашага выдатнага фальклярыста Міхаіла Грынблата.

Так натуральна ўжывалася слова **жыды** і ў Заходняй Беларусі да 1939 года.

Гэта што да гісторыі. А на дадзены момант, вядома, лепш карыстацца: **яўрэі** і ў рэлігійным значэнні — іудзеі.

Мне крыху незразумелы «Дадатак 7» — «Словы і звароты ветлівасці». Чаму ён трапіў на гэтае абмеркаванне? Раздзел гэты просіцца, скажам, у руска-беларускі размоўнік. У 1992 годзе ў мяне выйшаў трохсотстаронкавы «Беларуска-польскі размоўнік». Там ёсць такі раздзел, і ён арганічны ў такога тыпу выданнях.

А тут? Але калі ёсць, то яго варта пашырыць і ўдасканаліць.

Я, напрыклад, ніяк не магу згадзіцца з такім вітаннем, як руская калька «Добрай раніцы!». Не кажучы пра немілагучнасць такой языкаломкі — ... **рай раніцы** — яна штучная.

Зрання і да вечара ў нас гучыць вітанне «Добры дзень!» [«Дзень добры!»]. Яно гучыць як пажаданне не на пэўны кароткі прамежак часу, а на ўвесь доўгі працоўны дзень.

Прагледзьце творы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Цёткі, Ядвігіна Ш., Каруся Каганца. Ні ў кога не сустрэнеце гэтай «Добрай раніцы!». Няўжо каму здаецца, што наш народ да Кастрычніка не ўмеў па-людску і прывітацца?!

Гэтак жа па-беларуску трэба развітвацца не «Спакойнай ночы!», а «Дабранач!».

А побач з «Хлебам-соллю», «Смачна есці!» (снедаць, абедаць, вячэраць!) варта дадаць: «Сыць, Божа!».

Ну што сказаць пад канец:

Дабраславі нас, Божа!

ЧАЙКА Наталля Уладзіміраўна,

дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсіэт імя Максіма Танка»

Кніга для ўсіх хрысціян

Другое выданне Святога Евангелля (першае — 1997 г.), дапрацаванае пад кіраўніцтвам ксяндза-магістра тэалогіі Уладыслава Завальнюка, прызначанае для ўнутраных патрэб парафіі касцёла Святога Сымона і Святой Алены, з'яўляецца адметнай з'явай у духоўным жыцці Беларусі. Вызначаецца чысцінёй сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Аўтарскі калектыў значна палепшыў лексічны арсенал Кнігі. Адчуваецца, што працавалі высокакваліфікаваныя спецыялісты, якія добра адчуваць беларускае слова і ведаюць асаблівасці жыцця і побыту ў Палесціне часоў зямнога жыцця Сына Божага Ісуса Хрыста.

Выкарыстоўваецца толькі нарматыўная лексіка, у выданні адсутнічаюць прастамоўныя, дыялектныя словы і граматычныя формы, няма ўзятых без патрэбы іншамоўных слоў (паланізмаў, русізмаў), таму і змест тэксту Святога Пісання ўспрымаецца даволі лёгка, ён даступны, зразумелы і даросламу чалавеку, і школьніку.

На наш погляд, правільна называюцца *Гасподзь Бог*, Святая *Дзева Марыя*, бо ўжыванне ў канфесійнай літаратуры слоў *пан*, *панна* прыніжае змест тэксту. У сілу некаторых гістарычных умоў словы *пан, панна, панскі, панства* могуць мець пэўную адмоўную экспрэсіўную афарбоўку. Гэта пацвярджаюць разна-

стайныя творы вуснай народнай творчасці беларусаў (прыказкі, прымаўкі, казкі, загадкі, песні), творы мастацкай літаратуры (напр., «Паўлінка» Янкі Купалы).

Добра, што ўжыты грэчаскі варыянт імёнаў: Іаан, Іакаў, Матфей, Ілія.

Асобна трэба сказаць пра структуру тэксту. Вершы (мікратэксты) цалкам адпавядаюць кананічным патрабаванням. Як і належыць, у складаных сказах адсутнічае ўскосная мова. Адносна знакаў прыпынку адзначым, што адсутнічае двукоссе — захоўваецца традыцыя пунктуацыйнага афармлення кананічных тэкстаў.

Такім чынам, Мінскі касцёл Святога Сымона і Святой Алены выданнем кнігі Евангелля зрабіў вялікі ўклад у духоўнае жыццё беларусаў. Гэта Кніга з'яўляецца настольнай для кожнага з нас (хрысціян) і асабліва будзе запатрабавана ў сем'ях, дзе члены іх належаць да розных хрысціянскіх канфесій.

Вялікі Вам дзякуй, ксёндз Уладыслаў, за Вашу плённую працу. Няхай Вас беражэ Гасподзь Бог і дапамагае.

МАЛЬДЗІС Адам Іосіфавіч,

доктар філалагічных навук, прафесар

Я сядзеў і, слухаючы, думаў: наколькі быў геніяльны Францыск Скарына, ён прадбачыў нашы праблемы, робячы свой пераклад Святога Пісання на зразумелую народу мову.

Некаторыя нашы даследчыкі сцвярджаюць, што Скарына перакладаў толькі з царкоўнаславянскай мовы, браў працы Кірылы і Мяфодзія і перакладаў. Другія сцвярджаюць, што ён карыстаўся грэчаскімі тэкстамі, іншыя — іудзейскімі. А чаму ўсё гэта адбываецца? Відаць, таму, што такія даследчыкі не ведаюць названых моў. Вось я ў Лондане, у бібліятэцы імя Францыска Скарыны, праштудзіраваў не адну з кніг па перакладах нашага першадрукара і цяпер магу сказаць, як ён перакладаў кнігі Бібліі.

Паколькі Скарына добра валодаў названымі мовамі, перакладаў Біблію так: адзін урывак браў з царкоўнаславянскага тэксту, другі — з грэчаскага, трэці — з іудзейскага. Гэта значыць, ён падыходзіў да перакладу творча: з усіх тэкстаў браў тое, што яму найбольш падыходзіла, імкнуўся, каб **людемъ посполитымъ было ўсё даступна і зразумела**. Будучы, вядома, каталікам, ён арыентаваўся на праваслаўныя тэксты. Скарына вырашаў задачы, якія хочам вырашыць сёння мы. Ён браў тэксты айцоў і каталіцкіх, і праваслаўных, для яго ў гэтым не было розніцы, важна, каб адпавядала народным запатрабаванням. Сёння нашы даследчыкі робяць вялікую памылку ў тым, што дзеляць Скарыну і не могуць падзяліць яго наперакор яму самому.

Нядаўна я прачытаў у часопісе «Весці Акадэміі навук» з гуманітарнай серыі матэрыял даследчыка (слова даследчыка можна браць у двукоссе), які пачынае свой артыкул такімі словамі: «Георгий Лукич Скорина родился ...». Ён узяў з неба па астралагічных прыкметах гады нараджэння і смерці першадрукара. Я купіў кніжку гэтага аўтара і знайшоў у ёй артыкул «Странности биографии Скорины», у якім прыгадваецца, як Івану Шамякіну ў Полацку падаравалі партрэт Скарыны, на якой наш першадрукар з барадой. А калі з барадой, значыць, праваслаўны. Вось што піша з гэтай нагоды аўтар артыкула: «Странный мужик с бородой по имени Георгий Скорина — это и есть знаменитый русский первопечатник Франциск Скорина. Бороду ему, видимо, пририсовали, чтобы он больше соответствовал образу русского православного человека 16 века... Сейчас это выглядит нелепо». Вось з апошняй фразай я цалкам згодзен, таму што хрышчэнне ў каталіцкае веравызнанне было. Ян Кантак у сваёй кнізе, выдадзенай у Пінску да вайны, абапіраецца на архівы ордэна бернардзінцаў, а дакументы гэтыя цяпер знаходзяцца ў Польшчы. Адзначым, што бернардзінцы лічылі важным і першае хрышчэнне Скарыны (у праваслаўі), і другое (у каталіцтве), яны былі талерантныя. І Скарына гэтую талерантнасць унаследаваў.

Некаторыя яшчэ лічаць, што Скарына прытварыўся католікам, каб паступіць у Кракаўскі універсітэт. Але так думаць — значыць кідаць цень на сумленнасць Скарыны. Скажам такім «даследчыкам», што гэта не так, бо і Георгіі ў Кракаўскім універсітэце вучыліся. Аб гэтым сведчаць дакументы ўніверсітэта. А таму атрымоўваецца, што, стаўшы католікам, Скарына адначасова не пакідаў глыбокай павагі да праваслаўных.

І гэты факт сёння трэба лічыць таксама важным. Таму, зыходзячы з пазіцыяй Скарыны, мы з вамі павінны адзначыць, што трэба, каб перакладзенае Святое Евангелле пад кіраўніцтвам ксяндза Уладыслава чыталі і каталіцкія вернікі, і праваслаўныя. А калі евангельскія тэксты, як адзначалі тут выступоўцы, зразумелыя, лёгка ўспрымаюцца, лёгка кладуцца на душу, значыць, паважаны ксёндз Уладыслаў, пераклад Святога Пісання пад Вашым кіраўніцтвам дасягнуў сваёй мэты. Вядома, будуць нейкія меркаванні, кожны мае права выказаць свае прыватныя думкі (для гэтага мы і запрошаны), але я адзначу, што камісія, якая працавала над тэкстамі Евангелля, справілася добра. Удакладненні пэўныя будуць, але тады, калі збяруцца разам за адным сталом хрысціяне розных канфесій.

Я памятаю размову, якая адбылася ў Рыме ў 1990 г. Тады Папа Іаан Павел II праявіў добрую ініцыятыву сабраць прадстаўнікоў Рэчы Паспалітай этнічных, а не палітычных. Там таксама ўзнікла праблема каталікаў-беларусаў. Так склалася, што адны лічаць, быццам праваслаўныя беларусы — гэта рускія, каталікі — палякі або літоўцы. А дзе беларусы? Выходзіць, што ім на сваёй зямлі месца няма? Потым у Ватыкане мне было даручана ў час прыёму Яго святасці Іаану Паўлу II паднесці кнігу «Францыск Скарына і яго час» (Мн., 1988). У кароткай прамове па-польску я сказаў, што Скарына думаў пра адзінства хрысціян, і ў гэтай кнізе ўсё добра адлюстравана.

Цяпер наконт групы перакладчыкаў. Лічу, што ксёндз Уладыслаў правільна зрабіў, уключыўшы філолагаў-аднадумцаў. Хачу правесці паралель з вызначэннем Нобелеўскай прэміі. Як дзейнічае гэты апарат?

У камісію, па-першае, не ўваходзіць болей, чым 3—5 аўтарытэтных чалавек, бо чым у групе больш людзей, тым менш плёну. Па-другое, камісія працуе закрыта ў тым сэнсе, што ўмешвацца ў работу, ціснуць на яе не дазваляецца. Вы памятаеце хоць адзін выпадак, каб нобелеўскага кандыдата, так сказаць, свецкая грамадскасць забракавала? Такога выпадку не было. Таму і ў рэпліцы прагучала вельмі слушная думка: і пры перакладзе Святога Евангелля масавасці не павінна быць. Павінна быць выкарыстана сучасная беларуская літаратурная мова, без аніякіх напластаванняў з рэгіянальных дыялектаў. Гэта мы і бачым, чытаючы пераклад Святой Кнігі пад рэдакцыяй Уладыслава Завальнюка.

Пад канец свайго выступлення скажу: я ва ўсім Вас падтрымліваю, паважаны ксёндз Уладыслаў, няхай Вам Гасподзь Бог дапамагае ў выхаванні высокай духоўнасці беларусаў.

ЛУКАШАНЕЦ Аляксандр Аляксандравіч,

член-карэспандэнт НАН Беларусі,
доктар філалагічных навук, прафесар,
дырэктар ДНУ «Інстытут мовы
і літаратуры імя Якуба Коласа
і Янкі Купалы НАН Беларусі»

Шаноўнае спадарства! Я вельмі задаволены, што мяне запрасілі на такое важнае мерапрыемства як абмеркаванне лексікі канфесійных тэкстаў і перакладу Евангелля і для гэтага прапанавалі кніжку У. Завальнюка «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» і новы пераклад Святога Пісання, выкананы групай філолагаў.

Што датычыцца першай кніжкі, то я хацеў бы падкрэсліць такія моманты. Па-першае, ідэя кнігі наступная: **мова і рэлігія ў краіне павінны народ аб'ядноўваць**, а не раз'ядноўваць, і гэта сцвярджэнне вельмі правільнае і сучаснае. Па-другое, мяне радуе, што ўлічваліся гістарычныя традыцыі станаўлення і развіцця беларускай мовы. Па-трэцяе, хачу адзначыць, што ў працэсе працы над Евангеллем перакладчыкі вельмі ўважліва ставіліся да кожнага слова, і ў гэтым сэнсе я проста ў захапленні ад кніжкі «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі». Лічу, што яна павінна стаць настольнай кнігай для кожнага лінгвіста, тады ў нас будзе менш праблем з пісьмовай беларускай літаратурнай мовай у цэлым і з канфесійным стылем у прыватнасці.

Што датычыцца перакладу Евангелля, ён на мяне зрабіў вельмі прыемнае ўражанне па наступных прычынах: выкананы добрай зразумелай сучаснай беларускай літаратурнай мовай і разам з гэтым захоўваецца

неабходны ўзровень узнёсласці і ўрачыстасці, што так неабходна для выкарыстання ў канфесійных сферах. Як мне здаецца, гэтага ўдалося дасягнуць некалькімі асноўнымі момантамі. Па-першае, правільным падыходам да анамастыкону, які прадстаўлены ў гэтых тэкстах, таму што анамастыка, анамастычная лексіка — гэта спецыфічны пласт любой мовы, і ён не павінен перакладацца, а ў большай ступені транслітарыравацца. І ў гэтым сэнсе захоўваецца адпаведнасць кананічным тэкстам, а гэта найбольш прымальны варыянт для стварэння належнай ступені ўрачыстасці. Па-другое, стварэнню ступені ўрачыстасці садзейнічае і выкарыстанне прыметніка ў постпазіцыі да назоўніка. І трэцяе, на што хацеў бы звярнуць увагу, гэта тое, што перакладчыкі Святога Пісання вельмі разумна падыходзілі да ўжывання стараславянізмаў і царкоўнаславянізмаў, таму што праблема заключаецца не ў тым, каб іх наогул не ўжываць у канфесійным стылі, а ведаць разумную меру гэтага ўжывання. І тут яна, гэтая мера, добра прасочваецца. Таму, калі будзе весціся дапрацоўка, пажадана адзначаныя моманты захаваць і ўлічыць. І ў рэшце рэшт мы атрымаем дасканалы тэкст перакладу Евангелля, які можа быць і павінен быць адзіным для ўсіх хрысціянскіх канфесій, якія існуюць на тэрыторыі Беларусі.

Праўда, некаторыя заўвагі могуць быць, але яны абумоўлены не столькі амбіцыямі, а асабістымі густамі. Мне, напрыклад, не вельмі падабаецца ўжыванне слова *благі* ў выразе *благое дрэва дае благія плады*. Ёсць добрыя беларускія словы *дрэнны* і *кепскі*, бо можна сказаць *благі* ў сэнсе *добры* (царкоўнаславянізм). Таму варта падумаць над гэтым. У тэксце сустракаюцца варыянты *Узнясенне* і *Узвіжанне*. Узвіжанне — гэта

ўстанаўленне, так гаворыцца ў беларускай мове, а ўзнясенне — гэта падняцце. Што датычыцца *Унебаўзяцця*, то гэта выразны паланізм, таму і правільна, што замест яго ўжываецца выраз *Успенне Прасвятой Багародзіцы*, як прынята ва ўсіх энцыклапедычных даведніках і навуковых працах. Такім чынам, я выказаў свае ўласныя меркаванні, і, зразумела, у кожнага з тут прысутных могуць быць таксама свае.

А ў цэлым, я хацеў бы яшчэ раз паўтарыць, што тэкст Евангелля перакладзены добра, пры чытанні ўспрымаецца лёгка. А тых, хто яго будзе дапрацоўваць, заклікаю ўлічыць усе важныя і вельмі карысныя моманты сённяшняга абмеркавання. Дзякую.

ЦЫХУН Генадзь Апанасавіч,

доктар філалагічных навук, прафесар ДНУ «Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі»

Шаноўныя калегі! Я рады, што прысутнічаю на такім не толькі ўрачыстым, але і важным пасяджэнні. Думаю, што тут пачынаецца вельмі вялікая і важная справа, і яна, як мы бачым, ужо мае гісторыю, але да гэтага часу не рэалізавана па-сапраўднаму. А. А. Лукашанец добра сказаў, што мы як моваведы вельмі задаволены тым, што айцец Уладыслаў зрабіў за нас вялікую справу: у кнізе «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» паставіў пытанне пра выбар пэўных тэрмінаў, пэўных паняццяў, слоў для канфесійнага стылю, каб можна было з чаго выбіраць, і нават прапанаваў пэўныя рашэнні. Я хацеў бы звярнуць увагу на некалькі момантаў, якія лічу важнымі для далейшай работы.

Па-першае, варыянтнасць выбару тэрмінаў дапушчальная, асабліва на першым этапе. Наша роля тых, хто нешта рэкамендуе, заключаецца быццам бы толькі ў тым, каб паставіць на першае месца тое, што ён прапануе і лічыць найбольш абгрунтаваным. Нельга ставіць пытанне так: толькі мой варыянт, ён адзіны і правільны. На нейкім этапе можа быць і тое і другое. Таму скажу, што ў кнізе «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» правільна сказана: могуць паралельна ўжывацца такія пары слоў, як *манастыр* і *кляштар* (с. 186), *парафія* і *прыход* (с. 189), *піліграм* і *паломнік* (с. 190), *Укрыжаванне* і *Распяцце* (с. 198) і інш.

І гэта вельмі добры кірунак. Такая варыянтнасць існуе вельмі даўно, яна зафіксавана ў нашых шматлікіх лінгвістычных працах. І ці трэба нешта мяняць?

І таму я з удзячнасцю ўспрымаю гэтую новую кніжку. Я як спецыяліст у славянскіх мовах скажу, што ў многіх народаў ёсць і пратэстанты, і каталікі, і праваслаўныя, але ў гэтых выпадках яны дапускаюць пэўную свабоду. Так, як і ў нас, напрыклад: і *кляштар*, і *манастыр*. Названая, напрыклад, пара слоў, перш чым трапіць у слоўнікі, узважана кваліфікаванымі лінгвістамі і ніякім сумненням не павінна падлягаць. Гэта такая доля варыянтнасці, яна можа быць у мове, яна мае пэўную канфесійную маркіроўку. Гэта дапушчальна.

Ведаючы розныя мовы, розныя сітуацыі, я магу сказаць, што такое не толькі ў нас, таму яшчэ раз паўтараю: залішняя нармалізацыя і імкненне да аднаго, як тут прапаноўвалася некаторымі з прысутных, лічу, што можа толькі нашкодзіць нашай справе. Як сказаў А. І. Мальдзіс, сапраўды, гэта справа святая, калі яна ідзе яшчэ ад часоў Скарыны.

Зусім іншае — клопат пра канфесійны стыль. Тут трэба быць катэгарычнымі. Трэба размежаваць, дзе размоўная лексіка, дыялектная, і дзе лексіка, якая можа стаць асновай для рэлігійных тэкстаў. У нас не павінна быць перавагі ні для якіх рэгіёнаў, ні для якіх дыялектаў, бо наўрад ці ўспрымуць правільна каталікі Палесся перасыпаную, скажам, паланізмамі мову Гарадзеншчыны. Адзначым, што тэкст з нязвыклымі словамі з іншых моў ці нелітаратурнымі формамі агульнаўжывальных слоў перашкаджае ўспрыняццю тэксту, асабліва, калі гэта тычыцца набажэнства ў касцёле, заняткаў у нядзельных школах. Варта дбаць і пра нашу моладзь, якая вучыцца. Культура мовы як вуснай, так і пісьмовай павінна быць высокай і гэта датычыць канфесійных тэкстаў, і святароў.

Па-другое, хачу звярнуць вашу ўвагу на тое, што айцец Уладыслаў, каменціруючы ўжыванне слоў *пра-*

віннасці і *правіны* (с. 191), вельмі правільна робіць, што звяртаецца да іншых славянскіх моў, у прыватнасці, да ўкраінскай, прыгадваючы «Украінска-беларускі слоўнік» В. П. Лемцюговай (Мн., 1980). Лічу, што той выпадак, калі слова *правіны* ўжыта ў канфесійных тэкстах замест слова *грахі*, трэба лічыць нармальнай з'явай. Нічога страшнага ў тым няма, што гэта слова ўжываюць украінцы. Украінская мова для нас у пэўным плане выступае як фільтр, яна ўжо даўно адабрала тое, што можа быць ва ўсходзе славянскіх мовах, і таму нічога страшнага, што слова *правіны* будзе супадаць у нашай і ўкраінскай мовах.

Па-трэцяе, тое самае датычыцца пэўных русізмаў і царкоўнаславянізмаў. Тая ж форма *благаславіць*, на якую вельмі негатыўна ў сваіх рэпліках адрэагавалі некаторыя з прысутных. Тэрмін *благаславіць*, на наш погляд, зусім не звязваецца са словам *блага* (дрэнна). Некалі айцец Надсан пра гэта вельмі добра напісаў, у яго ёсць цэлы артыкул, які прысвечаны гэтай тэме.

У кнізе «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» разглядаецца і такая пара, як *Тройца* і *Троіца*. Так, ёсць агульнаўжывальнае слова *тройца* (гэтую *тройцу разм.* не разліць вадой — маецца на ўвазе трох асоб, якія заўсёды бываюць разам і сябруюць) і назва вёскі *Тройца*. У такім значэнні слова *тройца* больш падыходзіць для ўжывання на побытавым узроўні. Але ёсць слова *Троіца*, яно павінна ўжывацца толькі ў канфесійным стылі. Таму адна з асноўных праблем, як адзначае айцец Уладыслаў, не звесці высокі канфесійны стыль да ўзроўню гутарковага. **Адзначым, што кафесійны стыль павінен адрознівацца ад гутарковага, бо інакш ён не будзе ўспрыняты вернікамі.** Таму клопат кіраўніка групы па перакладзе Евангелля і іншай канфесійнай літаратуры айца Уладыслава мне вельмі зразумелы.

Трэба сказаць яшчэ, што некаторыя старэйшыя людзі на паграніччы з Польшчай лічаць сябе палякамі і думаюць, што польская мова — гэта канфесійная мова. На самай жа справе гэта далёка не так. Ды і так званыя палякі, выйшаўшы з касцёла, ужо размаўляюць не па-польску, а на сваім беларускім дыялекце. Адсюль наш агульны клопат заключаецца ў тым, каб беларуская канфесійная мова была на належным высокім узроўні і адпавядала іх уяўленням пра высокую мову.

І некалькі слоў пра пераклад Евангелля. Мне вельмі спадабалася, што людзі, якія працавалі над ім, падышлі з вялікай сур'ёзнасцю, узважвалі, вывяралі кожнае слова. Тыя разважанні, пытанні да навукоўцаў у кнізе «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» менавіта скіраваны да нас, каб не дапусціць прымітывізацыі, зніжэння стылю, і, з другога боку, не падняцца да поўнай царкоўнаславяншчыны. Я яшчэ раз падкрэслю, як правільна адзначыў А. І. Мальдзіс, што шлях Скарыны — гэта сапраўды найбольш прадуктыўны шлях у свой час. Таму незалежна ад таго, некаторыя сцвярджаюць, што мова Скарыны — царкоўнаславянская, мы добра ведаем, што гэта не царкоўнаславянская мова, гэта была спроба прыстасаваць так званыя царкоўнаславянскія традыцыі для вырашэння праблем літаратурнай ці канфесійнай мовы. Рускія пайшлі гэтым шляхам і фактычна руская мова і ўзнікла такім чынам. Наша ж беларуская мова пайшла іншым шляхам, звярнуўшыся да народных крыніц.

Выказваю Вам, паважаны айцец Уладыслаў, шчырую ўдзячнасць за Вашы кнігі «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» і Евангелле, за запрашэнне на гэтае вельмі важнае мерапрыемства, на канферэнцыю. Я падтрымліваю Вас.

ВОЮШ Інга Дзмітрыеўна,

дацэнт кафедры гісторыі журналістыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Хрысціянства і нацыянальная мова: праблемы дачыненняў у моладзевым асяродку

Пытанне ўжывання роднай мовы ў рэлігійным асяродку падчас набажэнства і ў штодзённых зносінах цікавіць прадстаўнікоў многіх канфесій Беларусі. Калі для праваслаўных выданне кананічнай літаратуры па-беларуску разглядаецца хутчэй як захады да аўтакефаліі, то для каталікоў гэта больш натуральны працэс. Імша на роднай мове даўно перастала быць нечым нешараговым, і таму пераважна не выклікае пярэчанняў ні сярод кліру, ні сярод вернікаў.

Кніга Уладыслава Завальнюка «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» якраз закранае многія з аспектаў акрэсленай праблемы — і аднаўлення забытай традыцыі, і вяртання да нацыянальных скарбаў, якая можа ўзбагаціць каталіцкае жыццё, зрабіць яго бліжэйшым сэрцу носьбітаў нашай мовы і культуры.

Далучэнне хрысціян да нацыянальнай культуры шляхам выкарыстання беларускай мовы ў свецкім і рэлігійным жыцці — несумненна, высакародная і важная задача. І адным з найбольш істотных яе аспектаў з'яўляецца актыўнае заахвочванне моладзі да прыняцця духоўных каштоўнасцяў свайго народа. У сувязі са складанай сітуацыяй у савецкі перыяд, хрысціянскай моладзі ў працэнтных адносінах да агульнай колькасці сёння не так ужо і шмат. Менавіта з гэтай

прычыны ўключыць яе ў кантэкст духоўнага жыцця Беларусі вельмі важна і своечасова.

Студэнцкая моладзь — самая актыўная частка грамадства, яна ж — самая безабаронная перад новымі павевамі, канфесійнымі і грамадскімі рухамі. Звернемся да практыкі выкладання на факультэце журналістыкі ў вядучай ВНУ краіны. Думаецца, назіранні паводле дадзенай студэнцкай аўдыторыі будуць даволі паказальнымі, бо на факультэце прадстаўлена моладзь усіх сацыяльных пластоў і тэрытарыяльнай прыналежнасці Беларусі. Што ж мы бачым? Прадстаўнікоў царкоўнай і касцельнай моладзі можна пералічыць па пальцах. Магчыма, паколькі ўстанова адукацыі свецкая, многія не афішуюць сваёй канфесійнай прыналежнасці, але і гэта таксама паказальна. Прывядзём у доказ нашай думкі такі прыклад. На адным з патокаў 1 курса колькасцю 125 чалавек на практычных занятках па старажытнарускай кананічнай літаратуры ніхто не здолеў прыпомніць, што такое «Сімвал веры», а таксама працытаваць яго пачатковыя радкі. Згадаем, што крызіс самаўсведамлення, самаразумення, станаўлення і пераходу да дарослasці прыпадае менавіта на студэнцкія гады. У выніку атрымліваецца, што маладыя ў пошуках ісціны, сэнсу жыцця, уласнага чалавечага шляху знаходзяцца на раздарожжы. Філосафы культуры і педагогі ў апошніх даследаваннях паказваюць, што менавіта з гэтай прычыны цяпер так распаўсюджаны моладзевыя субкультуры — рэйверы, растаманы, готы, эма і іншыя. Гэтыя з'явы абумоўлены пэўным вакуумам у сацыяльнай структуры, памежным становішчам маладога чалавека паміж падлеткам і дарослым. У выйгрышы застаюцца духоўныя лідэры субкультур. Паступова

распаўюджваюцца і экстрэмальныя віды баўлення часу, і гэта таксама супольнасць, якая выпрацоўвае сваю культуру, якая ставіць за прыклад рызыку жыццём або здароўем. Такім чынам, паркур, скейт- і сноўбордынг, скачкі з дахаў і мастоў, дайвінг і іншыя віды дзейнасці, звязаныя з рызыкай, набіраюць папулярнасць менавіта праз духоўны вакуум, які склаўся ў сілу сучаснага становішча студэнтцтва.

Хрысціянскі ўзор светаўспрымання, яго канцэпцыя часта проста не паспяваюць дапяць маладога чалавека. Свядомае імкненне да духоўнага самаўдасканалення ва ўлонні Царквы або Касцёла таксама ўзнікае нячаста і, пераважна, залежыць ад сямейнага асяродка. Але і такое імкненне можа хутка згубіцца. Не апошняе месца ў гэтай страце або адсутнасці інтарэсу адыгрывае мова набажэнства і аддаленасць ад папулярнай канфесійнай літаратуры. Калі пратэстанцкая царква, усходнія культы якраз прапануюць якасную рускамоўную прадукцыю, то каталіцкая — польскамоўную або беларускамоўную з моцным польскім уплывам, а праваслаўе — царкоўнаславянскую. (Выключэнне, бадай, складае Петра-Паўлаўскі сабор). З гэтай прычыны абсалютна лагічна і мэтазгодна прапаноўваць і для нядзельнай школы, і для моладзевых каталіцкіх суполак літаратуру на роднай мове. На той мове, якая вывучаецца ў школе, якая адначасова з'яўляецца прывабнай і як самакаштоўнасць, і як нацыянальная святыня, і як «адзнака» пэўнай хрысціянскай далучанасці, своеасаблівай субкультуры, кажучы слэнгам, «крутасці», адметнасці. Яна ж дадае дакладнасці ў разуменні сэнсаў і іх адценняў падчас Імшы або чытання малітоўніка. Не трэба скідваць з рахунку і тое, што мова дае юнаку, дзяўчыне адчуванне радзі-

мы, нараджае пачуццё патрыятызму. Існуе і іншы бок праблемы. Тыя маладыя людзі, хто чакае паклікання (маю вопыт зносін з імі. — І. В.), таксама гавораць аб тым, што яны хочуць служыць свайму народу на роднай мове — быць не польскімі, не літоўскімі, а беларускімі святарамі.

Прывіццё любові да роднай мовы ў духоўным жыцці, зразумела, павінна пачынацца не са студэнцкіх гадоў, а закладвацца раней. Менавіта праз гэта ўзнікае пільная патрэба ў канфесійнай літаратуры для дзяцей і юнацтва на сучаснай беларускай мове, прычым натуральнай, не насычанай як рускімі і царкоўнаславянскімі, так і польска-лацінскімі элементамі. Асабліва гэта важна для школы, для моладзевай суполкі, для энтузіястаў, бо яны з'яўляюцца новай генерацыяй — неафітамі, якія ў пераважнай большасці спазнаюць веру не ад бацькоў і продкаў, а нанава. Яны не падзяляюць сябе на рускіх і палякаў паводле веравызнання, як гэта было прынята сярод даваеннга і пасляваеннага пакаленняў, а ў большасці лічаць сябе беларусамі, што спавядаюць пэўную рэлігію. Такім чынам, даходлівей слова на той мове, якая вывучаецца ў школе, якая належыць карэннаму насельніцтву, якая зразумелая без перакладу, якая ўсведамляецца яе носьбітамі на генетычным узроўні, — адзін са шляхоў кансалідацыі каталікоў розных рэгіёнаў Беларусі, яднання маладых на падставе хрысціянскай дактрыны, шлях, які сёння рыма-каталікі могуць паказаць праваслаўным і пратэстантам.

Вось таму і адзначым, што кнігі Вашы, паважаны ксёндз Уладыслаў, «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» і пераклад на сучасную беларускую літаратурную мову Евангелля вельмі надзённыя і патрэбныя. Вялікі дзякуй Вам за Вашу карпатлівую працу.

ЕРМАЛОВІЧ Васіль Васільевіч,

старшы выкладчык нямецкай мовы УА «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»

Неабходнасць кніжкі Уладыслава Завальнюка «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» і перакладзенага Евангелля, якім будуць, спадзяюся, у будучым карыстацца беларусы ўсіх канфесій, ужо даўно паспела.

Нарэшце з'явіліся ўсім нам вельмі неабходныя духоўныя кнігі на нашай роднай сучаснай агульнанацыянальнай беларускай мове. Я поўнасцю згодзен з тым, каб мова Святой Імшы і заняткаў у нядзельнай школе, а таксама іншай дзейнасці з моладдзю пры храме адпавядала літаратурным нормам сучаснай беларускай мовы.

Маю некалькі заўваг.

Евангелле

1. Прадмова «Жыў у Капернауме...». Як германіст я выступаю за напісанне назвы горада цераз дыфтонг *аў*, бо яго варыянт без кароткага, нескладовага «*ў*», я разглядаю як русізм (*русіцызм*?).

2. Русіцызмамі лічу таксама ўласныя імёны *Давід* і *Матфей*. Слова *Сцяфан* неабходна замяніць на *Стэфан*. Замена імені *Езус Хрыстус* на *Ісус Хрыстос* пазбаўляе Святую Імшу каталіцкага каларыту.

3. Я выступаю за поўную форму прыметнікаў і дзеепрыметнікаў. Замест *якія былі ўкрыжаваны разам з Ім* прапаную пісаць ... *укрыжаваныя* (с. 134).

1. Замест *веруючы(я)* прапаную словы *вернік(і)*.

2. Выступаю таксама за поўную форму ўказальных займеннікаў. Замест *гэта праца* (с. 148) неабходна было б ужываць форму *гэтая праца*, замест *гэта слова — гэтае слова*, каб лепш на слых успрымаць родавыя нюансы і паняцці.

3. Нарэшце, на с. 300 неабходна пісаць слова не *воруб'ем*, а *вотруб'ем* (прапушчана літара *т*).

Шаноўны ксёндз-дэкан, пробашч Уладыслаў, шчыра дзякую Вам за той давер, які Вы аказалі нам усім. Не крыўдуйце, калі ласка, за пару невялікіх, мабыць, не зусім істотных заўваг, якія носяць суб'ектыўна прыватны характар.

Памагай Вам Бог! І спору Вам у Вашай такой неабходнай у духоўным жыцці беларускага народа працы па стварэнні духоўнай літаратуры.

Шчасці Вам Божа ва ўсіх Вашых духоўна-рэлігійных справах.

РОДАЎ Герман Паўлавіч,

старшыня Біблейскага таварыства

Очень благодарен Вам, уважаемый ксендз Владислав, что Вы пригласили меня на это важное мероприятие, что дали возможность ознакомиться с Вашими чудесными книгами «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» и новым доработанным переводом Святого Писания.

Сразу скажу, что во всем Вас поддерживаю. Вы взяли правильный подход в работе по упорядочению лексики конфессионального стиля. Очень хорошо, что Вы глубоко вникаете в значение каждого слова, выверяете, соотносите с научными исследованиями, которые нашли свое отражение в различных лингвистических трудах, словарях. Считаю, что возглавленная Вами рабочая группа филологов с переводом Евангелия справилась хорошо. Правильно делаете, что стремитесь к тому, чтобы конфессиональная лексика и все ее грамматические формы соответствовали литературным нормам современного белорусского литературного языка. Отмечу, что избранный Вами путь правильный.

Теперь расскажу о Библейском обществе, которое я возглавляю. Оно состоит из основных христианских конфессий. Это и православные, и католики, и грекокатолики, и представители протестантских церквей, а также христиане-адвентисты седьмого дня. Библейское общество ставит своей задачей мудрое сочетание того, что практически осуществляется в работе, с тем, что уже сделано с точки зрения перевода Библии. Существует синодальная комиссия по переводу, которая

действует при Экзархате Белорусской Православной Церкви. Возглавляет ее протоиерей Сергей Гордун. Входят в комиссию Иван Чарота и ряд других известных ученых, которые, как вам известно, издали Четвероевангелие на греческом, старославянском, русском и белорусском языках. Сейчас комиссия заканчивает работу по переводу Деяний Апостольских. Мы, как было отмечено, на конференции, посвященной юбилею Апостала Павла, готовы в ближайшее время издать полную версию перевода Библии ксендза Чернявского, потрясающего человека. Осталось только немногое — найти деньги. В этом году все-таки средства будут, поскольку мы бросили клич сестрам и братьям, которые готовы нам помочь. Мы этот перевод издадим, пусть наши белорусы читают, думают, размышляют и, прежде всего, молятся Господу Богу.

Что касается выступлений, которые здесь прозвучали, скажу, что они были очень интересными. И хотя кто-то нарушал регламент, для нас и лично для меня было очень интересно слышать тех, кто искренне стремится правильно и как можно понятнее донести Святое Писание до нашего народа. И Библейское общество приглашает к себе всех, чтобы мы в единении сотрудничали в этом важном деле.

У нас недавно проходила конференция, на которой присутствовали представители библейских обществ Польши, Великобритании. Они хотели встретиться с Вами, уважаемый ксендз Владислав, но у них ничего не получилось.

Что касается проблемы использования белорусского языка в богослужениях, то здесь больше всего отстают братья протестанты. Отмечу, что есть небольшие группы и у баптистов, и у пятидесятников, где

ведутся проповеди на белорусском языке. В больших церквях в основном проводятся проповеди на русском языке. А почему? Как сказал один из проповедников, раньше в 50—70-ые годы пользоваться белорусским языком было непринято. А теперь, когда это стало возможным, многие просто оказались неготовыми.

И последнее хочу сказать. Ксендз Владислав прекрасно говорит о том, что в воскресных школах должна звучать правильная белорусская литературная речь. Я это поддерживаю. Надо, чтобы в воскресных, субботних школах работа проводилась на белорусском языке. Очень хорошо, когда в храмах молодежь будет слышать родную белорусскую речь, разговаривать на ней.

Заканчивая свое выступление, еще раз хочу высказать свою благодарность за приглашение на эту интересную конференцию. Пусть Господь Бог Вам, уважаемый ксендз Владислав, помогает в Вашем благородном труде.

ВОЙЦІК Валянціна Вацлаваўна,

выкладчыца беларускай мовы і літаратуры

Выказваю шчырую ўдзячнасць паважанаму пробашчу Мінскага касцёла Святога Сымона і Святой Алены Уладыславу Завальнюку за даволі цікавую і патрэбную кнігу «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі», аўтарам якой ён з'яўляецца. У гэтай кнізе на прафесіянальным узроўні паказаны пошукі слова, каб раскрыць гістарычную праўду зямнога жыцця Госпада Ісуса Хрыста, зрабіць даступнай кожнаму з нас глыбокую мудрасць Святога Пісання. Для гэтага аўтар шырока карыстаецца шматлікімі аўтарытэтнымі навуковымі крыніцамі, разнастайнымі даведнікамі, упэўнена абапіраецца на працы нашага славутага асветніка Францыска Скарыны, на апошнія выданні лексікаграфічных прац, у прыватнасці, на «Слоўнік асабовых уласных імён (Мн., 2005, 2-е выданне, выпраўленае і дапрацаванае), укладальнікам якога з'яўляецца член-карэспандэнт НАН Беларусі М. Р. Суднік, а навуковы рэдактар — доктар філалагічных навук, прафесар А. А. Лукашанец.

Уважліва прааналізаваўшы Дадатак № 2 да кнігі «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» (с. 240), я цалкам падтрымліваю пробашча ва ўжыванні ў Евангеллі імён вучняў Ісуса Хрыста такімі, як было спрадвеку прынята ў Беларусі: святы Матфей, святы Марк, святы Лука, святы Іаан, а не ў вытворным варыянце і штучным перанясенні гэтых жа імён з польскай мовы.

Я згодна з тым, што раней, калі беларусы каталіцкага веравызнання называлі сябе палякамі і лічылі

за гонар валодаць польскай мовай, ды і набажэнствы праводзіліся на польскай мове, то і ўсе імёны гучалі так, як у Польшчы.

Але цяпер іншая сітуацыя. Упершыню ў гісторыі Беларусі існуе Каталіцкі Касцёл менавіта для беларусаў. І з гэтым трэба лічыцца. Трэба лічыцца і з беларускай лексікай, якая прыйшла да нас з далёкіх мінулых часоў. Таму пробашч Уладыслаў правільна робіць, калі рэкамендуе перакладчыкам Святога Пісання прытрымлівацца чыста беларускіх традыцый і правапісных норм. Яго патрабаванні якраз супадаюць з новымі «Правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі (Мн., 2008). Напрыклад, у § 9, п. 1 на с. 14, да правіла аб напісанні спалучэнняў галосных у запазычаных словах прапаноўваюцца прыклады — імёны: *Іосіф, Іаан*.

Як педагог я падтрымліваю пробашча ў тым, што і ўсе геаграфічныя назвы павінны пісацца ў адпаведнасці з нарматыўным слоўнікам: *Іардан, Іарданія, Іудзея, Іерусалім, Еўфат, Палесціна* і інш., а не ў лацінска-польскім варыянце. Па-беларуску правільна пішуцца і такія спалучэнні слоў, як *Гасподзь Бог, Ісус Хрыстос, Дзева Марыя*. Я як прадстаўніца каталіцкага веравызнання гэта прымаю. Прымаю таму, што Святое Евангелле павінна быць аднолькавым для ўсіх хрысціян Беларусі, аб'ядноўваць не толькі сем'і (у мяне быў муж праваслаўны), але і нацыю ў цэлым.

Вамі, паважаны ксёндз-пробашч, зроблены першы крок мудрага чалавека. Веру, што Вас падтрымаюць, бо за яднанне ўсіх хрысціян моляцца не толькі каталікі, але і прадстаўнікі іншых хрысціянскіх канфесій. Я Вас падтрымліваю.

Няхай Гасподзь Бог Вам дапамагае.

ЛЯВОШЫК Марына Міхайлаўна,

спецыяліст па маркетынгу,
г. Пінск

У час наведання Мінска ад сваіх родзічаў я атрымала дзве кнігі: «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі», аўтарам якой з'яўляецеся Вы, шаноўны ксёндз Уладыслаў, і пераклад Евангелля на сучасную беларускую літаратурную мову.

Наконт Святога Пісання скажу, што асабіста ў мяне ёсць кнігі Бібліі, яны на рускай мове і на беларускай. Але — можна я прызнаюся? — беларускі варыянт, выдадзены класічным правапісам, даволі цяжкі для ўспрыняцця. І менавіта таму, што імёны святых, якія ўвесь час на слыху ці можна бачыць у розных энцыклапедычных выданнях, напісаны не так, як ужо прынята ў Беларусі. А калі яшчэ ўжыты ў тэкстах словы з польскай мовы ці з нейкага незнаёмага мне дыялекту, выкарыстаны нязвыклыя граматычныя формы, то скажу адкрыта, што ўсё гэта выбівае з успрыняцця галоўнай думкі тэксту. Лаўлю сябе на тым, што спыняюся не на галоўным у кнізе, а на непатрэбных прыватных элементах.

Гаворачы пра гэта, я не супраць Святога Пісання з выкарыстаннем класічнага правапісу. Я ўбачыла і спецыяльна купіла такую кнігу, яна мая, у мяне і застанецца, але, павінна сказаць, пакуль што толькі як помнік беларускай мовы пачатку XX-га стагоддзя. Адзначу, што для чытання такой кнігі павінна быць добрая моўная падрыхтоўка, якой у мяне, на жаль, няма, ды і не толькі ў мяне. Выказваю не толькі маю думку, але і думку маіх сяброў, родных праваслаўнага і каталіцкага веравызнання.

І калі я прывезла ў Пінск Святое Евангелле на сучаснай беларускай літаратурнай мове, выдадзенае, паважаны ксёндз Уладыслаў, пад Вашым кіраўніцтвам, то мы ўсе дома прачыталі яго з вялікім задавальненнем, а мая бабуля (па прафесіі медык) сказала, што Ваша выданне чытаецца намнога лягчэй, чым нават на рускай мове. І яна хацела б набыць такую кнігу асабіста.

Яшчэ скажу Вам, што бачу вельмі цікавым і нязвыклым у Вашай кнізе Евангелля, дык гэта ўступныя артыкулы пра аўтараў-евангелістаў. Такія матэрыялы міжволі пераносяць чалавека ў эпоху Ісуса Хрыста, даюць магчымасць адчуць сябе побач з Яго вучнямі, быць сярод вялікага натоўпу людзей і слухаць такія блізкія, зразумелыя кожнаму словы Сына Божага, і чакаць, як і ўсе, ад Яго дапамогі.

Апраўдвае сябе ў Евангеллі і тое, што кожны раздзел мае некалькі частак, прычым кожная з іх са сваім загалоўкам. Па іх вельмі лёгка вярнуцца да ўжо прачытанага і знайсці патрэбнае месца, узнавіць яго ў памяці.

Хачу сказаць, паважаны ксёндз Уладыслаў, вялікі дзякуй і за кнігу «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі», бо яна вучыць любога чалавека, які займаецца інтэлектуальнай працай, як трэба ставіцца да слова, перш чым яго выкарыстаць, а гэта значыць — Ваша кніга вучыць думаць.

А дадатак № 5 (кароткі тлумачальны слоўнік) — цэлае адкрыццё. Ён закрые прагалы ў веданні Святога Пісання многіх вернікаў розных хрысціянскіх веравызнанняў, у тым ліку і мае.

Па-першае, трэба адзначыць, што кожны артыкул пабудаваны арыгінальна. Ён пачынаецца з эпіграфа, выкарыстанага са Святога Пісання, пры ім ёсць памета, адкуль ён узяты. Па-другое, мова кожнага тлумачэн-

ня вельмі даступная, дакладная, зразумелая. І які б артыкул з дадатку мы ні ўзялі, ён мае агульнаадукацыйнае значэнне, пашырае веды чытачоў, знаёміць з тымі звычаямі, абрадамі, законамі жыцця, якіх прытрымліваліся іудзеі часоў зямнога жыцця Госпада Ісуса Хрыста. Такія артыкулы як «Вітацца ў дарозе» (с. 292), «Вясельнае, святочнае адзенне», «Вячэра любові» (с. 285), «Геена вогненная» (с. 287), «Ігольнае вушка» (с. 288), «Радавод» (с. 291), «Разарваць сваё адзенне» (с. 291), «Распарадчык вяселля» (с. 292), «Скрыжалі запавету» (с. 295), «Субота» (с. 295), «Узляжаць за сталом» і інш. — усе яны, які ні вазьмі, пашыраюць, паглыбляюць веды вернікаў любога хрысціянскага веравызнання, калі ён не мае багаслоўскай адукацыі. Хочацца думаць, што ўсе артыкулы з названага Кароткага тлумачальнага слоўніка лягуць у аснову вялікага энцыклапедычнага даведніка да Новага Запавету, вельмі неабходнага кожнаму пры чытанні і правільным разуменні Святога Пісання.

У канцы свайго невялікага водзыву хачу сказаць, што я, мае родныя, сябры падтрымліваем Вас, паважаны ксёндз Уладыслаў, ва ўсім, выказваем Вам шчырыя словы ўдзячнасці. Няхай Вас і ўсіх, хто з вамі працуе, Гасподзь Бог умацоўвае і ўсім вам дапамагае.

БУРБОЎСКАЯ Алена Уладзіміраўна,

вядучы навуковы супрацоўнік аддзела фондаў установы «Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы»

Паважаны ксёндз Уладыслаў! Я ў захапленні ад Вашай кнігі «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі». У ёй сабраны праблемныя артыкулы, лексічныя напрацоўкі, закладзена аснова для далейшай працы па ўдасканаленнні мовы канфесійнага стылю, а слова ў новым выданні Евангелля стала прадметам скрупулёзнага аналізу, а то і цэлага даследавання. Цалкам згодна з вучонымі А. Мальдзісам і П. Васючэнкам у тым, што асобныя артыкулы, дадаткі да Вашай кнігі — гэта ўжо і ёсць пачатак працы па стварэнні канфесійнага слоўніка беларускай мовы.

У сваёй кнізе Вы робіце гістарычны экскурс у часы з'яўлення Бібліі ў Беларусі, робіце акцэнт на значэнні неацэннай спадчыны Ф. Скарыны, шырока абапіраецеся на Слоўнік мовы нашага славутага асветніка, першадрукара. Па гэтым пытанні хачу сказаць і я некалькі слоў.

З перакладамі Бібліі на нацыянальныя мовы Ф. Скарына, як мяркуе вучоны У. Калеснік, мог сутыкнуцца яшчэ ў гады вучобы ў Кракаве, дзе надзвычай вялікая ўвага ўдзялялася тэалогіі і былі спробы асэнсавана вытлумачыць пастулаты хрысціянскай веры.

Першы рукапісны пераклад Бібліі на польскую мову быў зроблены для ўдавы караля Ягайлы Соф'і Гальшанскай, якая не ведала латыні і чытала тэксты, напісаныя кірылічным алфавітам (паходзіла са старажытнага беларускага роду князёў Друцкіх). Але тэкст

таго перакладу не мог быць даступным ні вучоным, ні тым больш студэнту Ф. Скарыну. Друкаваныя польскія пераклады Біблії з'явіліся пазней, пасля выданняў Ф. Скарыны.

Вучоныя-даследчыкі мяркуюць, што Ф. Скарына выкарыстаў вопыт Чэхіі, у якой існавала некалькі перакладаў Біблії, разлічаны «к хвале Бога і праслаўленню мовы чэшскай».

Скарынаўскія выданні Біблії сталі адным з узорных выданняў свайго часу. І галоўным стымулам у яго была мэта паслужыць ведамі і ўменнямі роднаму краю і народу — *людемъ посполитымъ*.

Мова выданняў Ф. Скарыны лексічна багатая, выразная, стылёва арыгінальная, паўнагучная. Гэта тагачасная мова, на якой гаварылі і пісалі культурныя прадстаўнікі грамадства Беларусі і ўсяго Вялікага Княства Літоўскага. Яму ўдалося вытрымаць належную меру, паважнасць, спакойную ўрачыстасць стылю з тлумачэннямі і перакладамі цяжкіх для разумення слоў царкоўнаславянскай мовы. Гэта ставіла беларускую друкаваную літаратуру ў шэрагі вядучых і адметных літаратур Еўропы. Кніга скарынаўскага стагоддзя стала своеасаблівай гісторыка-культурнай з'явай. І гэтай кнігай была Біблія.

Ф. Скарына быў выдатным паэтам, перакладчыкам, пачынальнікам беларускай прозы, вучоным-тэкстолагам, майстрам сентэнцый і афарызмаў, якія і сёння ўспрымаюцца як вельмі змястоўныя жыццёвыя высновы ці філасофскія разумовыя заключэнні. Больш таго, Ф. Скарына — пісьменнік, які выхаваны дзвюма вялікімі культурамі чалавецтва і з'яўляецца спадкаемцам старажытнейшых культурных традыцый, якія сёння называюцца грэка-візантыйскай і рымскай.

Магчыма, гэта паспрыяла таму, што Скарына стаў тым першапраходцам, які інтэнсіўна працаваў на збліжэнне літаратурнага славянскага Усходу з культурамі і традыцыямі народаў Захаду.

Падступаючыся да характарыстыкі выдання «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі», хочацца адразу адзначыць, што Ваша кніга, паважаны ксёндз-пробашч, кожнага чытача ўмацоўвае перакананне: менавіта нацыянальнае з'яўляецца краевугольным каменем у асэнсаванні шматвяковай гісторыі.

Канцэптуальнае выданне паслядоўна даводзіць неаспрэчную думку, што «настаў час павярнуцца да мовы беларускай».

Асаблівае месца ў кнізе займае раздзел пад назвай «Жыве мова — жыве і народ!», а таксама артыкул «Мова — душа народа», што быў апублікаваны ў газеце «Наша слова» яшчэ ў 90-х гадах. У гэтым артыкуле Вы ўжо тады ўзнялі праблему і сцвярджальна даказалі, што набажэнствы павінны праводзіцца на нацыянальнай мове, каб народу быў зразумелым дыялог са святаром. У гэтым жа артыкуле Вы падводзіце чытача да высновы: «Родная мова аб'ядноўвае, сагравае, развівае, беражэ не толькі самога чалавека, але і яго сям'ю, супольнасць, народ, а людзі, хоць і розных веравызнанняў, блізкія і паважаныя».

Уласнае аўтарскае бачанне ролі нацыянальнай мовы ў развіцці духоўнасці як усяго народа, так і ў развіцці кожнай асобы, з'яўляецца асноўнай ідэяй кнігі. У пацвярджэнне правамернасці гэтых слоў хочацца паставіць побач выказванне прафесара В. Лемцюговай: «Вашы задушэўныя, мудрыя, гарачыя словы растопяць лёд нават самых заледзянелых душ. Бог Вам у дапамогу...».

ДЗЕМІДОВІЧ Ганна Пятроўна,

старшы выкладчык
беларускай і рускай моў
УА «Беларускі нацыянальны
тэхнічны ўніверсітэт»

Хачу Вам сказаць, паважаны ксёндз-пробашч, што Ваша кніга «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» — гэта цікавейшае лінгвістычнае даследаванне, у ёй Вы паказваеце, наколькі ўважліва трэба ставіцца да слова пры перакладах, асабліва тады, калі справа датычыцца канфесійнай літаратуры. Адчуваецца Ваша вялікая заклапочанасць, зацікаўленнасць у станаўленні духоўнага выхавання беларускага народа. Абапіраючыся на разнастайныя лінгвістычныя крыніцы, Вы разам з тым паказваеце высокі ўзровень развіцця беларускай мовазнаўчай навукі. Не абмінулі Вашай увагі важнейшыя даследаванні нашых вядомых беларускіх вучоных. Акрамя таго, Вы зрабілі цікавую спасылку на духоўную спадчыну Ф. Скарыны.

У кнізе шмат дадаткаў. Сярод іх мяне зацікавіў Кароткі тлумачальны слоўнік (с. 283—300). Вельмі каштоўным з'яўляецца раскрыццё разнастайных з'яў, звычаяў, уласцівых рэчаіснасці Іудзеі часоў эпохі Ісуса Хрыста. Такія тлумачэнні рыхтуюць чалавека да ўспрыняцця Новага Запавету. Хачу адзначыць агульнаасветніцкую вартасць такіх артыкулаў, як «Алавастр» (с. 280), «Вячэра любові» (с. 285), «Геена вогненная» (с. 287), «Разарваць адзенне сваё» (с. 291), «Распарадчык вяселля» (с. 292), «Сінедрыён» (с. 294), «Узляжаць за сталом» (с. 297) і інш. Хочацца верыць, што гэтыя арктыкулы стануць пачаткам падрыхтоўкі Энцыклапедычнага слоўніка да Евангелля.

Што датычыцца перакладу Новага Запавету, то мова гэтай святой Кнігі зразумелая, дакладная, даступная, граматычныя формы адпавядаюць патрабаванням сучасных нормаў.

Падтрымліваю выкарыстаны іменаслоў і далучаюся цалкам да ацэнкі кнігі «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі», дадзенай прафесарам В. Лемцюговай.

Вялікі Вам дзякуй, паважаны ксёндз Уладыслаў, за ўдзел у духоўным выхаванні маіх суайчыннікаў. Няхай Вам дапамагае Бог у Вашай духоўна-асветніцкай справе на карысць нашай Бацькаўшчыны.

ШАВЫРКІН Міхась Мікалаевіч,

загадчык рэдакцыі
арыгінальнай паэзіі і прозы
РУП «Літаратура і мастацтва»

Выказваю шчырую ўдзячнасць за запрашэнне на канферэнцыю, за атрыманыя кнігі «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» і Евангелле.

Што датычыцца першай кнігі, то павінен адзначыць: гэта цэлае лінгвістычнае даследаванне. Вы, паважаны ксёндз Уладыслаў, паказваеце прыклад, як трэба працаваць са словам. Вы спасылаецеся на нашу лінгвістычную спадчыну, на вопыт разнастайных слоўнікаў, асобных лінгвістычных прац, акцэнтуеце ўвагу на даследаваннях Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук.

Хоць, праўда, мы ведаем, што сучасныя нашы слоўнікі складаліся яшчэ ў савецкія часы, што ў гэты перыяд была вельмі актыўная атэістычная прапаганда, якая не магла не адбіцца і на слоўніках. Так, калі возьмем акадэмічнае выданне Тлумачальнага слоўніка, то заўважым, што там можна знайсці словы і *панна*, і *мадонна*, а вось слова *дзева* няма. Таму я падтрымліваю Вас, паважаны ксёндз Уладыслаў, што ў дачыненні да Багародзіцы вы ўжываеце слова *Дзева*. Менавіта гэтаму слову, а не іншым яму сінанімічным, быць у высокім канфесійным стылі.

Калі разглядаць пару слоў *веруючы — вернік*, то, вядома, аддадзім перавагу слову *вернік*. Бо мы з вамі ведаем, што тады слова дасягае сваёй моцы, калі становіцца назоўнікам. Са студэнцкіх гадоў памятаем: *хлеб — имя существительное.*

Такім чынам, паважаны ксёндз Уладыслаў, вы вельмі правільна падыходзіце да выбару патрэбных слоў. Я ўражаны Вашай карпатлівай працай, у захапленні ад кнігі «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі».

І хачу падкрэсліць, што праз усю Вашу кнігу праходзіць глыбокая павага і вялікі давер да нашых знакамітых вучоных-лінгвістаў. Таму можна адзначыць, што ў гэтым не толькі пазнавальнае, але і вялікае выхаваўчае значэнне Вашай кнігі.

Верым, што пры Вашым уважлівым, пільным падыходзе не трапяць у канфесійную лексіку выпадковыя гутарковыя словы, словаформы, або словы, якія прыйшлі да нас з іншых краін і маюць розныя сэнсавыя адценні, як, напрыклад, *пан* (польск. *pan*), *панна*. Не прымаючы названыя словы ў канфесійны стыль, мы гэтым нікога не крыўдзім. Бо такая наша рэчаіснасць, такая была гісторыя, такі быў пэўны гістарычны перыяд, лад жыцця, які пакінуў адпаведна вялікі след у лексіцы, у вуснай народнай творчасці, у мастацкай літаратуры. І Вы, паважаны ксёндз Уладыслаў, правільна робіце, што дбаеце пра мову святой Літургіі, мову набажэнстваў, мову Святога Пісання, а разам з тым арыентуеце сваю працу на беларусаў — адукаваных, выхаваных, маладых, цікаўных, прагных да ведаў, якія вучацца ці якія будуць вучыцца.

Што датычыцца кнігі Евангелля, то скажу, што яна чытаецца даволі лёгка, будзе даступнай, зразумелай і вучню, і студэнту, і настаўніку, і вайскоўцу — кожнаму, хто з верай прымае Божае слова і хоча далучыцца да Касцёла — Царквы, прычым незалежна ад таго, якога ён хрысціянскага веравызнання. У выкарыстанні ў Святым Пісанні ўласных імён, якія ўжо прыняты ў Беларусі са старажытных часоў, я Вас таксама падтрымліваю.

Вялікі Вам дзякуй, паважаны ксёндз Уладыслаў, за Вашу творчую працу, за тое, што менавіта ўпершыню з гэтага будынка, дзе мы зараз знаходзімся, з Мінскага касцёла Святога Сымона і Святой Алены, пачала гучаць у набажэнствах наша родная мова.

ЛЮКОВІЧ Тамара Уладзіміраўна,

рэдактар Выдавецкага
РУП «Народная асвета»
Міністэрства інфармацыі
Рэспублікі Беларусь

Святое Евангелле чытаецца на адным дыханні, бо перакладзена на выразную, зразумелую мову. Хочацца верыць, што гэтую Кнігу з лёгкасцю і карысцю для сябе будуць чытаць як дарослыя, так і дзеці.

Ужо І раздзел «Радавод Ісуса», дзе напісана «Аўраам быў бацькам Ісаака», настройвае на паразуменне. Пароднаму ўспрымаюцца многія выразы Евангелля: «Не хлебам адным жыве чалавек» (Мф 4, 4), «Бачыш сучок у воку брата твайго, а бервяна ў тваім воку не заўважаеш» (Мф 7, 3), «Не кідайце жэмчугу вашага перад свінямі» (Мф 7, 6) і інш., якія сталі шырока ўжывальнымі афарызмамі.

Вытрыманы канфесійны стыль, захаваны імёны, геаграфічныя назвы, ужытыя ў Новым Запавеце, што настройвае на чытанне высокай духоўнай літаратуры.

Спадзяюся, што Евангелле будзе выкарыстоўвацца не толькі для ўнутраных патрэб парафіі, але і стане галоўнай Кнігай у кожным доме верніка-беларуса.

РУСТАМАВА Гульнара Анвараўна,

выкладчыца беларускай мовы і літаратуры

На маю думку і на думку большасці людзей, Святое Евангелле — гэта настольная кніга хрысціян незалежна ад нацыянальнасці, сферы дзейнасці, сацыяльнага становішча, узросту, месца пражывання і нараджэння. Асабліва важнае значэнне яна мае для настаўнікаў, бацькоў, бо з дапамогай гэтай Кнігі дзеці вучацца прамудрасці Божай і прыстойным паводзінам. Настаўнікі не толькі ў нядзельных школах, але на ўроках, экскурсіях і індывідуальных занятках з поспехам могуць выкарыстоўваць Святое Пісанне, якое цалкам адпавядае асноўным прынцыпам навучання: навуковасці, даступнасці, свядомасці, наглядnасці, трываласці, індывідуалізацыі, цеснай сувязі навучання з жыццём. Важнае значэнне мае Евангелле як пры навучанні асобы ў школе, так і пры яе выхаванні ў сям'і і грамадстве, бо Гасподзь Бог заўсёды дапаможа ў жыцці школьніку і студэнту, настаўніку і ўрачу, інжынеру і рабочаму, пенсіянеру і маленькаму дзіцяці.

Мова Святога Евангелля — сучасная, чыстая, дакладная, даступная кожнаму чалавеку, яна — узорная, бо адсутнічаюць прастамоўі, дыялектныя словы і граматычныя формы, неўласцівыя высокаму канфесійнаму стылю. У Евангеллі не месца і напышліва-рытарычнай лексіцы, тут павінна быць толькі гістарычная праўда. І гэта праўда выразна адлюстравана, яна лёгка ўспрымаецца.

Вельмі добра, што пры дапрацоўцы Евангелля (першае выданне было выпушчана ў канцы XX ст.)

перакладчыкі шырока абапіраліся на навейшую навукова-даведачную літаратуру. Напрыклад, у адпаведнасці з беларускім правапісам выкарыстаны разнастайныя тапонімы: *Іардан, Іудзея, Еўфрат, Іерусалім* і інш., што, на вялікі жаль, у некаторых хрысціянскіх перыядычных выданнях ігнаруецца.

Я цалкам згодна з ужываннем імён вучняў Госпада ў такім варыянце, як падае «Слоўнік асабовых уласных імён» (Мн., 2005) пад рэдакцыяй доктара філалагічных навук прафесара А. А. Лукашанца.

Варта памятаць і тое, што ў нашай краіне, Беларусі, з прыняццем хрысціянства гучыць імя Сына Божага — *Ісус Хрыстос*. Гэта сцвярджае і Ф. Скарына.

Яшчэ адзначым наступнае: навуковыя крыніцы сведчаць, што ў нас слова *пан* ніколі не ўжывалася ў дачыненні да слова *Бог*, бо мы не Польшча. А паводле пэўных гістарычных умоў у Беларусі часцей за ўсё сярод простага народа слова *пан* насіла і носіць часта негатыўную афарбоўку. Аб гэтым можна даведацца з многіх літаратурных крыніц, вуснай народнай творчасці (легендаў, казак, песень, прыказак, прымавак).

Хачу адзначыць, што я цалкам падтрымліваю Вас, паважаны ксёндз-пробашч Уладыслаў, у Вашай вялікай працы, ідэі яднання, кансалідацыі беларускага народа на аснове мовы Святога Пісання.

Няхай Вам Гасподзь Бог дапамагае ў Вашай працы.

ЯЗЕРСКАЯ Святлана Анатольеўна,

старшы навуковы супрацоўнік навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі РБ

Водзыў на кнігу Евангелле

У нас хапае слоў сваіх
святлістых, важкіх, нібы глеба...
Юрась Свірка

З даўніх часоў вялікія асветнікі нашага народа імкнуліся да яго аб'яднання на грунце роднай мовы, да дэмакратызацыі хрысціянскіх канфесій шляхам выдання рэлігійнай літаратуры на даступнай і зразумелай вернікам мове. Узгадаем велічнае імя Францыска Скарыны. Амаль пяць стагоддзяў аддзяляюць нас ад таго часу, калі слаўны сын Полацкай зямлі, беларускі гуманіст, шырока карыстаючыся скарбамі роднай мовы, выдаваў і тлумачыў біблейскія тэксты. На той час былі і іншыя высокаадукаваныя падзвіжнікі, якія выкарыстоўвалі кніжнае слова ў асветніцкіх і палітычных мэтах. Мікола Гусоўскі ўславіў сваю зямлю і народ у паэме «Песня пра зубра», але гэта быў твор, напісаны на недаступнай народу, элітнай лацінскай мове. Скарына праз пераклады і друк біблейскіх тэкстаў наблізіў здабыткі ўсечалавечай культуры да простага люду роднай зямлі. Змяняліся гістарычныя эпохі, палітычныя і сацыяльна-эканамічныя ўмовы, маштабы і сілы культурна-гістарычнага працэсу, але паступовы рух нацыянальнага развіцця і адраджэння працягваўся, беларуская зямля нараджала новых

падзвіжнікаў, што змагаліся за асвету, родную мову, уздым дабрабыту і духоўную культуру народа.

Ідэю служэння агульнаму дабру, дзейснай практычна карыснай любові да народа, айчыннай патрыятычнай традыцыі падтрымлівае сваёй руплівай працай на ніве народнай асветы, захавання і развіцця беларускай мовы ксёндз-дэкан пробашч Мінскага касцёла Святога Сымона і Святой Алены, кандыдат гістарычных навук, магістр тэалогіі Уладыслаў Завальнюк.

Выданне ў перакладзе на беларускую мову Евангелля, адказным рэдактарам якога з'яўляецца пробашч Уладыслаў, арыентавана на лепшыя ўзоры сучаснай беларускай літаратурнай мовы — высокі ўзор чалавечай духоўнасці, грамадзянскасці, прафесіяналізму. Заслугоўвае вялікай ухвалы і падтрымкі імкненне перакладчыкаў кнігі ў выкарыстанні лексікі, тэрміналогіі пры перакладзе Святога Пісання да збліжэння з аналагічнымі выданнямі іншых хрысціянскіх канфесій. Пры гэтым у новым выданні Евангелля арганічна спалучаны і захаваны традыцыі ўжывання ўласных імёнаў, і ашчадна захаваны каноны Свяшчэннага Пісання.

Клопат Уладыслава Завальнюка пра чысціню, удасканаленне і ўзвышэнне беларускай мовы, каб «нішто... не раз'ядноўвала беларусаў», пра стварэнне беларускамоўнай Каталіцкай Царквы — гэта і ёсць яркі прыклад пераемнасці, сувязі часоў, глыбокай павагі да культуры і нацыянальнай свядомасці беларускага народа, што забяспечвае захаванне нацыянальнага адзінства, духоўную і фізічную неўміручасць беларускага народа і чалавецтва ў цэлым.

МАРОЗ Валянціна Канстанцінаўна,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт

Калі назіраеш добры плён нечай працы, то звыкаешся з думкаю, што ў гэтага чалавека па-іншаму і быць не можа, што ўсё і надалей павінна ісці сваім ладам, быццам само па сабе. Так мне бачылася і дагэтуль бачыцца ў беларускай філалогіі роля незабыўнага прафесара Фёдара Янкоўскага. Так нам сёння ўяўляецца постаць пробашча Мінскага касцёла Святога Сымона і Святой Алены, кандыдата гістарычных навук, магістра тэалогіі Уладыслава Завальнюка ў духоўным жыцці Беларусі. Усе добрыя справы, распачатыя Вамі, паважаны ксёндз, дзякаваць Богу, рухаюцца, хоць, на жаль, і не без пэўных перашкодаў.

Але з усіх добрых спраў Мінскага касцёла Святога Сымона і Святой Алены асобна павінна разглядацца дзейнасць па замацаванні ў набажэнстве беларускай нацыянальнай мовы. Для ксяндза Уладыслава Завальнюка гэта сур'ёзны клопат, шчырая рупнасць, скіраваныя на развіццё сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Наданне перспектывы беларускай мове ў беларускай дзяржаве, беларускай краіне, на беларускай зямлі клопатам беларускіх вернікаў усіх хрысціянскіх канфесій — вось мэта, якую вызначыў шаноўны аўтар выдання «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі». І як тут утрымацца ад аптымістычнага — няхай доля ручыць! Але разам з тым святая справа дапамагчы такому чалавеку ў яго рупнасці, падказаць, калі ў тым ёсць патрэба, зрабіць прафесійную заўвагу, калі маеш аргументы, разважаеш, калі валодаеш досведам. З такой просьбай і звярнуўся да беларускай навуковай

грамадскасці ксёндз Уладыслаў, бо яму надзвычай важна, якое моўнастылістычнае аблічча набудзе сучасная духоўная хрысціянская літаратура.

Усе мы разумеем, што пытанні літаратурнай моўнай нормы ў любой сферы, ці то гэта адукацыйная, ці адміністрацыйная, ці духоўная, не вырашаюцца аднабакова — толькі ў працэсе моўнай практыкі; яны абавязкова рэгулююцца і спецыялістамі-прафесіяналамі, фіксуюцца ў спецыльнай сістэме правілаў, кадыфікуюцца ў слоўніках. Ксёндз Уладыслаў выдатна разумее, што гэты працэс і ў справах духоўных не будзе рухацца сам па сабе, таму і вядзе паслядоўную працу на тое, каб па ўсёй Беларусі і ў каталіцкім касцёле, і ў праваслаўнай царкве гучала беларуская літаратурная мова — мова, распрацаваная як класікамі беларускай літаратуры Янкам Купалам, Якубам Коласам, так і ўсімі, хто вылецеў з-пад іх крыла, хто ў мастацкай літаратуры, публіцыстыцы, навуцы шліфуе дыямент народнай — нашай роднай беларускай мовы.

Вы, ксёндз Уладыслаў, паказваеце добры хрысціянскі прыклад, з якім стараннем трэба працаваць з кожным словам малітвы, евангельскіх тэкстаў, іншай хрысціянскай літаратуры. Гэта пацвярджаюць як набажэнствы ў Мінскім касцёле Святога Сымона і Святой Алены, так і друкаваныя па-беларуску выданні Святога Евангелля (1997, 2007), таксама штотыднёвы хрысціянскі бюлетэнь «Голас душы» і нарэшце кніга «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі», якая створана скрупулёзна, выверана, з адзнакамі так неабходных удумлівых развагаў.

Варта прайсціся па тых старонках кнігі, дзе просяцца ўдакладненні ці знаходзяцца дадатковыя аргументы для пацвярджэння аўтаравага меркавання.

С. 150. *Хвала Ісусу Хрысту!*
На векі вечныя. Амін.

Амін. На карысць такога фанетычнага варыянта паказвае ўжыванне гэтай формы пераважна ў цэнтральных раёнах Беларусі.

С. 151. *Ойча наш, Хто ёсць на небе.*

Хто. Выкарыстанне такога займенніка здымае спрэчныя пытанні наконт *які* і *каторы*.

С. 151. На небе — у небе?

Прымаюцца як слушныя разгорнутыя аўтаравы разважанні наконт большай мэтазгоднасці словазлучэння *на небе*. Але беларускі фразеалагізм *Хораша, як у небе* (не *на небе*), магчыма, паказвае на адыход народнага досведу ад язычніцкіх уяўленняў, дзе кожнаму з багоў адводзіўся свой ярус, сваё «неба». Адзіны ж Бог уяўляецца як духоўная сутнасць, якая там — *у небе, бязмежным, бяздонным*.

На небе і ***у небе*** могуць выкарыстоўвацца як варыянты.

С. 155. *Хлеб наш* ***надзённы*** (не *штодзённы*).

Такое сустракаем у паэзіі М. Танка.

С. 158. ***Госпад Бог! Госпадзе Божа!***

Госпад. Не выпадае разглядаць форму *Госпад* як гутарковую. Ужыванне яе на Міншчыне таксама не пацвярджае абавязковага ўплыву польскай мовы. ***Госпад Бог!*** — гэта не проста адзін з раўнапраўных варыянтаў, а форма, якой можа быць аддадзена перавага ўжо з той прычыны, што ў ёй захоўваецца націск на першым складзе ў форме назоўнага склону і ў форме клічнага склону.

Вельмі б хацелася, каб аўтар яшчэ раз вярнуўся да вельмі важнай слоўнай парадыгмы з коранем *добр (дабр)* і *блага*. Вось тут самы раз прыгледзецца да практыкі ўжывання такіх слоў у асяроддзі сучасных

беларуска-моўных вернікаў. Аддаецца перавага такім: ***Дабравест, дабраславёна, дабраславіць***. Слоўнікі адлюстравалі калькаваныя формы, якія перайшлі ў беларускую мову з царкоўнаславянскай праз рускую.

Што да ***Звеставанне***, ***Дабравест***, то яны маюць неабходныя паказчыкі літаратурнай формы перад народна-дыялектнымі *Дабравешчанне*, *Благавешчанне* і інш.

С. 167. ***Уваскрэснуць — уваскрос — уваскрашэнне***. Такія формы адпавядаюць нормам сучаснай беларускай мовы. Яны не нясуць ніякіх дадатковых семантычных характарыстык. То і ***Хрыстос уваскрос***!

С. 170. ***Валачобнікі*** не павінна быць заменена на *велікоднікі* хоць бы з той прычыны, што ў этнаграфіі гэтае слова замацавалася ў якасці тэрміналагічнага: ***валачобнікі***, ***валачобныя песні***. Часам варта мець на ўвазе, што тэрміналагізуючыся, слова адыходзіць ад свайго першаснага значэння, перастае захоўваць ранейшыя стылістычныя адценні, характарыстыкі. Тое адбылося і са словам ***валачобнікі***.

С. 172, 174. Варта дадаткова засяродзіцца і на форме ***агнец***. Ці ёсць прычына стылістычна зніжаць яго, царкоўна-славянскае, да агульнаўжывальнага *ягнец (ягнятка)*?

С. 179. Божа, ***выбач*** *правіны нашыя!* (замест *прабач, правіннасці нашы*).

Асобная ўвага да сінтаксічнай формы ***Божа, злітуйся з нас!*** (не *над намі*).

Іншыя, больш прыватныя заўвагі ці меркаванні, думаю, найлепей будзе выказаць аўтару кнігі ў прыватнай форме. А ў гэтым кароткім паведамленні шчыра дзякую Вам, ксёндз Уладыслаў, ад усіх за так дарэчы распачатыя дзейсныя захады на актывізацыю беларускай грамадскасці ў СВЯТОЙ СПРАВЕ КЛОПАТУ ПРА СВАЮ РОДНУЮ БЕЛАРУСКУЮ МОВУ.

ВАЛОЧКА Ганна Міхайлаўна,

загадчык лабараторыі гуманітарнай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі, доктар педагагічных навук, дацэнт

ЗЕЛЯНКО Вольга Уладзіміраўна,

аспірант Нацыянальнага інстытута адукацыі

Культуралагічны патэнцыял біблейскіх тэкстаў і моўных адзінак:

водзыў на кнігу ксяндза У. Завальнюка «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» (2008) і пераклад Евангелля на беларускую мову (2007, другое выданне)

Адным з напрамкаў развіцця сучаснай методыкі навучання беларускай мове з'яўляецца *лінгвакультуралагічны падыход*, які, як адзначаецца ў адукацыйным стандарце, звязаны з усведамленнем мовы як сродку спасціжэння нацыянальнай і сусветнай культур, як феномена, у якім знайшлі адбітак праяўленні культуры. У аснову лінгвакультуралагічнага падыходу пакладзена формула «мова + культура», якая ў выніку лінгвістычных, культуралагічных, псіхалінгвістычных і лінгвадыдактычных даследаванняў апошніх дзесяцігоддзяў трансфармавалася ў пастулат «культура праз мову і мова праз культуру», або «прысваенне фактаў культуры ў працэсе выкарыстання мовы і авалоданне мовай на аснове прысваення фактаў культуры» (Я. І. Пасаў).

Увядзенне лінгвакультуралагічнага падыходу ў вучэбную практыку тлумачыцца заканамерным працэсам змены парадыгм адукацыі. Сёння ведавацэнтрычная парадыгма, накіраваная на засваенне школьнікамі пэўнай сумы стандартызаваных ведаў, замяшчаецца культуралагічнай парадыгмай, якая прадугледжвае інтэграцыю асобы вучня ў нацыянальную і сусветную культуру. Гэта з'ява выклікана сучаснай сацыякультурнай сітуацыяй, калі адукаванасць атаясамліваецца не толькі з інфармаванасцю і кваліфікаванасцю ў сваёй справе, але і са здольнасцю «жыць паводле норм і прынцыпаў культуры свайго часу» (В. М. Мяжуеў).

Змест і шляхі рэалізацыі лінгвакультуралагічнага падыходу ў значнай ступені звязаны з задачамі, аб'ектам і прадметам даследавання *лінгвакультуралогіі* як навукі, што ўяўляе сабой памежную зону на стыку мовазнаўства і культуралогіі. З'яўляючыся прадуктам антрапацэнтрычнай парадыгмы ў лінгвістыцы, лінгвакультуралогія даследуе «ўзаемадзеянне мовы, якая ёсць транслятар культурнай інфармацыі, і культуры — гістарычнай памяці народа» (В. А. Маслава).

Сярод прадметаў даследавання лінгвакультуралогіі мовазнаўцы выдзяляюць галіну *ўзаемадзеяння рэлігіі і мовы*. Да моўных адзінак, у якіх знайшло адбітак гэта ўзаемадзеянне, адносяцца біблеізмы *(смяротны грэх)*, фразеалагізмы са схаванай унутранай формай *(закапаць талент у зямлю)* прыказкі і прымаўкі на тэму біблейскіх сюжэтаў *(Пасылаць ад Понція да Пілата)*. «Характэрна, што людзі могуць і не ведаць пра біблейскае паходжанне гэтых выразаў, — адзначае Н. Б. Мячкоўская. — Яны проста размаўляюць на мове, якая ўвабрала ў сябе вобразы, што сталі дзякуючы Пісанню крылатымі».

Шматлікія біблеізмы, якія ўваходзяць у фразеалагічны фонд беларускай мовы *(альфа і амега, берагчы як зрэнку вока, воўк у авечай шкуры, забаронены плод, за сямю пячаткамі, казёл адпушчэння, калос на гліняных нагах, краевугольны камень, плоць і кроў, сыпаць бісер перад свінямі, хлеб надзённы, чакаць манны нябеснай і інш.)*, сведчаць пра тое, што наша нацыянальная культура з'яўляецца неад'емнай часткай сусветнай культуры. Пачэсная задача настаўніка роднай мовы — дапамагчы вучням асэнсаваць этымалогію, вобразную аснову, унутраную форму падобных выразаў, якія сталі агульным культурным набыткам хрысціянскіх народаў. Вырашэнне гэтай задачы немагчыма без звароту да першакрыніцы — біблейскіх тэкстаў, правільна і дакладна перакладзеных на сучасную беларускую літаратурную мову.

Удумлівае чытанне і вывучэнне тэкстаў Бібліі з'яўляецца адным з асноўных шляхоў авалодання сістэмай хрысціянскіх ідэалаў, каштоўнасцей, норм паводзін — тым, што складае змест духоўнай культуры. «Слова Божае ў арыгінале — вось адзін са сродкаў выратавання; слова Божае, якое чалавек не толькі слухае, але і чытае, — сцвярджае выдатны рускі філосаф В. В. Разанаў. — У Бібліі ёсць такія сцэны, старонкі, цэлыя кнігі, якія цалкам даступны дзіцячаму ўзросту».

У далучэнні дзяцей да хрысціянскіх духоўных каштоўнасцей праз вывучэнне мовы Святога Пісання вялікую дапамогу настаўніку-філолагу можа аказаць кніга У. Завальнюка «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі». У ёй знайшлі адбітак наступныя *кампаненты зместу адукацыі* (культурна афарбаваныя моўныя сродкі), што забяспечваюць фарміраванне лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі ў вучняў:

1. Назвы рэалій беларускага побыту, якія фіксуюць у мове багацце і ўнікальнасць традыцыйнай беларускай культуры. У прыватнасці, у названай кнізе раскрываюцца значэнні, этымалогія слоў *велікоднікі* і *валачобнікі* (с. 170).

2. Гаваркія словы, якія не толькі называюць прадметы, прыметы, дзеянні і г. д., але і характарызуюць іх, з'яўляючыся, па сутнасці, словамі-вобразамі: *Звставаннe*, *укрыжаванне* (с. 163, 198) і інш. Увага да афармлення характарыстычных слоў у розных мовах (рус. *Благовещение, распятие*) дазваляе раскрыць перад вучнямі спецыфіку нацыянальнай моўнай карціны свету.

3. Тапонімы, у якіх знайшлі адбітак розныя бакі жыцця народа. Надзвычай карыснай і пазнавальнай з'яўляецца інфармацыя, прыведзеная ў дадатку № 4 «Геаграфічныя назвы, населеныя пункты, якія ўпамінаюцца ў Новым Запавеце». Карыстаючыся ёю, настаўнік зможа дакладна і даступна растлумачыць вучням сэнс і этымалогію біблеізмаў *вавілонскае стоўпатварэнне, віфлеемская зорка, іерыхонская труба* і інш.

4. Фразеалагізмы, у якіх адлюстраваны гісторыя яўрэйскага народа, хрысціянскія духоўныя каштоўнасці. У прыватнасці, у дадатку № 5 «Кароткі тлумачальны слоўнік» У. Завальнюка ў цікавай і даступнай форме раскрываецца семантыка і паходжанне фраземы *геена вогненная* (с. 287).

5. Словы-сімвалы хрысціянскай культуры. Напрыклад, аўтарам кнігі тлумачыцца сімвалічны сэнс *Хлеба духоўнага*, які «арганізуе і мабілізуе нас і наш дух веры на добрыя ўчынкі хрысціянскага жыцця, вытрываласць у добрым на ўсёй жыццёвай дарозе да неба» (с. 155).

6. Запазычаныя лексічныя адзінкі як знакі іншых культур. У кантэксце лінгвакультуралагічнага падыходу да навучання мове аб'ектам увагі могуць стаць факты падабенства намінатыўных адзінак беларускай і іншых моў. Так, звяртаючыся да «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы» і «Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы», У. Завальнюк раскрывае семантыку запазычанай з лацінскай мовы лексемы Каляды *(koleda, kolęda)* у польскай, чэшскай і інш. мовах (с. 141) і размяжоўвае паняцці *Каляды* і *Божае Нараджэнне* (с. 142).

7. Формулы беларускага маўленчага этыкету як кампанент багатай нацыянальнай сінтаксічнай ідыяматыкі. Так, у кнізе «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» прыводзяцца прыклады хрысціянскіх віншаванняў «З Нараджэннем Хрыстовым!», «З Божым Нараджэннем!», «Са Святам Божага Нараджэння!» (с. 140), прывітальных формул «Хвала Ісусу Хрысту!» (с. 150), «Хрыстос уваскрэс!» (с. 143) і інш.

8. Выказванні дзеячаў культуры пра ролю мовы ў духоўным жыцці народа і асобнага чалавека, што спрыяюць фарміраванню ў вучняў каштоўнасных адносін да роднай мовы, а таксама дазваляюць школьнікам выказаць уласную пазіцыю наконт праблем, узнятых у даных радках. У. Завальнюк цытуе не толькі Ісуса Хрыста, Апосталаў і евангелістаў, але і Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта (*«Себя очень корю, что «не размаўляю па-беларуску». Это мой недостаток. Но я стараюсь, чтобы и в Церкви звучал белорусский язык и чтобы Церковь в этом отношении не отставала»* (с. 231)); рускага лінгвіста І. Сразнеўскага (*«Народ выражае сябе найпаўней і найдасканалей у мове сваёй»* (с. 225)); беларускага паэта У. Дубоўку

(«*Родная мова, цудоўная мова! Ты нашых думак уток і аснова!..*» (с. 239)). Шмат цікавых фактаў і думак пра адносіны беларусаў да роднай мовы змяшчае артыкул У. Завальнюка «Мова — душа народа», прыведзены ў дадатку № 1.

Варта заўважыць, што раздзел кнігі «Пра дакладнасць ужывання слова» (с. 180, 181), у якім разглядаюцца выпадкі недакладнага ўжывання слоў *кадзіла, ладан* і інш. у некаторых выданнях, можа дапамагчы настаўніку арганізаваць заняткі па тэме «Дакладнасць маўлення» (11 клас).

Адзначым, што выкананы ў адпаведнасці з сучаснымі літаратурнымі нормамі пераклад біблейскіх тэкстаў на беларускую мову (Евангелле, 2007) мае вялікае значэнне для практыкі навучання не толькі роднай мове, але і беларускай літаратуры. Так, у тлумачальнай запісцы да вучэбнай праграмы па беларускай літаратуры для агульнаадукацыйных устаноў (2008) адзначаецца, што «знаёмства з Бібліяй і літаратурнымі творамі з біблейскімі матывамі падорыць вучням цудоўную магчымасць адчуць мудрасць адвечных маральных запаветаў, убачыць «вечную кнігу» як крыніцу вобразнасці беларускай літаратуры і яе сапраўднай духоўнасці».

Заўважым, што курс беларускай літаратуры ў агульнаадукацыйных установах уключае вывучэнне біблейскіх аповедаў «Стварэнне свету», «Прытча пра блуднага сына», «Патоп. Ной будуе каўчэг», прадмовы да Бібліі Ф. Скарыны, біблейскай асновы п'есы «Цар Ірад» (6 клас); тэм «Біблія як адзін з найвялікшых здабыткаў духоўнай культуры і найвыдатнейшы помнік літаратуры», «Сувязь «Жыція Еўфрасінні Полацкай» з хрысціянскім веравучэннем», «Словы, ка-

занні, павучанні Кірылы Тураўскага», «Прадмовы Ф. Скарыны да ўсёй Бібліі, да кніг «Псалтыр», «Іоў», «Юдзіф» (урывак з прадмовы да кнігі «Юдзіф» рэкамендаваны праграмай для завучвання на памяць), «Прадмова Сымона Буднага да «Катэхізіса», «Прадмова Васіля Цяпінскага да «Евангелля», «Палемічная літаратура пачатку XVII стагоддзя. Развіццё рэлігійнай публіцыстыкі (Іпацій Пацей, Мялецій Сматрыцкі, Лаўрэнцій Зізаній, Афанасій Філіповіч)» (9 клас); «Сучасныя пераклады Бібліі на беларускую мову (В. Сёмуха, А. Клышка, У. Чарняўскі, пераклады Біблейнай камісіі Беларускага экзархата)» і інш. (11 клас).

Вывучэнне адзначаных тэм і твораў прадугледжвае зварот да тэксту Бібліі, які павінен адпавядаць сучасным лексічным, арфаграфічным, пунктуацыйным, граматычным нормам, паколькі з'яўляецца для вучняў узорным тэкстам.

У гэтым сэнсе кніга У. Завальнюка «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» і пераклад Евангелля на беларускую мову спрыяюць не толькі фарміраванню маўленчай культуры сучасных вучняў, але і асэнсаванню імі хрысціянскай канцэпцыі дабра, праўды, любові, прыгажосці, веры — гэта значыць духоўнаму сталенню асобы.

ХАРАНЕКА Святлана Станіславаўна,
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт кафедры беларускай
і рускай моў УА «Беларускі
дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт»

Рэцэнзія

на рукапіс кнігі ксяндза Уладыслава Завальнюка
«Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі»

Пытанні аб перакладзе тэкстаў Свяшчэннага Пісання на нацыянальную мову заўсёды мелі важнае значэнне ва ўсіх сферах грамадства. Намаганні даследчыкаў і культурных дзеячоў у гэтым накірунку цяжка пераацаніць.

Відавочна, што праца ксяндза Уладыслава Завальнюка «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» — праца падзвіжніцкая. Гэта той рэдкі выпадак, калі супольнасць канфесійнай дзейнасці і роднага слова з'яўляецца магутным сродкам аб'яднання не толькі вернікаў, але і народа ў цэлым. Відавочна, што з'яўленне такой працы — гэта патрабаванне часу (!), таму ўсе намаганні ў гэтым накірунку павінны ацэньвацца станоўча.

Хацелася б адзначыць некаторыя важныя моманты, якія неабходна падкрэсліць.

Па-першае, само паняцце рэлігійнага стылю сучаснай мовы (як і сам рэлігійны стыль) з'явілася адносна нядаўна, што мае свае аб'ектыўныя прычыны (экстралінгвістычныя і інтралінгвістычныя), таму фарміраванне сучаснай мовы рэлігійнага стылю — працэс складаны і цяжкі. Відавочна, што ў падрыхтоўцы кнігі «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» зроблена вялікая даследчыцкая праца: прыводзяцца лінгвістычныя каментарыі, спасылкі на акадэмічныя даведнікі, энцыклапедыі і кампетэнтныя выданні; даволі шмат прыкладаў, якія пацвярджаюць думку аўтара.

Па-другое, вядучай лінгвістычнай праблемай даследавання перакладаў з'яўляецца праблема семантычнай тоеснасці паміж арыгінальным і перакладным тэкстамі. Паколькі размова ідзе аб тэкстах Свяшчэннага Пісання, паўстае пытанне аб неабходнасці захавання сакральнага сэнсу.

У гэтай сувязі дазволю сабе прыгадаць традыцыі перакладу тэкстаў Свяшчэннага Пісання, закладзеныя Кірылам і Мяфодзіем, паколькі пераклады тэкстаў вузкага канону, зробленныя Кірылам і Мяфодзіем з грэчаскай мовы на старажытнаславянскую, з'яўляюцца першакрыніцай для ўсіх астатніх перакладаў Свяшчэннага Пісання на сучасныя мовы. У тэкставай раўназначнасці грэчаскага арыгіналу і яго славянскага перакладу бачылася асобая духоўнасць старажытнаславянскай мовы, здольнай адэкватна перадаць сакральны грэчаскі тэкст.

Аднак тоеснасць перакладу, па-сутнасці, немагчыма, паколькі розныя мовы адрозніваюцца і па грамматычнай арганізацыі, і па напаўненні лексічных адзінак, і па кантэкстуальных словаўжываннях. Вырашэнне перакладчыцкіх праблем у тэкстах вузкага канону дасягаецца дзякуючы камунікатыўна-пасрэдніцкай дзейнасці перакладчыкаў — Кірылы, Мяфодзія і іх паслядоўнікаў, якія абіраюць уласныя стратэгіі перакладу.

Дазволю сабе спаслацца на думку Я. М. Верашчагіна, паколькі лічу дарэчным указанне механізмаў і прынцыпаў перакладу тэкстаў Свяшчэннага Пісання. Я. М. Верашчагін, аналізуючы перакладчыцкае мастацтва Кірылы і Мяфодзія, вызначыў тры складнікі ў перакладзеным тэксце: 1) інварыянтныя (супадзенне агульнага сэнсу), 2) рэцэптыўныя (пераклад накладвае свае адбіткі, абмежаванні і мадыфікацыі сэнсу пад уздзеяннем мовы, на якую перакладаюць), 3) персанальныя (двухмоўны чалавек і яго выбар)

[Верещагин Е. М. История возникновения древнего общеславянского литературного языка: Переводческая деятельность Кирилла и Мефодия и их учеников. М., Изд-во МГУ, 1971, с. 25]. Асобая роля, на думку Я. М. Верашчагіна, належыць рашэнням асобы ў перакладчыцкай дзейнасці.

Такім чынам, пры перакладах Бібліі перакладчык мае права выкарыстоўваць вышэйназваныя механізмы з мэтай алдюстравання з'яў сучаснай мовы. Выбар перакладчыка ў рукапісе кнігі «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» падмацоўваецца разважаннямі і прыкладамі, таму мае права на існаванне.

Трэба адзначыць, што ў цяжкіх і спрэчных момантах пры перакладзе можна звярнуцца да грэчаскага і старажытнаславянскага тэкстаў, да слоўнікаў грэчаскай і старажытнаславянскай моў, дзе, магчыма, будзе знойдзена выйсце шляхам аналізу семантычнага напаўнення лексемы.

Напрыклад, на старонцы 144—145 кнігі аналізуюцца словы **Унебаўзяцце — Успенне — Ушэсце**.

Звернемся да Старажытнаславянскага слоўніка па рукапісах (X—XI стагоддзяў) пад рэдакцыяй Р. М. Цэйтлін, М., 1999.

У слоўніку старажытнаславянскай мовы (далей — СС): оусъпенид (частотнасць 14) — сон, *перен.* смерть, успение (*устар.*) (с. 749), словазлучэнне оусъпенид богородиц — Успение Богородицы (*церковный праздник*) — адзначана як фразеалагізм (с.750). Грэчаскі адпаведнік κοίμησις — сонное состояние, сон.

Лексема въшьствид — вознесение (на небо) (СС, с. 159), грэчаскага адпаведніка няма; възнесенид — вознесение (СС, с. 141), ¢n£lhyij — Увознесение (спасылка на NT): напрыклад, възнесеньи на небо (Евхологий, 62а, 6—7).

Такім чынам, паводле аналізу семантычнага напаўнення лексічных адзінак можна сцвярджаць, што варыянты **Успенне — Ушэсце** павінны быць дапушчальнымі і для сучаснай беларускай мовы.

Наконт слова **Унебаўзяцце** можна сказаць, што спосаб утварэння гэтага слова не характэрны для сучаснай беларускай мовы, як і спосаб утварэння слова **Змёртвых-паўстанне** (с. 167 кнігі), але тут неабходна ўлічваць ужо складзеную традыцыю ўжывання гэтых слоў, таму што пры фарміраванні і фіксаванні мовы рэлігійнага стылю ў сучасных абставінах гэты факт павінен адыгрываць не апошнюю ролю.

Такую ж філалагічную працэдуру можна правесці на прыкладзе слоў **Благавешчанне — Добравешчанне — Звеставанне** (с. 164 кнігі).

На старонцы 158 адзначана, што **Благодать** — рускае слова, а затым на с. 164 удакладняецца, што **благаслаўляць** запазычана са стараславянскай мовы — благословити, якое з'яўляецца калькай з грэчаскай мовы: блага (бел.) = благо (рус.) = **eÙ** (грэц.). Першы корань складаных слоў благо- ў стараславянскай мове сустракаецца ў 77 лексемах (!), што складае больш значную колькасць словаўжыванняў. З гэтага пункту гледжання перавагу можна аддаць лексеме ***Благавешчанне***, якое змяшчае глыбокі сакральны сэнс. У слове ***Дабравешчанне*** першы корань падкрэслівае ўласнабеларускае паходжанне слова, не змяняючы семантычнага напаўнення.

Лексема ***Звеставанне*** не менш напоўнена семантычна, хаця знешне губляецца семантычны кампанент 'добрая' (вестка). Параўнаем: **eÙaggšlion** — благая весть, радостное известие, **eÙaggel...zomai** — 1) сообщать радостную весть, поздравлять, 2) благовествовать (спасылка на NT).

Такім чынам, аналізуючы тэкст кнігі, можна сцвярджаць, што слова мае права на існаванне, таму што шматлікія факты або пацвярждаюцца ў дыяхранічным аспекце, або трывала ўвайшлі ў рэлігійную сферу.

Здаецца мэтазгодным разгледзець магчымасці перакладу **Господь** на беларускую мову. Абапіраючыся на класічныя традыцыі, необходна ўлічыць, што слова мае некалькі асаблівасцяў. Па-першае, націск у стараславянскай мове ніколі не падаў на апошні склад, таму першы склад — націскны. Па-другое, у стараславянскіх помніках яно мае вельмі высокую частотнасць — больш за 1600 словаўжыванняў, што з'яўляецца істотным, (Господь, Господа, Господу і г. д., клічны склон — **Господи**). Такім чынам, назіраем варыянты каранеў — **Господ** і **Господ'**. Усё гэта дае падставу пакінуць лексему ў адпаведнасці з традыцыяй. У клічнай форме (зварота) — Госпадзі! Дарэчы, у старажытнагрэчаскім слоўніку І. Х. Дварэцкага дадзена памета, якая дакладна ўказвае на тэксталагічную прыналежнасць κύριος **II** — Господь (NT) (Дворецкий И. Х. Древнегреческо-русский словарь. В 2 т. — М., 1958).

Трэба адзначыць, што вялікая ўвага надаецца аналізу магчымых варыянтаў слоў, уласным імёнам, геаграфічным назвам. Павагу да аўтара выклікаюць дадаткі. Усё гэта сведчыць пра грунтоўнасць працы, пра любоў да беларускай мовы, пра імкненне да духоўнага адзінства.

Відавочна, што кніга ксяндза Уладыслава Завальнюка «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» дае магчымаць фарміраванню рэлігійнага стылю сучаснай беларускай мовы, стварэння літаратурнай нормы. Такім чынам, з лінгвістычнага пункту гледжання — гэта значны ўклад у развіццё і ўдасканаленне сучаснай беларускай мовы.

НЕКРАШЭВІЧ-КАРОТКАЯ
Жанна Вацлаваўна,

кандыдат філалагічных навук,
дацэнт кафедры сучасных
замежных моў факультэта
міжнародных адносін
Беларускага дзяржаўнага
ўніверсітэта

Рэцэнзія

на кнігу Уладыслава Завальнюка
«Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі»
(Мінск, 2008)

Пытанне пра беларускую мову ў Каталіцкім Касцёле Беларусі сёння набыло асаблівую актуальнасць. Калі ў першыя постсавецкія гады не было дастатковай колькасці тэкстаў Святога Пісання і асабліва літургічных тэкстаў на беларускай мове, то сёння іх колькасць значна павялічылася. Пры гэтым у сферы богаслужбовых тэкстаў назіраецца, на жаль, тая ж прыкрая сітуацыя, з якой мы маем дачыненне ў мастацкай і навуковай літаратуры: у кожнага, так бы мовіць, свая беларуская мова. Адны заклікаюць вярнуцца да «клясычнага» беларускага правапісу і адрадзіць граматычную норму, дэкларараваную амаль 100 гадоў таму назад Браніславам Тарашкевічам. Другія лічаць, што варта далей карыстацца «наркамаўкай», нягледзячы на яе моцную зрусіфікаванасць. Адносна сродкаў узбагачэння лексічнага фонду беларускай мовы таксама няма адзінадушнасці. Нехта прапануе ў максімальнай ступені адштурхоўвацца ад лексікі, запазычанай з рускай мовы, і гаварыць «адсотак» замест

«працэнт» (хаця, дарэчы, гэта слова лацінскага, а не рускага паходжання), «асадка» замест «ручка», «лецішча» замест «дача» і г. д. Хтосьці даводзіць, што не варта адмаўляцца ад лексічнай спадчыны царкоўнаславянскай мовы, а іншым здаецца, што трэба адраджаць старабеларускія і старапольскія выразы...

Напэўна, беларуская духоўная культура канца XX — пачатку XXI стагоддзя павінна была прайсці гэты этап станаўлення, ці, лепш сказаць, рэканструкцыі нацыянальнай самасвядомасці, у тым ліку — і нацыянальнай мовы. Але гэты працэс станаўлення доўжыцца ўжо амаль 20 гадоў! Асабліва стратна гэтая сітуацыя існавання ў моўнай сумесі (не будзем тут нават закранаць праблем дзяржаўнага двухмоўя або пытання пра трасянку!) адбіваецца на духоўным жыцці хрысціян-беларусаў. Немагчыма не пагадзіцца з ксяндзом-пробашчам Уладыславам Завальнюком у тым, што «беларускае слова ў святынях ужывалася і ўжываецца вельмі абмежавана і даволі пакалечана: гаворым абыяк» (с. 140). Таму заслугоўвае асаблівай увагі і ўшанавання той факт, што сам каталіцкі святар, які штодзённа правіць Святую Імшу, усклаў на сябе цяжкі крыж развязаць гордзіеў вузел беларускамоўнасці Касцёла. Уражвае той факт, што ў аснову свайго даследавання ён паклаў навуковую метадалогію, прычым не з галіны тэалогіі, а з галіны мовазнаўства. Ксёндз-пробашч вывучыў матэрыялы розных слоўнікаў беларускай мовы дзеля таго, каб зрабіць навукова абгрунтаваныя высновы: у якой лексічнай форме павінны існаваць у беларускай мове найбольш частотныя і агульнаўжывальныя ў Святым Пісьме (а значыць, і ў Літургіі) словы і выразы. Пры гэтым шаноўны аўтар для супастаўлення прыцягвае матэрыял як мінімум трох моў: лацінскай, польскай і рускай.

Уражвае таксама іншы факт. Зрабіўшы такую вялікую і складаную працу, ксёндз-магістр тэалогіі, кандыдат гістарычных навук, не стаў аўтарытарна ўводзіць адпаведную форму для ўсеагульнага ўжывання. Не стаў, хаця менавіта ён, які ў 90-х гадах асабіста, шляхам дзённых і начных чуванняў, шляхам шматлікіх перамоваў з уладамі, змагаўся за вяртанне каталіцкіх святыняў вернікам Мінска. Менавіта ён, паўтаруся, больш, чым хтосьці іншы, магчыма, мае на гэта права. Ён мог ультыматыўна заявіць, што вынікі яго працы павінны быць безадкладна ўведзены ў літургічную практыку. Але ён гэтага не зрабіў: ён вынес сваю працу на абмеркаванне — навукоўцам, перакладчыкам, настаўнікам, дзеячам Каталіцкага Касцёла і Праваслаўнай Царквы. Тым самым ён прадэманстраваў сапраўдную хрысціянскую пакорлівасць і спагаднасць, пацвярджаючы словы Евангеліста Матфея пра тое, што «erunt novissimi primi et primi novissimi» («апошнія стануць першымі, а першыя апошнімі»), выразна даказваючы, што ён — не толькі «vocatus» («пакліканы»), але яшчэ і «electus» («абраны»).

Таму я як літаратуразнавец хачу высока ацаніць плён той працы, якую выканаў ксёндз-пробашч Уладыслаў Завальнюк. Асабіста ў мяне не выклікаюць прынцыповых пярэчанняў тыя канкрэтныя прапановы адносна ўжывання пэўных слоў з агульнахрысціянскага лексікона, з якімі выступае айцец Уладыслаў. Зразумела, што пры арыентацыі на афіцыйныя слоўнікі савецкіх часоў адчуваецца перавага форм царкоўнаславянскага паходжання, аднак, магчыма, гэта трэба расцаніць як крэатыўную тэндэнцыю з пункту гледжання экуменічнасці і, ва ўсякім разе, як адзінае выйсце ў сітуацыі, калі «пануе разнабой ва

ўжыванні слоў і іх напісанні» (с. 181), калі ў адной сям'і — два розныя Святыя Пісанні (хаця і на адной мове!). Таму ў гэтай частцы я не буду выказваць канкрэтных заўваг; думаю, што больш кваліфікавана гэтыя заўвагі зробяць (напэўна, ужо зрабілі) шаноўныя прафесары-лінгвісты.

Я ж, паколькі маю пэўны вопыт перакладчыцкай працы, хачу звярнуць увагу шаноўнага пробашча Уладыслава на адзін вельмі важны аспект. Прафесійны пераклад заўсёды мае на ўвазе пераклад з мовы арыгінала. Гэтая думка здаецца банальнай, але я часта паўтараю яе з таго часу, калі ў папулярным часопісе ўбачыла жудасную фразу: «пераклад «Песні пра зубра» Мікалая Гусоўскага з беларускай мовы на рускую выканаў...». Як можна перакладаць шэдэўр лацінскай паэзіі эпохі Рэнесансу не з лацінскай мовы, а з ... беларускай??? Цікава, што беларускі асветнік Сымон Будны ў прадмове да свайго перакладу Старога Запавету, над якім ён працаваў у 1571—1572 гадах у Нясвіжы і Заслаўі, пісаў, што ў далёкім XVI стагоддзі святары сутыкаліся прыкладна з тымі ж праблемамі, што і шаноўны пробашч Уладыслаў Завальнюк у пачатку XXI стагоддзя! Пішучы пра адсутнасць перакладу Бібліі на польскую мову, Сымон Будны з іроніяй адзначаў, што ў яго час «лаціннікі ўжо зраўняліся па колькасці перакладчыкаў з грэкамі, а мы ва ўсім жадаем быць бяднейшымі за іншых»! «Аднак жа, — працягваў далей Сымон Будны, — розныя перакладчыкі чыняць розную карысць хвале Божай, калі адзін аддаў перавагу таму, а другі іншаму, ды і запісаў. Розныя дары Духа Святога выяўляе Бог то для аднаго, то для другога. Душы Прарокаў, гаворыць Апостал, павінны падпарадкоўвацца Прарокам. Дык чаму ж

гэтаксама мы не можам гаварыць пра душы перакладчыкаў?» Сымон Будны пісаў, што да справы перакладу Святога Пісаня трэба падыходзіць з асаблівай асцярожнасцю.

У сувязі з гэтай праблемай хачу ўспомніць словы Святога Гіераніма, у выніку самаахвярнай працы якога з'явіўся лацінскі пераклад Біблії (Biblia Sacra Vulgata). Ён пісаў так: «Як пітво, няхай нават і найлепшае, страчвае свой смак, калі яго пераліваюць з адной пасудзіны ў другую, а з другой у трэцюю і чацвёртую, — так і пераклад, калі ён выконваецца не адразу з той мовы, на якой напісаны пэўныя кнігі, але прапускаецца праз іншыя мовы, не можа быць ані шчырым, ані дасканалым. Найлепей бачыць той, хто глядзіць сваімі, а не чужымі вачыма». Падобным чынам, Святое Пісанне, паводле майго глыбокага перакананння, павінна перакладацца з мовы арыгіналу. На сустрэчы, наладжанай шаноўным пробашчам Уладыславам дзеля абмеркавання яго кнігі, прагучала фраза аб тым, што пераклад Евангелля паводле Святога Матфея, выпушчаны пад рэдакцыяй Уладыслава Завальнюка (другое выданне — 2007 г.) арыентаваўся на старажытнагрэчаскі тэкст. Але ж Евангелле паводле Матфея было створана не на старажытнагрэчаскай, а на арамейскай мове! Значыць, пераклад, зроблены з грэчаскага тэксту, непазбежна будзе другасным. Што ж да іншых кніг Новага Запавету, то іх, зразумела, трэба перакладаць са старажытнагрэчаскай мовы, бо на гэтай менавіта мове яны і былі створаны.

Але калі дойдзе справа да перакладу кніг Старога Запавету, то там ізноў нельга будзе арыентавацца на старажытнагрэчаскі тэкст, а толькі на старажытнаяўрэйскі. Зразумела, што ў наш час няма патрэбы

ствараць цалкам новы і цалкам арыгінальны пераклад. Аднак звернем увагу на тое, што Сымон Будны асобным чынам падкрэсліваў неабходнасць правільнай перадачы **біблейскіх імёнаў і біблейскіх тапонімаў**. Ён лічыў, што імёны старазапаветных асобаў трэба перадаваць у аўтэнтычнай форме, г. зн. замест «Ной» пісаць «Ноах», замест «Маісей» — «Мошэха», замест «Ерусалім» — «Ерушалайм» і г. д. Канешне, не трэба ў наш час ісці следам за такімі радыкальнымі прапановамі. Аднак трэба пагадзіцца з Сымонам Будным у тым, што спосаб транслітарацыі біблейскіх імёнаў і тапонімаў — надзвычай важнае пытанне, бо менавіта тое, якім чынам той ці іншы народ называе біблейскіх прарокаў, цароў, ды, у рэшце рэшт — самога Месію, вызначае нацыянальнае аблічча хрысціянства ў той ці іншай краіне. Таму імёны і тапонімы абавязкова трэба вывяраць паводле тэксту арыгінала.

У кантэксце сказанага, на вялікі жаль, дадатак № 2 — гэта, на маю думку, самы слабы раздзел рэцэнзаванай кнігі. Пры складанні табліцы, у выглядзе якой выкананы гэты дадатак, у якасці ўзору быў узяты не старажытнагрэчаскі тэкст, а тэкст рускага Сінадальнага перакладу. Даказаць гэта вельмі лёгка.

На с. 254 пад чацвёртай пазіцыяй зафіксавана форма «Марыям» пры тым, што ў якасці трэцяй пазіцыі мы бачым агульнавядомую форму імя «Марыя». Адкуль жа ўзялася форма «Марыям»? Я праверыла адпаведную спасылку (Рым 16, 6).

Дзеля справядлівасці, хачу адзначыць, што ў дадатку № 2 сустракаюцца і вельмі ўдалыя прыклады. Так, абсалютна дакладна зведзены ў адно наяўныя ў ранейшых выданнях варыянты «Мельхій» і «Мэльхій» (с. 254), бо і ў 24, і ў 28 вершах трэцяга раздзела Еван-

гелля паводле Лукі ў старажытнагрэчаскім тэксце фігуруе аднолькавая форма «Μελχί». Падобным чынам, абсалютна справядліва аб'яднаныя ў адзін варыянт «Матафій» існаваўшыя раней розныя варыянты «Матафій» і «Матацый», бо ў 25 і 26 вершах трэцяга раздзела Евангелля паводле Лукі фігуруе «Ματταθίου» (форма роднага склону). Але табліца павінна быць вельмі ўважліва праверана, і кожны прыклад павінен быць звераны з формамі арыгінальнага тэксту.

Разумею, якая гэта складаная і карпатлівая праца (бо сама гэтую працу рабіла, рэдагуючы пераклад Святога Пісання, зроблены Айцом Уладыславам Чарняўскім). Разумею, што мала хто з філолагаў-класікаў згадзіўся б падобную працу зрабіць. Але зрабіць яе абавязкова трэба, у іншым выпадку той пераклад, які адстойвае шаноўны пробашч Уладыслаў, не будзе мець пад сабой навуковага грунту. А вольных перакладаў Святога Пісання нам надзвычай стае!

Па-за гэтым лічу перакладчыцкую і лінгвістычную працу, выкананую пад кіраўніцтвам пробашча Уладыслава Завальнюка і асабіста ім, дастаткова кваліфікаванай і вельмі патрэбнай для беларусаў і Беларусі. Раю аўтару прадоўжыць працу па стварэнні новых перакладаў кніг Новага і Старога Запаветаў і веру, што на гэтым шляху ён дасягне вялікіх поспехаў, здабываючы для сябе і для ўсіх нас неацэнныя Дары Святога Духа і набліжаючы нас да праўды Слова Божага.

НЕВІДОМСКАЯ Марыя Антонаўна,

выкладчыца беларускай мовы і літаратуры, метадыст

Святое Пісанне ў школе

У Мінскім касцёле Св. Сымона і Св. Алены атрымала дзве кнігі. Адна з іх Евангелле ў перакладзе на сучасную беларускую літаратурную мову, другая — «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» аўтара У. Завальнюка. З вялікім захапленнем і цікавасцю іх прачытала. А паколькі ўся мая працоўная дзейнасць была звязана з навучаннем дзяцей у школе і працай з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры нашай краіны (больш як 15 гадоў працавала ў Рэспубліканскім інстытуце ўдасканалення настаўнікаў), хачу выказаць некаторыя свае меркаванні.

Па-першае, нізка схіляю галаву перад Вамі, паважаны ксёндз Уладыслаў, за тое, што Вы так шчыра клапоціцеся пра духоўнае выхаванне людзей маёй Беларусі, выступаеце за яднанне хрысціян-беларусаў на аснове Святога Пісання.

Па-другое, хачу сказаць, што Евангелле ў перакладзе на сучасную беларускую літаратурную мову пад Вашым кіраўніцтвам можа ды і павінна выкарыстоўвацца ў школе.

Для доказу гартаю вучэбную праграму для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання «Беларуская літаратура: V—XI класы», с. 26—27 (Мн., 2008) і называю такія тэмы: біблейскія аповеды «Стварэнне свету», «Прытча пра блуднага сына»; Ф. Скарына «Біблія»; «Цар Ірад». Для дадат-

ковага чытання «Патоп. Ной будуе каўчэг». На вывучэнне названага матэрыялу адводзіцца 4 гадзіны, плюс можа быць праведзена пазакласнае мерапрыемства, на якім прачытаюцца рэкамендаваныя праграмай вершы Я. Коласа «Не дай Божа сэрцам знікнуць...» і М. Танка «Божа мой шчодрасці...», дзе будзе праведзена гутарка па зноў-такі рэкамендаваных праграмай творах жывапісу: Біблія ў ілюстрацыях Г. Дарэ; біблейскія сюжэты ў жывапісе Мікеланджэла, Рэмбранта, Рафаэля, А. Іванова; «Іканапіс Беларусі XV—XVIII стагоддзяў»; ілюстрацыі да палотнаў Я. Драздовіча «Скарына» і В. Бялыніцкага-Бірулі «Блакітная капліца». І вядома ж, пры правядзенні вучэбна-выхаваўчага працэсу з выкарыстаннем твораў на тэмы хрысціянскага веравызнання на самым ганаровым месцы павінна знаходзіцца Біблія ці другая частка, Евангелле, на сучаснай беларускай мове, правапіс якой вывучаецца ў школе, без разнабою ў выкарыстанні імёнаў і геаграфічных назваў, напісанне якіх ужо прынята ў Беларусі. А такім патрабаванням якраз і адпавядае пераклад Святога Пісання пад Вашым кіраўніцтвам, паважаны ксёндз Уладыслаў.

Ад сябе асабіста на названыя заняткі ў якасці дадатковай літаратуры я рэкамендавала б і выдатна выдадзеную, з густам праілюстраваную кнігу для дзяцей сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту «Святое Пісанне для дзяцей» (Мн., «Народная асвета», 2005), рэцэнзаваную кандыдатам багаслоўя протаіерэем Георгіем Латушкам.

Або возьмем праграму IX кл. Тут ёсць такая тэма: Біблія як адзін з найвялікшых здабыткаў духоўнай культуры і найвыдатнейшы помнік літаратуры. І таму, захоўваючы прынцып нагляднасці, пажадана зрабіць

выставу кніг Святога Пісання розных выданняў, можам таксама напярэдадні папрасіць вучняў, каб і яны прынеслі кнігі з дому, калі ў іх ёсць, прычым, з выкарыстаннем любога з правапісаў (у заключнай гутарцы на ўроку настаўнік паведаміць прычыны такога разнабою ў лексіцы і напісанні), у перакладзе на любую з моў. Магчыма, атрымаецца, што перакладу на лацінскай мове не будзе. Але калі нехта з вучняў і яго прынясе, то, на наш погляд, усё роўна трэба настаўніку расказаць пра Вульгату — лацінскі пераклад Бібліі, завершаны каля 405 г. адным з айцоў Царквы Еранімам Блажэнным, прычым прыгадаць, што на той час існавала адна хрысціянская Царква (падзел на каталікоў і праваслаўных адбыўся толькі ў 1054 г.). У заключным слове на ўроку настаўнік скажа, што *Біблія ляжыць у аснове* трох рэлігій — *хрысціянства, іудаізму і ісламу.*

А звесткі пра Вульгату будуць добрым мастом для пераходу да тэмы пра Францыска Скарыну — першадрукара і асветніка, яго жыццё і творчасць. Для падрыхтоўкі паведамлення пра Вульгату — гэты найцікавейшы помнік Высокай Духоўнасці — выкарыстаем энцыклапедычны даведнік «Францыск Скарына і яго час» (Мн., 1988), с. 295.

Пры вывучэнні матэрыялу пра Ф. Скарыну можа выкарыстоўвацца і Ваша кніга, паважаны ксёндз Уладыслаў, «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі», дзе змешчаны змястоўныя артыкулы «Біблія ў Беларусі» і «Неацэнная спадчына Скарыны» (Мн., 2008), с. 73. Тут настаўнікі і вучні знойдуць цікавыя дадатковыя звесткі, якіх у падручніку няма.

З выкарыстаннем тэхнічных сродкаў навучання пажадана правесці пазакласнае мерапрыемства, якое

можа называцца «Францыск Скарына і мастацтва». У першай яго частцы могуць быць паказаны тытульныя лісты да кніг Бібліі, перакладзенай Ф. Скарынам. Для гэтага ўзяць матэрыялы з вышэй названага даведніка (сс. 26, 31, 40, 64, 73 і інш.), дзе змешчаны гравюры Скарыны-мастака.

У другой частцы такога мерапрыемства будуць выкарыстаны творы мастацтва, рэкамендаваныя праграмай (сс. 59—60). Гэта фотаздымкі *архітэктурных помнікаў*, напрыклад, Палаца Ватыкана ў Рыме (XV ст.), Падуанскага ўніверсітэта (XV ст.), Карлавага маста ў Празе (XIII—XV стст.); фотаздымкі *скульптурных выяў* З. Азгура «Францыск Скарына», С. Вакара «Францыск Скарына» (гіпс), А. Глебава «Помнік Ф. Скарыну ў Полацку» і інш.; рэпрадукцыі да *твораў жывапісу* І. Ахрэмчыка «Ф. Скарына», Я. Драздовіча «Друкарня Ф. Скарыны ў Вільні», П. Сергіевіча «Скарына ў рабочым кабінеце» і інш. Трэба адзначыць, што для праслухоўвання ўлічаны і *творы музыкі*: містэрыя А. Літвіноўскага «Францыск» (тэкст з прадмоў і каментарыяў Ф. Скарыны да Бібліі), сімфонія № 3 У. Дарохіна «Францыск Скарына, жыццё і бессмяротнасць» і інш. Рэкамендуецца таксама праграмай для прагляду кінафільм «Я, Францыск Скарына» (рэжысёр Б. Сцяпанаў).

Вядома, што грунтоўна разгледзець усе гэтыя творы на адным мерапрыемстве немагчыма. Але калі яго падрыхтаваць у форме вуснага часопіса з кароткімі каментарыямі да кожнай старонкі ці правесці канферэнцыю з выкарыстаннем кароткіх паведамленняў вучняў на аснове напісаных імі рэфератаў, то ўсё можна. Гэта ўжо залежыць ад творчасці настаўніка. Аднак ён павінен засяродзіць увагу вучняў на галоўным, у

імя чаго гэта робіцца. І на першым плане павінна быць не толькі асоба Скарыны, але і Святое Пісанне, выдадзенае на добрай сучаснай беларускай літаратурнай мове, правапіс якой вывучаецца ў школе, Евангелле, з якога настаўнік можа да любога ўрока або пазакласнага мерапрыемства ўзяць эпіграф.

Таму хачу сказаць: Святое Пісанне, выдадзенае, паважаны ксёндз Уладыслаў, пад Вашым кіраўніцтвам, Ваша кніга «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» з'яўляюцца вельмі сучаснымі і патрэбнымі. І паўтару словы, сказаныя галоўным навуковым супрацоўнікам Інстытута мовы і літаратуры НАН Беларусі, доктарам філалагічных навук, прафесарам В. П. Лемцюговай (с. 314), што пры абмеркаванні перакладу Евангелля, зробленага філолагамі пад Вашым кіраўніцтвам, на сходзе вельмі высокіх духоўных асоб растопіцца лёд нават самых заледзянелых душ. Надта хочацца верыць, што пераклад Святога Пісання, зроблены пад Вашым кіраўніцтвам, будзе кананізаваным, даступным для набажэнстваў у касцёлах і цэрквах, даступным у кожнай школе, у кожнай беларускай хрысціянскай сям'і.

МЕЛЬНІКАЎ Юрый Сяргеевіч,

выкладчык беларускай мовы і літаратуры

Водзыў

на пераклад Евангелля (Мн., 2007)

З асаблівым хваляваннем чытаецца Святое Пісанне на роднай матчынай мове, бо змест яго лёгка кладзецца на душу. Быццам становішся прысутным і сам бачыш усе апісаныя падзеі, якія адбываліся з Сынам Божым, знаходзішся сярод вялікага натоўпу, слухаеш прытчы, Яго тлумачэнні. Разам з тым аналізуеш свае ўчынкі, каешся, звяртаешся да Госпада Бога, просіш прабачэння, дапамогі, літасці. Ад гэтага адчуваеш вялікае задавальненне, хочацца яшчэ і яшчэ раз далучыцца да сакральнага тэксту.

Гэта, відаць, бывае з кожным, хто трымае у сваіх руках Кнігу, перакладзеную вельмі дасведчанымі філолагамі пад Вашым кіраўніцтвам, паважаны ксёндз Уладыслаў. Смела скажу — дасведчанымі ў галіне мовы людзьмі, бо ні адно слова, ні адна арфаграма, ні адна граматычная форма не выбівае цябе з тэксту, як гэта заўсёды бывае ў школьнага настаўніка пры праверцы пісьмовых работ вучняў, калі ўбачыш недакладнасць — і заўсёды ўжо на першае месца становіцца не сам змест, а лексіка, граматыка, правапіс. А калі шмат усякага роду памылак, нязвыклых мудрагелістых слоў — і сам тэкст рассыпаецца, тады гэтага тэксту ўжо проста не заўважаеш.

Я маю, чытаў і іншыя выданні Бібліі на беларускай мове, перакладзеныя з выкарыстаннем класічнага правапісу ці, скажам, скіраваныя часткова на класічны

правапіс. Але пра іх размова павінна быць асобная. Для духоўнай працы звычайнага чалавека з такімі выданнямі павінна быць добрая філалагічная падрыхтоўка з веданнем гісторыі Беларусі.

Бо што датычыцца чытання Святога Пісання, то не павінна быць смакавання выхапленных з іншай эпохі ці з іншай мовы асобных слоў, імён, пэўных фраз.

Чытанне Святога Пісання — гэта не чытанне мастацкага твора ці нейкага, скажам, вельмі важнага артыкула. Знаёмства з сакральным тэкстам Евангелля — гэта ў першую чаргу вялікая праца душы, асэнсавання, хто ты ёсць і якім павінен быць.

Выдадзеная кніга Евангелля пад Вашым кіраўніцтвам адрасуецца ўсім хрысціянам Беларусі, у першую чаргу моладзі, школьнікам, прычым без падзелу на канфесіі. Вы не адгароджваецце моўнымі бар'ерамі адну групу беларусаў ад другой. І гэта выключна важна.

Як настаўнік, выказваю Вам вялікую ўдзячнасць за тое, што Вы даяце магчымасць школьнікам авалодаць роднай мовай комплексна. Яны чуюць добрую літаратурную мову ў касцёле, чытаюць творы мастацкай літаратуры і вучэбныя дапаможнікі дома, выконваюць разнастайныя практыкаванні пісьмова ў школе. І ўсё гэта з захаваннем ужо ўнармаванай лексікі, у тым ліку іменаслова, і прынятага правапісу. Такі падыход толькі спрыяе станаўленню гарманічна развітай асобы і не дазваляе раздвойвацца паводле прынцыпу: я ў касцёле — я ў жыцці.

Таму трэба, каб студыйны тэкст Евангелля пад Вашай рэдакцыяй (Мн., 2007), паважаны ксёндз Уладыслаў, быў не толькі для ўнутраных патрэб парафіі касцёла Св. Сымона і Св. Алены, а стаў даступным кожнаму чалавеку ў нашай краіне, каб настаўнік бе-

ларускай мовы і літаратуры мог узяць гэта выданне і выкарыстаць у працы з вучнямі. Цяпер гэта рабіць школьнай праграмай дазваляецца. Верыцца, што высокія духоўныя асобы Рымска-Каталіцкай Царквы прыслухаюцца да маладых беларусаў.

Жадаю Вам, шаноўны ксёндз Уладыслаў, творчых поспехаў на ніве служэння Госпаду Богу і ў працы па духоўным станаўленні беларусаў.

РАМАНЦЭВІЧ Кацярына Вадзімаўна,

студэнтка УА «Прыватны інстытут кіравання і прадпрымальніцтва»

Вялікі дзякуй!

Хто веруе, той мае жыццё вечнае
(Ін 6, 47)

Паважаны ксёндз Уладыслаў, вялікі Вам дзякуй за кнігі, якія Вы мне падаравалі. Я іх, вядома, ужо прачытала і хачу падзяліцца з Вамі сваімі думкамі.

Ваша кніга «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» складаецца з асобных артыкулаў, і ўсе яны цікавыя, а разважанні пра выбар слова для тэксту наўрад ці дзе яшчэ можна знайсці. Што датычыцца Кароткага тлумачальнага слоўніка (с. 283), то для мяне гэта цэлае адкрыццё. Я яшчэ не маю вопыту ўспрыняцця Святога Пісання, таму ён дапамагае мне разабрацца ў многіх частках евангельскага тэксту.

А ўвогуле хачу сказаць, што Евангелле чыталася лёгка, мова зразумелая. Я нават заўважыла ўстойлівыя спалучэнні слоў і пачала сабе іх выпісваць. Некалі ў школе нам гаварылі, што фразеалагізмы ў беларускую мову трапілі рознымі шляхамі, з розных крыніц, у тым ліку і з Біблії. Я свае запісы паказала родным, а яны мне параілі знайсці адпаведнікі ў Тлумачальным слоўніку беларускай мовы (5 тамоў). Я гэта зрабіла і хачу Вам, ксёндз Уладыслаў, паказаць, што ў мяне атрымалася.

Евангелле паводле Св. Матфея

1. Вось зорка, якую яны [мудрацы] бачылі на ўсходзе, ішла перад імі. Пакуль нарэшце не спынілася над месцам, дзе нарадзілася Дзіця (Мф 2, 9).

Пуцяводная зорка — пра тое, што вызначае кірунак.

2. Вы — соль зямлі (Мф 5, 13).

Соль зямлі — пра лепшых людзей якой-небудзь грамадскай групы.

3. Вока за вока, і зуб за зуб (Мф 5, 38).

Вока за вока, зуб за зуб — адплата за зло той жа меркай.

4. А кожны, хто гэтыя словы Мае слухае і не выконвае іх, падобны да чалавека неразважлівага, які пабудаваў дом свой на пяску (Мф 7, 26).

Пабудаваць на пяску — зрабіць што-небудзь ненадзейна; аснаваць на хісткіх звестках, фактах.

5. Хто мае вушы, няхай слухае (Мф 13, 9).

Мець вушы — прыслухоўвацца.

6. Не застанецца тут каменя на камені, які не быў бы зрынуты (Мф 24, 2).

Каменя на камені не пакінуць — ушчэнт зруйнаваць.

7. Ён [Пілат] узяў ваду, памыў рукі перад натоўпам і сказаў: невінаваты я ў крыві Праведніка гэтага (Мф 27, 24).

Умыць рукі — ухіліцца ад удзелу ў якой-небудзь справе, зняць з сябе адказнасць за што-небудзь.

Евангелле паводле Св. Марка

8. Той самы камень, які адкінулі будаўнікі, стаў асновай вугла (Мк 12, 10).

Краевугольны камень — аснова, важнейшая частка чаго-небудзь.

9. Ён аддаў дух (Мк 15, 39).

Аддаць дух — памерці.

Евангелле паводле Св. Лукі

10. Не можаце служыць Богу і мамоне (Лк 16, 13).

Служыць двум багам — паводзіць сабе як двурушнік.

11. Іуда, ты пацалункам выдаеш Сына Чалавечага (Лк 22, 49).

Пацалунак юды — здрадніцкі ўчынак пад маскай добразычлівасці, дружбы.

Евангелле паводле Св. Іаана

12. Бацькі нашы елі манну ў пустыні, як напісана: даў ім да спажывы хлеб з неба (Ін 6, 31).

Манна нябесная — штонебудзь нечаканае.

Чакаць манны нябеснай — чакаць якой-небудзь удачы, чаго-небудзь неспадзяванага.

13. Ён адкрыў вочы мне (Лк 22, 49).

Вочы адкрыліся — (у каго) — пра таго, хто зразумеў сутнасць чаго-небудзь.

14. Пётр сказаў: Госпадзі, ... я жыццё сваё аддам за цябе (Ін 13, 37).

Аддаць жыццё — памерці, абараняючы каго-небудзь або што-небудзь.

15. Хіба ж злы дух можа адкрываць вочы слепым: (Ін 10, 21).

Злы дух — чорт, нячыстая сіла, д'ябал.

16. Хто зняважыць Духа Святога, той ніколі не атрымае адпушчэння, на ім будзе вечны грэх (Мк 3, 29).

Святы Дух — паводле хрысціянскага вучэння, адна з Асоб Святой Троіцы.

Лічу, што наступныя выказванні Ісуса Хрыста таксама могуць быць фразеалагізмамі, яны цікавыя і важныя, бо даюць нам правілы, нормы жыцця: *Не хлебам адзіным жыве чалавек* (Мф 4, 4); *Якім судом судзіце вы, такім і вас асудзяць* (Мф 7, 2); *Такой самай меркаю, якой мераеце, адмераюць вам* (Мк 4, 24); *Аддайце кесару кесарава, а Богу Божае* (Мф 22, 62).

Яшчэ Вам паведамляю, што не выпісала, а толькі падкрэсліла ў Евангеллі тыя выказванні, якіх павінна прытрымлівацца ў жыцці, бо да гэтай святой Кнігі я яшчэ буду звяртацца не адзін раз.

Паважаны ксёндз Уладыслаў, вялікі Вам дзякуй за падарунак. Няхай Вам Гасподзь дапамагае ў жыцці.

СОДАЛЬ Уладзімір Ільіч,

журналіст, пісьменнік

Калісь Францішак Багушэвіч у сваёй славутай Прадмове да «Дудкі Беларускай» са шчымлівым болем канстатаваў, што амаль усе нашы пабрацімы, «якаясь маленькая Булгарыя — са жменю таго народу — якіясьці харваты, чэхі, маларосы... другія маюць па-свойму пісаныя і друкаваныя ксёнжачкі. Сярод іх і набожныя».

Францішак Багушэвіч нагадаў усяму свету, што наш народ таксама мае патрэбу ў такіх кніжках, рэлігійных, на роднай мове. І шкадаваў, што ўсяго гэтага не маюць толькі беларусы. Гэтае шкадаванне, гэты Багушэвічаў болевы акцэнт пачулі, але, на жаль, не ўсюды змаглі на яго адрэагаваць. І найперш ва ўсходняй Беларусі, дзе ўсталявалася бальшавіцкая ідэалогія. Тут было не да набожных кніжак, калі ўсе святыні — праваслаўныя і каталіцкія — былі абвешчаны па-за законам і ператвораны ў розныя склады і клубы. Гэтак ва Усходняй Беларусі доўжылася амаль да апошняга часу. Натуральна, беларуская духоўная лексіка, тэрміналогія, не развівалася, не распрацоўвалася. Іншая рэч у Заходняй Беларусі. Хоць там беларусам таксама быў не рай, але ўсё ж людзі мелі магчымасць наведваць храмы. Аднак пасля 1939 года ў колішняй Заходняй Беларусі духоўнае жыццё пачало спакваля выраўноўвацца з Усходняй. Ваяўнічы атэізм запанаваў на ўсёй Беларусі. І гэта было да абвяшчэння незалежнасці нашай любімай краіны.

З канца дзевяностых гадоў мінулага стагоддзя ў рэлігійным жыцці пачаліся новыя павевы: з'явіліся святары новай духоўнай генерацыі. Сярод іх і Уладыслаў Завальнюк. У мяне часта пытаюцца — праваслаўны я ці католік.

Прызнаюся, што я хрышчаны ў праваслаўі праваслаўным святаром. Хрышчаны патаемна. Выходзіць, што я праваслаўны. Тым не менш, мяне даўно прывабліваюць каталіцкія абрады. Чаму? З самых розных прычынаў. І найперш з іх такая: пераважная большасць каталіцкіх святароў трымаецца нашай роднай мовы. На гэтай мове яны вядуць набажэнствы, выдаюць канфесіянальную літаратуру. І робяць гэта шчыра, пранікнённа. У гэтым можна пераканацца на постаці магістра тэалогіі, пробашча Мінскага касцёла Святога Сымона і Святой Алены Уладыслава Завальнюка. У яго поўная гармонія між словам і яго душою. Ва ўсім ён паслядоўны з Божым словам. Інтанацыі яго пропавядзяў даверлівыя, абагрэтыя сэрцам і душою. Вернікі яго парафіі вераць яму, гатовыя ва ўсім ісці за ім, жыць, як ён. Менавіта ў гэтым моц святара Уладыслава Завальнюка. Вера ў свайго пробашча — гэта і ёсць вышэйшая праява рэлігійнай веры. Вера ў Бога — гэта давер свайму духоўнаму пастару-пробашчу. Ці іншымі словамі: які пастар — такая і вера. Пробашч Уладыслаў Завальнюк — гэта духоўны пасрэднік між вернікамі і Усявышнім. Гэтае азначэнне цалкам адпавядае той місіі, якую ён узяў на сябе. Высакародны і той яго клопат, які ўзяў на сябе святар. Ён выдавец набожных кніжак, пра якія гэтак марыў Багушэвіч у свой час. Пераклад Евангелля, іншых канфесійных кніг, развагі над словам у кнізе «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» — пошукі і плён яго душы апошняга часу. Выданні святога Евангелля і кнігі «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» пераконваюць, што Вы, паважаны ксёндз Уладыслаў, не проста пробашч. Вы яшчэ і асветнік. Будзем спадзявацца: Ваша ўсебаковая асветніцкая руплівасць стане заўважана беларускай грамадскасцю і па-Божы будзе ацэнена.

ПАШКОЎ Генадзь Пятровіч,

паэт, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь

І я, не адзін усвядоміўшы век,
прымаю са шчырых,
з ружанцамі,
рук
кнігу.
Мудрэйшы
усё ж
чалавек,
хто напісаў яе, —
У. Завальнюк!

Радкі верша леглі на паперу пасля таго, як без адрыву, у добрым захапленні прачытаў кнігу ксяндза Уладыслава Завальнюка «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі». Навукова абгрунтаваная, гэта кніга сталася святам для душы. У ёй глыбокія разважанні дасведчанага чалавека пра ўжыванне нашага роднага слова ў канфесіянальнай літаратуры.

Я, як адзін з немалалікіх супляменнікаў, не меў магчымасці быць далучаным да светлага імя Бога з малалецтва. Дзе нарадзіўся — на Віцебшчыне — царквы не было, дзе жыў у дзяцінстве і падлеткавым узросце, у мястэчку Войстам, на Смаргоншчыне, быў касцёл, але ж маці працавала настаўніцай, і ёй, маладой удаве, з трыма дзяцьмі на руках, трэба было весці сябе адпаведна.

І бацька, і маці пахаваныя там, у Войстаме, на каталіцкіх могілках, і месца апошняга іх прыстанішча заўсёды дагледжанае. Здагадваюся, таму спрыяе і касцёл, ведаючы, што ў людскіх душах жыве ўдзячнасць.

Ды час усё вырашае для нас. У сталым веку лёс закінуў мяне ў службовую камандзіроўку на святую раку Іардан. Зайшоў у раку, у чым быў, нырцануў і палічыў сябе хрышчоным.

— Мілы чалавек! Хіба хрысцяцца без храма?! — асудзіла маю радасць жанчына ў духоўных строях у Місіі Рускай Праваслаўнай Царквы, куды прывезлі нас ужо ў якасці турыстаў. — Тут, кіламетраў за трыццаць, айцец Раман жыве. Пазвонім — прыедзе. У вас жа такая магчымасць! Нехта ўсё жыццё марыць!..

Там і адбылося хрышчэнне... І прычашчэнне... Амаль на пяцідзесятым годзе жыцця.

Як чалавек, які мае дарослых пляменнікаў, — адзін з іх, Змітрок, нарадзіўся на Каўказе па прычыне службовых абавязкаў бацькі, а другі, Дзяніс, на Балтыйскім востраве Саарэма, і якія ніводнага дня не вучыліся ў беларускай школе — выдатна валодаюць беларускай мовай, карыстаюцца ёю ў штодзённым ужытку і нават мяне часам папраўляюць.

Любоў да нашай мовы прывіў ім касцёл.

Тая асветніцкая справа, якую праводзіць разумна і дасведчана ксёндз Уладыслаў Завальнюк, упэўнены, увойдзе ў гісторыю нашай нацыі і добра будзе ўспрынята нашчадкамі.

Мне, як былому энцыклапедысту, было прыемна, што ў перакладзе Евангелля на беларускую мову шырока выкарыстоўваўся моўны тэрміналагічны матэрыял, які рыхтавала і выдавала «Беларуская энцыклапедыя». 5-томны «Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы», 2-томны «Слоўнік іншамоўных слоў», 18-томная «Беларуская энцыклапедыя», 2-томная энцыклапедыя «Вялікае княства Літоўскае» — гэта далёка не поўны пералік той літаратуры, над

якой працавалі вядучыя беларускія навукоўцы, а іх набыткі творча выкарысталі перакладчыкі Евангелля.

Святая кніга на беларускай мове — справа святая. Можа, мы ўсяго гэтага і не ўседамляем пакуль. Але гэта так. Кожны, хто прычыняецца да гэтай высакароднай справы, робіць справу святую. У мяне ёсць верш «Апосталы святла». Ён у поўнай меры датычыцца і вас, хто перакладае святую кнігу на маю родную мову. Ім і завяршу прамову.

Ёсць мудрыя апосталы святла.
Не тыя,
хто, калоцячы
у грудзі,
гарлае грамавержна:
«Геній — я!» —
а тыя,
што свядомасць ціха будзяць,
душы і сэрцу кажуць:
хто такі.
Адкуль ты
і чаму на гэтым свеце?
І што за грамавержныя вякі
твой род хрысцілі,
і якое вецце
на дрэве радаслоўным,
на тваім,
дзе кроў жывая,
ды з глыбінь планеты,
нібы рака вясновая — аж дым! —
згрызае лёд мярзлотаў пракаветных.
Не веру крыкунам і кляцьбітам,
іх пустазвонству,
марнаму адвеку.
Ёсць ціхія апосталы святла,
што будзяць чалавека ў чалавеку.

МАЗУР Ірына Аляксандраўна,

студэнтка УА «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»

Слова ў падтрымку пробашча

З вялікай радасцю прыняла запрашэнне на навукова-практычную канферэнцыю, прысвечаную абмеркаванню новага перакладу Евангелля на сучасную беларускую літаратурную мову і кнігі «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі», аўтарам якой з'яўляецца ксёндз-пробашч Уладыслаў.

Канферэнцыя праходзіла у касцёле Св. Сымона і Св. Алены. У гэтым важным мерапрыемстве бралі ўдзел многія вядомыя вучоныя Беларусі, выкладчыкі розных вышэйшых навучальных устаноў Мінска, супрацоўнікі выдавецтваў, пісьменнікі, настаўнікі сярэдніх школ, студэнты. Гэта былі людзі з чыстым сэрцам, хрысціяне, гатовыя далучыцца да справы ўдакладнення мовы Святога Пісання, выказаць свае адносіны да вынікаў працы філолагаў, якія рупіліся не адзін год пад кіраўніцтвам пробашча Уладыслава.

Трэба сказаць, што ўсе, хто выступаў, адзначылі высокі ўзровень перакладу. А гэта невыпадкова, бо, як я даведалася з выступленняў, перад імі, філолагамі, была пастаўлена канкрэтная задача: кожную лексічную адзінку, структуру кожнага верша абгрунтаваць на аснове дасягненняў сучаснай мовазнаўчай навукі. Як працаваць над словамі, кіраўнік сам даў узор уласных разважанняў, якія потым сталі асноўным зместам кнігі «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі».

Прамовы ўдзельнікаў канферэнцыі не паўтараліся, а, як правіла, дапаўнялі адна другую, у іх была вельмі

цікавая інфармацыя. Неабходна адзначыць выступленні прафесара, доктара філалагічных навук, дырэктара Інстытута мовы і літаратуры НАН РБ А. А. Лукашанца, таксама прафесараў А. І. Мальдзіса, Г. А. Цыхуна, М. Р. Прыгодзіча, вядомага драматурга П. В. Васючэнкі. Гэтыя вучоныя, акрамя сваіх асноўных прамоў, давалі адказы на пытанні, тлумачылі некаторыя рэплікі, сказаныя прысутнымі з месца.

Адзначалася на канферэнцыі і тое, што немалаважнае значэнне ў Евангеллі маюць ужытыя геаграфічныя назвы і імёны, якія ўжо даўно прыняты ў нашай краіне і адпавядаюць нормам сучаснага напісання.

Хачу асобна сказаць, што для мяне не зусім зразумела, чаму некаторыя выступоўцы замест імя *Анна* прапаноўвалі ўжываць *Ганна*. Згаджаюся, што імя *Ганна* паходзіць з грэчаскай мовы і ў той жа час увабрала ў сябе ўвесь каларыт беларускай народнай мовы. Але ж у нас ужываецца таксама імя *Анна*, ад гэтага слова ёсць і вытворныя формы *Анюта*, *Анечка*. Я асабіста ведаю людзей маладых і сталага ўзросту з такімі імёнамі. І калі ўзяць паралельна словы *Анна — Ганна*, то вядома ж, для сакральнага тэксту больш падыходзіць імя *Анна*. Напрыклад, як хораша, узнёсла гучыць такая назва: Касцёл Святой *Анны*. З гэтым імем не ўзнікае ніякай пабочнай асацыяцыі, як пры вымаўленні імені *Ганна*. Такая асацыяцыя або паралельнае бачанне добра вядомай асобы можа быць у кожнага чалавека.

У канцы свайго кароткага паведамлення хачу сказаць, што ва ўсіх моўных пытаннях я цалкам падтрымліваю Вас, паважаны ксёндз-пробашч Уладыслаў — мой Духоўны Настаўнік. Мы ўсе з нашай каталіцкай сям'і верым Вам, падтрымліваем Вас малітвамі ў Вашых асветніцкіх намаганнях і справах.

ЦІХАНЧУК Арцём Васільевіч,

студэнт УА «Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт»

Мне пашчасціла прысутнічаць на навукова-практычнай канферэнцыі ў Мінскім касцёле Св. Сымона і Св. Алены. І я за гэта вельмі ўдзячны свайму лёсу.

Па-першае, я ўпершыню трапіў у гэты святы храм і быў вельмі ўражаны яго велічнасцю і святасцю. Адразу падумалася: наколькі тут бывае ўрачыста, калі збіраецца шмат народу, ідзе набажэнства.

Па-другое, сама тэма канферэнцыі зацікавіла мяне. Тут абмяркоўваўся пераклад Евангелля на сучасную беларускую літаратурную мову.

Як пазней выявілася, на канферэнцыі прысутнічала шмат знакамітых людзей, і некаторых з іх я ведаў па іх кнігах. Напрыклад, з захапленнем слухаў выступленні вучоных А. І. Мальдзіса і П. В. Васючэнкі. Менавіта кнігай А. І. Мальдзіса я карыстаўся ў школе пры вывучэнні творчасці У. Караткевіча, а па кнізе П. В. Васючэнкі рыхтаваў рэферат па сучаснай беларускай драматургіі.

На канферэнцыі браў удзел А. К. Клышка. Для мяне гэта, у першую чаргу, аўтар кнігі «Францыск Скарына, альбо Як да нас прыйшла кніга», якую я з цікавасцю прачытаў у школьныя гады і некаторыя моманты з яе памятаю да гэтага часу. А потым высветлілася, што Анатоль Канстанцінавіч яшчэ і аўтар Буквара, па якім я вучыўся грамаце.

Усе гады вучобы ў школе мяне вельмі выручаў слоўнік-даведнік М. Р. Прыгодзіча «Асобна, разам, праз

дэфіс». Я нават сціху падглядваў у яго падчас напісання кантрольных работ па мове і літаратуры. І быў прыемна ўражаны, калі даведаўся, што выступоўца Мікалай Рыгоравіч Прыгодзіч — доктар філалагічных навук, прафесар — гэта і ёсць аўтар названага мною слоўніка.

Тут жа мне сказалі, што на канферэнцыі прысутнічае Г. П. Пашкоў. Гэта паэт, яго вершы, зборнікі паэзіі «Журавінавы востраў» і «Тваім святлом благаславёны» мы вывучалі ў школе. Хацеў нават падысці пагаварыць, але ў мяне не атрымалася. А калі даведаўся, што Генадзь Пятровіч яшчэ і галоўны рэдактар энцыклапедыі «Вялікае Княства Літоўскае» ў 2-х тамах, то, як прыехаў дамоў у Пінск, мне захацелася абедзве гэтыя вялікія кнігі пагартаць.

А цяпер па змесце канферэнцыі. Усе выступленні — і журналістаў, і педагогаў, і вучоных — былі вельмі цікавымі, і як гэтага вымагала тэма канферэнцыі, грунтаваліся яны на аснове кніг «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» і перакладзе Святога Евангелля.

Вельмі не хачу каго-небудзь пакрыўдзіць, але павінен сказаць, што самую высокую і самую аб'ектыўную ацэнку перакладу Евангелля далі дактары філалагічных навук А. А. Лукашанец, Г. А. Цыхун, М. Р. Прыгодзіч, А. І. Мальдзіс, драматург, крытык, кандыдат філалагічных навук П. В. Васючэнка. Яны ўлічылі, дапаўняючы адзін другога, усе аспекты асаблівасцей перакладу. Я для сябе адзначыў, што названыя вучоныя, акрамя ўсяго, паказалі і выдатную методыку аналізу кнігі. У гэтым мне як студэнту тэхнічнай навучальнай установы было ў іх чаму павучыцца. Акрамя таго, на многія рэплікі, якія гучалі з месцаў, яны спакойна давалі грунтоўныя адказы. Напрыклад, па

выкарыстанні слова *благаславёны* даў вычарпальнае тлумачэнне Г. А. Цыхун — вучоны, які ведае асаблівасці ўсіх славянскіх моў свету. Ён, як я зразумеў, адзін з самых аўтарытэтных вучоных нашай краіны, а ў сваіх навуковых працах разглядае беларускую лексіку ў кантэксце розных славянскіх моў. Я слухаў яго выступленні, каментарыі (яму прыходзілася даваць тлумачэнні на канферэнцыі не адзін раз) з вялікай цікавасцю.

Ад сябе я таксама магу сказаць: на мой погляд, як бы мы ні выкідалі склад [га] са слова *благаславёны*, усё роўна ў нашай краіне цяпер людзі адукаваныя, і кожны разумее, што *благаславёны* і *блаславёны* паходзяць з аднаго кораня, а частка *блага-* у названым слове ні ў якім разе не ўжыта ў значэнні *дрэнна*. Пра гэта, дарэчы, добра сказаў у кнізе «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» ксёндз Уладыслаў (сс. 161—165; с. 182). Я на другі дзень пасля канферэнцыі спецыяльна пайшоў у бібліятэку, пагартаў слоўнікі і яшчэ раз пераканаўся, што словы *благаславёны* і *блаславёны* маюць права на выкарыстанне.

Цяпер наконт імені *Анна* (*Ганна*). Я не ведаю, чаму мой любімы пісьменнік А. К. Клышка так адстойвае варыянт Ганна. Я зноў-такі спецыяльна звярнуўся да «Слоўніка асабовых уласных імён» М. Р. Судніка. Тут жа ёсць беларуска-руская, руска-беларуская часткі мужчынскіх і жаночых імён, ёсць раздзел устарэлых рэдкаўжывальных імён (як я разумею, яны выпісаны са старажытных беларускіх помнікаў), улічаны новыя імёны, якія ўзніклі ў савецкі час (напр. Акцябрына). Таму вашу спасылку, паважаны ксёндз Уладыслаў, на названы Слоўнік лічу правільнай, я ў гэтым Вас падтрымліваю.

Пад канец хачу сказаць, што Святое Евангелле, мова якога абмяркоўвалася на канферэнцыі, пры чытанні ўспрымаецца вельмі лёгка. Лічу правільным, што імёны Усіх Святых, якія ўпамінаюцца ў Новым Запавеце, у тым ліку імя Бога *Гасподзь*, а таксама імя Сына Божага *Ісус Хрыстос* павінны пісацца і вымаўляцца так, як ужо прынята ў Беларусі. Мы ўсе чакаем зацвярджэння разгледжанага перакладу Святога Пісання і верым, што ў хуткім часе гэта адбудзецца.

За кнігі «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» і пераклад Евангелля на сучасную беларускую літаратурную мову, за запрашэнне на навукова-практычную канферэнцую хачу сказаць Вам, паважаны ксёндз Уладыслаў, вялікі-вялікі дзякуй. Жадаю Вам і творчай групе, якая працуе пад Вашым кіраўніцтвам, творчых поспехаў.

ГАЖЭЎСКАЯ
Таццяна Станіславаўна,

выкладчыца вакальна-харавых дысцыплін УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтва»

Водзыў
на кнігу У. Завальнюка «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» і пераклад Евангелля на сучасную беларускую літаратурную мову

Істотныя грамадска-палітычныя і сацыякультурныя пераўтварэнні, якія адбыліся ў нашай краіне, прадвызначылі радыкальныя змены ў жыцці грамадства, сістэме каштоўнасцей і светапоглядзе людзей. Гісторыя сведчыць, што тэхнічны прагрэс, пашырэнне матэрыяльнай вытворчасці, якія як быццам вырашаюць многія праблемы існавання чалавецтва, у шэрагу выпадкаў абвастраюць іх і ствараюць новыя, калі не ўлічваецца духоўны фактар. Катэгорыя духоўнасці набыла ў апошні час вялікае значэнне для навукі і сацыякультурнай дзейнасці. Аднак у цяперашні час назіраецца дэфіцыт духоўнай літаратуры на роднай мове, якая вельмі патрэбна моладзі. Таму вельмі карыснымі, актуальнымі і своечасовымі з'яўляюцца кніга Уладыслава Завальнюка «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» і пераклад Евангелля на сучасную беларускую літаратурную мову пад яго кіраўніцтвам. Мова абедзвюх кніг адпавядае беларускаму правапісу, які зацверджаны на дзяржаўным узроўні.

У кнізе «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» ўзняты вельмі важныя пытанні — пытанні ўнарма-

вання літургічнай мовы, а калі глядзець больш шырока, то закранута і пытанне чысціні і прыгажосці маўлення ўвогуле. Аўтар вельмі слушна зазначае, што сучасны стан перакладаў літургічных тэкстаў і набор лексікі, распаўсюджанай у каталіцкім асяроддзі, не можа лічыцца задавальняючым, бо ў ім прысутнічаюць і прыкметы прастамоўя, і розначытанні ў адносінах да імёнаў і геаграфічных назваў, а часам выкарыстоўваюцца калькаваныя словы, якія ніякім чынам не спрыяюць шанаванню роднай мовы.

Вельмі цікавымі і змястоўнымі ў кнізе з'яўляюцца дадаткі: палемічнае эсэ «Мова — душа народа», «Уласныя імёны, якія ўжываюцца ў Новым Запавеце», «Геаграфічныя назвы», «Кароткі тлумачальны слоўнік», «Словы і звароты ветлівасці». Адзін пералік гэтых дадаткаў сведчыць пра грунтоўнасць аўтарскай задумы ксяндза Уладыслава. Ён прапануе напрацаваны матэрыял, ад якога сапраўды можна адштурхнуцца, каб стварыць слоўнікі і дапаможнікі па літургічнай лексіцы. Кніга «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» ўяўляе сабой метадычны напрамак, які вучыць, як працаваць над перакладам, як выбраць пэўны адпаведнік з шэрагу сінанімічных слоў. Работ, дзе быў бы прапанаваны комплексны варыянт з глыбокім даследаваннем гісторыка-марфалагічных і фанетычных заканамернасцей складаных і па-рознаму пададзеных у розныя часы літургічных, сакральных слоў, сэнсаваму іх зместу і прынцыпаў фарміравання, да гэтай пары не было. Аўтар падымае шэраг праблем, якія ўзнікаюць пры аналізе тэксту літургічных спеваў, звязаных з перакладамі сакральных тэкстаў і імёнаў (як з адной нацыянальнай мовы на другую, так і для адной і той жа мовы з яе архаічнага варыянта на сучасны).

Евангелле з'яўляецца галоўным складнікам не толькі рэлігійнага культу, біблейскага канона, але і суадносіцца з вектарам развіцця агульнай духоўнай культуры і арганічна ўпісваецца ў культурагенез. Таму для яго разумення неабходны падыход як да гісторыка-культурнага феномена. Раней Евангелле было аб'ектам даследавання толькі ў рэлігійных і гістарычных працах, але ў XX ст. яно пачало прыцягваць актыўную ўвагу спецыялістаў у галіне лінгвістыкі, псіхалогіі, культуралогіі, філасофіі і іншых навук. Евангелле як старажытны пласт духоўнасці і культуры з'яўляецца невычэрпнай крыніцай выхавання і развіцця чалавека ў сацыяльным асяроддзі. Гэта кніга можа прыводзіць чалавека да асаблівага стану пакаяння, глыбокага разважання, падзякі і праслаўлення Бога, служыць сродкам маральнага выхавання, дапамагае людзям звярнуцца да свайго сумлення, адчуць дабыню, прыгажосць, развіць у сабе высакароднасць, унутраную дысцыпліну, спрыяе развіццю пачуцця любові і спачування да чалавека.

Кніга Евангелле пад рэдакцыяй Уладыслава Завальнюка ўяўляе сабой грунтоўнае даследаванне паходжання шматлікіх слоў і выразаў, якія ўвайшлі ва ўжытак у каталіцкай традыцыі. Аўтар вельмі правільна зазначае, што Евангелле (ды і ўвогуле мова) павінны не раз'ядноўваць, а аб'ядноўваць поліканфесіянальную краіну. Менавіта таму вельмі актуальным з'яўляецца заклік стварыць урэшце адзіны пераклад Евангелля на беларускую мову і распрацаваць адзіную тэрміналогію, якая б адпавядала сучаснаму стану развіцця беларускай мовы. Адчуваецца, што аўтара сапраўды асабіста хвалюе лёс роднай мовы і асабліва варункі яе існавання ў рэлігійным асяроддзі.

Заслугоўваюць увагі звесткі пра евангелістаў, яны ўводзяць чытача ў эпоху дзеяння Хрыста. Выдатна і тое, што кожны раздзел падзелены на часткі, што дапамагае хутчэй знайсці патрэбны матэрыял. Тэкст Евангелля кананічна вытрыманы ў адпаведнасці з лексічнымі і сінтаксічнымі нормамі сакральнасці канонаў, дагматычнай строгасцю і паслядоўнасцю.

Выдатна распрацаваныя дадаткі дапамаглі групе філолагаў, якія працуюць над перакладам Евангелля, знайсці правільны кірунак. У дадатках аўтар падымае пытанні 2002 года аб увядзенні сучаснай беларускай літаратурнай мовы ў Літургію, царкоўную мову. Цікавасць выклікаюць імёны, напісаныя ў адпаведнасці з нарматыўнай сучаснай беларускай мовай, жыццёвасць якіх сцвердзілася адлюстраваннем у энцыклапедычных выданнях і іншых лінгвістычных працах.

РАМАНЦЭВІЧ
Валянціна Карлаўна,

выкладчыца беларускай мовы і літаратуры, метадыст, выдатнік народнай асветы, ветэран педагагічнай працы

Для працы па ўдакладненні тэксту Евангелля (Мн., 1997) была створана рабочая група філолагаў, якую ўзначаліў ксёндз Уладыслаў — пробашч Мінскага касцёла Св. Сымона і Св. Алены.

Перад намі, членамі групы, была пастаўлена канкрэтная задача: дапрацаваць кнігу Святога Пісання, выдадзеную ў 1997 г., з улікам правапісу сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Як нам было сказана, гэта — просьба бацькоў вучняў, што наведваюць нядзельную школу, іншыя пазакласныя мерапрыемствы ў касцёле. Тэксты Евангелля павінны цалкам адпавядаць сучаснаму правапісу, правілам, якія неабходна ведаць выпускнікам школ пры выкананні тэстаў для паступлення ў ВНУ.

Калі з арфаграфічнымі, граматычнымі, пунктуацыйнымі памылкамі можна было справіцца адносна лёгка, то праца з лексікай, з недакладнасцямі ў змесце патрабавала грунтоўнага ведання розных бакоў жыцця іудзеяў эпохі Ісуса Хрыста. Для гэтага прыходзілася чытаць шмат багаслоўскай літаратуры, энцыклапедычных даведнікаў, вывучаць законы, па якіх жылі яўрэі таго часу, ведаць палітычны лад краіны, традыцыі, звычаі, абрады, асобныя бакі побыту і інш. А прасцей сказаць, умець умоўна апынуцца на Святой Зямлі

2-тысячагадовай даўнасці, быць сведкам падзей, звязаных з Сынам Божым, разумець, што адбывалася і што складае аснову хрысціянскага веравызнання. Таму мы працавалі над тэкстам Святога Евангелля тры гады, г. зн. чыталі прапанаваную літаратуру, абмяркоўвалі асобныя пытанні з нашым кіраўніком, параўноўвалі розныя пераклады, шукалі лексічныя сродкі, каб можна было як найдакладней перадаць змест.

Вядома, што Евангелле — гэта не мастацкі твор, у якім кожны, хто да яго мае дачыненне, можа мяняць, удакладняць пэўныя думкі, выкарыстоўваць свае, прызвычаеныя яму выяўленчыя сродкі мовы, узятыя з вобразнай гутарковай мовы.

Святое Евангелле мае сакральны змест, таму і мова яго павінна быць адпаведнай. Калі заглянуць у гісторыю, то заўважым, што ў богаслужэнні той ці іншай канфесіі ўжываецца менавіта сакральная мова.

Функцыяніраванне сакральнай мовы ў кожнай канфесіі вызначаецца гістарычнымі традыцыямі, якім надаецца сакральны сэнс. У раннехрысціянскай Царкве сакральнымі мовамі былі іўрыт, грэчаская і лацінская мовы. Пасля падзелу Царквы (1054 г.) Рымска-Каталіцкая Царква выкарыстоўвала як сакральную ў Імшы лацінскую мову. Рашэннем II Ватыканскага сабора 1926—65 гг. дапускаюцца і сучасныя народныя мовы. Але, як адзначана ў «Агульных уводзінах да Рымскага Імшала» (§ 392), *павінна ўжывацца мова ўзнёслая, літаратурная*.

Значнасць мовы Святога Пісання трэба абгрунтаваць і тым, што чытанне Евангелля з'яўляецца вяршыняй Літургіі Слова, а сама Літургія вучыць, што чытанню аддаецца найвышэйшая пашана (§ 60). Таму

ўсе вернікі *павінны з павагаю слухаць чытанні Слова Божага, якія з'яўляюцца вельмі важным элементам Літургіі* (§ 29).

Адзначым, што ў нас ёсць выдатны эталон сучаснай беларускай літаратурнай мовы, ёсць добрае размежаванне стыляў, патрабаванні да якіх вывучаюцца ў школах. Цяпер вельмі важна вызначыцца з канфесійным стылем пры адборы лексікі і не збіцца да побытавага ўзроўню, тым больш да аднаго нейкага дыялекту.

Таму з нагоды абмеркавання мовы перакладу Евангелля і праведзена навукова-практычная канферэнцыя, на якую былі запрошаны многія вядомыя вучоныя, педагогі, журналісты, прадстаўнікі розных прафесій — вернікі Рымска-Каталіцкай Царквы і іншых хрысціянскіх канфесій. Да канферэнцыі нашым кіраўніком ксяндзом-пробашчам Уладыславам падрыхтавана кніга «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі». У ёй адлюстраваны прыёмы работы са словам з выкарыстаннем навуковай і даведачнай літаратуры, методыка выбару адпаведнай лексікі для сакральных тэкстаў.

Мы шчыра ўдзячны ўсім, хто не застаўся раўнадушным у абмеркаванні мовы сакральных тэкстаў і прыняў удзел у канферэнцыі, выказаў свае адносіны да перакладу Евангелля ці, не маючы магчымасці прысутнічаць, адгукнуўся праз перыядычны друк або проста даслаў нам свае меркаванні ў пісьмовай форме.

Выказваем таксама удзячнасць педагогу Г. М. Туромшы (г. Мінск), медыку Л. К. Ляпеевай (в. Пагост-Загародскі Пінскага р-на Брэсцкай вобл.), якія з бласлаўлення сваіх святароў грунтоўна вычыталі наш пераклад Евангелля, далі яму ацэнку і пры сустрэчы прапанавалі вусна свае парады.

Да некаторых рэкамендацый, выказаных у пісьмовай форме, ёсць неабходнасць вярнуцца. Для абгрунтавання нашай пазіцыі бяром спосаб працы над словам, выкарыстаны ксяндзом-пробашчам Уладыславам у кнізе «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі».

Напрыклад, ёсць заўвагі па ўжыванні хрысціянскага імя Бога — *Гасподзь*. Прапануецца варыянт *Госпад*.

Звернемся да «Гістарычнага слоўніка беларускай мовы», т. 7, с. 109 (Мн., 1986). Заўважым, што ў прыведзеных прыкладах у артыкуле ўжываюцца абодва словы — варыянты, *Гасподзь* і *Госпад*, ніякаму з іх перавага не аддаецца.

У прадмове да ўсяго Слоўніка (т. 1) сказана, што своеасаблівасць гісторыі беларускай мовы заключаецца ў тым, што старажытная беларуская пісьменнасць развівалася ва ўмовах літаратурнага мнагамоўя. У самым пачатку для рэлігійных патрэб выкарыстоўвалася царкоўнаславянская мова, якая ў пэўнай меры абслугоўвала і свецкую літаратуру. Беларуская ж мова пашырала свае грамадска-культурныя функцыі і пранікла ў царкоўна-рэлігійную сферу ў XVI ст. Аднак паступова яна ўступала свае пазіцыі польскай мове, а ў хуткім часе пачала выкарыстоўвацца латынь. З канца XVIII ст. запанавала руская мова.

Як сцвярджаюць вучоныя, помнікаў рэлігійных твораў на беларускай мове не так многа, таму складальнікі Гістарычнага слоўніка імкнуліся па магчымасці выкарыстаць увесь матэрыял і на аснове яго паказаць патрэбныя ўзоры. Таму ёсць прыклады з выкарыстаннем слоў *Гасподзь* і *Госпад*. Якому з іх аддадзена перавага — выбраў сам час, бо частотная характарыстыка ў гістарычных слоўніках не прадугледжваецца.

Такім чынам, назавём некаторыя аўтарытэтныя крыніцы, дзе ў сучаснай беларускай літаратурнай мове ўжываецца імя *Гасподзь*, прычым без спасылкі на варыянтнасць.

1. «Слоўнік беларускай мовы» пад рэд М.В. Бірылы (Мн., 1987), с. 177.
2. «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы», т. 2 (Мн., 1978), с. 38.
3. «Русско-белорусский словарь» пад рэд. Я. Коласа, К. Крапівы, П. Глебкі, т. 1 (Мн., 1993), с. 327.
4. «Беларуская энцыклапедыя» ў 18-ці т., т. 5 (Мн., 1997), с. 84.
5. Энцыклапедычны даведнік «Рэлігія і царква на Беларусі» (Мн., 2001), с. 72.
6. І. Л. Капылоў, Т. М. Маракуліна, С. Я. Рапацэвіч. «Арфаграфічны слоўнік сучаснай беларускай мовы» (Мн., 2008), с. 51.
7. «Святое Пісанне для дзяцей» (Мн., «Нар. асвета», 2005), с. 18.
8. Свяшчэннае Евангелле. Пераклад Біблейскай камісіі Беларускай Праваслаўнай Царквы (Мн., 2007).

Ёсць яшчэ пераклад Евангелля, зроблены названай камісіяй крыху раней (1991, 1999, 2003, 2005) у чатырох кнігах. Ён цікавы тым, што тэксты (вершы) падаюцца на чатырох мовах: грэчаскай, славянскай, рускай і беларускай з паралельнымі месцамі. У канцы кожнай кнігі ёсць тэксталагічны аналіз, дзе ўлічаны разыходжанні ў грэчаскіх выданнях.

Ужыванне імені *Гасподзь* адлюстравана і ў вуснай народнай творчасці, напрыклад: Не дай *Гасподзь* — у значэнні *няхай не будзе гэтага* (ТСБМ, т. 2, с. 154). Адгорнем кнігу «Прыказкі і прымаўкі», т. 2, с. 152

(Мн., 1976) і прачытаем: *У дабрэ Гасподзь не ў паміне.* Гэта прыказка запісана ў Добрушскім раёне.

І ні ў адной аўтарытэтнай крыніцы, якая б адпавядала прынятаму ўнармаванаму правапісу беларускай мовы, не ўбачым прапанаваны варыянт імя *Госпад.*

Таму наш кіраўнік ксёндз-пробашч Уладыслаў і мы, хто працуе пад яго кіраўніцтвам, пакідаем імя *Гасподзь* без змянення. І гэта па той прычыне, што мы з павагай прымаем афіцыйна ўжо прыняты варыянт, які трывала ўвайшоў у жыццё беларусаў, з хрысціянскай паслухмянасцю падпарадкоўваемся прынятай норме. А норма, як сцвярджаюць вучоныя, — гэта пашыранае і ўстойлівае выкарыстанне моўных сродкаў, якое стала ўзорным і таму заканадаўча (у нарматыўных слоўніках) замацавана.

Ёсць і такая яшчэ заўвага (с. 58): не ўжываць імя *Ісус*, а *Езус*. Гэта па той прычыне, што слова *Езус* быццам бы надае тэксту каталіцкую адметнасць, каларыт. Мы параіліся ў нашай камісіі і павінны сказаць, што каларыт Беларускай Каталіцкай Царквы заключаецца не ў асобна выхапленых з суседняй мовы словах, а ў прынятых фундаментальных догматах, палажэннях Царквы, у пэўных рытуалах набажэнства і г. д. Асобныя ж словы, у тым ліку і імёны, павінны падпарадкоўвацца прынятым ужо лексічным нормам.

Што датычыцца імені *Ісус*, то яно ўжываецца ў Беларусі яшчэ з часоў Скарыны. У энцыклапедычным даведніку «Францыск Скарына і яго час» (Мн, 1988) на с. 349—350 можам знайсці і прачытаць: Ісус Навін, Ісус Сірахаў, Ісус Хрыстос, так як і імёны Іаан (с. 341), Фама (с. 530) і інш.

А цяпер давайце задумаемся: ці правільна, ці гэта той выпадак, калі трэба імёны Госпада Бога, Сына Бо-

жага Ісуса Хрыста перакручваць, аспрэчваць, выхоплівацъ з адной мовы ў другую, паўтараць без патрэбы шмат разоў, распальваць недавер, праз яго ўзвышаць адну канфесію над другой, паказваць сваю перавагу і інш.

Цяпер пару слоў наконт жаночых імён *Марыя* і *Марыям* (с. 99). Трэба сказаць, што гэтыя імёны ў Святым Пісанні ёсць, і яны адно другім не замяняюцца.

Імя *Марыям* (яўрэйскае, у перакладзе абазначае *высокая*) сустракаецца ў Старым Запавеце (Вых 15, 20—21). *Марыям* — старэйшая сястра Маісея і Аарона. Менавіта, мяркуюць, яна, *Марыям*, выратавала свайго маленькага брата Маісея ад смерці, а потым пры выхадзе з Егіпта пайшла за ім на чале ўсіх яўрэйскіх жанчын. Памерла і пахавана ў Кадэсе (Лік 20, 1).

Другі раз упамінаецца імя *Марыям* у Новым Запавеце (Рым 16, 6). Нам вядома толькі тое, што *Марыям* жыла ў часы Апостала Паўла. «Вітайце *Марыям*, — піша пра яе святы Апостал, — якая шмат працавала для нас».

І асобна ўжываецца імя *Марыя*. Як сведчаць розныя энцыклапедычныя даведнікі, гэта імя блізкае па значэнні да яўрэйскага *Марыям*, яно перакладаецца як *узвышаная, узнёслая, высакародная*. Асоб з імем *Марыя* мы ведаем некалькі: гэта і Святая Багародзіца (Мф 1, 16), і Марыя Клеопава (Ін 19, 25), і Марыя Магдаліна (Мк 15, 40—41), і Марыя — маці евангеліста Марка (Дзн 12, 12), і Марыя — сястра Лазара (Лк 10, 39—42).

Названыя імёны *Марыям* і *Марыя* сустракаюцца ў розных выданнях Бібліі, напрыклад: Библия (М., 2006), Библия (Международная организация «Гедеоны»; Мн. 1999), Свяшчэннае Евангелле (пераклад Біб-

лейскай камісіі Беларускай Праваслаўнай Царквы; Мн., 2007), Біблія ў перакладзе В. Сёмухі (USA, 2002), кніга «Симфония» (месца і год выдання не адзначаны) і інш.

Так што, спасылаючыся на аўтарытэтныя выданні Святога Пісання і разнастайную даведачную літаратуру, мы пакідаем абодва імені без змен, *Марыям* і *Марыя*, без выпраўленняў.

Неабходна адрэагаваць на заўвагу (с. 37) па выкарыстанні імені *Анна*. Адзначым, што мы цалкам давяраем аўтарытэтнаму «Слоўніку асабовых уласных імён» (Мн., 2005), складзенаму членам-карэспандэнтам НАН Беларусі М. Р. Суднікам. Рэцэнзентамі яго з'яўляюцца доктар філалагічных навук, прафесар Г. М. Мезенка і кандыдат філалагічных навук А. К. Усціновіч, а навуковы рэдактар — доктар філалагічных навук, прафесар А. А. Лукашанец. Ды і імя *Анна* сустракаецца ў Свяшчэнным Пісанні (Мн., 2007) Праваслаўнай Царквы: с. 146 (Лк 2, 36), с. 147 (Лк 3, 2), с. 274 (18, 13). Таму наўрад ці патрэбны нейкія змены.

Выказана заўвага і па выкарыстанні формы дзеяслова *уваскрэс* (с. 35). Прапанавана прытрымлівацца напісання гэтага слова ***уваскрос***. Тое ж чытаем на с. 83.

Але давайце звернемся да акадэмічнага выдання кнігі «Граматычны слоўнік дзеяслова» (Мн., 2007). Укладальнікі яго В. П. Русак, Л. А. Ліхадзіеўская, Н. П. Еўсіевіч, А. А. Кірдун. Рэцэнзентамі з'яўляецца кафедра беларускага мовазнаўства УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М Танка» і доктар філалагічных навук, член-карэспандэнт А. М. Булыка. Навуковыя рэдактары акадэмік А. І. Падлужны і доктар філалагічных навук В. П. Русак. Адгортваем артыкулы на с. 1161:

уваскрэ́сіць *зак.*, *каго-што* **уваскрэ́шу, уваскрэ́сіш, уваскрэ́сіць, уваскрэ́сім, уваскрэ́сіце, уваскрэ́сяць, уваскрэ́сь, -це; уваскрэ́сіў, уваскрэ́сіла, уваскрэ́сілі; уваскрэ́шаны; уваскрэ́сіўшы.**

уваскрэ́снуць *зак.*, **уваскрэ́сну, уваскрэ́снеш, уваскрэ́сне, уваскрэ́снем, уваскрэ́снеце, уваскрэ́снуць; уваскрэ́сні, -це; уваскрэс, уваскрэ́сла, уваскрэ́слі; уваскрэ́шаны; уваскрэ́сшы.**

Тое ж мы прачытаем і ў «Слоўніку беларускай мовы» пад рэдакцыяй акадэміка АН БССР М. В. Бірылы (Мн., 1987) на с. 805.

Як бачым, ва ўсіх граматычных формах дзеяслова гук [э] знаходзіцца ў моцнай пазіцыі, пад націскам, ён якасна не змяняецца. Таму мы слова **уваскрэ́с** пакідаем без змянення.

Іншыя заўвагі мы таксама вывучылі і абавязкова ўлічым пры дапрацоўцы Святога Евангелля ў трэцім выданні.

У канцы выступлення неабходна адзначыць, што выданне Святога Евангелля на сучаснай беларускай літаратурнай мове ні ў якім разе не выключае кнігі Святога Пісання, перакладзеныя на беларускую мову з выкарыстанем класічнага правапісу. Лічым, што такія кнігі, як, скажам, Біблія (Мн., 2002) у перакладзе В. Сёмухі або пераклад ксяндза У. Чарняўскага ці іншыя выданні ў нашай краіне павінны быць, бо яны, акрамя зместу Святога Слова, адлюстроўваюць і гістарычны факт станаўлення правапісу нашай мовы. Таму гэтыя кнігі, на наш погляд, чытаюцца і будуць чытацца ўжо сталымі людзьмі, якія маюць добрую моўную падрыхтоўку, валодаюць сучаснай беларускай літаратурнай мовай, ведаюць добра гісторыю класічнага правапісу і гісторыю Беларусі.

У абарону сучаснага правапісу скажам, што нават у самыя найскладанейшыя часы для ўсяго беларускага, у савецкі час, працаваў Інстытут мовазнаўства імя Я. Коласа АН, нашы беларускія вучоныя-лінгвісты не рабілі нешта сваё, не стваралі штучную так званую *наркомаўку*. А наадварот, беларуская мова ўнармоўвалася, удакладнялася, развівалася ў кантэксце агульнаеўрапейскіх славянскіх моў, на аснове вывучэння старажытнай беларускай літарауры, рэгіянальных гаворак. І сведчанне гэтаму — разнастайныя шматтомныя слоўнікі, працы вядомых беларускіх лінгвістаў і, у рэшце рэшт, спадчына Ф. Скарыны, якія ігнараваць нам ніхто не даў права. Таму і каталіцкае выданне Евангелля, як і праваслаўнае, павінны суадносіцца з моўнымі традыцыямі сучаснай беларускай літаратурнай мовы і плённа выкарыстоўвацца ў школах пры навучанні і выхаванні школьнікаў. Між іншым, гэта дазваляюць рабіць сучасныя праграмы па навучанні мове і літаратуры ў сярэдніх агульнаадукацыйных установах, ВНУ. А калі гэта можна рабіць, паралельна з вывучэннем якога праграмнага матэрыялу, мы добра бачым з асобных выступленняў удзельнікаў канферэнцыі. Толькі адна ўмова: лексіка і правапіс выкарыстоўваемай канфесійнай літаратуры павінны цалкам суадносіцца з агульнапрынятымі ў Беларусі, не выдзяляцца сваім нейкім выключэннем, паколькі ў нас адна беларуская мова, адзін прыняты на дзяржаўным узроўні правапіс, адна Беларусь і адзін Гасподзь Бог.

Дом Гасподні, Святы Храм, заклікае да яднання ўсе хрысціянскія канфесіі. І няхай гэта будзе пакуль што толькі на моўным узроўні. І мы, філолагі, цалкам падтрымліваем нашага кіраўніка — пробашча Уладыслава.

Разам з тым верым, што тэкст Святога Пісання з'явіцца дасканалым толькі тады, калі на афіцыйным узроўні ў абмеркаванні прымуць удзел прадстаўнікі розных хрысціянскіх веравызнанняў.

Добрым прыкладам да сказанага можа быць кніга «Сакральны жывапіс Беларусі XV—XVIII стагоддзяў» (Мн., 2007), да якой маюць дачыненне дасведчаныя вучоныя агульнаеўрапейскага ўзроўню з гарадоў Масквы, Варшавы, Кракава, Парыжа, і кніга А. Аляксеева, А. Лукашэвіча «Спадчына Беларусі» (Мн., 2007). У першай з іх да ілюстрацый даюцца тэкставыя каментарыі на рускай, беларускай і англійскай мовах, у другой — на беларускай і англійскай. І самае найгалоўнейшае трэба адзначыць тое, што выйшлі абедзве кнігі з бласлаўенства Кардынала Казіміра Свёнтэка, Старшыні Канферэнцыі каталіцкіх Біскупаў Беларусі, і Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі. Гэтыя бласлаўенствы падмацаваны ўласнымі подпісамі гэтых Паважаных Асоб.

У кнізе «Сакральны жывапіс Беларусі XV—XVIII стагоддзяў» у подпісах да ікон знаходзім: «Святое Сямейства з *Францыскам*» (15), «Новазапаветная *Троіца*» (27), «*Анна* з Дзіцем» (28), «Архангел *Міхаіл*» (29), «Упэўненне *Фамы*» (43), «Павел і *Іаан*» (82), «*Хрыстос* Пантакратар» (108), «*Антоній* Падуанскі» (121), «*Фама* і *Іаан*» (157), «Фадзей» (164), «Варфаламей» (165) і інш.

У кнізе «Спадчына Беларусі» сярод подпісаў да ілюстрацый чытаем: «*Ісус Хрыстос*» (24, 86), «Св. Апостал *Іаан* Багаслоў» (24), «Касцёл *Ушэсця* Найсвяцейшай *Дзевы* Марыі» (29), «Прарок *Данііл*» (93), «Трэцяя

кніга «*Царствы*» (95), «Касцёл Св. *Варвары*» (с. 110), «Касцёл Св. *Францыска* Ксаверыя ў Гродне» (152), мармуровая статуя «*Давід*» (167), «Дэкор фасада *Дабравешчання* Найсвяцейшай *Дзевы* Марыі» (169), «Смаргонскі касцёл Св. *Міхаіла* Архангела» (181), «Касцёл Св. *Іаана* Хрысціцеля ў Гальшанах (191), «Касцёл Св. *Міхаіла* ў Гнезне» (221), драўляная скульптура «*Ісус Хрыстос* перад Укрыжаваннем» (296), «Касцёл *Ушэсця* Найсвяцейшай *Дзевы* Марыі ў мястэчку Канстанцінава» (296), «Статуя Св. *Іаана* Хрысціцеля» (300), «Статуя *Ісуса Хрыста*» (300), «Касцёл Св. *Іосіфа*» (307) і інш.

Такім чынам, паколькі кнігі, змест гэтых кніг бласлаўёныя, то можна лічыць, што атрымалі блаславанне — дазвол на выкарыстанне і імёны *Ісус Хрыстос, Іаан, Анна, Міхаіл, Рафаіл, Фама, Варфаламей, Антоній, Фадзей, Карл, Сімяон, Данііл, Варвара, Давід, Іосіф, Францыск*, а таксама тэрміны *Архангел, Архістраціг*, Маці *Боская, Дзева* Марыя, *Уваскрэсенне, Успенне, Грамніцы* (*Стрэчанне*), *Троіца, Узвіжанне, Пакроў, Ушэсце, Укрыжаванне, Царства, Дабравешчанне, Благавешчанне* і інш.

Як бачым, пачатак дазволу на смелае ўжыванне імёнаў, геаграфічных назваў (упамінаецца Іерусалім), асобных багаслоўскіх тэрмінаў ёсць. Ён у подпісах да твораў сакральнага мастацтва (жывапісу, скульптуры, архітэктуры).

Мы (гавару ад імя нашай групы філолагаў, якія працуюць пад кіраўніцтвам ксяндза-пробашча Уладыслава) з хрысціянскай пакорнасцю чакаем, каб вельмі паважаная Канферэнцыя Біскупаў Беларусі разгледзела нашы працы і мы атрымалі дазвол на распра-

цоўку метадычных рэкамендацый па выкарыстанні Святога Пісання на ўроках беларускай мовы, літаратуры, у пазакласнай рабоце. Верым, што Святое Евангелле на ўзроўні мовы будзе гучаць у школах Беларусі, будзе яднаць і выхоўваць хрысціян-беларусаў. Але паўтару думку, выказаную вучонымі на канферэнцыі: каб пытанне ўнармавання хрысціянскай лексікі прапанаваць на міжканфесійны ўзровень, трэба спачатку прыйсці да згоды ў межах адной канфесіі.

Уладыслаў Завальнюк

РОДНАЯ МОВА Ў ДУХОЎНЫМ ЖЫЦЦІ БЕЛАРУСІ

Выданне другое, дапоўненае

Рымска-Каталіцкая парафія
Святога Сымона і Святой Алены
Мінск, 2008

А ў т а р:

Уладыслаў Завальнюк — ксёндз-дэкан
пробашч Мінскага касцёла
Святога Сымона і Святой Алены,
кандыдат гістарычных навук, магістр тэалогіі

Р э ц э н з е н т ы:

Лемцюгова В. П. — галоўны навуковы супрацоўнік
ДНУ «Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа
і Янкі Купалы НАН Беларусі»,
доктар філалагічных навук, прафесар;

Мальдзіс А. І. — доктар філалагічных навук, прафесар.

Карэктар — *Валянціна Раманцэвіч*
Камп'ютарная вёрстка — *Ксенія Жартун*

Мы нічога не сцвярджаем,
мы просім парады ў вучоных,
гатовых дапамагчы нам.

Аўтар.

ПАВАЖАНЫЯ ПАРАФІЯНЕ, МОЛАДЗЬ І ДАРОСЛЫЯ, ДАРАГІЯ ЧЫТАЧЫ!

Звяртаюся да вас і пішу для будучых пакаленняў, хрысціянскіх і культурна адукаваных, якім будзе неабыякава развіццё і веліч матчынай беларускай мовы, мовы бацькоў сваіх. Бо сёння пакаленне ў большасці сваёй размаўляе на беларускай мове «ніяк»: **з кожнай мовы па слове.**

НАСТАЎ ЧАС ПАВЯРНУЦЦА АБЛІЧЧАМ ДА МОВЫ БЕЛАРУСКАЙ

Першыя спробныя кнігі і малітоўнікі, выдадзеныя невялікім тыражом у 1989—2004 гг., якімі мы практычна рэгулярна карысталіся і карыстаемся, удасканальваюцца і папраўляюцца.

Ідзе вялікі супраціў з боку «прывыкшай публікі» да польскіх ці рускіх выразаў і зваротаў, і выбрацца з-пад гэтага прэсінгавага друзу было няпроста і ў далёкія дзевяностыя гады, няпроста і цяпер.

Даволі цяжка прадбачыць і правільна выбраць адпаведнае слова з яго значэннем, гучаннем і мелодыяй

як для чытання, так і для літургічнага спеву. Многія словы вымушаны быў пакідаць у літургічных тэкстах толькі з-за таго, што так хацела невялічкая група аднадумцаў. Многія часова і няўдала падабраныя словы, ад якіх трэба было даўно адмовіцца, сталі асноўнымі і галоўнымі.

Людзі больш палюбілі трасянку, чым мілагучную матчыну мову, якая каму матчына, а каму — мова мачахі.

У Польшчы нас лічаць усходнім краем — крэсамі, рускімі,

у Расіі — заходнімі землямі, палякамі,

а пасярэдзіне, дзесьці тут і там, знаходзяцца тутэйшыя.

Многія, нават тутэйшыя, не вельмі любяць сваю мову, бо чуюць яе ў руска-польскім засмечаным варыянце. І што вельмі хвалюе, дык гэта тое, што многія духоўныя саноўнікі (каталіцкія, уніяцкія, праваслаўныя, пратэстанцкія) не вельмі схільныя да роднай мовы: маўляў, на чужой мове і выглядаеш больш адукаваным.

Мова як крынічная вада: або яна чыстая і здаровая, або забруджаная і хваравітая. У апошнім выпадку яе трэба ачышчаць, фільтраваць. Так выглядае справа і з мовай, якую трэба ачышчаць і ўдасканальваць, або ўводзіць новую, суседняга народа, «жывую» мову.

Няўжо беларуская мова падпадае пад катэгорыю мёртвай мовы?

У свой час (у 90-х) пра мову і любоў да яе я напісаў артыкул **«Мова — душа народа»** ў газеце «Наша слова». Падаю яго тэкст у дадатку.

На вялікі жаль, трэба адзначыць і прызнаць, што беларускае слова ў святынях ужывалася і ўжываецца вельмі абмежавана і даволі пакалечана: гаворым абы-як.

На чысціню і мілагучнасць правільнай беларускай мовы аказваюць вялікі ўплыў польская і руская мовы. У беларускай мове сустракаем многа іншамоўных слоў і словазлучэнняў, паланізмаў, русізмаў і кампіляцый. З сумам можна назіраць святочныя паштоўкі з віншаваннямі, дзе беларуская мова нясе не святочны настрой, а прыніжэнне.

Напрыклад, **З Ражаством Хрыстовым!**

З Калядамі!

а трэба гаварыць і пісаць:

З Нараджэннем Хрыстовым!

З Божым Нараджэннем!

Са Святам Божага Нараджэння!

З Раством Хрыстовым!

З Божым Нараджэннем і Калядамі!

Пагаворым пра значэнне слова **Каляды**.

«Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» (т. 2, с. 595) падае значэнне гэтага слова наступным чынам.

Каляды — царкоўнае хрысціянскае свята Нараджэння Хрыста, якое адзначаецца 25 снежня і ў наступныя дні на працягу двух тыдняў, па 6 студзеня.

Тут жа тлумачацца іншыя аднакарэнныя словы.

Каляда — абрад хаджэння па хатах у калядныя вечары з віншаваннем, велічальнымі песнямі; песня, якая спяваецца ў час гэтага абраду; падарункі, атрыманыя ад гаспадара за віншаванне, песні.

Калядаванне — дзеянне паводле значэння дзеяслова калядаваць.

Калядаваць — хадзіць па дварах у калядныя вечары, віншаваць гаспадароў, спяваючы калядныя песні.

Каляднік — той, хто калядуе.

Калядніца, *разм.* — калядная пара, калядная ноч.

Калядны — які мае адносіны да Каляд; такі, які бывае на Каляды. *Калядныя песні. Калядныя маразы. Калядная ночка ўвесь свет пакрывае, Па белай ад пуху зямельцы сніе.* Я. Купала.

«Этымалагічны слоўнік беларускай мовы» (т. 4, с. 215) змяшчае прыкладна такую ж інфармацыю. Толькі ў артыкуле **«Каляда»** дадаецца, што беларускі фальклярыст і этнограф А. К. Сержпутоўскі адзначае персаніфікацыю Каляды, г. зн. надае яе паняццю вобраз чалавека. І гэта сапраўды мы бачым на прыкладзе разнастайных калядных песень, напрыклад: «Прыехала Каляда на сівым коніку», «Ішла Каляда» і інш.

Далей з артыкула мы даведваемся, што не толькі ў беларусаў, але і ва ўкраінцаў, у рускіх — ва ўсіх усходніх славян — слова Каляда азначае свята Нараджэння Хрыста, свята радасці.

Польскае *kolęda* — калядная песня, навагодні або калядны падарунак, адведванне вернікаў ксяндзом.

Славінска-кашубскае *koleda* — калядная песня, абрад хаджэння па хатах з песнямі.

Ніжнелужыцкае *koloda* — навагодні падарунак.

Чэшскае *koleda* — калядная песня, а таксама час, калі пяюць калядныя песні.

Ёсць слова **Каляда** з прыкладна такім жа значэннем у славацкай, славенскай, сербскай, македонскай, балгарскай, стараславянскай мовах.

Слова *koleda* запазычана з лацінскай мовы, яно азначае першы дзень месяца; першапачаткова, відаць, свята было звязана з пачаткам года, паколькі даўнія рымскія святы ***календы*** адзначалі з 1 па 5 студзеня. Далей у сувязі з прыняццем хрысціянства аднесена да свята Нараджэння Хрыста.

Таму можна сказаць так: **Са Святам Божага Нараджэння і Калядамі!**

Толькі пры гэтым трэба памятаць, што **Каляды — гэта ўсё-такі перыяд, а Божае Нараджэнне — гэта гістарычны факт, дзень, Свята Хрыстовага Нараджэння. Вера ў Ісуса Хрыста, Сына Божага, Які нарадзіўся, жыў, пакутаваў на Галгофе і ўваскрэс.**

Тады трэба пісаць:

Са Святам Божага Нараджэння!
З Божым Нараджэннем і Калядамі!
З Нараджэннем Хрыстовым і Калядамі!
З Раством Хрыстовым і Калядамі!

Не трэба, на наш погляд, баяцца ўжываць і слова **Раство**. Яно сустракаецца ў навукова-папулярнай літаратуры, энцыклапедычных даведніках.

Прачытаем уважліва, што сказана пра слова **Раство** ў «Этыманалагічным слоўніку беларускай мовы», т. 11.

Раство (с. 137) — свята Нараджэння Хрыста, старабеларускае **разтво**. Я. Ф. Карскі выводзіць яго праз стадыю асіміляцыі **росство** з **рожьство**. Гл. **раздво, ражаство**.

Раздво (с. 53), **ражджаство, рожество, роздво, ражство, рождво** параўнаем з украінскім **різдво**, рускім **рождество**. Далей прачытаем і заўважым, што слова **ражаство** ёсць у сербскай, харвацкай, балгарскай, стараславянскай мовах. Утворана ад **радзіць**. Ва ўсходніх славян — беларусаў, украінцаў, рускіх — у XI—XII стст. свята мела назву **рожьство**, пазней **рожество**, старабеларускае **раство, розтво** (1387), апошняе з **рожьство**, што адпавядала зыходнай стараславянскай форме гэтага слова са значэннем **нараджэнне, дзень нараджэння**.

У польскай мове свята Нараджэння Хрыста называецца **Boże Narodzenie**, у чэхаў — **Narozeni Páně**.

Такім чынам, свята Нараджэння Ісуса Хрыста можа мець дзве назвы:

Божае Нараджэнне і **Раство**,

хоць перавагу аддадзім першаму варыянту.

Слова **раство** звязана і з нараджэннем Маці Божай. У гэтым мы можам пераканацца з подпісаў, напр.: «Беларуская энцыклапедыя» ў 18 т.: *Царква* **Раства** *Багародзіцы ў Салігорску* (т. 18, кн. 2, с. 709).

Энцыклапедыя ў двух тамах «Вялікае княства Літоўскае»:

Касцёл **Раства** *Дзевы Марыі ў Шылуве. 1760—86* (т. I, с. 133).

Гарадзенскі манастыр **Раства** *Багародзіцы* (т. I, с. 504).

Мураванкаўская царква **Раства** *Багародзіцы* (т. 2, с. 325).

У кнізе Лакоткі А. І. «Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры» таксама чытаем подпіс: *Касцёл* **Раства** *Багародзіцы ў Трабах* (с. 180, II абз.).

Або возьмем словазлучэнне:

Хрыстус Змёртвыхпаўстаў!

А трэба казаць і пісаць:

Хрыстос Уваскрэс!

Праўда, яшчэ ёсць і народны выраз: **Хрыстос Уваскрос**. Гэты выраз сапраўды выкарыстоўваецца ў касцёлах Беларусі для рыфмы ў літургічных спевах ці некаторых тэкстах. Але граматычная форма **уваскрос** ні ў адным нарматыўным слоўніку, ні ў адным падручніку сучаснай беларускай літаратурнай мовы не пададзена. Аднак у хрэстаматыі «Беларускі фальклор», у раздзеле «Абрадавыя песні» (песня «Ідзём, пайдзём у слаўны дом», с. 105—106), прачытаем:

Ідзём, пайдзём у слаўны дом,
Хрыстос Сын Божы, Хрыстос уваскрос!

Такую граматычную форму **уваскрос** простыя людзі выкарысталі, хутчэй за ўсё, як бачым, для рыфмы.

Аднак у святых храмах, у час набажэнстваў, і ўвогуле заўсёды пажадана гаварыць правільна: **Хрыстос Уваскрэс!** (гл. тлумачэнне ніжэй, на с. 164).

Або возьмем словазлучэнне: **Унебаўшэсце Панскае!**
А трэба казаць і пісаць: **Узнясенне Гасподняе!**

Прыгадаем вялікае хрысціянскае свята, яно ў літаратуры называецца па-рознаму:

Унебаўзяцце, Успенне, Ушэсце.

Як бачым, існуюць тры варыянты. Разгледзім, як гэта адлюстравана ў даведачнай літаратуры.

Унебаўзяцце Дзевы Марыі

1. «Беларуская энцыклапедыя», т. 16, с. 84: *Тыцыян.* **Унебаўзяцце** *Марыі. Каля 1516—18.*
2. Энцыклапедыя «Вялікае княства Літоўскае», т. I, с. 432: *Касцёл* **Унебаўзяцця** *Дзевы Марыі.*
3. Тая ж кніга, с. 591: *Дзятлаўскі касцёл* **Унебаўзяцця** *Маці Божай.*
4. Энцыклапедыя «Вялікае княства Літоўскае», т. 2, с. 125: *Касцёл* **Унебаўзяцця** *Найсвяцейшай Дзевы Марыі. Апсіда.*

Успенне Маці Божай

1. «Беларуская энцыклапедыя» ў 18 т., т. I, с. 343: *Ф. Ангілейка.* **Успенне** *Багародзіцы. Гравюра на дрэве, ілюстрацыя ў кнізе Іаана Дамаскіна. Магілёў, 1700.*

2. Тое ж выданне, т. 10, с. 334. *Міёрскі* **Успенскі** *касцёл.*
3. Энцыклапедыя «Вялікае княства Літоўскае», т. I, с. 226: **Успенне** *Багародзіцы.*
4. Энцыклапедычны даведнік «Архітэктура Беларусі», с. 22: *Званіца перад касцёлам* **Успення** *Дзевы Марыі. Пінск. 1-я палавіна XIX ст.*
5. Кніга «Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння», с. 68: **Успенне** *Маці Божай. Фрагмент. 1580—1630. Брэсцкая вобласць.*
6. Церашчатава В. В. «Старажытнабеларускі манументальны жывапіс XI—XVIII стст.», с. 63: **Успенне**. *Фрэска калегіяты ў Вісліцы. Пачатак XV ст.*
7. У той жа кнізе: *Блакітнае* **Успенне**. *Фрагмент абраза. Першая чвэрць XV ст.*, с. 76.

Ушэсце Святой Марыі

Такога свята, лічым, няма ані ў Царкве, ані ў Касцёле, хоць у даведачнай літаратуры можам прачытаць:

1. «Беларуская энцыклапедыя», т. 9, с. 322: *Ліхтар касцёла* **Ушэсця** *Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў вёсцы Адэльск Гродзенскага р-на.*
2. Тое ж выданне, т. 14, с. 416: *Мініяцюра «***Ушэсце** *Святой Марыі» з Евангелля Рабулы. 586.*
3. Энцыклапедычны даведнік «Архітэктура Беларусі», с. 210: *Жалудоцкі касцёл* **Ушэсця**.
5. Церашчатава В. В. «Старажытнабеларускі манументальны жывапіс XI—XVIII стст.», с. 135: **Ушэсце** *Марыі. Фрэска касцёла Станіслава ў Магілёве. 1765—1767.*

Звяртаемся з просьбай да вучоных: вызначце свае адносіны да назвы свята з пункту гледжання гісторыі

беларускай мовы. Ці можна пакінуць тры назвы да аднаго і таго ж свята?

Кожная мова жыве, удасканальваецца, гэта праўда, набывае адпаведныя для канкрэтнага перыяду развіцця свайго народа поўную і дасканалейшую форму, гэта таксама вялікая праўда, але яна павінна весціся як з боку дзяржавы, так і з боку Цэркваў, свецкімі і духоўнымі спецыялістамі высокага класа і высакароднага духу. У наш час у святынях Беларусі, цэрквах і касцёлах, сярод веруючых **вельмі востра** адчуваецца разбітасць, недахоп царкоўнай тэрміналогіі (у Бібліі, малітоўных тэкстах, спевах, духоўных чытаннях, рытуалах і абрадах).

Людзі ў Беларусі, вернікі і святары, будуць цярпець да той пары, пакуль аўтарытэтныя духоўныя лідары ўсіх веравызнанняў Беларусі з іх літургічнымі камісіямі пры ўдзеле дзяржаўных лінгвістычных устаноў не падыдуць дружна, па-хрысціянску, патрыятычна да згоднага вырашэння пытання адзінства ў беларускай мове. А пакуль што ў святынях Беларусі ідзе працэс дзялення мовы на рэгіянальных узроўнях. Хто як.

Між іншым, французы, палякі, рускія, як і людзі іншых цывілізаваных краін, любяць свае мовы, паважаюць і лічаць адной з важнейшых умоў выхаванасці і агульнай культуры чалавека размаўляць правільна на сваёй роднай мове.

Прабачце мне, але ў Беларусі няма адзінства мовы, таму і недалюбліваюць родную мову людзі — дзеці Беларусі. Аднак выкрыўляцца і насміхацца з мовы бацькоў — гэта **сапраўды цяжкі грэх**, бо мы насміхаемся з людзей, іх культуры і чалавечага жыцця, дадзенага Госпадам Богам. Мы насміхаемся з саміх сябе.

Даволі цяжка ідзе распрацоўка канфесіянальнага стылю, выкарыстоўваецца яшчэ ў тэкстах малітоўнага характару прастамоўная лексіка, не ўласцівыя беларускай мове граматычныя формы і інш.

Але адзначым, што беларуская мова менавіта цяпер, у наш час, пачынае ўжывацца ва ўсёй сваёй красе, велічы і паўнаце ў касцельных і царкоўных набажэнствах, у Літургіі. І трэба адзначыць, што ў многім мы абавязаны гістарычнай спадчыне. З прыняццем хрысціянства на нашай зямлі пачаўся не толькі росквіт дойлідства, выяўленчага мастацтва, музыкі, але і значна стаў пашырацца беларускі слоўнік.

Па-першае, кожны з нас, хрысціян, атрымаў сваё імя, якое часцей за ўсё суадносіцца з імем святога, вучня Ісуса Хрыста ці асобы, якая самаахвярна несла слова Божае ў народ, або асобы са Святога Пісання: Адам, Давід, Веньямін, Варфаламей, Гаўрыіл, Дамінік, Іосіф, Канстанцін, Лука, Марк, Міхаіл, Навум, Павел, Сіман, Фама, Цімафей, Ціт; Марыя, Алена, Варвара, Ніна, Соф'я, Хрысціна, Юлія і шмат інш.

Па-другое, **неабходна спаслацца** на значную ролю царкоўнаславянскай мовы ў развіцці беларускай пісьмовай мовы і яе стыляў. Гэта пераконліва даказаў беларускі мовазнавец, доктар філалагічных навук Л. М. Шакун, у якога галоўным аб'ектам навуковых даследаванняў была гісторыя беларускай літаратурнай мовы. Леў Міхайлавіч выдаў па названай тэме шэраг кніг, адна з якіх зацверджана Міністэрствам адукацыі ў якасці дапаможніка для студэнтаў філалагічных факультэтаў.

Па-трэцяе, беларуская мова **не развівалася ізалявана, а ў кантэксце іншых славянскіх моў.** Гэтаму пы-

танню ўдзяляе шмат увагі Г. А. Цыхун — акадэмік, віцэ-прэзідэнт Міжнароднай Акадэміі навук Еўразіі, аўтар каля 200 навуковых прац па тыпалогіі славянскіх моў і іх сувязях, моўных саюзах і праблеме праславянскай мовы, па беларускай этымалогіі і дыялектнай мове. Усе свае даследаванні Генадзь Апанасавіч спалучае з даследаваннямі ў галіне беларускай мовы. Ён сааўтар «Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы», «Тураўскага слоўніка», на якія і мы робім спасылкі, падбіраючы адпаведную лексіку для канфесіянальнага стылю.

А яшчэ неабходна адзначыць, што лексіка са Святога Пісання ўключана ў такія лексікаграфічныя працы, як «Слоўнік беларускай мовы» пад рэд. М. В. Бірылы, пяцітомны «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы», «Слоўнік іншамоўных слоў» у 2-х тамах А. М. Булыкі і інш.

Як бачым, мы распачынаем працу не на пустым месцы. Толькі просьба да вучоных: дапамажыце нам, калі ласка, вызначыцца ў той лексіцы, якая складала б высокі канфесіянальны стыль сучаснай беларускай літаратурнай мовы, каб нам не апусціцца да прастамоўя, набору слоў, якія часцей за ўсё падыходзяць да ўзроўню гутарковага стылю, што абслугоўвае сферу бытавых зносін.

МОВА — ГЭТА ДУША НАРОДА

Калі ты па-сапраўднаму любіш сваю Бацькаўшчыну, гэтае дрэва твайго жыцця і народа твайго, тады і па-сапраўднаму беражы і цані родную мову, гэтыя плады, якімі карыстаешся, каб жыць шчасліва.

Гісторыя вучыць, што калі ідзе ў заняпад і памірае мова, услед за мовай марнеюць і знікаюць традыцыі, пасля — культура, а потым знікае сам народ як нацыя.

«Народ выражае сябе найпаўней і найдасканалей у мове сваёй», — пісаў у XIX ст. вядомы рускі лінгвіст І. Сразнеўскі.

«Народ і мову нельга ўявіць адно без аднаго», — падкрэсліваў ён.

Гэта праца з'яўляецца ані пачаткам у станаўленні духоўнага гмаху беларускай мовы, бо яе распачалі многа стагоддзяў таму назад нашы, святой памяці, дарагія продкі, ані завяршэннем, бо ніхто не мае права паставіць кропку, акрамя Госпада Бога, над лёсам як аднаго чалавека, так і цэлага народа, у дадзеным выпадку Беларусаў. Дадзеная праца — гэта цаглінка нашага пакалення ў наш агульны культурна-духоўны бацькоўскі дом. Судзіць нашчадкам, і дай Ты Божа, каб нас судзілі, бо калі судзяць — значыць рэагуюць. А гэта азначае, што яшчэ жывуць і неабыякава ставяцца жывыя і належаць да жывога дрэва свайго народа. Беларусь жыве і жыць будзе! У стагоддзях і пакаленнях сярод магутных народаў — вялікіх моўных кветак — васільковай лагодаю мовы бацькоўскай, магутнай дзяржаваю.

ЖЫВЕ МОВА — ЖЫВЕ І НАРОД!

Прапаную для Вашага разважання і глыбейшага разумення некаторыя літургічныя і малітоўныя словы і іх значэнні. Мяркуйце самі.

Laudetur Iezus Christus.
In saecula saeculorum. Amen.

Хвала Ісусу Хрысту.
На векі вечныя. Амэн.

Слава Ісусу Хрысту!
На векі вечныя. Амэн.

Хвала Хрысту!
На векі вечныя. Амэн.

➤ **1.** У малітоўніках, кнігах для навучання катэхізісу і ў жыццёвай практыцы падаецца:
Пахвалёны Езус Хрыстус!
На векі вечныя. Амэн.

Або поўная форма:
Няхай будзе пахвалёны Езус Хрыстус!
На векі вечныя. Амэн.

А трэба: **Хвала Ісусу Хрысту!**
На векі вечныя. Амэн.

➤ **2.** У імя Айца, і Сына, і Духа Святога. **Амэн.** =/= [не] **Аман.**

Амэн, Амін, Амінь (ад грэчаскага слова **amen**) — заключнае слова хрысціянскіх малітваў, пропаведзей, якое азначае **«так», «правільна»**.

РАЗВАЖАННІ НАД МАЛІТВАЙ «ОЙЧА НАШ» І ІНШЫМІ МАЛІТОЎНЫМІ ТЭКСТАМІ

Ойча наш

➤ **3.** Ойча наш, **Які** ёсць на небе... =/= [*а не*] **Каторы**... ...*(каторы з* **іх** *паводле пераліку?)* ёсць на небе (non sens).

Нельга так няграматна гаварыць і пісаць. Гэта даслоўны пераклад-калька з польскага «**który**».

Які — адносны займеннік, што злучае даданыя азначальныя, дапаўняльныя, дзейнікавыя, выказнікавыя сказы з галоўным сказам:

а) *Прыгоды,* **якія** [*не* **каторыя**] *пачаліся яшчэ раніцай, не скончыліся для людзей пад самы вечар.* Лынькоў.

б) *Помню, я думаў пра тое,* **які** [*не* **каторы**] *дзень там, у нас, за Дняпром.* Шамякін.

в) *Сустракаліся і такія,* **якія** [*не* **каторыя**] *страцілі ўсякую волю.* Лынькоў.

г) **Якая** *работа,* [*не* **каторая**] *такая і плата.*

І што цікава, калі мы ў малітоўніках і літургічных тэкстах выкарыстоўваем пераважна толькі слова **ЯКІ**, тады чаму наш зварот да Бога Айца ў малітве «Ойча наш» павінна ўжывацца толькі слова **КАТОРЫ**, з-за прынцыпу? Каму такі прынцып патрэбны?

А вось яшчэ прыклады:

а) Ягнец Божы, **Які** адпускае грахі свету, змілуйся над намі [*не* **Каторы** *адпускаеш*].

б) Дух Святы, **Які** сышоў на Апосталаў [*не* **Каторы** *сышоў*]...

в) Ісус Хрыстос, **Які** жыве і валадарыць на векі вечныя [*не* **Каторы** *жыве і валадарыць*]...

г) **Які** сядзіць па правы бок ад Айца... (Хвала на вышынях Богу)... [*не* **Каторы** *сядзіць*].

д) **Які** быў зачаты ад Духа Святога... (Верую ў Бога)... [*не* **Каторы** *быў зачаты*]... і інш.

Каторы — займеннік, паводле лексічнага значэння бывае:

1) **Пытальны**:

а) які іменна, які з некалькіх: **Каторы** *агрэгат пойдзе першы*;

б) які па парадку пры падліку: *А ты ў* **каторы** *клас хадзіў?* [*не ў* **які** *клас?*].

2) **Неазначальны**:

а) не першы, не адзін: *Люба вось ужо* **каторы** *год вучыцца ў гімназіі*;

б) паасобныя, некаторыя: **Каторыя** *мужчыны дык хадзілі глядзець тую канаву* [*не* **якія** *мужчыны*];

в) які-небудзь:

У гадах жанчына, а наўрад ці ўгоніцца за ёю **каторы** *малады*.

У польскай мове **który** — у беларускай мове **які** [*не* **каторы**],

каторы — гэта літаральны пераклад-калька з польскай мовы.

Dom, w **którym** mieszkam, stoi nad rzeką — *Дом*, у **якім** *я жыву* [*не ў* ***каторым*** *з іх*], *стаіць над ракой*.

Каторы: **która** godzina? — **каторая** гадзіна (пытальны займеннік — які іменна, які з некалькіх). Jaki — які: **Jakie** piękne miasto — **які** *прыгожы горад* [*не* **каторы**?].

Ужыванне займенніка **каторы** ў ролі злучальнага слова ў значэнні **які** з'яўляецца адначасова русізмам і паланізмам.

Лічым, што ўжо даўно настала пара захоўваць і правільна выкарыстоўваць беларускую лексіку і граматычны лад мовы.

➤ **4.** Ойча наш, Які ёсць **на небе** =/= [*не*] **у небе**...

На — прыназоўнік. Адно з яго значэнняў — месца ці прадмет, на якім (на паверхні якога) знаходзіцца хто- або што-небудзь ці адбываецца якое дзеянне.

Гасподзь Бог **на небе**. ...Иже еси **на небеси**... [*не*] **в небеси.**

Гасподзь Бог не ў чымсьці, а па-над усім, па-над вякамі і вечнасцю. Ён усё ахінае Сваёй адвечнай любоўю і праўдай і ёсць па-над усім бачным і нябачным.

Гасподзь Бог не можа быць абмежаваны небам. Паслухай:

*«У пачатку стварыў Бог **неба і зямлю**»* (Быц 1, 1).

Паўстае пытанне: а дзе тады знаходзіўся Усявышні да стварэння неба і зямлі, калі кажам, што Ён знаходзіцца **ў небе**?

Гасподзь узвышаны над народамі ўсімі,
*Яго слава сягае **па-над нябёсамі**.*
Хто ж, як не наш Гасподзь Бог,
мае сядзібу на вышынях,
Хто ўніз пазірае
на неба і на зямлю? (Пс 113, 4-6).

«У» — прыназоўнік. Ужываецца пры называнні асяроддзя, у якім хто- ці што-небудзь знаходзіцца, што-небудзь адбываецца.

Калі што-небудзь знаходзіцца ўсярэдзіне, у асяроддзі, яно абмежавана тым асяроддзем:

Тапаліны пух лётае **ў паветры.**
Патануць **у вадзе.**
Самалёт ляціць **у небе** =/= [*не*] **на небе.**
Птушкі ляцяць **у небе**... *нябёсах*; =/= [*не*] **на нябёсах.**

Калі штосьці знаходзіцца ў чымсьці, у якім-небудзь асяроддзі, яно абмежаванае, набірае форму абмежа-

ванасці, напрыклад, вада ў бутэльцы, цеста ў форме. Што датычыцца разважанняў пра бязмежную Веліч Усемагутнага Бога, Творцы **неба** і **зямлі**, усяго **бачнага** і **нябачнага**, Гасподзь Бог не можа быць абмежаваны небам, закрыты ў ім. Калі Ён яго стварыў, Ён панад усім небам і ва ўсім. Па-за Богам нічога няма, а Ён усюды прысутны.

Ісус Хрыстос Уваскрэс і ўзнёсся **на неба**... =/= [*а не* **ў неба**, у яго сярэдзіну].

Па-над Богам і па-за Богам нічога няма і не можа быць... Ён **Усявышні, Усемагутны, Усепрысутны, Усяўладны.**

Гасподзь Бог не **ў чымсьці**, Ён **па-над** усім і ўсюды, праз Якога абсалютна ўсё сталася, створана.

➤ **5.** Ойча наш... прыйдзі **Валадарства** Тваё...
Магутны Божа, **Ўладар** *сусветаў*... Арсеньева.

Словы *валадар* і *уладар* па сваім лексічным значэнні роўныя. Гэта пацвярджаюць нарматыўныя «Слоўнік беларускай мовы» пад рэдакцыяй акадэміка М. В. Бірылы (с. 127 і с. 818), а таксама пяцітомны «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» пад рэдакцыяй акадэміка К. К. Атраховіча (т. I, с. 455 і т. 5, кн. 2, с. 7). Напісанне слова **ўладар** з ў пасля коскі ў паэзіі дапускаецца.

Усім усходнеславянскім мовам характэрна поўнагалоснае спалучэнне **-оло-, -оро-, -ере-**. Спалучэнні — **-ла-, -ра-, -ре-, -ря-** характэрны паўднёваславянскім мовам:

валасы *(бел.)*,	**волосы** *(рус.)*,	**власы** *(балг.)*;
горад *(бел.)*,	**город** *(рус.)*,	**град** *(балг.)*;
бераг *(бел.)*,	**берег** *(рус.)*,	**бряг** *(балг.)*.

У рускай літаратурнай мове стараславянізмы вельмі распаўсюджаны, яны ствараюць цэлы лексічны пласт, які характэрны для высокага стылю.

А па-беларуску скажам:

Валадар — па-над усімі. **Гасподзь Бог валадарыць** спрадвеку.

Гасподзь Бог валадарыць вечна па-над усім і ўсімі з вышыняў нябесных, і Яму няма падобнага.

➤ **6.** Ойча наш... як **на небе** так і на зямлі... =/= [*не*] як **у небе.**

Калі валадарыць **на небе,** тады валадарыць і ў небе, і на зямлі, і пад зямлёю... як на небе, так і **на зямлі** =/= [*не*] у **зямлі.**

Калі чалавек-гаспадар на зямлі (як дзяржава, краіна), тады ён гаспадар і пад зямлёю, унутры, а менавіта: гаспадар шахтаў, мінералаў, нафты, мінеральных вод і інш.

➤ **7.** Ойча наш... **Хлеб наш штодзённы** дай нам сёння... =/= [*не*] **хлеба нашага штодзённага.**

Дзеяслоў **даць** кіруе назоўнікам, патрабуе, каб назоўнік стаяў у вінавальным склоне: прынесці добры ўраджай, плён. Ужыванне ў дадзеным сказе слова **хлеб** у форме роднага склону (хлеба нашага) будзе абазначаць не **хлеб** як сродак існавання, а як частку ад цэлага. Напрыклад, узяць са склада адну булку хлеба. Тады значэнне становіцца вельмі канкрэтным, звужаным, матэрыяльным і немагчымым.

Неба гатовага хлеба ці булак не дае, не выдае.

Каля хлеба, які расце пшаніцаю ў полі, трэба яшчэ многа папрацаваць. Манна ў пустыні для народа абра-

нага каштавала 40-гадовага посту ў вандраванні ад егіпецкага рабства да зямлі абяцанай, да свабоды.

Хлеб Еўхарыстычны, Святая Камунія таксама арганізуюць і мабілізуюць нас і наш дух веры на добрыя ўчынкі хрысціянскага жыцця, вытрываласць у добрым на ўсёй жыццёвай дарозе да неба.

...Хлеб наш насущный дай нам днесь... =/= [*не*] **Хлеба нашего насущного дай нам днесь...**

Мы просім **хлеб — Дар** Божы, а не булку **хлеба** гатовага — падаянне-міласціну — хлеба нашага штодзённага.

Хлеб-ежу трэба здабыць, трэба зарабіць у поце чала.

Зарабляюць **на хлеб**-пражыццё, а не на **булку хлеба**, якую трымаеш у руцэ, а мог купіць каўбасу, цукеркі, адзежу, машыну, лекі, кватэру, раздаць бедным, ахвяраваць на Святую Імшу аб здароўі ці за памерлых родных і сваякоў.

Малітва да Бога азначае не што іншае, як: дай нам розум, добрую волю, сілы, здароўе, каб мы былі паслухмяныя Тваім натхненнем і паводзілі сябе паводле Тваёй святой волі. Таму, хто просіць, Бог дапамагае, каб мы добрай і сумленнай працай пракармілі сябе, сям'ю і народ.

На хлеб — у дадзеным выпадку мае значэнне **існавання**, каб жыць паўнацэнным жыццём на зямлі.

Хлеб для ўсіх нас, дарослых і малых, здаровых і хворых, бедных і багатых. Каб адны не ленаваліся працаваць, а іншыя, маючы сумленне, дзяліліся з бліжнім хлебам — міласэрнасцю, якая бярэ пачатак з веры, каб іншыя былі ўдзячныя і маліліся за дабрачынцаў.

Хлеб духоўны, а менавіта малітва, вера, сумленнасць і добрыя ўчынкі спрыяюць з'яўленню хлеба штодзённага на стале для сям'і.

Чалавек, які мае веру і любоў да Бога і бліжняга, дзякуючы гэтаму духоўнаму хлебу і веры, ужо жыве ў Богу і дзейнічае для свайго збаўлення.

➤ **8.** Ойча наш... **збаў** нас ад злога. =/= [*не*] **захавай** нас ад злога.

Ісус Хрыстос — **Збаўца** свету... =/= [*не*] **Захаваўца** свету... =/= [*не*] **Выбаўца** свету.

Збавіць — гэта назаўсёды і ад усяго, на вякі ад пекла і смерці. Такая вялікая моц і сіла належыць толькі Госпаду Богу.

Захаваць можна толькі на нейкі час, нават найдаўжэйшы, але гэта толькі працяг пэўнага часу.

Выбавіць можна ад чагосьці, ад небяспекі часовай, ад агню, пажару, палону, але не назаўсёды, а толькі пры часовым жыцці.

➤ **9.** Ойча наш... збаў нас **ад злога** ... =/= [*не*] **ад ліхога.**

Ліхое — гэта страх, пужала, людская фантазія ў байках. **Злы дух** — ёсць злы дух, д'ябал, сатана.

*Хворых аздараўляйце, пракажоных ачышчайце, памерлых уваскрашайце, **злых духаў*** [*не ліхіх духаў*] *выганяйце,* — настаўляе Апосталаў Сын Божы, а наш Збаўца Ісус Хрыстос (Мф 10, 8).

➤ **10. Вітана будзь, Марыя...** =/= [не] **Вітай, Марыя**
=/= [не] **Завітай, Марыя**
=/= [не] **Прывітана будзь, Марыя.**

Граматычна правільна ў дадзеным малітоўным тэксце будзе толькі першая фраза, іншыя тры не пасуюць, хіба толькі ў спевах, народных песнапеннях.

➤ **11.** Вітана будзь, Марыя...
Ласкі поўная =/= [не] **Благадаці** поўная;
[не] **Мілаты** поўная.

Благодать — рускае слова і азначае: 1) раскоша, любата, харство; **какая благодать!** якая раскоша (любата)! якое харство; 2) *рэл.* Боская Ласка, Дар Божы. Таму правільна скажам так: ... Марыя, **Ласкі** поўная.

➤ **12.** Вітана будзь, Марыя... **Гасподзь** з Табою =/= [не] **Пан** з Табою. **Гасподзь Бог. Госпадзі Божа! Госпада Бога!**

Варта памятаць, што **Гасподзь** — адна з назваў Бога ў хрысціянскай рэлігіі. Пра гэта можна прачытаць у пяцітомным «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» (т. 2, с. 38). Для выказвання здзіўлення, нецярпення і пад. існуе выраз: **Не дай Гасподзь!** Слова **Гасподзь** можна знайсці і ў «Слоўніку беларускай мовы» (с. 177), а таксама ў руска-беларускім слоўніку (т. I, с. 327). Іншых форм слова *Гасподзь* у даведачнай літаратуры, у тым ліку ў гістарычным і этымалагічным слоўніках, не зафіксавана.

Праўда, існуе ў літургічных тэкстах і варыянт — Госпад.

Ён узнік у 90-х гадах у гутарковай мове хутчэй за ўсё пад уплывам польскай мовы (націск падае на перадапошні склад), перанесены ў літургічныя тэксты, у тэксты духоўных песень.

Галоўнае цяпер, каб вучоныя маглі даць правільную ацэнку гэтай з'яве.

У беларускай лексікаграфічнай літаратуры занатаваны цікавыя звесткі:

Другі том «Слоўніка іншамоўных слоў» А. М. Булыкі (с. 154) падае:

ПАН (польск. pan) — 1) памешчык у дарэвалюцыйнай Беларусі, а таксама гаспадар, начальнік у адносінах да прыслугі, падначаленых; 2) форма ветлівага звароту ў Польшчы, а ў Беларусі — форма звароту да грамадзян іншых краін.

Можна адзначыць, што *ў сілу пэўных гістарычных умоў* у нашай краіне слова *пан* можа мець адмоўную экспрэсіўную афарбоўку. Гэта шырока адзначана ў вуснай народнай творчасці і мастацкай літаратуры.

Але, між іншым, гэта не адбіваецца, не павінна адбівацца на адносінах паміж Беларуссю і Польшчай і іх народамі, тым больш, што гэтыя краіны былі адзінай дзяржавай, дзе было намнога больш добрага, чым дрэннага.

ПАННА. «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» (т. 3, с. 669) паведамляе наступнае:

ПАННА. 1. Незамужняя дачка пана. 2. Маладая дзяўчына, якая належала да прывілеяваных пластоў грамадства ў дарэвалюцыйны час. *Панна Ядвіся выглядала вельмі цікаваю і прыгожаю.* Я. Колас. 3. Форма ветлівага звароту да маладой дзяўчыны, а таксама

форма ветлівага ўпамінання маладой дзяўчыны, якая належала да прывілеяваных пластоў грамадства. *Не гневайся, панна старастоўна, з песні слова не выкінеш.* К. Крапіва.

Што датычыцца спалучэння **Панна Марыя** ў адносінах да Багародзіцы, то такога ў беларускай мове не існавала, і ні ў якіх літаратурных крыніцах не зафіксавана. Таму мы гаворым так: **Дзева Марыя**. Гэта пацвярджаюць шматлікія крыніцы, подпісы да ілюстрацый, напрыклад:

1. «Беларуская энцыклапедыя» ў 18-ці т., т. 3, с. 107: *Берастаўцкі касцёл Візітацыі* **Дзевы Марыі**.

2. Тое ж выданне, т. 6, с. 517: *Касцёл* **Дзевы Марыі** *ў Гданьску.* 1343—1502.

3. Тое ж выданне, т. 9, с. 322: *Ліхтар касцёла Ушэсця Найсвяцейшай* **Дзевы Марыі** *ў в. Адэльск Гродзенскага раёна.*

4. Энцыклапедыя «Вялікае княства Літоўскае», т. I, с. 473: *Касцёл Візітацыі* **Дзевы Марыі**.

5. Тое ж выданне, с. 432. *Касцёл Унебаўзяцця* **Дзевы Марыі**.

6. Энцыклапедычны даведнік «Архітэктура Беларусі», с. 22: *Званіца перад касцёлам Успення* **Дзевы Марыі** *ў Пінску.*

8. Кніга «Архітэктура Беларусі», т. I, с. 229: *Касцёл Узнясення (нон сэнс)* **Дзевы Марыі**. *Коўна. План і агульны выгляд.*

Праўда, у літаратуры мы знаходзім і іншыя запісы, напр., «Беларуская энцыклапедыя», т. 7, с. 192: *Іканапіс.* **Мадонна** *з маленькім Ісусам. Канстанцінопаль. 1200.* Або тут жа яшчэ: *Тадэа ды Бартала.* **Мадонна** *з дзіцем. XV ст. Італія.*

А якое лексічнае значэнне мае слова **Мадонна**?

А.М. Булыка ў «Слоўніку іншамоўных слоў», т. 2, с. 8, тлумачыць так:

МАДОННА (іт. *madonna*) — 1) старадаўні зварот да жанчыны ў Італіі; 2) Божая Маці, Багародзіца ў каталікаў і яе выява ў скульптуры і жывапісе; 3) *перан.* жанчына, якая ўяўляецца ўвасабленнем прыгажосці, пакорнасці і нявіннасці.

Прыкладна такія ж запісы ў «Этымалагічным слоўніку беларускай мовы», т. 6, с. 156 і ў «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы», т. 3, с. 81. Гэтае ж слова зафіксавана ў «Слоўніку беларускай мовы» пад рэд. М. В. Бірылы, с. 371, а таксама ў руска-беларускім слоўніку, т. 2, с. 16, і інш.

Такім чынам, калі мы будзем звяртацца да Багародзіцы, то скажам: **Дзева Марыя**. Пры паведамленні пра Яе або пры тлумачэнні да іконы ці скульптуры з Яе выявай, скажам: **Мадонна**, але, на наш погляд, не Панна. Хіба толькі слова Панна пачуем у ранейшых песнях, перакладзеных з польскай мовы, ці прачытаем тэксты ранейшых выданняў.

Адзначым, што ёсць малітоўная традыцыя, калі святары, вернікі гавораць пра Маці Божую са словамі **Панна Марыя**. Таму не толькі ў гутарковай мове, але і ў касцельных тэкстах яно ёсць і будзе яшчэ нейкі час заставацца як варыянт. Але хацелася б, каб маладыя беларусы-каталікі задумаліся над сказаным вышэй: **Дзева Марыя** — **Панна Марыя**, паколькі са словам **Дзева** мы гаворым толькі пра Святую Багародзіцу, звяртаемся да Яе. А са словам **панна** гаворка можа ісці пра любую незамужнюю дзяўчыну: панна Алена, панна Марыя, панна Ірына, панна Наталля, панна Тэрэза і інш.

Вельмі хочам пачуць, што на гэты конт скажуць вучоныя — знаўцы гісторыі беларускай мовы, культуры мовы, стылістыкі?

Праўда, калі ў жыцці звяртаемся да чалавека са словамі — **шаноўны пан (шаноўная пані)**, то ў гэтым нічога дрэннага няма. Але ў беларусаў усё-такі ёсць выдатнае слова ветлівага звароту **спадар (спадарыня)**.

➤ **13.** Вітана будзь, Марыя...Гасподзь з Табою, **Бласлаўлёна** Ты, =/= [не] **Дабраслаўлёна.**

Прапануем паглядзець, як адлюстраваны ў нарматыўных беларускіх слоўніках лексемы з першай часткай **блага-** і якое яны маюць значэнне.

І. Возьмем «Слоўнік беларускай мовы» пад рэд. М. В. Бірылы. На с. 113 чытаем: **Благавешчанне, Благавешчанскі; благаславенне** і **бласлаўленне; благаславенны** і **бласлаўленны; благаславёны** і **бласлаўлёны; благаславіць** і **бласлаўляць**.

ІІ. «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» пад рэд. К. К. Атраховіча, т. І, адзначае:

Благавешчанне — адно з веснавых хрысціянскіх свят (с. 381).

Благавешчанскі — які мае адносіны да Благавешчання (с. 381).

Благаславенне — дзеянне паводле значэння дзеясловаў *благаслаўляць — благаславіць* (с. 381).

Бласлаўленне — дзеянне паводле значэння дзеясловаў *бласлаўляць — бласлаўляць* (с. 384).

Бласлаўленне — дзеянне паводле значэння дзеясловаў *бласлаўляць — бласлаўляць* (с. 384).

Благаславенны — варты благаслаўлення, падзякі, хвалы (с. 381).

Благаславёны — 1) дзеепрыметнік ад дзеяслова *благаславіць*; 2) тое, што і *благаславенны* (с. 381).

Бласлаўенны — дзеепрыметнік ад дзеяслова *бласлаўіць* (с. 384).

Благаславіць — 1) перахрысціць каго-небудзь са словамі малітвы, з пажаданнем удачы, шчасця;

2) ухваліўшы, накіраваць на што-небудзь; ухваліць, даць згоду на што-небудзь. *Калі ж, палаючы ў агні, мяне Радзіма пазвала ў паход у грозны час, — На подзвігі яна благаславіла І матчын аддала мне свой наказ.* А. Русак.

Блаславіць — тое, што *благаславіць. Ксёндз паклаў... [Баляславу] рукі на галаву і блаславіў яго.* К. Чорны.

III. «Русско-белорусский словарь» пад рэдакцыяй Я. Коласа, К. Крапівы, П. Глебкі (Мн., 1993). Чытаем словы:

Благовещение *церк.* — Благавешчанне (с. 105).

Благовещенский — Благавешчанскі (с. 105).

Благословение *в разн. знач.* — благаславенне (с. 107).

Благословенный — благаславенны, благаславёны (с. 107).

Благословить *в разн. знач.* — благаславіць (с. 107).

Давайце пабачым, як гэтыя словы адлюстраваны ў даведачнай, навукова-папулярнай літаратуры.

I. «Беларуская энцыклапедыя» ў 18-ці т. Прачытаем наступныя подпісы да ілюстрацый:

1) *Віцебская* **Благавешчанская** *царква* (т. 4, с. 217);

2) *Л. Кавалінi. Мазаіка «***Благавешчанне***» ў царкве Санта-Марыя ін Транстэверэ ў Рыме. Каля 1291 г.* (т. 7, с. 396).

II. Энцыклапедычны даведнік «Францыск Скарына і яго час». Чытаем подпіс пад ілюстрацыяй: *«Рэшткі*

Віцебскай **Благавешчанскай** *царквы пасля кансервацыі»* (с. 285).

III. Церашчатава В. В. «Старажытнабеларускі манументальны жывапіс XI—XVIII стст.» У адным з подпісаў (с. 134) заўважаем: *Фрагмент фрэскі з кампазіцыі «***Благавешчанне***». Каталіцкі касцёл у Мсціславе. Другая палова XVII ст. — пачатак XVIII ст.*

Можам бачыць і слова **Дабравешчанне**. У тым жа 18-томным выданні «Беларускай энцыклапедыі» заўважаем:

1. *Ф. дэль Коса.* **Дабравешчанне**. *Каля 1473 г.* (т. 8, с. 427).

2. *Л. Лота.* **Дабравешчанне**. *Каля 1527 г.* (т. 9, с. 350).

3. *Лядоўскі манастыр* **Дабравешчання** (у гэтай жа кнізе, с. 419).

4. *Харкаў.* **Дабравешчанскі** *сабор* (т. 16, с. 548).

Ужываецца і назва свята **Звеставанне**. Напрыклад, у кнізе «Архітэктура Беларусі», т. 2, на с. 202, ёсць да малюнка такі подпіс: *Касцёл* **Звеставання** *Дзеве Марыі.*

Такім чынам, назвы **Благавешчанне, Дабравешчанне, Звеставанне** маюць роўныя правы на ўжыванне ў хрысціянскіх храмах.

Але подпіс пад малюнкамі яшчэ не гарантуе, не дае права на ўжыванне ў касцельна-царкоўнай тэрміналогіі. Падпісваць можа кожны, але як? Гледзячы на мноства варыянтаў тых ці іншых царкоўных выразаў свецкімі, міжвольна пераконваешся, што беларуская царкоўна-кананічная лексіка была ў заняпадзе і доўгі час без уплыву на свецкую тэрміналогію.

Таму правільна скажам так: **Звеставанне Найсвяцейшай Дзеве Марыі.**

А цяпер давайце зробім экскурс у глыбіню стагоддзяў і пабачым, адкуль бяруцца карані да слоў з часткай **блага-**.

Звернемся да «Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы», (т. I, с. 335).

Благаслаўляць, рускае *благословлять*, украінскае *благословити* і г. д. Усё запазычана са старажытнаславянскай мовы — **благословити**, якое з'яўляецца калькай з грэчаскай. У народнай гутарковай мове ёсць розныя скарачэнні: *блаславіць, бласлаўляць.*

Ёсць яшчэ і слова **благі** і азначае *дрэнны, худы.* Рускае *благой — дрэнны*; украінскае *благий* — дрэнны, стары, бедны, слабы; польскае *błahy — малы, нязначны.* Ёсць некалькі этымалогій:

1) усходнеславянскае *благъ — дрэнны* запазычана са старажытнаславянскага *благъ — добры.* Значэнне *дрэнны-бедны* і г. д. развілося як вынік табуістычнага словаўжывання;

2) усходнеславянскае *благъ — дрэнны* да праславянскага *blagъ — дрэнны, слабы*, якое быццам роднаснае з лацінскім *flaccus — слабенькі*, з грэчаскім .... — *вялы, расслаблены.* Трэба адрозніваць праславянскія *bolgъ — добры* і *blagъ — дрэнны.* Да *благі* адносіцца і дзеяслоў *блажэць* — худзець. Некаторыя даследчыкі лічаць, што для *благі — дрэнны* існуе дакладная адпаведнасць — літоўскае слова *blagnas.*

Таму скажам так: ...**Бласлаўлёна** Ты між жанчынамі.

➤ **14.** Вітана будзь, Марыя... Гасподзь з Табою,
Бласлаўлёна Ты... =/= [не] **Дабрадатная.**
Слова **Дабрадатная** мае зусім іншы сэнс і значэнне.

У малітвах мы заўсёды молімся: **Найсвяцейшая Дзева Марыя, Багародзіца, маліся за нас!...**

Верую ў Бога

У беларускай мове ёсць 2 словы: **верыць** і **вераваць**.

Верыць — значыць: 1) быць цвёрда перакананым, упэўненым у чым-небудзь: *Веру ў перамогу;* 2) лічыць верагодным: *Верыць у сны і прыкметы;* 3) давяраць каму-небудзь: *Васіль верыў ёй.*

Вераваць — значыць мець пэўныя рэлігійныя погляды, уяўленні, прымаць змест, сутнасць той ці іншай рэлігіі. Ёсць да гэтага слова і аднакарэннае — **вераванне**. **Вераванне** — гэта рэлігійныя погляды: *Вераванні старажытных славян.*

Такім чынам, абодва словы **верыць і вераваць** блізкія паводле свайго лексічнага значэння, але ўсё-такі больш правільна сказаць:

Верую ў Бога Айца Усемагутнага... =/= [не] **Веру ў Бога...**

➤ **15.** Верую ў Бога Айца Усемагутнага, **Творцу** неба і зямлі... =/= [не] **Стварыцеля** неба і зямлі... **Stworzyciela** *(паланізм).*

Слова **Стварыцель** у беларускай мове няма. Слова «Стварыцель», калі яно адносіцца да Госпада Бога, то мае неканкрэтнае значэнне, гэта значыць, прыніжае годнасць Бога. Таму немэтазгодна яго ўжываць у дачыненні да Госпада Бога.

Творца стварае, Ён з нічога прызваў да існавання ўсё бачнае і нябачнае, Яго адзіная бязмежная святая воля. Чалавек **стварае** што-небудзь з гатовага матэрыялу праз вытворчасць, дзякуючы абставінам, магчымасцям і здольнасцям.

Гасподзь Бог **Творца** ўсяго бачнага, велічнага, матэрыяльнага Сусвету і нябачнага, духоўнага. Гасподзь Бог — гэта **Творца**, Вечны, Валадар усяго і заўсёды.

➤ **16.** Верую ў Бога Айца Усемагутнага... і ў Ісуса Хрыста, Які стаў

Чалавекам... =/= [не] **целам**...

Учалавечанне =/= [не] **Уцелаўленне** (Уцяленне).

Ісус стаў чалавекам — **Учалавечанне.**

Прыняў **цела** з Дзевы Марыі і стаў чалавекам.

➤ **17.** Трэцяга дня **ўваскрэс**... =/= [не] **змёртвыхпаўстаў** *(паланізм)*.

Уваскрашэнне, уваскрэсенне

=/= [не] **Змёртвыхпаўстанне.**

З-мёртвых-паўстанне — гэта штучна створанае слова, варварызм.

Варварызм — гэта запазычанае ці створанае па ўзоры якой-небудзь іншай мовы слова або выраз. **У дадзеным выпадку — гэта словаўтваральны варварызм.** Узята польскае слова «**Zmartwychwstanie**» і перакладзена па частках на беларускую мову. Такое слова не фіксуецца ніводным слоўнікам беларускай літаратурнай мовы.

У беларускай мове няма падобных словаўтваральных мадэляў. Ёсць канкрэтныя беларускія словы **уваскрашэнне** і **уваскрэсенне.**

Цяпер разгледзім гэтыя лексемы падрабязна.

Уваскрэсенне — значыць вяртанне мёртвых да жыцця.

Уваскрашэнне — абазначае дзеянне паводле значэння дзеясловаў **уваскрэсіць** і **уваскрашаць.**

Уваскрэсіць (што зрабіць?) — *вярнуць* да жыцця таго, хто памёр, *ажывіць.*

Уваскрашаць (што рабіць?) — *вяртаць* да жыцця таго, хто памёр, *ажыўляць.*

Як бачым, словы **уваскрэсіць** (што зрабіць?) і **уваскрашаць** (што рабіць?) адрозніваюцца толькі граматычнай формай трывання, закончанага і незакончанага, і ўтвараюць адну суадносную пару. Дзеяслоў незакончанага трывання **уваскрашаць** (што рабіць?) утвораны ад дзеяслова закончанага трывання **уваскрэсіць** (што зрабіць?) пры дапамозе суфікса -а-, прычым адбываецца чаргаванне гукаў.

Ёсць яшчэ дзеяслоў **уваскрэснуць**. Менавіта ад асновы інфінітыва гэтага дзеяслова (аснову выдзелім: **у-васкрэс**-ну-ць) утворана форма прошлага часу **уваскрэс**. Таму мы гаворым так: **Хрыстос Уваскрэс!** І пажадана ў гэтым сказе ні аднаго слова не скажаць. Не перайначваць, як гэта часам робяць людзі, якія не ведаюць граматычнага ладу сучаснай беларускай мовы, а вымаўляць правільна, бо гэты выраз нясе надзвычай вялікую інфармацыю, Божую сілу, надзею на выратаванне чалавецтва. Таму мы яшчэ раз скажам: **Хрыстос Уваскрэс!**

➤ **18.** Абвяшчаем смерць Тваю, Госпадзі, вызнаём Тваё Уваскрэсенне і чакаем Твайго **прышэсця** ў славе. =/= [не] **прыйсця**.

Госпадзі, калі гэта настане і які будзе знак Твайго ***прышэсця*** *і сканчэння свету* (Мф 24, 3)?

Слова **прышэсце** ў адносінах да Ісуса Хрыста, Сына Божага, Які ў Сваім апошнім **прышэсці** прыйдзе судзіць жывых і памерлых, больш актуальнае і больш пасуе, чым слова **прыйсце**.

Пришествие Господне.

Слова **прыйсце** спрошчвае, прыніжае веліч і ўрачыстасць Хрыстовага **прышэсця**.

➤ **19.** Верую…ў Касцёл **Каталіцкі**... =/= [гэта не азначае] у Касцёл «**Польскі**». Ёсць Праваслаўная Царква, а не Руская Царква.

Мы не можам сказаць: **Польскі Каталіцкі Касцёл.**

Як і не вельмі правільна гучыць:

Руская Правослаўная Царква.

А трэба гаварыць:

Каталіцкі Касцёл у Польшчы, Італіі, Японіі...

Праваслаўная Царква ў Расіі, Польшчы, Канадзе...

Бо інакш губляецца ўвесь сэнс Усяленскасці, а прывязваем толькі да канкрэтнага рэгіёна, краіны. Тады гэта ўжо не Апостальскі Усяленскі Касцёл і Царква, а штосьці падобнае на сектанцкі збор, які стварае «сваю» абмежаваную царкву і што толькі ў ёй збаўленне.

Грэчаскае слова **Katholikos** абазначае Каталіцкі, Паўсюдны, Сусветны, **Вселенский**. Ва ўсім свеце ў грэчаскіх храмах Усходняга абраду так і моляцца і называюць **Catholica — Katholikos**.

Каталіцызм (с.-лац. catholicismus, ад гр. katholikos — галоўны, усеагульны). *(Б. Сл. інш. слоў., т. I, с. 630).* Калі нехта называе ў нас, у Беларусі, Каталіцкі Паўсюдны Касцёл **польскім,** а вернікаў-каталікоў **палякамі,** то тады выходзіць, што ўсе краіны свету і народы *(італьянцы, англічане, рускія, японцы, латышы...)* **таксама палякі.** Што ж тады пра такога «светлага» агітатара, духоўнага прапаведніка ці дзяржаўнага мужа можна сказаць? Непісьменны або хітры, як сатана, і становіцца *опиумом для народа. Разделяй и властвуй!*

А Сам Ісус Хрыстос пра такіх кажа: *Сцеражыцеся ілжывых прарокаў, якія прыходзяць да вас у авечай скуры, а ўнутры яны — ваўкі драпежныя* (Мф 7, 15).

Я ведаю, што пасля Майго адыходу ўвойдуць да вас драпежныя ваўкі, якія не пашкадуюць статка (Дзн 20, 29).

Ісус Хрыстос, Сын Божы, а наш Збаўца, заснаваў Святую Каталіцкую Сусветную Усяленскую Царкву на фундаменце Апосталаў толькі для еднасці народаў і іх збаўлення, кажучы:

*Ідзіце па **ўсім свеце** і прапаведуйце Евангелле **ўсяка**му **стварэнню!*** (Мк 16, 15).

Хрыстовы Касцёл-Царква — па-над усімі нацыямі, народамі і нацыянальнасцямі, па-над усімі палітыкамі, ён не ведае межаў і часу.

А як ты разумееш гэтыя словы Хрыста?

Гэта заданне і пасланніцтва **Паўсюднага Каталіцкага і Усяленскага (CATHOLICA) Касцёла-Царквы** абазначае: *Дык ідзіце і навучайце **ўсе народы**, хрысціце іх у імя Айца, і Сына, і Святога Духа* (Мф 28, 19). Як бачым, Ісус Хрыстос заснаваў Касцёл-Царкву ў Іерусаліме, на Тайнай Вячэры і на Галгофе, а не ў польскай Варшаве.

➤ **20. Узнясенне** =/= [не] **У неба ўшэсце,** гэта няўдалы пераклад *(кампіляцыя трох слоў).*

Ісус Хрыстос **узнёсся на неба.**

Узнясенне Гасподняе!

Калі ёсць велічнае беларускае слова **Узнясенне**, тады навошта гэтыя прыдумванні?

➤ **21. Велікоднікі** і **валачобнікі** — словы-сінонімы, лепш — **велікоднікі.**

Велікоднікі — гэта людзі, дзеці і моладзь, якія ў Велікодныя святы наведваюць дамы вернікаў, іграюць, спяваюць песні на хвалу Уваскрэслага Хрыста. Яны таксама вестуны Велікоднай радасці, услаўляюць Вялікдзень. Яны славяць **Веліч Боскага Уваскрэсення.**

Валачобнікі — слова больш простае, яно прыйшло з народнага слоўніка, але і яно мае права на існаванне.

Мы з павагай ставімся да кожнага слова, якое прабівалася праз доўгія стагоддзі, ішло да нас з глыбокай даўніны, асабліва з часоў, калі на нашай зямлі ўсталявалася хрысціянства. Увераваўшы ў Хрыста, Сына Божага, беларусы ўслаўлялі Уваскрэсенне Збаўцы. Гэта зафіксавана ў фальклорных выданнях. Напрыклад, у хрэстаматыі «Беларускі фальклор» (с. 101) можам прачытаць песню «Ідуць, гудуць валачобнікі» (слова **валачобнік** магло вымаўляцца ў розных рэгіёнах краіны па-рознаму).

Наяўнасць слоў **валачобнае** *наз.*, **валачобнік**, **валачобны** пацвярджае «Слоўнік беларускай мовы» пад рэд. М. В. Бірылы (с. 128).

У «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» (т. I, с. 456) зафіксавана:

Валачобнік — песеннік, які ходзіць у велікодныя дні па дварах з віншавальнымі песнямі.

Валачобны — які мае адносіны да валачобнікаў: *Валачобныя песні;* уласцівы валачобніку, такі, як у валачобніка.

Словы **валачобнік, валачобны, валачобнае** падаюць іншыя слоўнікі, напрыклад: «Беларуска-рускі слоўнік» (т. I, с. 456); «Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча» (т. I , с. 273); «Слоўнік гаворак цэнтральных раёнаў Беларусі», (т. I, с. 98); Сцяшковіч Т. Ф. «Слоўнік Гродзенскай вобласці» (с. 77); «Тураўскі слоўнік» (т. I, с. 137), «Гістарычны слоўнік беларускай мовы» (т. 4, с. 149).

А вось якія тлумачэнні дае «Этымалагічны слоўнік беларускай мовы» (т. 2, с. 35—36):

Валачобнік — адзін з групы песняроў, што хадзілі па хатах у велікодныя дні. Гэта слова ёсць ва ўсіх

усходне-славянскіх мовах: рус. *волочебник, волочобник*, укр. *волочиння*. І ўсе маюць адно значэнне: *хаджэнне на Вялікдзень*. Існуе вялікая колькасць варыянтаў гэтай назвы; параўн. *валачэбнік (< валачэба), валачоўнік (< валачоўе), валачоннік (< валачонне), валачыннік (< валачынне). Валачобнік* да *валачыцца* праз *валачоба* — хаджэнне на Вялікдзень.

Валачобно, *валачэўна* — велікоднае яйка. Кароткая субстантываваная форма прыметніка *валачобнае* (*яйка*).

Валачы (*валакці*) — цягнуць, несці. Гэта слова ёсць з тым жа значэннем у такіх мовах, як руская, украінская, польская, верхнелужыцкая, ніжнелужыцкая, чэшская, славацкая, балгарская, македонская, сербскахарвацкая, славенская. Праславянскае слова — ***volčiti***. Гэта слова ёсць у літоўскай і грэчаскай мовах са значэннем *цягнуць*. Праўда, у кожнай мове яно вымаўляецца паводле сваіх арфаэпічных правіл і пішацца ў адпаведнасці са сваімі арфаграфічнымі нормамі.

➤ **22. Вечарнік** і **Вячэрнік**. У лексіконе Каталіцкай Царквы часта сустракаецца слова **Вечарнік** (дом і пакой, у якім Гасподзь Ісус быў на Тайнай Вячэры), але ў беларускай мове такога слова няма.

Ці можна гэта слова ўвесці ў нарматыўную лексіку?

Адзначым, што ёсць слова **Вячэрнік**, яно абазначае: студэнт, які вучыцца вечарам.

➤ **23.** Ягнец Божы, Які адпускаеш грахі свету, адары нас **спакоем.**

=/= [не] **супакоем.**

Слова **супакой** падаецца слоўнікам як сінонім слова **спакой**.

Ураўнаважанасць, фізічнае і душэўнае супакаенне. **Вечны спакой — смерць. Мёртвы спакой, цішыня.**

Глыбока веруючы чалавек, у душы якога пануе ласка і **спакой** Божы, можа добра паўплываць на іншых і **супакоіць** людзей, якія аказаліся ў бядзе. **Супакойся** *ты са сваімі нараканнямі і вярні* **спакой** *у сваё сэрца.*

Слова **супакой** нясе ў сабе дзейнасць і накірунак, а слова **спакой** азначае сталы стан. Калі слова **супакой** азначае **спакой**, тады якім словам суцішыць ці ўтаймаваць, супакоіць распешчаных дзяцей — *супакойся* ці, можа, ёсць якое іншае слова? Адчуйце, як прыніжана гучыць зварот у Святой Літургіі са словам *супакой.*

➤ **24. Спакой Госпада (Божы),** няхай заўсёды будзе з вамі! =/= [не] **супакой Пана,** няхай заўсёды будзе з вамі!

Атрымліваецца так, як быццам спачатку трэба супакоіць, утаймаваць **Госпада** ці **Пана Бога,** і толькі тады Ён будзе з вамі, намі?

Гэты зварот, хутчэй, выглядае здзекам і прыніжэннем Госпада Бога, чым праслаўленнем Яго. *(Тут мая асабістая віна, што даў згоду на ўжыванне формы гэтага слова ды й іншых у 90-х гадах, падрыхтоўваючы малітоўнікі і літургічныя тэксты, але і ў наш час не так проста пераканаць погляды прадстаўнікоў рэгіёнаў. Пакорна прашу прабачэння. Улад. Завальнюк.)*

Перакручаны тэксты і настолькі, што ў такой форме і цяжка палюбіць мову. І нядзіўна, што многія больш схіляюцца да рускай ці польскай мовы, чым роднай беларускай. У гэтых суседніх мовах ты не вельмі будзеш размаўляць ці пісаць, як захочаш, бо абсмяюць і не дапусцяць не тое што на радыё, каб вяшчаць на ўсю Беларусь, але і на сталую казань у Божым храме.

Кожны народ вельмі ганарыцца сваёю моваю і беражэ яе, як зрэнку вока, ты гэта добра ведаеш і адчуваеш. Трэба сумленна вывучаць і карыстацца мовай таго народа, дзе жывеш, працуеш ці служыш як святар. Місіянеры перад тым, як адправіцца ў якую краіну свету, сумленна вывучаюць мову таго народа, а Беларусь — выключэнне, трасянка.

➤ **25.** Праз **Хрыста**, з **Хрыстом** і ў **Хрысце**...=/= [не] Праз **Хрыстуса**,
з **Хрыстусам** і ў **Хрыстусе**, бо гэта паланізмы.

Слоўнік падае:
Хрыстом Богам прашу, =/= [не] **Хрыстусам** Богам.
Як у Хрыста за пазухай, =/= [не] **у Хрыстуса.**
Праз **Хрыста**, Госпада нашага. Амэн.

➤ **26. Хрысце**, пачуй нас, **Хрысце**, выслухай нас. =/= [не] **Хрыстэ**, пачуй нас,
Хрыстэ, выслухай нас.
О Хрысце, Божа наш =/= [не] **О Хрыстусе**, Божа наш.
=/= [не] **О Хрыстэ**, Божа наш.
Беларускай мове характэрна чаргаванне, напраклад: **г—з, к—ц, т—ц**, а таксама тут і ўплыў памякчэння.

Хрыста =/= [не] **Хрыстуса**
Хрысту =/= [не] **Хрыстусу**
З Хрыстом =/= [не] **з Хрыстусам**
О Хрысце! =/= [не] **о Хрыстусе!** =/= [не] **о Хрыстэ!**

А цяпер давайце паглядзім, як называюць Сына Божага ў свецкай літаратуры. Адгорнем 3-ці том «Беларускай энцыклапедыі» і на с. 235 прачытаем: *Статуя* **Хрыста** *на вяршыні ўзгорка Каркаваду ў*

Рыо-дэ-Жанейра. У кнізе «Архітэктура Беларусі» на с. 126 ёсць такі подпіс пад ілюстрацыяй: *Мазаіка* **«Ісус Хрыстос»**. *Сафійскі сабор у Канстанцінопалі*.

У прыгаданай раней хрэстаматыі «Беларускі фальклор», у сцэнарыі для слуцкай батлейкі (с. 502) гаворыцца:

Анёл пастухам з'явіўся
І сказаў, што ***Хрыстос*** *нарадзіўся.*

У «Арфаграфічным слоўніку беларускай мовы» на с. 856 змешчаны такі артыкул:

Хрыстос *рэл.*, Хрыста, Хрысце.

Можна было б прывесці вялікую колькасць прыкладаў з літаратурных крыніц, дзе імя Сына Божага па-беларуску называецца так: **Ісус Хрыстос**, і не інакш.

➤ **27. Звеставанне, Благавешчанне, Дабравешчанне**
Дабравешчанне =/= [не] **Дабравесце.**

Але, на наш погляд, лепш сказаць: **Звеставанне**. І гэта правільна.

Анёл Гасподні **звеставаў** Дзеве Марыі
І пачала ад Духа Святога...

Архангел Гаўрыіл Дзеве Марыі добрую вестку **звеставаў**.

➤ **28.** Анёл, Арханёл, Архангел

Анёл. Слова **Анёл**, што абазначае *пасланец Бога*, прыйшло да нас з грэчаскай (angelos) праз польскую мову (anioł).

Арханёл ці **Архангел**? Слова **Архангел**, што абазначае **Анёл, Ангел** *вышэйшага рангу ў хрысціянскай рэлігіі*, запазычана з грэчаскай мовы (archangelos). Яно трывала ўвайшло ў сучасную беларускую літаратурную мову, зафіксавана ў розных лексікаграфічных працах, слоўніках, напрыклад:

1. «Слоўнік беларускай мовы» пад рэд. М. В. Бірылы, с. 84:

Архангел *рэл.*, -ла, -ле, -лаў.

Архангельскі.

2. «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» ў 5-ці т., т. I, с. 269:

Архангел — у хрысціянскай рэлігіі — Анёл вышэйшага рангу.

3. Тое ж чытаем у «Тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы», с. 66.

4. «Русско-белорусский словарь», т. I, с. 59:

Архангел *церк.* Архангел, -ла, *м.*

Архангельский *церк.* архангельскі.

5. А. М. Булыка. «Слоўнік іншамоўных слоў», т. I, с. 142:

Архангел (грэч. *archangelos*) — Анёл вышэйшага рангу ў хрысціянскай рэлігіі.

Таму ці варта слова *Архангел* мяняць на слова *Арханёл*, штучна ўтворанае з двюх частак, грэчаскай (arch-) і польскай (-anioł), паколькі польская частка ўсё роўна паходзіць з грэчаскай мовы (angelos). Відаць, такія словаўтваральныя эксперыменты ў канфесіянальнай літаратуры з'яўляюцца непажаданымі, тым больш, што слова *Арханёл* ні ў якія слоўнікі не ўключана.

А вось прыклады з выкарыстаннем слова **Архангел**. Ёсць розныя крыніцы ў свецкай літаратуры, напрыклад:

1. «Францыск Скарына і яго час», с. 174. — Загаловак: *Пасляслоўе да «Канона* **Архангелу** *Міхаілу»*.

2. «Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі», т. I, с. 65 (уклейка). — Подпіс: *Абраз* «**Архангел** *Гаўрыіл*».

3. «Архітэктура Беларусі», т. І. — Подпіс да ілюстрацый: *Царква Міхаіла* **Архангела** *ў Сынковічах: галоўны фасад і агульны выгляд* (с. 257) і *Касцёл Міхаіла* **Архангела** *ў Гнезна: агульны выгляд і сучасны галоўны алтар* (с. 276).

4. Церашчатава В. В. «Старажытнабеларускі манументальны жывапіс», с. 64. — Подпіс: **Архангел** *Гаўрыіл. Фрэска капліцы. 1918.*

➤ **29.** Анёл Гасподні... **І Слова** стала целам і жыло сярод нас =/= [не] **А** Слова ...

➤ **30.** Анёл Гасподні... І Слова стала целам і **жыло** сярод нас =/= [не] і **пасялілася** сярод нас.

➤ **31. Гэта** слова Божае. =/= [не] **Вось** слова Божае.

Слова **вось** — у адносінах да прачытанага тэксту Святога Пісання простанароднае.

➤ **32.** Спавядаюся **Богу Усемагутнаму...**
спавядаюся =/= [не] **да Бога Усемагутнага...**
памаліцца =/= [не] да Бога..., [а] **Богу Усемагутнаму**
малюся =/= [не] да Бога..., [а] **Богу Усемагутнаму**
спяваю =/= [не] да Бога..., [а] **Богу Усемагутнаму.**

Калі спавядаюся **Богу Усемагутнаму**.., спяваю **Богу**.., малюся **Богу**, тады чаму ў тэксце сустракаем зварот **памаліцца за мяне да Бога Айца Усемагутнага?**

Я прызнаюся **Госпаду Богу** ў сваіх грахах, спавядаюся ці малюся **Богу**, а звяртаюся да Бога.

Мы звяртаемся да чалавека і просім перадаць нашу просьбу ці пажаданні. А гэта ўжо іншы сэнс: звяртаемся да каго і просім перадаць нешта каму.

Я **звярнуўся да Госпада** з просьбаю і **маліўся Богу** на працягу некалькіх дзён.

➤ 33. Памаліцца за мяне **Госпаду Богу нашаму**
=/= [не] памаліцца за мяне **да Пана Бога нашага.**
Я малюся і спяваю **Богу** на хвалу,...
=/= а [не] **да Бога** на хвалу.
Мы выказваем у малітве **Госпаду Богу** свае беды,
=/= а [не] **да Госпада Бога** свае беды.

➤ 34. **Памолімся** (будучы час), **молімся** (цяперашні час) — гэта граматычныя формы аднаго слова. Слова **памолімся** — гэта заклік да малітвы ў самым пачатку набажэнства і абазначае прызыў вызваліцца ад выканання якіх-небудзь абавязкаў, пакінуць усё на нейкі час і распачаць малітву ці набажэнства.

Перад тым, як распачаць работу, давайце **памолімся** і папросім Божага бласлаўлення. Пасля працы мы **памаліліся** і падзякавалі Богу за здароўе і добрае надвор'е.

Формай **молімся** перадаецца заклік да далейшага малітоўнага чування ў працэсе малітвы ці набажэнства.

Маліцеся, браты і сёстры, каб маю і вашу ахвяру прыняў Бог Айцец Усемагутны [не **памаліцеся**] *(Святая Імша).* Слова з прыстаўкай па- (памаліцеся) абазначае абмежаванасць працягласці дзеяння або няпэўную працягласць і паўторнасць дзеяння.

➤ 35. Гэта **Ягнец** Божы, Які адпускае грахі свету.
=/= [не] Гэта **Баранак** Божы,
=/= [не] Гэта **Ягнё** Божае, Які адпускае грахі свету (Хрыстос Ён, а не Яно).

➤ **36.** Гэта Ягнец Божы, **Які** адпускае грахі свету.
=/= [не] Гэта Ягнец Божы, **Каторы** адпускае грахі свету.

(Параўнай тэкст у малітве Ойча наш... **Каторы** *ёсць на небе...).*

➤ **37.** Гэта Ягнец Божы, Які **адпускае** грахі свету =/=
[не] Гэта Ягнец Божы, Які **даруе,** грахі свету,
[не] Гэта Ягнец Божы, Які **зглажвае,** грахі свету.

➤ **38. Перадайце** бліжняму знак спакою.
=/= [не] **Пажадайце** бліжняму знак спакою.

У адпаведным часе Святой Імшы святар чытае малітву-просьбу аб спакоі, пасля якой **перадае** вымалены спакой Божы прысутнаму ў храме народу, заахвочваючы людзей, каб гэты Дух Божага спакою прынялі самі і **перадалі** ў духу любові і веры бліжнім. Не **пажадаць** спакою, а менавіта **перадаць** другому Дух спакою, Які атрымалі ад Усявышняга праз святара. (Вогненныя языкі падчас Пяцідзесятніцы, Спасланне Святога Духа на Вячэры).

Падчас Святой Літургіі прысутныя атрымліваюць ласку Божую, Дар Божага спакою з вышыняў нябесных праз святара, як і Апосталы атрымалі Дары Духа Святога. Сукцэсія ўскладання рук на кандыдата да святарства і біскупства трывае ад Апостальскіх часоў і да нашых дзён безупынна і непарыўна перадаецца *(дзве тысячы гадоў).* Вера перадаецца ад бацькоў дзецям, унукам праз навучанне і выхаванне.

Жадаць можна ад сябе і сваё, а **перадаць** можна і трэба толькі тое, што ты атрымаў, што табе было дару-

чана ці даверана перадаць другім. Інакш бяда такому чалавеку, святару ці Апосталу, які не выконвае ці не выконваў заданне свайго паклікання. *«Рабіце тое, чаму вы навучыліся, што перанялі, што пачулі і што пабачылі ў мяне, і Бог спакою будзе з вамі»* (Флп 4, 9).

➤ **39. Гасподзь** з вамі. =/= [не] **Пан** з вамі.

Нават на польскай мове **«Pan z wami»** ўжываецца толькі ў касцёле ў Святой Імшы і ўсіх літургічных паслугах. Па-за Святой Імшой у жыцці не вельмі скажаш другому чалавеку:

«**Pan** z tobą, co ty mówisz!»,

а толькі «**Bóg** z tobą, co ty mówisz!»

«Niech **Pan** cię broni!»,

а толькі «Niech **Bóg** cię broni!»

«Broń **Panie,** nie rób tego!»,

а толькі «Broń **Boże,** nie rób tego!»...

«Człowieku, bój się **Pana**!»,

а толькі «Człowieku, bój się **Boga**!»

Так падобна і ў беларускай спольшчанай тэрміналогіі не вельмі скажаш па-за касцёлам гэтае выслоўе са словам **пан.**

На беларускай мове слова **пан** нават у Святыні не вельмі ўспрымаецца, штосьці падобнае ўзнікае, як вышэй сказана, па-за набажэнствам у польскай мове. Таму ў Святыні больш падыходзіць велічнае беларускае слова **Гасподзь** замест **Пан** і тут не павінна быць аніякай абразы ці комплексаў.

Спяваем, молімся і гаворым з верай і ў радасці духу па-беларуску:

Гасподзь з вамі. =/= [не] **Пан** з вамі.

У народзе заўсёды кажуць:

Гасподзь з табой, што ты робіш. =/= [не] **Пан** з табой.

Гасподзь з табой, схамяніся... =/= [не] **Пан** з табой.

Бог табе суддзя. =/= [не] **Пан** табе суддзя і г. д.

➤ **40.** Божа, **зрабі,** =/= [не] Божа **ўчыні.**

Просім Цябе, Божа, прабач правіннасці нашы і **зрабі** нас =/= [не] **учыні** нас дастойнымі Валадарства Нябеснага.

Слова **зрабіў, зрабіць** нясе ў сабе **пазітыўную** дзейнасць.

Слова ж **учыніў** нясе ў сабе значэнне **негатыўнай** дзейнасці. Учыніць на зло, утварыць што-небудзь. *Ён прычыніў яму боль. Што ты ўчыніў?...*

➤ **41. Архібіскуп** ці **Арцыбіскуп?**

Архідыякан =/= [не] **Арцыдыякан.**

Архікатэдра =/= [не] **Арцыкатэдра.**

Архісвятар Мельхіседэк =/= [не] **Арцысвятар...**

ПРА ДАКЛАДНАСЦЬ УЖЫВАННЯ СЛОВА

У кнізе «Агульныя ўводзіны да Рымскага Імшала» (Рым, 2002) паведамляецца, што «выкарыстанне нацыянальнай мовы можа быць вельмі карысным для народа», але «мова павінна быць адпаведная вернікам краіны, узнёслая, літаратурная» (с. 112, § 392).

Адзначым, што ў нашай краіне выдаецца на беларускай мове значная колькасць канфесіянальнай літаратуры, рэгулярна можам чытаць перыядычныя выданні. Але, на вялікі жаль, з мноствам розным памылак — лексічных, граматычных, арфаграфічных, хоць даволі часта ўжытыя словы, іх напісанне і граматычныя нормы зафіксаваны ў афіцыйных нарматыўных слоўніках. Часам здаецца, што людзі хочуць стварыць свае нормы правапісу. Часцей за ўсё гэта датычыцца напісання назваў прадстаўнікоў каталіцкіх ордэнаў, частак літургічнага набажэнства, прадметаў, якія ўжываюцца ў час набажэнства, і інш.

Напрыклад, слова «кадзільніца» і «кадзіла». У «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» (т. 2, с. 572) чытаем артыкул: «**Кадзіла** — металічны сасуд на доўгіх ланцужках, у якім у час набажэнства курыцца **ладан** або іншыя пахучыя рэчывы». У другім артыкуле адзначана, што «**кадзільніца** — тое, што і **кадзіла**». Але ў некаторых выданнях, на жаль, заўважаем няправільнае ўжыванне слова **кадзіла**. Яно выкарыстоўваецца замест слова *ладан*. Таму і выходзіць, што *кадзіла* курыцца ў *кадзільніцы*, а прасцей сказаць — *пасудзіна* курыцца ў *пасудзіне*.

А калі гэта недакладнасць ужыта ў Евангеллі? Яе трэба тэрмінова выпраўляць.

Або возьмем граматычныя формы **пасве́чаны** і **пасвячо́ны**, утвораныя ад дзеясловаў **пасвяці́ць**[1] — асвятляць што-небудзь і **пасвяці́ць**[2] — правесці абрад асвячэння. Таму, калі ідзе размова пра пасвячэнне, г.зн. наданне якому-небудзь прадмету святасці, трэба ўжываць слова **пасвячоны**, як рэкамендуе той жа названы тлумачальны слоўнік (т. 4, с. 71).

Часта можна сустрэць ужыванне мяккага знака ў словах на месцы асімілятыўнай мяккасці (*дзьве, сьвечка, зьляцець* і інш.) Наконт гэтага пажадана памятаць, што ў нас не ўсе словы пішуцца так, як вымаўляюцца. Для вымаўлення і напісання добра распрацаваны свае правілы.

Пажадана яшчэ памятаць, што няправільна ўжыты мяккі знак, або канчатак, або скажона выкарыстанае слова, правільнасць напісання якога даўно ўжо зафіксавана ў афіцыйнай даведачнай літаратуры, — гэта яшчэ не *класіка*, не *класічны правапіс*. Перад класічным правапісам, а дакладней перад людзьмі, якія яго распрацавалі і многія з якіх загінулі пакутніцкай смерцю, мы нізка схіляем свае галовы, за іх трэба маліцца.

Але цяпер, у наш час, неабходна карыстацца тым правапісам, які з'яўляецца афіцыйным, які вывучае наша моладзь у школах, у іншых навучальных установах, правапісам, пра нормы якога можна прачытаць у фундаментальных навуковых працах нашых знакамітых беларускіх мовазнаўцаў.

Такім чынам, у сувязі з разнабоем ва ўжыванні слоў і іх напісаннем, пануючым у нашай вельмі хутка перакладзенай на беларускую мову канфесіянальнай літаратуры, якая патрабуе сур'ёзнай дапрацоўкі, прапануем вам, паважаныя вучоныя і педагогі-практыкі, невялікі слоўнік (дадатак № 6). У яго ўключаны назвы

асоб, якія прымаюць удзел у набажэнствах, назвы частак набажэнства, прадметаў, якія выкарыстоўваюцца ў час Імшы, назвы адзення святара, дыякана, а таксама назвы прадстаўнікоў каталіцкіх ордэнаў і інш.

Шчыра просім выказаць сваё меркаванне наконт гэтых слоў і даць згоду на іх уключэнне ў «Слоўнік беларускай мовы», які ў нас ствараецца. Зоркамі пазначаны словы, якія ўжо зафіксаваны ў афіцыйных лексікаграфічных выданнях.

УЗНЁСЛАЯ БЕЛАРУШЧЫНА, ЦІ ЗАПАЗЫЧАНАЯ ТРАСЯНКА

Давайце задумаемся

➤ **І. Блаславенне, бласлаўленне, благаславенне і блаславенства**

Адзначым адразу, што слова **блаславенства** ў слоўніках не зафіксавана.

Затое ў большасці лексікаграфічных даведнікаў знаходзім словы **блаславенне**, **бласлаўленне** і **благаславенне**. Хоць у «Слоўніку беларускай мовы» (с. 113) аддаецца перавага слову **благаславенне**, аднак у практыцы каталіцкай царквы пастаянна ўжываюцца толькі словы **блаславенне** і **бласлаўленне**. Гэта лічым нармальнай з'явай і наўрад ці трэба тут нешта мяняць.

➤ **ІІ. Веруючы** ці **вернік**?

1. Гартаем «Слоўнік беларускай мовы» пад рэд. М. В. Бірылы. На с. 134 чытаем: **веруючая** *наз.*, **веруючы** *наз.* Слова **вернік** — няма.

2. Тое самае знаходзім у «Беларуска-рускім слоўніку» на с. 480. Слова **вернік** апушчана.

3. Не ўключана слова **вернік** у «Этымалагічны слоўнік беларускай мовы», т. 2. с. 87.

4. У пяцітомным «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы», т. I, с. 480, падаюцца словы **веруючая**, **веруючы**, слова **вернік** на с. 179 — няма.

5. Затое ў «Тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы» пад рэд. М. Р. Судніка і М. Н. Крыўко, на с. 110, ёсць словы **вернік**, **веруючая** і **веруючы**.

6. «Русско-белорусский словарь», т. I, таксама змяшчае пераклад слоў *верующая* на **веруючая**, **верніца** *і верующий* — на **веруючы**, **вернік**.

7. І ў «Гістарычным слоўніку беларускай мовы», т. 3, знаходзім слова **верникъ** (с. 124). І тлумачэнне такое: **Верникъ** *наз.* 1. Веруючы. 2. Прыхільнік, памочнік.

8. А вось «Тураўскі слоўнік», т. I, с. 88, прапануе такое цікавае тлумачэнне: **вернік** — давераная асоба і адзін з каляднікаў, якому давяралі насіць сабраныя грошы, сала.

Таму прапануем пытанне вучоным: калі ў Святым Пісанні, Літургіі ідзе гаворка пра чалавека, які верує ў Бога, то як лепш сказаць: **вернік** ці **веруючы**, **верніца** ці **веруючая**?

➤ III. Кафедра ці катэдра?

Адгорнем «Слоўнік беларускай мовы» і на с. 335 прачытаем: **кафедра**, **кафедральны** *царк.* Тое ж мы бачым і ў «Беларуска-рускім слоўніку», т. 2: **кафедра** (с. 173) і **кафедральны** *царк.* (с. 173). У абодвух згаданых слоўніках слова **катэдра** адсутнічае.

Возьмем «Русско-белорусский словарь» у трох тамах, т. I. На с. 621 ёсць тлумачэнне:

Кафедра — *в разн. знач.* кафедра; кафедральный *церк.* — кафедральны; кафедральный собор *церк.* — кафедральны сабор.

Слова **катэдра** і ў гэтым слоўніку апушчана.

Пяцітомны «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы», т. 2, с. 666, паведамляе:

Кафедра — 1) узвышэнне, памост для лектара або прамоўцы. *Узысці на кафедру. Леў Раманавіч стаў за кафедру і доўга не мог гаварыць ад хвалявання.* А. Асіпенка; 2) аб'яднанне выкладчыкаў і навуковых работнікаў адной або некалькіх блізкіх навуковых дысцыплін у вышэйшай навучальнай установе. *Кафедра гісторыі. Кафедра педагогікі. Пасяджэнне кафедры. Загадчык кафедры;* 3) пасада епіскапа, які кіруе епархіяй (першапачаткова — крэсла ў царкве для епіскапа); 4) тое, што і *кафедральны сабор.* [Ад грэч. kathedra — сядзенне].

«Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы» дае такое самае тлумачэнне слова *кафедра*.

У «Слоўніку іншамоўных слоў» А. М. Булыкі, т. I, с. 635, змяшчаецца прыкладна такая ж інфармацыя:

Кафедра (грэч. kathedra = сядзенне) — 1) аб'яднанне выкладчыкаў аднаго або некалькіх навуковых прадметаў у вышэйшай навучальнай установе; 2) спецыяльнае ўзвышанае месца для прамоўцы, лектара, выкладчыка; 3) узвышэнне, з якога гаворацца пропаведзі ў хрысціянскай царкве.

У тлумачальных слоўніках, як і ў прыгаданым вышэй слоўніку А. М. Булыкі, слова **катэдра** не падаецца.

Затое ў «Этымалагічным слоўніку беларускай мовы», т. 4, с. 308, чытаем:

Катэдра — кафедральная царква; прапаведніцкі амбон, кафедра. У старабеларускай мове адзначаецца на пачатку XVI ст. Лічыцца, што непасрэднай крыніцай беларускага слова з'яўляецца польскае *katedra*. Апошняе ўзята з лацінскага cathedra; першакрыніцай, бясспрэчна, трэба разглядаць грэчаскае слова, што ў перакладзе абазначае *сядзенне*, *крэсла*. Гэта слова вядома ў многіх еўрапейскіх мовах: чэшскай, славацкай, украінскай *дыялект.*, балгарскай, сербскахарвацкай і інш. Таксама запазычана ў некаторых заходнееўрапейскіх мовах, напрыклад, нямецкай *Katheder*.

Сустракаецца гэта слова і ў іншых крыніцах, напрыклад, у кнізе В. В. Церашчатавай «Старажытнабеларускі манументальны жывапіс XI—XVIII стст.». Адгорнем с. 59 і прачытаем: *Агульны выгляд* **катэдры** *ў Сандаміры. Фрэскі. Пачатак XV ст.* На с. 61: *Увядзенне ў храм. Фрэска* **катэдры** *Сандаміра. Пачатак XV ст.*

Аднак спалучэнне **кафедральны сабор** (касцёл) ужываецца ўсё-такі часцей, яго можна бачыць у розных выданнях. Для прыкладу назавём некаторыя з іх.

1. «Беларуская энцыклапедыя» ў 18-ці т., т. 3, с. 69. Чытаем подпіс пад ілюстрацыяй: *Беласток.* **Кафедральны касцёл.**

Яшчэ подпіс: *Тур.* **Кафедральны сабор** (т. 16, с. 33).

2. Энцыклапедычны даведнік «Праваслаўныя храмы Беларусі». Да адной з ілюстрацый подпіс: **Кафедральны сабор** *у імя святога Архангела Міхаіла ў г. Мазыр.*

3. Энцыклапедыя «Вялікае княства Літоўскае», т. I. На с. 390 чытаем: *Варні.* **Кафедральны касцёл** *Пятра і Паўла.* 1680—91; *Званіца* **кафедральнага сабора** (с. 438).

Яшчэ адзін подпіс пад ілюстрацыяй (с. 425): *Віленскі* **кафедральны касцёл** *Станіслава і Уладзіміра. Сучасны выгляд.*

Як бачым, існуе два тэрміны для назваў адной і той жа святыні: **катэдра** і **кафедральны сабор**. Але калі спалучэнне **кафедральны сабор** можна назваць тэрмінам канфесіянальнай лексікі і гэты тэрмін ужываецца ў дачыненні да праваслаўных і каталіцкіх храмаў, то тэрмін **катэдра** — да каталіцкіх. А як правільна? Чаму слова **катэдра** не ўнесена ў нарматыўныя слоўнікі беларускай літаратурнай мовы? Так яно і застанецца ў вуснай размоўнай практыцы? А калі трэба афармляць афіцыйныя дакументы, якому з тэрмінаў аддаць перавагу? На гэтыя і іншыя пытанні чакаем адказу вучоных-лексікографаў і тых, хто займаецца пытаннямі культуры мовы і стылістыкі. Настала ўжо пара мець аўтарытэтны даведнік канфесіянальнай лексікі, якая сустракаецца ў Свяшчэнным Пісанні, Літургіі, малітвах і ўвогуле ў грамадскім жыцці хрысціян, прычым без падзелу на асобныя канфесіянальныя катэгорыі, групы, класы і інш.

Кафедра — у інстытуце, ВНУ...;

Катэдра — галоўны Каталіцкі і Праваслаўны Сабор. Велічная **Катэдра** святога Апостала Паўла; =/= [*не*] Велічная **Кафедра** святога Апостала Паўла.

Праваслаўная **Катэдра** =/= [*не*] Праваслаўная **Кафедра**.

але:

Кафедральны Сабор Каталіцкі, Праваслаўны.

Катэдра — трон, з якога **ex Catedra** аб'яўляюцца Дагматы Святой Каталіцкай Паўсюднай Апостальскай Царквы.

Не можам сказаць на галоўны Сабор **кафедра**, а толькі **катэдра**. А што на гэты конт думаюць вучоныя?

➤ **IV. Кляштар ці манастыр?**

У «Этымалагічным слоўніку беларускай мовы» пра гэтыя словы сказана вельмі дакладна.

Манастыр — абшчына манахаў, якая ўтварае царкоўна-гаспадарчую арганізацыю, царква, жылыя памяшканні і тэрыторыя, якая належыць такой абшчыне. Украінскае *монастырь, манастырь*, рускае *монастырь*, старажытна-рускае *монастырь* — усё гэта са стараславянскага *манастырь, монастырь*, якія паходзяць з грэчаскай мовы і абазначаюць *адасобленае жыллё* (т. 6, с. 212).

Кляштар — каталіцкі манастыр. З польскай *klasztor*, якое з нямецкай *Kloster* — манастыр (т. 5, с. 8).

Заўважым, што абодва словы значацца ва ўсіх нарматыўных слоўніках беларускай мовы. Мы іх не супрацьпастаўляем, мы іх прымаем, толькі памятаем: слова **кляштар** прынята ўжываць у Каталіцкай Царкве, **манастыр** — у Праваслаўнай. Ужыванне гэтых слоў з адпаведным ім значэннем знаходзім у свецкай навукова-папулярнай літаратуры, энцыклапедычных даведніках. Прывядзём некалькі прыкладаў.

1. «Беларуская энцыклапедыя», т. 7, с. 367: *Іўеўскі касцёл і* **кляштар** *бернардзінцаў.*

2. Энцыклапедыя «Вялікае княства Літоўскае»:

Кляштар *у Віграх* (т. 2, с. 24);

Касцёл Клецкага **кляштара** *дамініканцаў* (т. 2, с. 107);

Лішкаўскі **кляштар** *дамініканцаў* (т. 2, с. 214);

Царква Лядаўскага Дабравешчанскага **манастыра** (т. 2, с. 235); *Магілёўскі Мікольскі* **манастыр** (т. 2, с. 252);

Супрасльскі Дабравешчанскі **манастыр** (т. 2, с. 644).

3. Энцыклапедычны даведнік «Архітэктура Беларусі»:

Кляштар картэзіянцаў у Бярозе (с. 22).

➤ **V. Літанне ці Літанія?**

У «Слоўніку іншамоўных слоў» А. М. Булыкі, т. I, с. 725, чытаем:

Літанне (лац. litania, ад грэч. litaneia) — малітва ў каталікаў, у якой звяртаюцца да Бога або святых з просьбай аб заступніцтве.

«Слоўнік беларускай мовы» змяшчае такі артыкул:

Літанне [ньне] *рэл.*, -нні, -нняў.

«Русско-белорусский словарь», т. I, с. 726, паведамляе:

Литания *ж., рел.* — **літанне**, -ння, ср.

Выходзіць, што пры перакладзе слова на **-ния** ў беларускім варыянце з'явілася падаўжэнне **-нн-** і змянілася катэгорыя роду: ж. р. — н. р.

Давайце разгледзім наступныя групы слоў.

I, ж.р.

агония (ж.р.)	— агонія (ж.р.)
гегемония (ж.р.)	— гегемонія (ж.р.)
колония (ж.р.)	— калонія (ж.р.)
кампания (ж.р.)	— кампанія (ж.р.)
компания (ж.р.)	— кампанія (ж.р.)
линия (ж.р.)	— лінія (ж.р.)
мания (ж.р.)	— манія (ж.р.)
церемония (ж.р.)	— цырымонія (ж.р.) і інш.

II, н.р.

деление (с.р.)	— дзяленне (н.р.)
дублирование (с.р.)	— дубліраванне (н.р.)
обливание (с.р.)	— абліванне (н.р.)
оживание (с.р.)	— ажыванне (н.р.)
описание (с.р.)	— апісанне (н.р.)
подание (с.р.)	— паданне (н.р.)
решение (с.р.)	— рашэнне (н.р.)
трение (с.р.)	— трэнне (н.р.) і інш.

Прыгадаем, што ў школе з рускай мовай навучання пры тлумачэнні напісання слоў з падоўжанымі зычнымі настаўнік можа рэкамендаваць вучням такі прыём праверкі (спосаб падстаноўкі): калі ў рускай мове слова канчаецца на **-ние** (напр., **значение**) або **-нье** (напр., **варенье**), то па-беларуску пішам у пераладах **-нн-** (**значэнне**, **варэнне**), прычым заўважаем, што катэгорыя роду слоў не мяняецца: оправда**ние** — апраўда**нне**, призна**ние** — прызна**нне**, горе**ние** — гарэ**нне** і інш. Вядома, могуць быць выключэнні, але тады і пераклад іншы, напр.: строе**ние** I (*здание*) — будынак, строе**ние** II (*структура*) — будова, пабудова.

Аднак пераклад слова **литания** пад гэта правіла не падыходзіць, і наўрад ці хутка можна знайсці яшчэ падобныя прыклады.

Таму пытанне да вучоных: ці можна пакінуць пераклад і адпаведна напісанне слова **літанія** з **-нія**, без змены катэгорыі роду і без падаўжэння? Заўважым, што тэрмін **літанія** трывала ўвайшоў у жыццё Каталіцкай Царквы. Ці можна ўнесці ў арфаграфічны слоўнік тэрмін **літанія** *ж*?

➤ VI. Лодка, човен, чайка

Прачытаем асобныя радкі з Новага Запавету.

Ледзь толькі Ён выйшаў з **лодкі**, *як адразу выбег насустрач Яму з магільнай пячоры чалавек, апанаваны нячыстым духам* (Мк 5, 2).

На змярканні вучні Яго прыйшлі да возера, селі ў **лодку** *і паплылі на ёй у Капернаум* (Ін 6, 16—17).

Раптам узнялася на возеры такая вялікая бура, што хвалі заліваліі **лодку**, *а Ісус спаў* (Мф 8, 24).

Лічым, што слова **лодка** ўжыта ў сказах правільна. Для пацвярджэння гэтага прапануем звярнуцца да слоўнікаў, напр., да «Тлумачальнага слоўніка беларускай літаратурнай мовы».

Лодка — 1) невялікае, звычайна веславое судна. *Парусная лодка. Маторная лодка.* 2. Назва некаторых відаў ваенных суднаў. *Падводная лодка. Атамная лодка* (с. 321).

Човен — лёгкая лодка, выдзёўбвалася са ствала дрэва; лодка наогул (с. 747).

Пра **човен** можам прачытаць у «Слоўніку беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе памежжа», т. 5, с. 424: *Човен, як карыто, выдоўблі з дзерава. Чаўны выдаўбуюць з таўстой калоды.* Варыянты вымаўлення гэтага слова наступныя: *човен, чална, чолна, чалнок* (390).

Чайка — пласкадонная лодка; пласкадонка. *Падплысці на чайцы* (с. 741).

➤ VII. Парафія ці прыход?

Звернемся да даведачнай літаратуры і пабачым, што абазначаюць гэтыя словы.

1. «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы», т. 4, с. 51:

Парафія — акруга, тэрыторыя, якая адносіцца да аднаго касцёла і падпарадкоўваецца аднаму ксяндзу; прыход.

Касцёл хоць быў і вялікі, але ўласнай парафіі не меў і лічыўся капліцай. Чарнышэвіч.

Парафіяльны — які мае адносіны да парафіі.

Парафіяльны касцёл.

Парафіянін — вернік, які адносіцца да якой-небудзь парафіі.

2. Тая ж кніга, с. 693.

Прыход — ніжэйшая царкоўная арганізацыя ў хрысціянскай царкве, пераважна праваслаўнай; мясцовасць, дзе жывуць члены гэтай арганізацыі. *Царкоўны прыход.*

Прыхаджанін — веруючы, які належыць да якога-небудзь царкоўнага прыхода. [*Ксёндз*] *гаварыў па-польску, устаўляючы і беларускія словы, мусіць, каб прыхаджане лепш разумелі яго.* Л. Арабей.

Як бачым, слова **парафія** і **прыход** паводле свайго лексічнага значэння падобныя, толькі слова **парафія** часцей ужываюць каталікі, а **прыход** — праваслаўныя.

➤ VIII. Пілігрым ці паломнік?

У «Слоўніку іншамоўных слоў», т. 2, с. 206, чытаем:

Пілігрым (польск. *pielgrzym* < с. — лац. *pelegrinus*, ад лац. *peregrinus* = чужаземны) —

1) вандроўны багамолец, паломнік; 2) *перан.* вандроўнік, падарожны.

Паломнік — падарожны, які адпраўляецца з мэтай наведаць святыя месцы (манастыры, храмы, месцы свяшчэнных падзей і інш.), памаліцца перад іх святынямі, атрымаць духоўную параду і падтрымку вопытных старцаў.

Такім чынам, **пілігрым** і **паломнік**, **пілігрымка** і **паломніцтва** — словы адназначныя, толькі першыя варыянты прынята ўжываць сярод католікаў, другія — сярод праваслаўных.

➤ IX. Праабражэнне Гасподняе ці Перамяненне Гасподняе?

У Евангеллі паводле святога Лукі чытаем: *Ён* [Ісус Хрыстос] *узяў з сабой Пятра, Іаана і Іакава і ўзышоў*

на гару, каб памаліцца (9, 28). *Калі маліўся, выгляд Яго аблічча змяніўся, Яго адзенне стала белае і бліскучае* (9, 29).

Якія вытокі гэтых слоў — **Праабражэнне** і **Перамяненне** — паводле гісторыі беларускай мовы? Як правільна назваць свята: **Праабражэнне Гасподняе** ці **Перамяненне Гасподняе**? Бо ў аўтарытэтных даведніках чытаем:

1. «Беларуская энцыклапедыя», т. I, с. 459: *Арган* **Праабражэнскага** *касцёла ў в. Новая Мыш Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. 1762.*

2. Тое ж выданне, т. 11, с. 100: *Навамышскі* **Праабражэнскі** *касцёл.*

3. Тое ж выданне, т. 17, с. 34: *Хмелеўская* **Праабражэнская** *царква.*

4. Энцыклапедыя «Вялікае княства Літоўскае», т. I, с. 236: *Арган* **Праабражэнскага** *касцёла ў в. Новая Мыш Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. 1762.*

5. «Архітэктура Беларусі», т. I, с. 178: *Спаса-***Праабражэнская** *царква ў Полацку.*

➤ X. Правіннасці ці правіны?

Слова **правіннасці** (*правіннасць*) зафіксавана ў «Слоўніку беларускай мовы» (с. 606), «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» (т. 4, с. 308), перакладных слоўніках, аднак слова **правіна** (*правіны*) няма, ёсць толькі размоўны варыянт *правінка*.

Затое ва «Украінска-беларускім слоўніку» В. П. Лемцюговай (Мн., 1980) ёсць наступны артыкул:

Провина *ж.* віна; (парушэнне нормы, правіл паводзін — яшчэ) правіннасць, праступак *м.* (с. 517).

Як бачым, ва ўкраінскай мове існуе такое слова, яно нейкім чынам перанесена і ў канфесіянальныя тэксты

Беларусі. Таму пытанне да вучоных: гэта слова можна выкарыстоўваць у Евангеллі, малітвах? Яно — гэта слова **правіна** — можа быць унесена ў афіцыйную лексікаграфічную літаратуру? Ці ўсё-такі пры перакладах карыстацца толькі літаратурнай нормай — **правіннасць, правіннасці**?

➤ **XI.** Свята **Крыжаўзвіжанне** ці **Узвышэнне Святога Крыжа?**

Ні ў адным нарматыўным слоўніку гэта свята не занатавана, аднак у «Беларускай энцыклапедыі» чытаем:

1. *Вілейка.* **Крыжаўзвіжанскі** *касцёл і царква (справа)* (т. 4, с. 158).

2. *Гошчаўская* **Крыжаўзвіжанская** *царква* (т. 5, с. 375).

3. *Лідскі* **Крыжаўзвіжанскі** *касцёл* (т. 9. с. 251).

Крыжаўзвіжанне — свята, устаноўленае ў 326 г. у дзень, калі святая царыца Алена знайшла на Галгофе крыж, на якім быў распяты Ісус Хрыстос. Крыж быў узняты і ўстаноўлены для агульнага ўшанавання, пакланення.

Хочацца верыць, што ў адпаведнасці з усходнеславянскімі традыцыямі свята названа правільна. Просім выказаць сваю думку па гэтым пытанні вучоных (у каталікоў прынята гэта свята называць **Узвышэннем** Святога Крыжа Гасподняга).

➤ **XII. Тройца** ці **Троіца?**

Адгорнем «Слоўнік беларускай мовы» на с. 793 і прачытаем артыкул: **тройца** *разм.*, -цы. Памета *разм.* азначае, што слова з размоўнай лексікі.

У «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» (т. 5, кн. I, с. 519) напісана:

Тройца — 1) у хрысціянскай рэлігіі — Трыадзінае Бажаство (*лепш было б сказаць Трыадзіны Бог*), у *Якім* спалучаюцца тры Асобы: Бог — Бацька (*правільна было б Айцец*), Бог — Сын і Бог Дух Святы;

2) свята хрысціянскай Царквы, якое адзначаецца на пяцідзесяты дзень пасля Вялікадня; Сёмуха;

3) *разм.* пра трох асоб, якія звычайна бываюць разам і сябруюць. *У саўгасе добра памятаюць, як хадзіла да Федасюка на склад дружная* **тройца***: кіраўнік аддзялення, галоўны заатэхнік і ветфельчар.* «Вожык».

Як бачым, тлумачэнне слова **Тройца (тройца)** у слоўніку даволі прыстойнае, калі не браць пад увагу правапіс — напісанне слоў, змест якіх складае сутнасць хрысціяскай веры, з малой літары, а замест слова *Бог* ужыта *Бажаство*. Але ў той час, калі выдаваўся слоўнік, інакш не магло і быць.

А яшчэ ёсць вёска **Тройца** ў Шклоўскім р-не Магілёўскай вобл., на р. Бярозе. Пра гэта можна прачытаць у кнізе «Беларуская энцыклапедыя», т. 15, с. 527.

Цяпер давайце падумаем: якую **тройцу**, каго мелі на ўвазе складальнікі «Слоўніка беларускай мовы», калі побач са словам *тройца* ставілі памету *разм.* Вядома ж, пэўных жывых, смяротных людзей, якія часцей за ўсё бываюць разам, сябруюць. *Дурная будзе Зося, калі... не выпра з хаты ўсю тройцу.* Ц. Гартны.

Таму пытанне: ці можна тэрмін **тройца** з такім розным значэннем уводзіць у канфесіянальны стыль для абазначэння вялікага хрысціянскага свята? Хутчэй за ўсё не, бо ў некаторых людзей, якія яшчэ не цвёрда сталі на шлях хрысціянскай веры або не ўмеюць канцэнтраваць увагу на асноўным, пры выкарыстанні гэтага слова могуць узнікаць пэўныя непатрэбныя асацыяцыі.

У літаратуры сустракаецца і другі варыянт вымаўлення і напісання слова: **Троіца**, вытворнае ад яго **Троіцкі** (*не бяром пад увагу Траецкі, Траецкае Прадмесце — народную назву часткі Мінска*).

Звернемся да некаторых крыніц, дзе можна знайсці розныя варыянты напісання гэтага свята:

1. «Беларуская энцыклапедыя» ў 18 т., т. 10, с. 179. Чытаем: *Духаўская царква* **Троіца**-*Сергіевай лаўры ў г. Сергіеў Пасад Маскоўскай вобл. 1467.*

2. Такі ж самы прыклад і ў кнізе нарысаў «Архітэктура Беларусі», с. 18.

3. «Помнікі мастацкай культуры эпохі Адраджэння», т. I. На с. 67 подпіс: *Старазапаветная* **Троіца**.

4. У «Беларускай энцыклапедыі», т. 13, с. 423, напісана: *А. Рублёў.* **Тройца**.

5. «Беларуская энцыклапедыя», т. I, с. 134, змяшчае такі подпіс пад ілюстрацыяй: *Ш. Б. Цуг. Лютэранская царква Святой* **Тройцы** *ў Варшаве. 1777—80.*

6. У «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі», т. 5, с. 613, пад ілюстрацыяй чытаем: *Мінскі* **Троіцка** — *Залатагорскі касцёл.*

7. Энцыклапедыя «Вялікае княства Літоўскае», т. I, с. 443, падае: *Вільня.* **Троіцкі** *касцёл XV—XVIII стст.*

8. У кнізе А. І. Лакоткі «Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры» напісана: *Роскі* **Троіцкі** *касцёл* (с. 417) і *Ружанскі* **Троіцкі** *касцёл* (с. 418).

9. У кнізе Церашчатавай В. В. «Старажытнабеларускі манументальны жывапіс XI—XVIII стст.», на с. 110, чытаем: *Супакойванне бурлівага мора. Роспіс* **Троіцкай** *царквы. Другая палавіна VIII ст.*

10. Энцыклапедычны даведнік «Праваслаўныя храмы Беларусі» падае:

Царква ў гонар Святой **Троіцы** *ў в. Аздамічы* (с. 9).

Царква ў гонар Святой **Троіцы** *ў г.п. Арэхаўск* (с. 20).

Такім чынам, якому слову аддаць перавагу, калі гаворка ідзе пра вялікае хрысціянскае свята? Думаецца, што больш падыходзіць **Троіца**, а **тройцу** пакінуць для побытавага ўжывання. Будзем памятаць словы святога Апостала Паўла: *Бог не дазволіць, каб насміхаліся з Яго. А што чалавек сее, тое і жаць будзе* (Гал 6, 7).

➤ **XIII. Труна, магіла, пахавальня** ці **гроб**?

Разгледзім значэнне гэтых слоў.

У пяцітомным «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» чытаем:

Труна — спецыяльная скрынка, у якой хаваюць памерлага. *Неўзабаве была гатова труна. Сасновая, з выгаблеваных дошак, якія пахлі смалой.* Дайліда (т. 5, кн. I, с. 525).

Магіла — 1) яма для пахавання памерлых. *Капаць магілу. Засыпаць магілу;* 2) месца пахавання кагонебудзь, а таксама насып на гэтым месцы. *Я ўсё шукаю матчыну магілу і не магу знайсці пасля вайны.* С. Грахоўскі (т. 3, с. 78).

Пахавальня. У «Слоўніку беларускай мовы» на с. 556 ёсць словы *пахавальны, пахаванне, пахаваць,* але аднакарэннага да іх *пахавальня* не знаходзім.

Тое самае мы назіраем і ў іншых слоўніках.

Але ў кнізе А. І. Лакоткі «Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры», на с. 277, знаходзім такі подпіс пад ілюстрацыяй: *Капліца-***пахавальня** *Паскевічаў у Гомелі, XIX ст.*

Значыць, слова **пахавальня** існуе, проста пакуль што не ўнесена ў нарматыўныя слоўнікі.

Просім вучоных прааналізаваць і вызначыць, ці правільна ўжыта слова **пахавальня** ў Евангеллі паводле святога Іаана.

Калі Ісус прыйшоў туды [*у Віфанію*], *Лазар ужо чатыры дні спачываў у пахавальні* (11, 17).

Ісус загадаў: адсуньце камень. Сястра памерлага, Марфа, сказала Яму: Госпадзі, патыхае ўжо, бо ляжыць чацвёрты дзень у пахавальні (11, 39).

Ісус сказаў ёй: ці ж не казаў Я табе, што, калі ўверуеш, убачыш славу Божую? І вось адсунулі камень (11, 40).

Ісус узняў вочы ўгару і сказаў: Ойча, дзякую Табе, што Ты выслухаў Мяне (11, 41).

Пасля гэтых слоў Ён усклікнуў гучным голасам: Лазар! выйдзі адтуль (11, 43)!

І выйшаў памерлы, ногі і рукі яго былі абвязаны палатном, а твар быў ахінуты хусткаю (11, 44).

Гартаем кнігу Церашчатавай В. В. «Старажытнабеларускі манументальны жывапіс XI—XVIII стст.» і знаходзім подпіс: *Палажэнне Цела Гасподняга ў* **труну**. *Фрэска Мікалаеўскай царквы. Пачатак XVIII ст.* (с. 116). У дадзеным выпадку, думаецца, слова **труна** ўжыта для вобразнасці апісання падзеі, бо яно больш зразумелае для хрысціян нашай краіны.

Аднак справа ў тым, што ў Палесціне ў часы зямнога жыцця Сына Божага і задоўга да Яго, з самых даўніх часоў, у старажытных яўрэяў не было звычаю хаваць памерлых у зямлю. Магіламі (у нашым разуменні) для пахавання служылі пячоры ці гроты, часта паміж дрэвамі або ў садах, у цяністых мясцінах *(Ін 19, 41)*. Праўда, былі выключэнні. Карміцелька Рэвекі Дэвора была пахавана пад дубам (дуб плачу) *(Быц 35, 8)*. Але ў кнігах Новага Запавету ў часы зямнога жыцця Ісуса Хрыста мы такога тыпу пахавання не знаходзім. Багатыя людзі высякалі пахавальні ў скалах *(Мф 27, 6; 28, 2; Ін 11, 38)*. У Палесціне, Сірыі і іншых месцах

да гэтага часу знаходзяць пахавальні з глыбокай старажытнасці і па-рознаму зробленыя.

Так, Іосіф з горада Арымафеі папрасіў у Пілата Цела Ісуса Хрыста і перанёс яго ў **пахавальню**, якая потым была закрыта вялікім **каменем**.

Пасля Уваскрэсення Госпада на месцы пахавання засталася скамечаная хустка і Плашчаніца, у якую было загорнута Цела Яго. Гэта Плашчаніца да сённяшняга дня захоўваецца ў Турыне, а копію яе можна бачыць у нашым Мінскім касцёле Святога Сымона і Святой Алены.

А як мы скажам: быў у Іерусаліме і пакланіўся **Магіле** Гасподняй? **Труне**? **Пахавальні**? **Гробу**?

Верагодна, больш прымальны апошні варыянт — **Гробу Гасподняму**.

Праўда, у беларускіх нарматыўных слоўніках слова **Гроб** не зафіксавана. «Этымалагічны слоўнік беларускай мовы», т. 3, с. 106, паходжанне гэтага слова не разглядае.

Пабачым, а якое тлумачэнне гэтаму слову даюць рускія даведнікі.

Адгорнем «Этимологический словарь русского языка» М. Фасмера, т. I, с. 459. І высвятляем, што слова **гроб** ёсць не толькі ў рускай, але і ў стараславянскай, украінскай, балгарскай, сербскахарвацкай, славенскай, чэшскай, славацкай, польскай мовах. Роднаснае старажытнаверхненямецкаму *grab* са значэннем *магіла*, готскаму — з тым жа значэннем. Літоўскае слова з тым жа значэннем паходзіць са славянскага.

Такім чынам, паколькі слова **гроб** ёсць амаль ва ўсіх славянскіх мовах, магчыма, і мы, беларусы, скажам: паклонімся **Гробу Гасподняму**, г.зн. месцу ў пахавальні, куды было паложана Цела Святое.

➤ **XIV. Трысціна, палка, кій, друк ці дручок?**

У Святым Евангеллі чытаем: *Насадзілі* [жаўнеры] *на* **трысціну** *губку, змочаную ў воцаце, і падалі Яму* [Ісусу Хрысту] *піць* (Ін 19, 29).

Якое слова лепш узяць замест **трысціна**?

1. **Палка.** У «Этымалагічным слоўніку беларускай мовы», т. 8, с. 131, чытаем: **палка** — частка тонкага ствала або галіны, ачышчаная ад парасткаў. Рускае, украінскае слова — *палка*, старажытнарускае — *палка*, польскае — *pałka*. Пэўнай этымалогіі няма, меркаванні вучоных разыходзяцца.

2. **Кій.** У тым жа выданні, т. 5, с. 31, запісана: **кій** — прамая тонкая палка. Ёсць гэта слова ў рускай, украінскай, балгарскай, сербскахарвацкай, славенскай, польскай, чэшскай, славацкай, верхнелужыцкай, ніжнелужыцкай мовах, праўда, у кожнай з заходнеславянскіх моў слова мае сваё значэнне. Як сказана ў гэтай кнізе, пры больш пільным разглядзе гэтага слова вучоныя прыйшлі да высновы, што, магчыма, **кій** — балтаславянскага паходжання.

3. **Друк.** У тым жа выданні, т. 3, с. 155, сказана: **друк** — дубіна. Гэта слова ёсць у рускай, украінскай, чэшскай, славацкай, балгарскай, сербскахарвацкай мовах, мае праславянскае паходжанне. Слова **дручок** памяншальнае ад слова **друк**.

4. **Трысціна.** У «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы», т. 5, с. 537, адзначана, што **трысціна** — сцябло трыснягу (вадзяной ці балотнай шматгадовай расліны сямейства злакаў з раскідзістай мяцёлкай і каленчатым пустацелым або губчатым сцяблом).

Трысцінка — 1) сцяблінка трыснягу; 2) тонкая палачка для апоры пры хадзьбе.

Калі дапусціць, што **трысціна** — гэта таксама тонкая палка для апоры пры хадзьбе, то гэта слова можна пакінуць у тэксце Евангелля?

➤ XV. Укрыжаванне ці Распяцце?

У «Слоўніку беларускай мовы», с. 693—694, змешчаны словы **распяты**, **распяцце**, **распяць**.

«Тлумачальны слоўнік беларускай мовы», т. 4, с. 673, раскрывае значэнне гэтых слоў:

Распяцце — 1) дзеянне паводле дзеяслова *распяць*;

2) крыж з фігурай Распятага Хрыста.

Распяць — прыбіць цвікамі да крыжа рукі і ногі.

Прыкладна такія ж тлумачэнні гэтых слоў падаюцца і ў «Этымалагічным слоўніку беларускай мовы», т. 11, с. 132. Слова **распяцце** шырока выкарыстоўваецца ў энцыклапедычных даведніках, навукова-папулярнай літаратуры, напр.:

1. «Беларуская энцыклапедыя», т. 17, с. 69. Подпіс пад ілюстрацыяй: *Ісус Хрыстос.* **Распяцце.** *Канец XIV ст.*

2. Энцыклапедыя «Вялікае княства Літоўскае», т. I, с. 140: *Фрэска* «**Распяцце**». *Віленскі кафедральны касцёл Станіслава і Уладзіслава. Канец XIV ст.*

3. Церашчатава В. В. «Старажытнабеларускі манументальны жывапіс XI—XVIII стст.», с. 80: **Распяцце.** *Фрэска капліцы Святога Крыжа на Вавелі ў Кракаве.*

Ёсць яшчэ вельмі ёмістае, вобразнае слова, сінонім да *распяцце* — **укрыжаванне**. Хоць яно пакуль што не ўнесена ў лексікаграфічныя даведнікі, але шырока выкарыстоўваецца ў Каталіцкай Царкве і, на нашу думку, мае права на існаванне, тым больш, што яно часам ужываецца ў літаратуры, напр.:

Кніга «Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння», с. 154. Пад ілюстрацыяй напісана: *Нікадзім Зубрыцкі. Гравюра* «**Укрыжаванне**». *1711.*

Пытанне да вучоных: якому слову лепш аддаць перавагу?

➤ **XVI.** У малітвах, песнапеннях у дачыненні да Маці Божай часам можна пачуць слова **Балесная.** Ці правільна гэта?

Адгорнем «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» (т. I, с. 333) і прачытаем:

балесны *абл.* — 1) хваравіты. [*Дзядзька Прохар*] *быў* **балесны** *і заўсёды, зашыўшыся ў куток, курыў і кашляў.* Сабаленка; 2) які адбываецца з болем, выкліканы болем, балючы. *У цішыні раптам пачуўся балесны стогн.* Караткевіч.

Лічым, што гэта слова (і падобныя дыялектныя) у высокім канфесіянальным стылі не павінна ўжывацца. А што скажаце на гэта Вы, паважаны чытач?

➤ **XVII. Хрышчэнне** ці **хрост?**

Пагартаем «Слоўнік беларускай мовы». На с. 857 бачым слова **хрышчэнне.** Глянем на с. 856. Менавіта на гэтай старонцы месца слову **хрост,** але яго тут няма.

«Беларуска-рускі слоўнік», т. 3, с. 993, слова **хрышчэнне** падае, а слова **хрост** на с. 992 адсутнічае.

У «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы», т. 5, кн. 2, с. 219, чытаем:

Хрышчэнне — рэлігійны абрад прыняцця каго-небудзь у лік веруючых хрысціянскай рэлігіі. *З Пецярбурга ўсё яшчэ ішлі адказы протаіерэяў і прыставаў,*

што не знаходзілі ў царкоўных кнігах запісу аб хрышчэнні Аляксандры Адольфаўны Ізмайловіч. У. Мехаў.

«Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы» пад рэд. М. Р. Судніка і М. Н. Крыўко тлумачыць гэта слова падрабязна (с. 726):

Хрышчэнне — адно з хрысціянскіх таінстваў, рэлігійны абрад прыняцця каго-небудзь у лік верующых, далучэнне да царквы і наданне асабовага імя.

Слова **хрост** у абодвух тлумачальных слоўніках не прыгадваецца.

Толькі ў «Слоўніку беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча», т. 5, с. 323, знаходзім:

Хрост — абрад хрышчэння.

З дадатковай літаратуры можна нагадаць кнігу В. В. Церашчатавай «Старажытнабеларускі манументальны жывапіс XI—XVIII стст.», с. 139, дзе знаходзім подпіс пад ілюстрацыяй: **Хрышчэнне.** *Фрэска касцёла Станіслава ў Магілёве.*

Узнікае пытанне: якое з гэтых двух слоў — **хрышчэнне** ці **хрост** — павінна ўвайсці ў канфесіянальны стыль, у тэксты Святога Евангелля, Літургіі, у малітвы? Якое з гэтых двух слоў мы паставім у сказы, тэксты, калі ідзе размова пра Сына Божага Ісуса Хрыста і Іаана Хрысціцеля? Як гэта будзе выглядаць з пункту гледжання культуры мовы? Магчыма, менавіта цяпер, калі ідзе станаўленне канфесіянальнага стылю, мы пакінем і слова **хрост**, як і іншыя словы, якія ўжываліся да гэтага часу, толькі для гутарковай мовы?

➤ XVIII. Цар і кароль

Якое з гэтых слоў лепш выкарыстаць у Свяшчэнным Пісанні?

Разгледзім слова **Цар**.

1. «Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы» значэнне гэтага слова падае так:

Цар — тытул манарха ў некаторых краінах, а таксама асоба, якая мае такі тытул.

2. Макс Фасмер у сваім этымалагічным слоўніку рускай мовы (т. 4, с. 290) тлумачыць паходжанне слова **цар** ад *цэсар*.

А якое паходжанне слова **кароль**?

1. «Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы» (с. 280) адзначае:

Кароль — адзін з тытулаў манарха, а таксама асоба, якая носіць гэты тытул.

2. У «Этымалагічным слоўніку беларускай мовы», т. 4, с. 276, чытаем:

Традыцыйная этымалогія зводзіцца да запазычання ў якасці тытула імя Карла Вялікага (як цэсар, якое зыходзіла да імя Цэзара).

Таму, на наш погляд, пры перакладзе Святога Пісання мы будзем ужываць слова **цар**. Таму скажам: **Цар** *Давід*. **Цар** *Саламон*. І кнігі Старога Запавету назавём так: «Першая кніга **Царстваў**», «Другая кніга **Царстваў**», «Трэцяя кніга **Царстваў**», «Чацвёртая кніга **Царстваў**», як гэта зрабіў Францыск Скарына.

➤ XIX. Царква і Касцёл

Адгорнем «Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы» і прачытаем:

Царква — 1) аб'яднанне паслядоўнікаў той або іншай рэлігіі, арганізацыя, якая ведае рэлігійным

жыццём; рэлігійная абшчына. *Каталіцкая Царква. Уніяцкая Царква. Праваслаўная Царква;* 2) памяшканне, у якім адбываецца набажэнства; храм. *Пабудавалі новую царкву.*

Касцёл — польская назва каталіцкага храма (с. 284). Слова **Касцёл** ёсць не толькі ў польскай мове, але і ў балгарскай, украінскай, чэшскай і інш. Паходзіць слова ад лацінскага *castellum* (умацаванне), бо сярэдневяковыя цэрквы ўмацоўваліся, як замкі.

Сцвярджаем, што слова **Касцёл** з часам таксама набыло больш шырокае значэнне і цяпер гэта не толькі памяшканне, у якім адбываюцца набажэнствы, але і азначае аб'яднанне паслядоўнікаў каталіцкага веравызнання: **Паўсюдны (Усяленскі) Каталіцкі Касцёл.**

Але ўлічваючы тое, што тэрмін **Царква** з'явіўся намнога раней, што пры станаўленні Хрысціянства падзелу на канфесіі не было, то ўсё-такі пры перакладзе Святога Евангелля на беларускую мову будзем ужываць слова **Царква** — агульнае для ўсіх хрысціянскіх канфесій.

➤ **XX. Язычніцтва** ці **паганства?**

Святло для асвячэння ***язычнікаў*** *і славы народа Твайго, Ізраіля* (Лк 2, 32).

Мне, самаму найменшаму з Усіх Святых, была дадзена гэтая ласка: абвясціць ***язычнікам****, як Дабравесце, неспазнанае багацце Ісуса Хрыста* (Эф 3, 6).

Пабачым, як тлумачацца значэнні слоў **язычніцтва** і **паганства** ў лексікаграфічным працах.

І. «Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы» пад. рэд. М. Р. Судніка і М. Н. Крыўко:

Язычніцтва — рэлігія, заснаваная на пакланенні многім багам, ідалапаклонства; *прым.* язычніцкі.

Язычнік — паслядоўнік язычніцтва.

ІІ. «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» ў 5-ці т. пад рэд. К. К. Атраховіча, т. 3, с. 491:

Паганства, *разм.* 1. Язычніцтва. 2. *разм.* Нешта вельмі дрэннае.

Паганскі, *разм.* 1. Мярзотны, подлы. 2. Нехрысціянскі, якой-н. іншай веры. *Паганскія багі.*

Такім чынам, больш дакладным з'яўляецца ўжыванне слоў **язычнік, язычніцтва, язычніцкі**, а не **паганства, паганскі** — *размоўныя варыянты.*

➤ **XXI. Ялей ці алей?**

Адгорнем «Слоўнік іншамоўных слоў» А. М. Булыкі і прачытаем наступнае:

Ялей (гр. elaion — алей) — аліўкавы алей, які ўжываецца ў царкоўнай службе (т. 2, с. 734).

Алей (лац. oleum) — 1) тлушч, атрыманы з пладоў і насення розных раслін; 2) аліўкавы тлушч, які выкарыстоўваецца ў царкоўным абыходку (т. 1, с. 59).

Такія ж значэнні слоў знаходзім і ў «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» (т. 1, с. 222; т. 5, кн. 2, с. 500).

Таму, на наш погляд, для канфесіянальнага стылю лепш узяць слова **ялей**: **ялеепамазанне**, =/= не **ялеенамашчэнне**, бо ў гэтай жа кнізе (т. 3, с. 646) знаходзім і тлумачэнне слова *памазанне*.

Памазанне — гэта хрысціянскі абрад, які заключаецца ў крыжападобным мазанні мірам, **ялеем** у знак бласлаўлення (пры хрышчэнні, канфірмацыі, перад смерцю, пры каранаванні цароў і пад.).

➤ XXII. Яўрэі, іудзеі, габрэі, жыды

У «Слоўніку беларускай мовы» чытаем артыкулы:

с. 314:

іудзеі -еяў
іудзей -ея, -ею, -еяў
іудзейка -ейцы, -еек
іудзейскі

с. 901:

яўрэі [эйі] -эяў
яўрэй -эя, -эю, -эяў
яўрэйка -эйцы, -эек
яўрэйскі
яўрэйства -ве

Адгорнем пяцітомны «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы».

Т. 2, с. 565:

іудзеі, -яў; *адз.* **іудзей**, -я, *м.*; **іудзейка**, -і, *ДМ* -дзейцы; *мн.* іудзейкі, -дзеек, *ж.* Першапачаткова жыхары Іудзеі, пазней яўрэі наогул

іудзейскі, -ая, -ае. 1. Які мае адносіны да Іудзеі, іудзеяў, належыць ім. *Іудзейскае веравызнанне.* 2. Тое, што і *яўрэйскі.*

Т. 2, кн. 2, с. 506:

яўрэі, -яў; *адз.* **яўрэй**, -я, *м.*; **яўрэйка**, -і, *ДМ* -рэйцы; *мн.* яўрэйкі, -рэек, *ж.* Народ семіцкай моўнай групы, аб'яднаны агульным паходжаннем і часткова рэлігіяй.

Яўрэі цяпер маюць сваю дзяржаву Ізраіль, створаную ў 1947 г. па рашэнні Генеральнай Асамблеі ААН. Сталіца — Тэль-Авіў. У Ізраілі знаходзіцца шмат мясцін, звязаных з зямным жыццём Госпада Ісуса Хрыста, напрыклад: святы горад Іерусалім, Геф-

сіманія, Кана Галілейская, Назарэт, Фавор, Іардан, узбярэжжа Галілейскага мора, дзе некалі быў Капернаум, і шмат інш.

Слова **габрэі** ні ў адным нарматыўным слоўніку не зафіксавана, таму яго пажадана пакінуць толькі ў гутарковым стылі, афіцыйна не ўжываць.

Што тычыцца слова **жыды (жыд, жыдоўка)**, то яно ў беларусаў гучыць вельмі непаважліва, нават абразліва да асоб яўрэйскага паходжання. Гэта слова і вытворныя ад яго іншыя словы нават не ўнесены ў нарматыўныя слоўнікі беларускай мовы. Таму просьба да тых, хто ім карыстаўся па аналогіі з польскай мовай: выкінуць гэта слова з арсенала свайго лексікону і ніколі яго не выкарыстоўваць, тым больш у святынях.

З адзначанага вышэй відаць, што пры перакладзе на сучасную беларускую літаратурную мову канфесіянальнай літаратуры, асабліва кніг Евангелля, узнікаюць шматлікія моўныя праблемы, іх можна вырашыць толькі з дапамогай вучоных-лінгвістаў. Асабліва правільным павінен быць падыход пры перакладзе тэкстаў з уласнымі імёнамі. Па гэтым пытанні мы паспрабавалі зрабіць свой экскурс у раздзел анамастыкі, зверыць свае меркаванні з навейшымі лексікаграфічнымі працамі. І наколькі нам гэта ўдалося, просім даць сваю ацэнку людзей дасведчаных, беларускіх вучоных, якія працуюць у гэтай галіне. Бо перад намі стаіць вельмі важная задача: зрабіць кнігі Новага Запавету агульнадаступнымі **для ўсіх хрысціян, незалежна ад падзелу на канфесіі.**

Таму настаў вырашальны момант: звярнуць належную ўвагу на хрысціянскую канфесіянальную мову на прафесійным, акадэмічным узроўні.

АБ АДЗІНЫМ ЕВАНГЕЛЛІ ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ

Адзначым, што нас, хрысціян, у нашай краіне яднае як беларуская мова, дадзеная Богам, так і Святое Пісанне. Не павінна быць Евангелля каталіцкага, Евангелля праваслаўнага або яшчэ якога іншага. Заўважым, што Евангелле — па-над усімі мовамі, не гаворачы ўжо ў межах адной, беларускай нацыі, па-над усімі хрысціянскімі канфесіямі адной краіны. Святое Пісанне прызначана для таго, каб не раз'ядноўваць, не прыўздымаць адну канфесію над другой, а аб'ядноўваць, паколькі ў нас адзіны Гасподзь Бог, адзіны Сын Божы Ісус Хрыстос, адзіны Дух Святы, адзіныя святыя Апосталы, адно Святое Евангелле.

Беларуская лексіка тэкстаў Святога Евангелля часткова распрацавана, яна зафіксавана ў шматлікіх навуковых лексікаграфічных працах, даведніках, слоўніках. Таму няма ніякага сэнсу ўводзіць свае новаўтвораныя словы або словы з размоўнай лексікі, дыялектызмы, назвы з моў іншых краін толькі таму, што мы маем нейкую традыцыйную прывычку. Хто мы такія? Будзем памятаць, што за намі ідзе моладзь, ідуць школьнікі, дзеці, якія вучацца ці будуць вучыцца.

Цяпер скажам некалькі слоў наконт кнігі Новага Запавету. Святое Пісанне ўжо сёння павінна быць выдадзена па-беларуску добра і на перспектыву, каб школьны настаўнік смела мог узяць Евангелле, напрыклад, на ўрок літаратуры, калі разглядаецца мастацкі твор на маральна-этычную тэму, або на ўрок мовы, калі вывучаюцца стылі мовы, у прыватнасці — канфесіянальны стыль. Гартаючы Святое Пісанне, вучні самі заўважаць адметнасць гэтай Кнігі.

Святое Евангелле павінна стаць настольнай кнігай у нядзельных школах. Толькі дзякуючы якаснаму выданню кнігі Новага Запавету, пры яе выкарыстанні мы забяспечым асноўныя прынцыпы (правілы) навучання: навуковасць, даступнасць, дакладнасць, свядомасць, нагляднасць і інш. А паралельна з гэтым будзе ажыццяўляцца выхаванне маральна чыстай, духоўна багатай асобы.

Пры дапрацоўцы Евангелля мы шырока карысталіся разнастайнай мовазнаўчай літаратурай.

Напрыклад, «Слоўнікам беларускай мовы» пад рэдакцыяй акадэміка М. В. Бірылы (Мн., 1987). Тут зафіксаваны шматлікія тапонімы, якія ўпамінаюцца і ў Новым Запавеце. Таму мы выкарысталі назвы не Ярдан, а Іардан (Сл., с. 304), не Юдэя, а Іудзея (Сл., с. 314), не Эўфрат, а Еўфрат (Сл., с. 227), не Ерусалім, а Іерусалім (Сл., с. 305), не Ерыхон, а Іерыхон (Сл., с. 305) і інш.

Тое ж і з уласнымі імёнамі. Ёсць выдатны «Слоўнік асабовых уласных імён», 2-ое выданне, выпраўленае і дапрацаванае (Мн., 2005). Укладальнік — М. Р. Суднік. Як адзначана ў анатацыі, гэты слоўнік з'яўляецца нарматыўным даведнікам па ўжыванні і выкарыстанні ўласных асабовых імён. У ім прыведзены асноўныя мужчынскія і жаночыя імёны, а таксама ўстарэлыя і новыя рэдкаўжывальныя з рускімі эквівалентамі да іх. Да многіх дакументальных (пашпартных) імён дададзены іх размоўныя, народныя і вытворныя формы, якія выкарыстоўваюцца ў маўленчай практыцы. Прызначаны работнікам пашпартных сталоў і кадравых сужб, ЗАГСам, натарыяльным канторам і юрыдычным кансультацыям, работнікам друку, настаўнікам і студэнтам, а таксама ўсім тым, хто цікавіцца беларускім іменасловам.

Як бачым, існуюць імёны, якія прызначаны для афіцыйных дакументаў, вытворныя ад іх — для побытавага ўжывання. Сярод іх ёсць і старадаўнія, якія ўжываліся ў высокім стылі, у канфесіянальнай літаратуры. Імі называліся святыя Апосталы, іншыя духоўныя асобы, якія з бласлаўлення Госпада Ісуса Хрыста пашыралі Хрысціянства сярод многіх народаў свету.

А ці задумваемся мы, адкуль узяліся імёны? Давайце разгледзім, што на гэты конт гавораць беларускія вучоныя.

СЛОВА ПРА ЎЛАСНЫЯ АСАБОВЫЯ ІМЁНЫ

Возьмем, напрыклад, кнігу «Беларуская антрапанімія» М. В. Бірылы (1923—1992), акадэміка АН Беларусі, доктара філалагічных навук, прафесара кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага ўніверсітэта (1956—1958), былога загадчыка сектара навуковай тэрміналогіі і сектара сучаснай беларускай мовы і культуры мовы Інстытута мовазнаўства АН Беларусі.

У гэтай кнізе чытаем, што імя — сталы спадарожнік чалавека на працягу ўсяго жыцця, што сучасныя імёны, якія ўжываюцца ў Беларусі, у асноўным запазычаны з іншых моў (грэчаскай, старажытнаяўрэйскай, лацінскай, скандынаўскіх моў, германскіх), з якіх трапілі ў нашу мову разам з прыняццем Хрысціянства, а ранейшыя імёны (Жук, Воўк, Лісіца і інш.) сталі мянушкамі. З гэтых мянушак і новых імён у XVII—XVIII стст. узніклі прозвішчы.

У помніках беларускай пісьменнасці XV—XVIII стст. уласныя мужчынскія імёны ўжываюцца ў поўнай і памяншальнай формах. Поўная форма імён мае нейт-

ральнае значэнне, служыць толькі сродкам адрозненя адной асобы ад другой, памяншальная форма імя з'яўляецца эмацыянальна-ацэначнай. Сярод вучоных шырока распаўсюджаны погляд, што ўжыванне поўных і памяншальных форм імя ў дакументах старой пісьменнасці мае пад сабой сацыяльную глебу: поўнымі імёнамі звычайна называюцца прадстаўнікі вышэйшай знаці і прывілеяваных колаў грамадства, а памяншальнымі — прадстаўнікі ніжэйшых класаў грамадства.

Як правіла, у памяншальнай форме ўжывалі свае імёны тыя, хто ў пісьмовай форме звяртаўся да асобы, што займала больш высокае становішча ў грамадстве. Памяншальнай формай называлі сябе і пісцы ў тэксце запісаў, у подпісах.

У вуснай форме зносін у неафіцыйнай абстаноўцы звычайна выкарыстоўваліся не поўныя імёны, а размоўна-бытавыя, якія найчасцей з'яўляліся эмацыянальна-ацэначнымі, памяншальнымі. Шырокае выкарыстанне ў вусных зносінах размоўна-бытавых форм не магло не адбіцца і на пісьме. Акрамя таго, некаторыя суб'ектыўна-ацэначныя значэнні станавіліся нейтральнымі, набываючы функцыю афіцыйнага поўнага імя, хоць па форме з'яўляюцца памяншальнымі.

Многія афіцыйна-юрыдычныя формы поўных мужчынскіх імён у помніках XV—XVIII стст. ужываюцца ў варыянтах, якія, захоўваючы структуру афіцыйна-юрыдычнай формы, адрозніваюцца ад яе чыста фанетычна. Фанетычныя адрозненні найчасцей звязаны з дыялектным асяроддзем, у якім бытавала імя. У некаторых выпадках, відаць, мы маем справу толькі з асаблівасцямі перадачы на пісьме іншамоўных слоў, г. зн. не з фанетычнымі, а арфаграфічнымі адрозненнямі.

Такім чынам, у помніках XV—XVIII стст. побач з афіцыйна-юрыдычнымі формамі імён сустракаем і рэгіянальныя, а таксама арфаграфічна-канцылярскія варыянты. Вось некаторыя з іх:

а) ужыванне зычных [n], [х] ці спалучэнне [хв] адпаведна зычнаму [ф]: **Стефан — Степан**;

б) ужыванне зычнага [м] адпаведна зычнаму [н]: **Николай — Миколай**;

в) устаўное [в] паміж галоснымі ў сярэдзіне слова: **Наум — Навум**;

г) спрашчэнне груп зычных у пачатку ці ў сярэдзіне слова: **Григорий — Рыгор** і інш.

Асобную групу сярод пэўных афіцыйна-традыцыйных форм мужчынскіх імён складаюць лацінізаваныя, што трапілі ў беларускую мову з *польскай*: **Якуб, Ян, Юзэф, Лукаш, Тамаш** і інш.

У працэсе бытавання ў народзе частка поўных мужчынскіх імён пражыла больш значныя змены, чым тыя, што названы вышэй. Да ліку такіх змен належаць:

а) адпадзенне канцавога склада [ий] ці толькі канцавога [й]: **Денис, Игнат, Климент, Дмитр**;

б) адпадзенне канцавога [й] у імёнах на *-ай*: **Николай, Миколай — Микола**;

в) дабаўленне канцавога [о] ці [а] да імён, якія заканчваюцца зычным гукам: **Даниил — Данила** і інш.

На аснове аналізу імён, зробленага вучоным, можна адзначыць, што ў выніку пэўных гістарычных умоў на тэрыторыі Беларусі з'явіліся варыянты імён — поўнае імя паводле перакладу на старажытную беларускую мову і гутарковы варыянт, або польскі, напрыклад:

Аўраам — Абрагам	Іаан — Ян
Гаўрыіл — Габрыіл	Іосіф — Юзаф
Іакаў — Якуб	Міхаіл — Міхал і інш.

ЗРОБІМ ГІСТАРЫЧНЫ ЭКСКУРС

Калі заглыбімся ў гісторыю, то пагодзімся, што менавіта не Якуб, а Іакаў, патрыярх, з'яўляецца роданачальнікам ізраільскага народа, што ён, Іакаў, — сын Ісаака і ўнук Аўраама, — атрымаў другое імя Ізраіль ад Госпада Бога. Ды і занадта шмат стагоддзяў аддзяляюць час станаўлення краін *Польшча* і *Беларусь* з іх самабытнымі непаўторнымі мовамі ад эпохі Аўраама, часу, калі яшчэ на месцы сённяшняга Мёртвага мора квітнелі гарады Садом і Гамора; ад часу Іакава, пра якога дакладна паведамляецца ў кнізе Быціе — першай кнізе Бібліі, напісанай Маісеем. І вымаўлялася гэта імя Іакаў так, як было прынята, без усякіх польскіх, калі б гэта нават і можна было па часе, пераўтварэнняў аж да часоў Ісуса Хрыста, і няхай сабе са сваімі фанетычнымі асаблівасцямі, але верыцца, што ў перакладзе на грэчаскую мову, а з грэчаскай на царкоўнаславянскую, напісанне гэтага імя перададзена дакладна. А ўвогуле ў Іудзеі імя **Іакаў** было даволі распаўсюджаным, яно сустракалася і ў часы Ісуса Хрыста. Мы ведаем асоб, якія яго насілі, напрыклад, Іакаў Алфееў, Іакаў Зевядзееў.

БІБЛІЯ Ў БЕЛАРУСІ

А цяпер разгледзім, як прыйшла Біблія да нас, усходніх славян, беларусаў.

На Беларусі Біблія стала вядома ў часы Кіеўскай Русі. Біблейскія кнігі, відаць, перапісвала Ефрасіння Полацкая. Біблію шырока каменціраваў у сваіх творах Кірыла Тураўскі. Але ў эпоху сярэдневякоўя артадаксальнае духавенства было супраць перакладу Бібліі

на жывыя народныя мовы. Першыя пераклады асобных біблейскіх кніг на старабеларускую мову зроблены ў XV ст. Вядома ж, на гэты час ужо была перакладзена Біблія і на польскую мову. Але заснавальнікам гуманістычнага падыходу да Бібліі ў Беларусі і ўсходнеславянскіх землях стаў Францыск Скарына.

НЕАЦЭННАЯ СПАДЧЫНА СКАРЫНЫ

Францыск Скарына — выдатны дзеяч беларускай культуры эпохі Адражэння, заснавальнік беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання, рознабаковая дзейнасць якога мела агульнаславянскае значэнне. Вучоны, пісьменнік, перакладчык, мастак, доктар філасофіі і медыцыны, гуманіст і асветнік аказаў значнае ўздзеянне на развіццё многіх сфер беларускай культуры.

Жывучы доўга на чужыне, ён развіў свае патрыятычныя пачуцці, паглыбіў погляды на радзіму і ўмацаваў сувязь з духоўнымі каштоўнасцямі свайго народа.

Вакол канфесіянальнай прыналежнасці Скарыны вядуцца спрэчкі. Але факты, зафіксаваныя ў навуковай літаратуры, пра многае сведчаць, напрыклад: а) каб заняцца навукай, Ф. Скарыне спатрэбілася вывучыць латынь — тагачасную мову навучання, і засвоіў ён яе ў каталіцкім бернардзінскім кляштары Полацка; б) вучыўся і паспяхова закончыў Кракаўскі ўніверсітэт; в) на пасяджэнні калегіі ў касцёле святога Урбана ў Падуі была прынята пастанова дапусціць адукаванага, здольнага Скарыну да экзамену на атрыманне вучонай ступені доктара лекарскіх навук; г) вядома, што служыў у віленскага біскупа Яна.

Адзначым яшчэ той факт, што яшчэ перад Вялікай Айчынай вайной бернардзінец Ян Кантак, які меў у

сваіх руках многія адсутныя сёння дакументы, напісаў у сваёй саліднай манаграфіі, прысвечанай ордэну бернардзінцаў, што адным з першых у Полацку пасля прыбыцця туды з Вільні бернардзінцаў, заснавання імі касцёла ў гонар святога Францыска Асізскага і кляштара «прыняла каталіцкае хрышчэнне сям'я Скарынаў». Там жа будучы першадрукар вучыўся, напэўна ж, лаціне.

Наш славуты зямляк, які пачуваў сябе ў веры хрысціянінам, з'яўляўся не толькі сынам новага часу, але перш за ўсё сынам роднага краю. Новыя рэнесансавыя ідэі ён прымаў асцярожна, трымаючы курс на асвету. Умеў быць разважлівым і стрыманым. Азнаёміўшыся з культурамі розных краін Еўропы, з кнігавыдавецкай дзейнасцю гэтых краін, памятаў, што ў яго на радзіме існуе свой уклад жыцця, адметны ад іншых. Свае кнігі першадрукар выдаваў на царкоўнаславянскай мове беларускай рэдакцыі, на палях рабіў пераклады цяжкіх для разумення царкоўнаславянізмаў, багаслоўскіх тэрмінаў і ў самім тэксце пераказваў асобныя выслоўі жывою, зразумелаю шырокаму колу чытачоў моваю. Таму, напрыклад, кніга «Апостал» прызначалася для самастойнага чытання, адукацыі і для набажэнства.

У эпоху Адраджэння ў Беларусі былі дзве імёнаназыўныя сістэмы. Адна з іх для беларусаў, устаноўленая рускамоўнай Праваслаўнай Царквой, другая — для беларусаў, устаноўленая польскамоўнай Каталіцкай Царквой. Паколькі на той час беларускамоўнай Каталіцкай Царквы не існавала, то беларусы каталіцкага веравызнання лічылі сябе палякамі. І так яно было да нядаўняга часу. Толькі цяпер яны зразумелі, што беларусы могуць быць і каталікамі, і праваслаўнымі, а таксама могуць належаць да іншых хрысціянскіх канфесій.

А цяпер паглядзім, якой імёнаназыўной сістэме аддаў перавагу Францыск Скарына. Вядома, той, якая належала беларусам, людзям тутэйшым, бо ў палякаў была і ёсць свая вялікая краіна — Польшча, з добра распрацаванай цудоўнай польскай мовай, мовай, якая развівалася па сваіх уласных законах. Яму, сыну беларускай зямлі, трэба было выдаць кнігу *«Богу ко чти и людемъ посполитымъ къ доброму научению»*, трэба было падняць прэстыж сваёй краіны, якой ён вельмі ганарыўся, і неаднаразова прыгадваў, што ён — са слаўнага горада Полацка. Яму не зацьмілі вочы ні прэстыжныя еўрапейскія мовы, якіх ён ведаў, па звестках вучоных, больш дзесяці, ні высокая культура еўрапейскіх краін з багатымі каралеўскімі палацамі, дзе ён, доктар лекарскіх навук высокай кваліфікацыі, філосаф, мог уладкавацца на работу і спакойна жыць. Ён жа выбраў іншы шлях — вучыць, выхоўваць беларусаў, спрыяць іх духоўнаму станаўленню, працаваць на карысць Бацькаўшчыны.

Таму ў кнігах Скарыны мы і чытаем: Ісус Хрыстос, Ісус Сірахаў, Ісус Навін, Матфей, Іаан, Іакаў-Апостал, Данііл-прарок, Аарон і шмат інш.

Калі параўнаць спіс уласных імён, якія ўжываюцца пры дапрацоўцы выдання Новага Запавету (змешчаны ў дадатку № 2) і Слоўнік мовы Скарыны, т. 3 (Мн., 1994), то заўважым, што большасць з іх супадае. А дапрацоўваліся намі тэксты Евангелля, як ужо гаварылася вышэй, з улікам «Слоўніка асабовых уласных імён» (Мн., 2005).

Францыск Скарына нібы спраектаваў свае выданні Бібліі і свае думкі на пяцьсот гадоў наперад, у наш час, даводзячы, што Святое Пісанне на роднай мове павінна народ яднаць, а не раз'ядноўваць.

ПАРАЎНАННЕ ЎЛАСНЫХ ІМЁН У РОЗНЫХ ВЫДАННЯХ ЕВАНГЕЛЛЯ

І яшчэ. Калі параўнаем у дадатку імёны дапрацаванага варыянта Новага Запавету і ранейшых выданняў, то заўважым істотнае адрозненне, напрыклад:

Авель — Абель
Анісім — Анісым
Варава — Бараба
Вераніка — Бераніка
Ілія — Гэлля
Іуда — Ёда, Юда
Лаіда — Лэя
Лідзія — Лідыя
Сіф — Сэт
Фама — Тамаш
і шмат інш.

У другой графе ўласныя імёны ў асноўным з польскай мовы, лацінізаваныя. Вы скажаце, што так склалася традыцыйна. Можна з гэтым пагадзіцца. Але і прыгадаем, што наконт традыцый, прыдуманых людзьмі, гаварылі Сын Божы, святыя Апосталы. Наўрад ці такая традыцыя спрыяе духоўнай еднасці беларускага народа.

Для падтрымання гэтай думкі адзначым, што пры дапрацоўцы тэкстаў Евангелля мы глядзелі, які з варыянтаў уласных імён і тапонімаў са Святога Пісання сустракаецца ў жыцці краіны.

І вось наведваем Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь і цікавімся подпісамі да мастацкіх палотнаў на рэлігійныя тэмы. У адной з залаў спыняемся каля палотнаў В. Д. Паленава і чытаем: «Хрыстос, Які сядзіць» і «Хрыстос на Тыверыядскім (Генісарэцкім) возеры», а подпісы да скульптурных выяў такія: «Архангел Міхаіл», «Святы Іаакім» і інш. Цяпер адгорнем падручнік па фізіцы для 10 кл. аўтараў Дыніч, Талкачова, Здановіча (Мн., 2007) і чытаем пра маятнік

Фуко, які знаходзіцца ў Ісаакіеўскім саборы Санкт-Пецярбурга. Таму сказанае вышэй яшчэ раз пацвярджае, што ўжыванне імён польскага варыянта ў Евангеллі не мае патрэбы.

Можам яшчэ паназіраць, якія імёны ўжываюцца ў беларускай аўтарытэтнай энцыклапедычнай або навукова-папулярнай літаратуры, напрыклад:

І. «Беларуская энцыклапедыя» ў 18-ці тамах:

1. *Святыя* **Фама** *і* **Матфей**. *Фрагмент габелена. Брусель. Канец XV ст.* (т. 3, с. 86).

2. *Брэсцкая* **Сімяонаўская** *царква* (т. 3, с. 293).

3. *Варнянскі архітэктурны ансамбль.* **Георгіеўскі** *касцёл* (т. 4, с. 10).

4. *Прарок* **Ілія**. *Абраз. Канец XIV — пач. XV ст.* (т. 7, с. 197).

5. *Андрэа ды Бартала.* **Іаакім** *пакідае горад. Дрэва, тэмпера* (т. 7, с. 358).

6. *Каменкаўскі* **Антоніеўскі** *касцёл* (т. 7, с. 513).

7. *Крамяніца-Дольнаўскі* **Георгіеўскі** *касцёл* (т. 8, с. 448).

8. *Ш. Лебрэн.* **Магдаліна** *каецца. 1656-57* (т. 9, с. 176).

9. *Іаган Себасцян Бах* (*арт.*). *Месы сімінор «Страсці па* **Іаану**» *і «Страсці па* **Матфею**» (т. 2, с. 356).

ІІ. Энцыклапедычны даведнік «Францыск Скарына і яго час»:

1. *Тытульны ліст кнігі* «Прарок **Данііл**» (с. 157).

2. *Тытульны ліст «Акафіста* **Іаану** *Прадцечы»* (с. 174).

3. *Евангеліст* **Іаан**. Дрэва. XVII ст. (с. 412).

4. Загаловак да артыкула «**Фама** *Аквінскі*» (с. 530).

III. «Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі» ў 5-ці т.:

1. Уклейка. *Абраз* «**Варвара** *пакутніца*» (т. 1, с. 65).

2. Уклейка. *Абраз* «*Архангел* **Гаўрыіл**» (т. 3, с. 65).

IV. Энцыклапедыя ў двух тамах «Вялікае княства Літоўскае»:

1. *Кафедральны касцёл* **Антонія** *Падуанскага ў Цельшах. 1762—65* (т. 1, с. 135).

2. *Фрэска «Распяцце». Віленскі кафедральны касцёл* **Станіслава** *і* **Уладзіслава**. *Канец XIV ст.* (т. 1, с. 140).

3. *Капліца Святога* **Іасафата** *Кунцэвіча* (т. 2, с. 686).

V. «Архітэктура Беларусі». Нарысы:

1. **Іерусалім**. *Роспіс бібліятэкі семінарыі ў* **Падуі** (т. 1, с. 9).

2. *Мазаіка* **«Ісус Хрыстос»**. *Сафійскі сабор у Канстанцінопалі* (т. 1, с. 126).

3. *Касцёл* **Міхаіла** *Архангела ў* **Гнезна**. *Агульны выгляд і сучасны галоўны алтар* (т. 1, с. 276).

VI. Церашчатава В. В. «Старажытнабеларускі манументальны жывапіс XI—XVIII стст.»:

1. *Архангел* **Гаўрыіл**. *Фрэска капліцы Святой Тройцы ў Любліне. 1418.* (с. 64).

2. **Марыя** *і* **Іаан**. *Фрагмент фрэскі з кампазіцыі «Крыжовая дарога» капліцы Святога Крыжа на Вавелі ў Кракаве. 1470.* (с. 81).

3. *Евангеліст* **Матфей**. *Роспіс Святадухаўскай царквы. Другая палавіна XVII ст.* (с. 102).

4. *Сон* **Іакава**. *Фрэска кармеліцкага манастыра ў Бялынічах. 1761.* (с. 158).

5. *Ахвярапрынашэнне* **Аўраама**. *Фрэска царквы Нараджэння Маці Божай. Слаўгарад. Канец XVIII ст.* (с. 164).

VII. «Помнікі мастацкай культуры эпохі Адраджэння»:

1. *Тытульны ліст «Акафіст* **Ісусу**». *Вільня. Каля 1522 г.* (с. 29).

2. *Святы* **Міхаіл**. *Музей Алка ў Цельшай* (с. 121).

Як бачым, у прыкладах з указанай літаратуры імёны асоб са Святога Евангелля напісаны так, як гэта было прынята ў беларусаў задоўга да нашага часу, так, як яны зафіксаваны ў новых нарматыўных слоўніках. І ці трэба іх мяняць цяпер на польскія, калі ёсць свае, беларускія, адшліфаваныя стагоддзямі. На наш погляд, самым аўтарытэтным прыкладам у выкарыстанні імён для Святога Пісання з'яўляецца наш суайчыннік — сусветна вядомы асветнік Францыск Скарына. І можам не сумнявацца, што польскую мову ён ведаў не горш, чым некаторыя з нас.

Вядома, напрыклад, што ў беларускай мове ёсць імя Іаан (Сл. асаб. ул. імён, с. 130), у польскай яно — *Ян*, у нямецкай — *Іаган*, у французскай — *Жан* і інш. І таму, калі мы чытаем у «Беларускай энцыклапедыі» (т. 7, с. 165) подпіс *Кафедральны сабор святога* **Яна** *Хрысціцеля ў Варшаве*, то нікому і ў галаву не прыйдзе гэта імя вымаўляць і пісаць інакш, як прынята ў польскай мове. Такім чынам, можна лічыць, што імя **Іаан** павінна застацца ў беларускай мове для канфесіянальнага стылю, для свецкага афіцыйнага ўжывання ёсць варыянты **Іван** і **Ян** (у новым выданні Слоўніка імя **Ян** перанесена з размоўнага стылю ў афіцыйны, с. 60, а размоўнымі засталіся *Івась, Янка, Янук, Ясь* і інш.).

➤ **Анна** ці **Ганна**?

У «Слоўніку асабовых уласных імён» зафіксаваны і імя **Анна** (с. 63) і імя **Ганна** (с. 65). У энцыклапедыі «Вялікае княства Літоўскае» (т. 1, с. 420) чытаем: *Віленскі касцёл* **Ганны** (тут чамусьці апушчана слова *святой*). Імя *Ганна* мы можам сустрэць у дачыненні да святой **Анны** — Маці Дзевы Марыі — і ў іншых крыніцах.

Але ці правільна гэта? Магчыма, у Святым Пісанні трэба ўсё-такі ўжыць імя **Анна**, бо **Анна** — не толькі жаночае імя, але і мужчынскае, што ў перакладзе азначае *літасцівы*. Аннам звалі, напрыклад, іудзейскага першасвятара — цесця Каіафы. Калі Ісуса Хрыста ўзялі ў Гефсіманскім садзе, то спачатку яго прывялі да Анны, які карыстаўся на той час вялікім аўтарытэтам, а той ужо ў сваю чаргу адправіў Яго да Каіафы.

Сярод жанчын, акрамя Маці Дзевы Марыі, імя **Анна** мелі і іншыя асобы, напрыклад, і маці прарока Самуіла, і жонка Тавіта, і прарочыца з калена Асіравага — дачка Фануіла. Менавіта прарочыца **Анна**, дасягнуўшы глыбокай старасці, разам з Сімяонам славіла маленькага Госпада Ісуса Хрыста, Якога Бацькі прынеслі ў Іерусалімскі храм.

Таму мяркуем так: мужчынскае і жаночае імя **Анна** ўзяць для асоб, якія ўпамінаюцца ў Святым Пісанні, а жаночае імя **Ганна** пакінуць для беларусак, бо, напрыклад, нават расійскую імператрыцу **Анну** наўрад ці мы назавём *Ганнай*.

Добрым прыкладам па гэтым пытанні з'яўляецца кніга Лакоткі А. І. «Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры», дзе знаходзім подпіс: *Касцёл Святой* **Анны** *ў Вільні, XIII ст.* (с. 221).

➤ **Давід** ці **Давыд**?

Калі ідзе размова пра цара **Давіда** — асобы з радаводу Ісуса Хрыста і аўтара Псалтыра, то гэта імя напішам так: **Давід**. Пра гэта сведчаць пераклады Святога Пісання прадстаўнікоў іншых хрысціянскіх канфесій усходніх славян, некаторыя пераклады кніг Евангелля на беларускую мову, а таксама разнастайная свецкая літаратура, напрыклад:

І. Энцыклапедычны даведнік «Францыск Скарына і яго час»:

1. **Давід** *перад кіотам. Гравюра з тытульнага ліста 2-й кнігі «Царствы» Ф. Скарыны* (с. 316).

2. *Памазанне* **Давіда**. *Гравюра з тытульнага ліста 1-й кнігі «Царствы» Ф. Скарыны* (с. 441);

3. *Назва артыкула «Цар* **Давід**» (с. 541).

4. *Цар* **Давід**. *Гравюра з тытульнага ліста «Псалтыра» Ф. Скарыны* (с. 541).

ІІ. «Помнікі мастацкай культуры эпохі Адраджэння»:

1. **Давід**, *які іграе на цымбалах* (с. 50).

2. *Цар* **Давід** *іграе ў гуслі* (с. 222).

➤ **Маісей, Майсей, Масей.**

Маісей — старажытнаяўрэйскае імя, абазначае *узяты, выратаваны з вады.* Маісей — прарок, першы іудзейскі пісьменнік, кіраўнік і заканадаўца. Пажадана пакінуць у перакладзе на беларускую мову першы варыянт напісання гэтага імя — **Маісей**, як прынята ва ўсіх усходніх славян. Варыянты **Майсей, Масей** пакінуць для свецкага ўжывання.

У «Пасланні да Яўрэяў» Апостала Паўла чытаем: *Веру* **Маісей** *быў утойваны бацькамі сваімі на працягу трох месяцаў пасля яго нараджэння, бо яны бачылі, якое гэта цудоўнае дзіця, і не спалохаліся зага-*

ду цара (11, 23). *Вераю* **Маісей**, *калі стаў дарослым, адмовіўся называцца сынам фараонавай дачкі, ён палічыў за лепшае цярпець разам з Божым народам, чым карыстацца часовымі дабротамі граху* (11, 24—25).

➤ **Матфей, Мацвей** ці **Мацей**?

Імя **Матфей** у перакладзе азначае *дар Божы*. **Матфей** — Апостал з 12-ці, евангеліст, аўтар першага Евангелля, іначай называўся *Левіем* ці *Левіем Алфеевым*. Аб прызванні яго Госпадам з мытнікаў да апостальскага служэння ўпамінаецца ў Святым Пісанні (Мк 2, 14; Лк 5, 27). Напрыклад, чытаем: *Адыходзячы адтуль, Ісус убачыў чалавека, званага* ***Матфеем***, *які сядзеў у мытні, і сказаў яму: ідзі за Мной. Той устаў і пайшоў* (Мф 9, 9).

Таму, калі ідзе гаворка пра святога Апостала, то менавіта імя **Матфей**, а не спрошчаныя яго варыянты ўжываюцца нават у разнастайных свецкіх крыніцах, не гаворачы ўжо пра канфесіянальную літаратуру, напрыклад:

1. «Беларуская энцыклапедыя», т. 3, с. 86: *Святыя* **Фама** і **Матфей**. *Фрагмент габелена. Брусель. Канец XV ст.*

2. Церашчатава В. В. «Старажытнабеларускі манументальны жывапіс XI—XVIII стст.»: *Евангеліст* **Матфей**. *Роспіс Святадухаўскай царквы. II палова XVII ст.* (с. 102).

➤ **Сцяфан** ці **Сцяпан**?

Імя **Сцяфан** у Новым Запавеце ўпамінаецца двойчы:

1. **Сцяфан** (Дзн 6, 5) — першапакутнік, першы з сямі дыяканаў, пастаўленых Апосталамі. Мужны пра-

паведнік і абаронца Хрысціянства, за што быў забіты камянямі ў прысутнасці Саўла.

2. **Сцяфан** — член Карынфскай Царквы. Яго сям'я ў ліку нямногіх прыняла хрышчэнне ад рукі святога Апостала Паўла і шчыра служыла Госпаду Богу і ўмацаванню Божай Царквы.

Сцяпан — афіцыйнае імя, зафіксавана ў «Слоўніку асабовых уласных імён» М. Р. Судніка (с. 53). Вытворнае ад яго імя *Сцёпа*, *размоўныя* варыянты *Сахван*, *Стапусь*, *Стэлька*.

Цяпер давайце прааналізуем, хто можа быць Сцяфанам і Сцяпанам.

Калі імя **Сцяфан** адразу нагадвае адну з асоб Святога Пісання, то прыгаданае імя **Сцяпан** яшчэ нам нічога не гаворыць. Гэта можа быць і пэўная асоба, можа быць і казачны герой або літаратурны персанаж, як, напрыклад, у творы А. Вольскага «Сцяпан — Вялікі Пан».

Такім чынам, у Евангеллі правільным будзе выкарыстанне імя **Сцяфан**.

➤ **Фама** ці **Тамаш**?

Звернемся да «Слоўніка асабовых уласных імён» М. Р. Судніка і прачытаем адпаведныя артыкулы.

Тамаш, *разм.*, гл. Фама (с. 54);

Фама (*разм.* Хама, Хамусь, Тамаш, Тумаш) (с. 54).

Як бачым, размоўны варыянт *Тамаш* не можа адносіцца да святога Апостала **Фамы**.

Фама (у перакладзе з грэчаскай мовы *блізня*) — Апостал з 12-ці. Калі Гасподзь Ісус Хрыстос намерыўся пайсці ўваскрэсіць Лазара, *тады* **Фама**, *званы Блізнём, сказаў іншым вучням: хадзем і мы, каб памерці*

разам з Ім (Ін 11, 16). Гасподзь таксама прапанаваў **Фаме** паглядзець на раны Яго, атрыманыя ў час Укрыжавання, каб той паверыў, што Ісус Хрыстос сапраўды ўваскрэс (Ін 20, 24-29).

➤ **Іуда** ці **Юда**?

Імя **Іуда** (абазначае *праслаўлены*, г. зн. *Іегова*) сустракаецца ў Бібліі 17 разоў. Гэта не толькі чалавек, які здрадзіў Госпаду Богу, выдаўшы Ісуса Хрыста за 30 срэбранікаў, але ёсць і іншыя, паважаныя асобы. Сярод іх, напрыклад, іудзей, які жыў у Дамаску і ў якога некаторы час знаходзіўся Саўл — будучы Апостал Павел; адзін з братоў Іерусалімскай Царквы, які меў другое імя Варсава, быў прарокам; і, урэшце, аўтар Паслання, які называе сябе братам Іакава, і інш.

А **юда**? У беларускай мове назоўнік **юда** не ўласны, а агульны, пішацца з малой літары. Гэта слова можна знайсці ў розных слоўніках, напрыклад:

1. У «Слоўніку беларускай мовы», с. 899, пасля **юда** стаіць памета *разм.* Значыць, слова з размоўнага стылю.

2. «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы», т. 5, кн. 2, с. 484: **юда** *пагард., лаянк.* — здраднік. *Я юдам не стану. Ад мяне вы звестак не атрымаеце.* М. Ткачоў.

3. «Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча», с. 540:

юда *абразл.* — прадажнік, здраднік;

юдзіць — спакушаць, падгаворваць; зводзіць.

4. Сцяшковіч Т. Ф. «Слоўнік Гродзенскай вобл.»:

з'юдзіць — падгаварыць на дрэнны ўчынак (с. 185);

пад'юдзіць — навучыць дрэннаму, *неадабр.* (с. 292);

юдаш — злы, помслівы чалавек (с. 571).

5. Адгорнем «Слоўнік асабовых уласных імён» М. Р. Судніка і пераканаемся, што імя **Юда** ў сучаснай беларускай мове не існуе, яно проста не рэкамендавана людзям для ўжывання ў якасці імені.

Такім чынам, прааналізаваўшы з пазіцый сучаснай беларускай літаратурнай мовы значэнне ўласнага назоўніка **Іуда** і адпаведнага яму агульнага **юда**, прыходзім да высновы, што ў Святым Пісанні павінна ўжывацца **толькі** імя **Іуда** і адпаведныя яму словы і спалучэнні слоў, за якімі захоўваецца пэўны сэнс: **Іудзея**, **Іудзейская** пустыня або **Іудава** пустыня, **Іудзейскае** царства, **Іудава** калена, **Іудавы** горы. І яшчэ наша задача заключаецца ў тым, каб правільна назваць і дакладна перакласці на беларускую мову цікавейшы твор Новага Запавету — Пасланне святога Апостала **Іуды**.

Як бачым, пры перакладзе Святога Евангелля ўзнікае шмат пытанняў. Цяпер нам трэба вызначыцца: ці мы будзем ісці ўпоравень з жыццём, з дасягненнямі навейшай лінгвістыкі і з захаваннем старадаўніх беларускіх традыцый, з развіццём беларускай культуры з улікам сродкаў навучання і выхавання моладзі, ці будзем таптацца ізалявана, няхай сабе гэта будзе нават даволі значная частка вернікаў адной з канфесій. І будзем паказваць пальцам, што ў іх, у другіх, усё не так? А калі не ляжа наша Евангелле на школьны стол побач з іншымі хрысціянскімі выданнямі, дзе ўжо напрацаваны праграмы, выданні дзецям для афіцыйнага выкарыстання, то што загадаем рабіць вучням — дзецям з сем'яў каталікоў? Рабіць выгляд, што гэта *не маё*, пакідаць клас ці проста займацца іншымі справамі, як некалі ў савецкі час дазвалялася рабіць вучням, вызваленым ад вывучэння беларускай мовы, каб ***речь не засорять***? Няхай Гасподзь Бог крые, каб дапусціць такое.

На нас зараз ляжыць вельмі сур'ёзная і адказная задача. Таму хочам выслухаць вас, паважаныя вучоныя-лінгвісты.

Можа нехта сказаць, што ўжо ёсць добрыя пераклады Евангелля, зробленыя праваслаўнай царквой. Не адмаўляем. У іх першае і другое выданне зроблены, на наш погляд, выдатна, прычым першы варыянт — на чатырох мовах, з тэксталагічным аналізам.

Але нам патрэбна свая кніга, з яшчэ больш узвышанай беларускай мовай, тэксты, прынятыя Рымска-Каталіцкай Царквой, са спецыфічнай структурай, з крыху іншым падзелам на часткі-вершы. Такім чынам, пры перакладзе Святога Евангелля трэба пакінуць без змяненняў прынцыповыя пытанні і працаваць над лексікай.

Пажадана, каб ва ўсіх беларусаў без дзялення на хрысціянскія канфесіі, у кожнага чалавека, які чытае Свяшчэннае Пісанне, цікавіцца свецкай культурай, атрымлівае веды ў беларускіх навучальных установах, склалася аднолькавае цэласнае ўяўленне пра Сына Божага, Госпада нашага Ісуса Хрыста, пра святых Апосталаў, пра асоб, якія стаялі на службе Хрысціянства, каб нішто, што тычыцца духоўнага станаўлення асобы, не раз'ядноўвала беларусаў. Будзем памятаць, што наша краіна і мова — усходнеславянскія са сваёй гістарычнай спадчынай, а Польшча, мілагучная польская мова — заходнеславянскія, належаць этнічным палякам. І штучна пераносіць слоўнікавы склад польскай мовы, нават на аснове канфесій, няма патрэбы, тым больш, што ўпершыню ў гісторыі краіны, дзякуй Богу, мы маем сваю **беларускамоўную Каталіцкую Царкву**, маем свае касцёлы-святыні.

Будзем удасканальваць паміж народамі і сваю беларускую канфесіянальную літаратуру з улікам сваіх, беларускіх, законаў мовы. І ў першую чаргу кнігі Святога Евангелля, якія павінны аднолькава служыць, як і наша адзіная родная беларуская мова, кожнаму беларусу, незалежна ад канфесіі.

Шаноўныя чытачы, заўважу, што выданне кнігі «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» мае на мэце яшчэ і паведаміць, што рыхтуецца другі дапрацаваны варыянт кнігі Новага Запавету з прадмовамі да кожнай часткі, а таксама Біблейская энцыклапедыя да кніг святога Евангелля (узор мы прапануем у дадатку № 4) і слоўнік беларускай мовы, у які будуць уключаны многія тэрміны з біблейскай і канфесіянальнай лексікі.

ДАДАТАК № 1

МОВА — ДУША НАРОДА

Хвала Ісусу Хрысту!

Добры дзень, шаноўныя людзі!

Спакой Божы няхай будзе ў Вашых сем'ях і дамах!

Дазвольце звярнуцца да вас, вашага сумлення са святарскім словам пра мову нашу.

Дзякуючы мове, якой Гасподзь адарыў кожны народ, і друкаванаму слову, мы маем магчымасць паразумення з другімі людзьмі як у межах адной дзяржавы, так і сярод народаў іншых краін, і не толькі ў сферы штодзённага жыцця, але і ў храмах. Дарэчы, выдаўцом першай друкаванай кнігі сярод усходніх славян з'яўляецца наш суайчыннік, асветнік Францыск Скарына. І кніга гэта — Біблія, выдадзеная ў жніўні 1517 г., адрасавана *«Богу кто чти и людемъ посполитымъ къ доброму научению»*.

Слова Божае даступна для кожнага народа, калі яно гучыць на мове гэтага народа. Гэта датычыцца і Беларусі. Узносяцца Усявышняму малітвы на роднай мове падчас правядзення набажэнстваў, удзялення Сакрамантаў.

Каталіцкі Касцёл і Праваслаўную Царкву, Галавой і Пастырам якіх з'яўляецца Ісус Хрыстос, называем яшчэ Апостальскімі. Бо толькі Апосталам і іх наступнікам Ісус Хрыстос пасля Свайго годнага хвалы Уваскрэсення даручыў місію прапаведавання Слова Божага —

Евангелля: *«Ідзіце па ўсім свеце і абвяшчайце Евангелле ўсякаму стварэнню. Хто паверыць і ахрысціца, збаўлены будзе; хто ж не паверыць, асуджаны будзе»* (Мк 16, 15-16).

Слова «**Catholicos**» — азначае Паўсюдны, Каталіцкі, Вселенский — для ўсяго свету, усіх людзей, усіх пакаленняў.

У Вялікім княстве Літоўскім на ўсіх дзяржаўных узроўнях карысталіся беларускай мовай, вялі на ёй дакументацыю, таму што быў прыняты Статут Вялікага княства Літоўскага (1566 г.), які абавязваў да гэтага.

Рэнесанс у гісторыі Беларусі з поўнай падставай называюць залатым векам, бо ў гэты час не толькі выйшлі ў свет першыя 23 друкаваныя кнігі Бібліі (1517—1519 гг.) і «Малая падарожная кніжыца» (1522) Францыска Скарыны, цудоўная паэма «Песня пра зубра» Міколы Гусоўскага, «Катэхізіс» (1562) Сымона Буднага, «Евангелле» (1580) Васіля Цяпінскага, першыя вершы па-беларуску, але і былі дасягнуты значныя поспехі ў розных галінах культуры, духоўнасці і мастацтва.

Беларуская мова ў XVI — першай палове XVII ст. дасягнула вышэйшага ўзроўню свайго развіцця. Развівалася грамадства, развівалася і граматыка. **«Народ выражае сябе найпаўней і найдасканалей у мове сваёй**, — пісаў у XIX ст. вядомы рускі лінгвіст І. Сразнеўскі. — **«Народ і мову нельга ўявіць адно без аднаго»**, — падкрэсліваў ён.

14 ліпеня 1924 г. распачынаецца так званая поўная беларусізацыя (усё павінна быць на беларускай мове). Канстытуцыя 1927 г. аб'яўляе беларускую мову «пераважнай для зносін як дзяржаўных і прафесійных, так і грамадскіх устаноў і арганізацый».

Беларуская мова мае глыбокія жыватворныя карані ў стагоддзях: і як дзяржаўная мова беларускага народа, і як духоўная мова ў храмах.

Адносіны да беларускай мовы з боку Касцёла былі ў многіх выпадках вельмі сталыя і сур'ёзныя. Гэтаму гістарычныя сведчанні і стаўленне да беларускай мовы Віленскага біскупа Ропа, Айцоў мар'янаў у парафіі Друі Віцебскай вобл., ксяндзоў А. Станкевіча, Я. Германовіча, К. Стаповіча, А. Астрамовіча, А. Цікоты, П. Пякарскага, В. Гадлеўскага і многіх іншых. Поўня беларускай мовы выражаецца і ў малітвах, песнях, напр., «Мы хочам Бога»:

...Хай будзе Бог у сямейным коле,
У жыцці бацькоў, у дзіцячых снах.
Хай будзе Ён у кніжцы, у школе,
У адпачынку, у працы днях ...
Мы хочам Бога ў нашым Краі,
Між беларускіх бедных стрэх.
У нашай мове і звычаях

(падкрэслена намі — У.З.)

Не можа меці месца грэх...

XVI стагоддзе стала Залатым векам для беларускай мовы, культуры, архітэктуры, жывапісу. Нешта падобнае ў наш час магло паўтарыцца на рубяжы 80—90 гадоў XX стагоддзя, у час так званай перабудовы.

Настаў Духоўны век — беларуская мова прызнана Канстытуцыяй. Адраджаецца мова і ў якасці духоўнай і літургічнай у святынях Беларусі. І мы павінны разумна, з любоўю прыкладаць свае сілы і сваё стараннe, каб выкарыстаць кожную хвіліну ў гэтай святой справе. Тут патрабуецца і наш удзел, унутраная ду-

хоўная перабудова кожнага з нас, наша жывая вера незалежна ад накірунку адукацыі ці ўзросту. Гэта асабліва датычыцца інтэлігенцыі.

Без унутранай духоўнай перамены ў сабе мы не вельмі многа ўзнёслага і карыснага зможам прынесці Бацькаўшчыне, якая чакае ад кожнага сыноўняй любові і ўдзячнасці. Роднае Божае Слова ў Святынях глыбей узварушвае сэрца чалавека, адраджае дух любові дзяцей да бацькоў, узмацняе павагу да продкаў як простых, так і вялікіх, вучоных, да гісторыі свайго народа, пашану да старэйшых і ўладаў. Вельмі важна тое, што ў храмах, у сэрцах людскіх нараджаецца вера не толькі ў Госпада Бога, але і ўпэўненасць ў сваіх духоўных сілах, творчых і цнатлівых.

Зразумець гэта дапамагае вялікі Апостал народаў Павел: *«Дык вера ад слухання, а слуханне ад Слова Божага»* (Рым 10, 17). Вось на гэтым духоўным і маральна чыстым фундаменце веры можна смела працягваць будаваць сваё жыццё, сям'ю, культуру, традыцыі і Бацькаўшчыну. Дух вечны, чалавек жа і ўсе фізічныя рэчы — часовыя. Толькі Дух аб'ядноўвае і ўсё трымае, падобна як цэментны раствор трымае цагліны, камяні высокага дома. Дух і вера надаюць форму той ці іншай культуры народа, чалавека.

Чалавецтва яшчэ не навучылася разумець і не ў стане асэнсаваць і ўспрыняць такія памеры, як **УНІВЕРСУМ** і **АДЗІНКА.**

Універсум і адзінка — гэта **АЛЬФА** і **АМЕГА.**

АДЗІНЫ і **ПАЎСЮДНЫ** — тут, цяпер, у гэтую хвіліну ў табе. Ці па сіле табе гэта, чалавеча?

Губляецца пашана чалавека да чалавека, самай асноўнай мэтай жыцця сёння становіцца жаданне разбагацець, мець як мага больш. І гэта зразумела, бо

калі няма веры ў Бога, калі чалавек душою не бачыць Бога, тады не бачыць і бліжняга свайго. Але Боская справядлівасць ніколі не спазняецца, заўсёды прыходзіць у адпаведны час, калі на яе найменш спадзяюцца.

Паглядзіце, як кожная рэспубліка былога Саюза цяпер адраджае сваю мову, і гэта зразумела, гэта нармальны працэс вяртання да свайго. Вялікі атэістычны эксперымент не ўдаўся не толькі з нацыянальнымі мовамі, каб аб'яднаць іх у адну, але і з усім, што звязана з гігантаманіяй, казарменным, калектыўным жыццём і працаю. У кожным чалавеку, у цэлых народах ад пачатку закладзены Богам своеасаблівасць, непаўторнасць. Хачу тут ужыць тэрміны **РАЗАМ** і **ПААСОБКУ**.

Разам як народы, паасобку як нацыі.

Чалавек у калектыве, у школе, на рабоце, у вёсцы, у горадзе, нават у сям'і — разам, але як асоба — самаіснаяя, самадастатковая як здароўем, адзеннем, здольнасцямі, так і характарам, сілаю, душой, жыццём. Гэта Боскія дары, якія чалавек ніколі не здолее зламаць, перамяніць, пераўтварыць у адну масу. Асобныя людзі не могуць знішчыць народ, аб гэтым сведчыць гісторыя. Маем на ўвазе апошнія 10 гадоў: «всё возвращается на круги своя». Мы бачым, як вяртаюцца родная мова, культура, гісторыя да сваіх народаўдзяцей у кожнай рэспубліцы, і мы сведкі гэтага. Выступаючы супраць гэтых адвечных законаў, ты, чалавеча, выступаеш супраць спрадвечных, Богам закладзеных правоў — Законаў, Запаведзяў. А гэта ўжо святатацтва і выступленне супраць Бога.

Ці гатовы ты, чалавек, ізноў ужо сёння змагацца з Богам праз пасрэдніцва людзей з Тым, Які быў, Які ёсць, Які надыходзіць, з Творцам Неба і Зямлі, усяго

бачнага і нябачнага, Які і цябе стварыў? Ты — **homo sapiens**. Зірні краем вока ў гісторыю на пакаленні і народы. Дзе яны? Хто перамог: чалавек ці Гасподзь Бог? **Хто як Бог**, — Архангел Міхаіл — галоўны апякун нашай Беларусі, абаронца ад сатаны. Святы Аўгусцін з болем душы выкрыкнуў аднойчы: «Неспакойная душа і дух мой, Божа, аж пакуль не спачне ў Табе, мой Госпадзі!»

Цяпер ідзе час станаўлення кожнай з рэспублік былога СССР як асобнай дзяржавы, і калі ўсё ўсталюецца, тады зноў паўстане сімпатыя да суседзяў, іх мовы, культуры і г. д. — як роўны да роўнага. Навасе́лле святкуецца некалькі дзён, а пасля наведваюць суседзяў, шукаюць з імі сталай прыязні і ўзаемадапамогі. Навасе́лле ў маладых дзяржавах праз некалькі гадоў пройдзе, і распачнуцца салідныя стасункі з усімі навакольнымі дзяржавамі. Возьмем, напрыклад, Польшчу, Літву. Раней як інтэлігенцыя, так і моладзь у гэтых краінах не вельмі добраахвотна вучылі рускую мову, пад прымусам, а цяпер многія лічаць за гонар размаўляць па-руску.

«Мы — суседзі!» — кажуць. Перамагае дух — Духоўны век.

Кожны народ мае ад Бога своеасаблівую ласку і абарону — сваю святыню, санктуарый — святое месца пілігрымак, сваіх Святых Заступнікаў — Апекуноў краіны. З даўніх часоў Каталіцкі Паўсюдны Касцёл прысвяціў Беларусь апецы святога Міхаіла Архангела і Маці Божай Будслаўскай. Праваслаўная Царква даручае Беларусь апецы святой Ефрасінні Полацкай. І падобна гэтаму кожная краіна, народ прысвяцілі сябе і сваю Айчыну апецы Божай і заступніцтву Святых. Паглядзіце ўважліва на гербы розных краін свету,

на гербы розных гарадоў Беларусі, напрыклад, сталіцы Беларусі — г. Мінска.

Такім чынам, калі хто выступае супраць іншага народа, краіны, культуры, мовы, той грашыць перад Богам, выступае супраць Усявышняга і Святых Апекуноў — Заступнікаў, а гэта ўжо вельмі цяжкі грэх. Барацьба ў абарону Айчыны названа нашымі прадзедамі свяшчэннай вайной, таму што яна не толькі дзеля свабоды, аховы ад няволі, рабства, але яшчэ больш дзеля захавання сваёй культуры, развіцця народа, яго духоўнасці, таго канкрэтнага задання, якое кожнаму народу наканавала Боскае прадбачанне. **БОГ, АЙЧЫНА, ЗБАЎЛЕННЕ!**

Кожнага чалавека Гасподзь Бог адарыў жыццём, вызначыў яму шлях, прызначыў узнагароду і вечнае збаўленне. Таму чалавек не мае права загубіць сваё жыццё самазабойствам, гэта смяротны і непрабачальны грэх. Цяжкі грэх, калі чалавек шкодзіць здароўю (наркаманія, беспрабуднае п'янства, забойства, уваход у секту), за гэтыя грахі будуць пакутаваць некалькі пакаленняў родных, дзеці і ўнукі. Сваімі бязбожнымі паводзінамі чалавек пярэчыць Богу, як люцыпар, кажучы, што не будзе слухацца. «*Жывіце і размнажайцеся, рабіце зямлю сабе падданай*» (Быц 1, 28). Яўнае заданне кожнаму народу — жывіце... і Бога хваліце. Гасподзь Бог дае жыццё, і ты, чалавек, не маеш права яго знішчаць, ані сваё, ані бліжняга.

Ісус Хрыстос кажа: «*Дазвольце дзецям прыходзіць да Мяне, бо такім належыць Валадарства Божае*» (Мк 10, 14). Гэта датычыцца не толькі дзяцей з сем'яў, але і народаў з агульначалавечай сям'і. Як сведчыць гісторыя, калі хтосьці хацеў знішчыць іншых, забіць

як нацыю, той грашыў такім жа цяжкім грахом, як самазабойца.

Часта пасля вайны генералы, палкаводцы атручваліся, вешаліся, стралялiся, як, напрыклад, Гітлер і інш., або ўсенароднае правасуддзе іх асудзіла і пакарала (Нюрнбергскі працэс). Бо з кіпцюроў адданай д'яблу душы выйсця, ратунку без Боскай дапамогі, амаль няма, а толькі яшчэ глыбейшае падзенне ў геену вогненную.

Да мяне, святара, звярнуліся з просьбаю напісаць артыкул «Беларуская мова ў Касцёле». А што такое напісаць артыкул? Гэта падзяліцца з Вамі, дарагія людзі, бацькі, настаўнікі, інтэлігенцыя, вучоныя і шаноўная моладзь, сваімі думкамі як святара і духоўнай асобы. Адкрыць Вам таямніцы сэрца ў вельмі ўзнёслым і далікатным пытанні матчынай мовы, поўным дзіцячых уражанняў:

...Хай будзе Бог ў сямейным коле,
У жыцці бацькоў, у дзіцячых снах.

Тым больш калі ідзе гаворка пра мову ў Касцёле і Царкве. Цяжка ў жыцці даказваць самае простае, зразумелае, даступнае. А ці варта даказваць, напрыклад, што Чарнобыль побач з намі, што цяпер зіма і г. д.

Як даказаць Вам, добрыя людзі, што неабходна, каб беларуская мова была ў храмах, і дзе? У Беларусі!

Прывяду словы Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта: «Себя очень корю, что *не размаўляю па-беларуску*. Это мой недостаток. Но я стараюсь, чтобы и в церкви звучал белорусский язык и чтобы Церковь в этом отношении не отставала. Также я благословил в Петро-Павловском Соборе совершать некоторые частные богослуже-

ния, как крещение, венчание, молебны на белорусском языке. Некоторые молодые семьи желают, чтобы в процессе богослужения звучала *родная мова*. Ещё я прошу отцов общаться с народом *на беларускай мове* и проповедовать слово Божье». Размову праводзіла Валянціна Шымановіч (артыкул «Любить человека — это всегда подвиг» надрукаваны ў часопісе «Беларусь». — 1998, № 4).

Калі б паўстала пытанне пра ўвядзенне беларускай мовы, напрыклад, у Латвіі, Літве, Германіі, яно было б больш-менш зразумелым і шукалі б працэнтныя суадносіны беларусаў, якія пражываюць у дадзенай краіне. А ў Беларусі гэта павінна быць сілаю факта і рэальнасці — гэта Беларусь. Таму прашу цябе, шаноўны чытач, задумацца, чаму загаловак артыкула гучыць не «Беларуская мова ў Касцёле», а «Мова — душа народа».

Беларускую мову, як і кожную іншую мову, можна замяніць, ігнараваць, адкінуць, але родную мову — ніколі, гэта святатацтва. Гэта пацягне за сабой не толькі цяжкі грэх, але і праклятце. «*Калі, Іерусалім, я забуду цябе, няхай адсохне правіца мая! Няхай язык мой прыліпне да гартані маёй, калі я не буду помніць цябе, калі Іерусалім не пастаўлю за найвышэйшую радасць маю*», — сцвярджае псалміст (Пс 137, 5-6).

«*Слаўце Госпада ўсе народы! Слаўце Яго ўсе народы!*» (Пс 117, 1-2). Пытанне пра мову ў Касцёле пастаўлена вельмі рытарычна, быццам без вас, без людзей, Касцёл вырашыць гэтую праблему. Чалавеча, гэта твой асабісты і наш агульны святы абавязак. Касцёл — гэта мы, людзі! Наведвайце Святыні сем'ямі і ўсім народам, і яны будуць прамаўляць роднай моваю. Трэба быць не толькі назіральнікамі, але і душою нашых Храмаў.

Мы ўсе разам перажывалі цяжар перабудовы, многае для нас успрымаецца балюча і з неразуменнем. Хуткія перамены і ў цэнах, і ў адносінах паміж людзьмі, няўпэўненасць у заўтрашнім дні, асабліва для людзей сталага ўзросту. Якраз цяпер і настаў для ўсіх нас той момант выпрабавання даверу Богу, экзамен, якога мы духу. Настаў час вяртання да Бога і веры.

Святое Пісанне і Катэхізм Каталіцкага Паўсюднага Касцёла гавораць, што чалавек жыве толькі адзін раз у гэтым жыцці, дарогі назад няма. Усе мы памятаем крылаты выраз пісьменніка Мікалая Астроўскага: «Жизнь надо прожить так, чтобы не было мучительно больно за прожитые годы»... Пытанне: «Ці можна ў Беларусі ў храмах прапаведаваць і маліцца па-беларуску?» Дай Бог, каб толькі было каму. А як бы рэагавалі на падобнае пытанне тыя ж немцы ў Германіі, французы ў Францыі, калі б на старонках газет, часопісаў запытвалі, якая мова павінна быць у нямецкіх ці французскіх храмах, школах, інстытутах... Для іх і ўсіх іншых народаў ніколі не ўзнікала нават сумненняў, ці можна гаварыць і маліцца на роднай мове сваіх продкаў.

Калі я выконваў душпастыркія абавязкі пробашча ў Малдове (Кішынёве), з бласлаўлення Кардынала Юліяна Вайводса была ўведзена ў набажэнствы нямецкая мова як адна з многіх моў у касцельных набажэнствах Малдовы. Святая Імша і ўсе Сакраманты таксама служыліся на нямецкай мове для шматлікіх нямецкіх сем'яў, якія пераязджалі з Казахстана ў Германію. Тысячы людзей з розных куткоў Малдовы, пераадольваючы па 100—200 кіламетраў машынамі, аўтобусамі, электрычкамі, прыязджалі кожную нядзелю сем'ямі на *сваё набажэнства*. «Касцёл, — гаварылі

яны, — гэта адзінае месца ў Малдове, дзе мы адчуваем сябе паўнацэннымі людзьмі, як дома, дзе ніхто нас не прыніжае. Тут, у храме, мы можам спакойна маліцца і размаўляць на роднай нямецкай мове. Касцёл стаў для нас маленькаю Бацькаўшчынай».

Тое ж мы бачым і на прыкладзе Казахстана, дзе набажэнствы таксама вяліся на мовах тых людзей, якія рознымі лёсамі туды трапілі. Паўсюдны Касцёл адзін з першых працягнуў духоўную руку прабачэння і добрых узаемаадносін паміж людзьмі і нацыямі. Спачатку — воля і дух, а пасля, як бачым цяпер, мы пасталелі настолькі, што спакойна працягнулі руку згоды.

На сённяшні дзень ажыццяўляецца матэрыяльная (гуманітарная, медыцынская і тэхнічная) дапамога, аздараўленне дзяцей за мяжой у тых жа немцаў, наладжваюцца культурныя ўзаемаадносіны, абмен вопытам. Ездзім у гарадскім транспарце, аўтобусах, распісаных нямецкімі рэкламамі. Як велізарная віхура смерч праляцела ідэалогія фашызму, змяшаўшы і збунтаваўшы народы, нарабіўшы бяды і гора, але, дзякуй Добраму Богу, мы знайшлі сілы для прабачэння і вяртання чалавечага гонару-аблічча. Не народы вінаватыя, а тыя, хто ўкінуў іх у тую бездань узаемнай нянавісці.

Працуючы душпастырам у Латвіі, у парафіях гарадоў Валміера, Скрунда, Салдус, Кулдзіга і інш., я меў бласлаўенства і дазвол ад шаноўнага Кардынала Юліяна Вайводса і вялікае зразуменне ў той час яго сакратара, а сёння Кардынала і Мітрапаліта Латвіі Яніса Пуятса, на першыя рэгулярныя набажэнствы — Святыя Імшы для парафіянаў на латышскай мове. Тады па ўсёй Латвіі, і асабліва ў рэгіёне Курзэмэ, Святая Імша служылася толькі на лацінскай мове. (Курзэмэ —

паўночназаходняя частка Латвіі, дзе латышская мова служыць амаль эталонам літаратурнай мовы ўсёй Латвіі).

Першыя набажэнствы на латышскай мове сталі вялікай сенсацыяй, на іх пачало прыходзіць усё больш людзей, моладзі, пратэстанты-лютэране зноў вярталіся да Рымска-Каталіцкага Касцёла, кажучы: «Цяпер мы разумеем богаслужэнне і будзем маліцца з вамі». У горадзе Салдус самі лютэранскія вернікі вярнулі каталікам адзін з найбольшых касцёлаў у цэнтры горада (ён у часы ўвядзення лютэранства сілай быў адабраны ў католікаў).

Родная мова аб'ядноўвае, саграваe, развівае, беражэ не толькі самога чалавека, але і яго сям'ю, супольнасць, народ, нацыю. Тады і Бог адзін, а людзі, хоць і розных веравызнанняў, блізкія і паважаныя. І тым больш калі людзі чуюць родную мову ў Святынях сваёй Бацькаўшчыны, а там мова яшчэ больш узвышаная, бо духоўная, чыстая, малітоўная, з сэрца, душы, поўная даверу і веры, мова голасу душы, які вырываецца з грудзей, мова, поўная любові да Бога і бліжняга, мова прабачэння, напоўненая сілаю вытрымкі і моцы духа. *«Ідзі і скажы гэтаму народу, — гаворыць Гасподзь Бог прароку Ісаіі. — Чуць будзеце і не зразумееце, і вачамі глядзець будзеце і не ўбачыце»* (Іс 6, 9). Што тут скажаш, калі хочам мець адраджэнне ці мовы, ці культуры, ці народа як адзінкі, трэба распачынаць заўсёды ад духа. *«Хрыстос даў нам здольнасць быць слугамі Новага Запавету, не літары, але духа, бо літара забівае, а дух ажыўляе»* (2 Кар 3, 6). Без саліднага адраджэння веры ў нашых сем'ях і вяртання ўсіх у Храмы, малых і старых, да першакрыніц духоўнасці не будзе дадзена нам бачыць і плёну жыватворнага адраджэння.

Паўстае пытанне: **«Што такое Касцёл ці Царква?»** Гэта людзі, народ. Без людзей няма Касцёла. Хрыстовы Касцёл і Царква заўсёды між людзьмі, гэта — мы з вамі, святары і свецкія, бацькі, дарослыя і дзеці, вучоныя і простыя.

Маці-Касцёл ніколі не асудзіць, бо мы і так асуджаны сваімі бедамі, цярпеннямі, вечна ў слязах змагаемся за лепшае заўтра. Толькі ўся бяда ў тым, што чалавецтва так і не навучылася адрозніваць сапраўднае дабро ад скрытага зла. Касцёл і Царква, вернікі, браты і сёстры, праваслаўныя і каталікі шмат пацярпелі ад генацыду і ідэалогіі атэізму — тады мы былі бліжэй паміж сабою, таму што былі на адной Галгофе і кленчылі пад адным Крыжам. Як бачым, у нас не толькі адзін Гасподзь, але і адна Галгофа, аднолькавыя цярпенні, хоць трошкі адрозніваюцца крыжы, але Ісус Хрыстос на крыжы адзін і неба адно. Цяпер жа, ідучы дарогаю жыцця і адраджэння, мы спрачаемся, хто чый, хоць перасцерагаў яшчэ Апостал Павел, каб не гаварылі: *«Я Апалоса, я Кіфа, а я — Хрыста»* (1 Кар 1, 12).

Таму паўстае пытанне-зварот да інтэлігенцыі, пісьменнікаў, паэтаў, кампазітараў і выкладчыкаў, навукоўцаў і міністраў, якія працуюць у справе культурнага адраджэння: «Ці вы сапраўды духоўна цесна звязаныя з Касцёлам і Царквою?» Як часта вы па-сапраўднаму як хрысціяне наведваеце храм, ці па патрэбе голасу душы, ці толькі, каб пасвяціць пасху. Ці прымаеце Святыя Сакраманты, такія як Шлюб, Споведзь, Святое Прычасце, ці стараецеся жыць паводле адвечных Божых Запаведзяў, ці моліцеся шчыра дома і ў Храме?

Часта мы ўспрымаем Ісуса Хрыста і Яго вучэнне **«ОПТАМ»** — гэта азначае, што мы дома, сярод розных

кніг, маем Біблію — Слова Божае, але ніяк не можам успрыняць Хрыстовае вучэнне ў **«РОЗНІЦУ»** — гэта значыць, праз выкананне Боскіх Запаведзяў, прыманне Святых Сакрамантаў, выхоўваць дзяцей па-хрысціянску. Браць удзел у набажэнствах, маліцца, быць практыкуючым хрысціянінам у сваім асабістым жыцці і добрым прыкладам для сваёй сям'і. Сёння, як ніколі, шаноўныя настаўнікі, вельмі патрэбны ваш духоўны прыклад сярод моладзі, бо праз мову Сам Гасподзь Бог гаворыць да нас, праз мову адраджаецца дух веры, прагрэсу, культуры.

Не ў свечцы, якую мы трымаем у руцэ ці ставім на падсвечнік перад людзьмі, заключаецца ўся наша вера, а ў сапраўднай адказнасці перад Богам, продкамі, Бацькаўшчынай, сваім сумленнем і павагай да чалавека.

«Hic transit gloria mundi» — «Так праходзіць слава свету». Адна справа пакінуць напісанае слова, верш, мастацкі вобраз, пабудаваць дом, падобна як паставіць проста свечку ў храме, і зусім іншая — дадаць ім духоўнага жыцця, што і робяць вера і малітва.

Без веруючай інтэлігенцыі, без вас, шаноўныя бацькі, цяжка ўявіць сабе глыбокае адраджэнне. Вы думаеце, што жывяце сабе, а Касцёл і Царква — сабе. Яны існуюць толькі для вас, нясуць і ахвяруюць Госпаду Богу вашы цяжкасці, праблемы і малітвы. Ісус Хрыстос у Касцёле і Царкве церпіць за вас і разам з вамі...

Пытанне, якая павінна быць мова ў Храме? — Тая самая, што і ў сем'ях, яслях, дзіцячых садках, школах, месцах працы, ВНУ і г. д. На якой мове ў сям'і — на такой жа і ў Касцёле. «Служыце Богу, каб не памерлі».

Мілагучнасць беларускай мовы як струмень чыстай крынічнай вады, які сцякае паміж каменьчыкамі

і зялёнымі берагамі, як шчабятанне птушак у гаі. Услухайцеся, якое мяккае вымаўленне ў нашых суседзяў літоўцаў, палякаў, у Заходняй Украіне, у чэхаў, славакаў. Гэта яшчэ раз сцвярджае пра колішнюю еднасць як духоўную, так і культурную.

Таму кожны чалавек, які лічыць сябе сапраўдным грамадзянінам сваёй Бацькаўшчыны, павінен імкнуцца несці сам і запаліць жывы агеньчык любові да роднай мовы ў сэрцах сваіх блізкіх.

Скажу шчыра, што, на мой святарскі погляд і думку, калі не будзе вяртання да Бога і духоўных хрысціянскіх традыцый у сем'ях і народзе, мы ўвесь час будзем блукаць, пакуль не адродзіцца вера, якая дапаможа ўсё зразумець. Дзякуючы веры і сапраўднай любові да Бога нараджаецца любоў да бліжняга і Бацькаўшчыны. Бо ў Святыні немагчыма не ўспамінаць у малітвах пра бліжніх, пра Богам дадзены край.

Родная мова ў Касцёлах і Цэрквах Беларусі, магчыма, таму мала гучыць, што няма каму яе там слухаць. Калі апошні раз ты быў у Божым Храме, твая сям'я, твае калегі, нашы міністры? Для каго ёй там гучаць? Таму не здзіўляйся, што іншыя меншасці-народы Беларусі — палякі ў касцёлах, а рускія ў цэрквах, татары ў мячэцях — намнога лепш выглядаюць ад карэннага беларускага насельніцтва падчас набажэнстваў як сваёю колькасцю, так і дынамізмам веры.

Нам не толькі трэба патрабаваць беларускай мовы ў храмах або быць толькі назіральнікамі, нам трэба вяртацца да Бога праз Святыні Беларусі. Калі ў Святынях рэдка гучыць родная мова, гэта сведчыць аб тым, што там няма карэннага насельніцтва. Усе мы дарослыя, адукаваныя і інтэлігентныя людзі, а саромеемся прызнацца да хрысціянства, Бога, духоўнай традыцыі

продкаў. А, як сам пераконваешся, іншыя народы не саромеюцца сваёй веры. Наша прынцыповае патрабаванне беларускай роднай мовы ў Святынях толькі таму, што мы дасканальна разумеем галоўную прычыну, бо нас няма ў Святынях. Каму тады служыць і на якой мове? У Святынях Беларусі ўжо часцей гучаць набажэнствы нават на літоўскай мове для літоўцаў.

Паглядзіце, як трансфармуецца духоўна Захад. Але тут не ідзе гаворка пра тэхналогіі ці навуковы прагрэс, а пра рэлігійнасць мусульманскіх народаў, якія свята захоўваюць усе каноны сваёй рэлігіі, а рэлігія захоўвае іх мнагадзетныя сем'і і культуру. Мясцовыя ж прадаюць свае Храмы за бясцэнак, храмы пустыя — і *пустыя* сем'і. Усё трымаецца дзякуючы жывому духу, духоўнасці, які і ажыўляе ўсіх і заўсёды, а прагрэс і тэхналогіі — пясок.

Паламаўшы і разбурыўшы бачныя храмы ў краіне, толькі цяпер мы адчулі і ўбачылі, што паламалі, разбурылі штосьці большае і вельмі ўзнёслае — душы людскія, нябачныя храмы ў сэрцах людскіх. Гэта адкрытая рана бачна ў многіх з нас, бо як з даўніх часоў мы не хадзілі ў храмы, каб памаліцца, пабыць на набажэнствах, паспавядацца і прыступіць да Святога Прычасця, так гэта працягваецца і па сённяшні дзень.

Ваяўнічы атэізм даўно ўжо знік, як імгла з усходам сонца, а мы ўсё яшчэ жывём пад яго замбіраваннем.

Браты і Сёстры, увайдзіце смела ў Божы Храм, не бойцеся, Бог чакае вас. Бацькі вашы не саромеліся веры і Госпада Бога, яны вельмі цанілі і любілі храм, духоўнасць і Бога. Мы разгубленыя ў жыцці толькі таму, што згубілі храм і духоўнасць. Калі знойдзеш храм, знойдзеш веру, а знайшоўшы веру, знойдзеш і сябе, і народ, і дапамогу Божую.

Давайце ж адбудуем не толькі каменныя Святыні, але і адродзім з Божай дапамогаю душы нашы.

Родная мова, цудоўная мова!
Ты нашых думак уток і аснова!
Матчын дарунак ад самай калыскі,
Ты самацветаў яскравая нізка.

У. Дубоўка.

А цяпер слова за табою, паважаны суайчыннік, хрысціянін, сын і дачка Зямлі Беларускай. Усё залежыць ад твайго сумлення і ад твайго асабістага хрысціянскага прыкладу — жыцця.

УЛАСНЫЯ ІМЁНЫ, ЯКІЯ ЎЖЫВАЮЦЦА Ў НОВЫМ ЗАПАВЕЦЕ

У дапрацаванным выданні	У ранейшых выданнях	Ужываюцца ў сучаснай беларускай літаратурнай мове	Месца ў кнігах
Аарон	Аарон	Аарон	Лк 1, 5; Дзн 7, 40; Яўр 5, 4
Авадон	Абадон	Авадон	Апак 9, 11
Авель	Абель	Авель	Мф 23, 35; Лк 11, 51; Яўр 11, 4
Авід	Авід	—	Мф 1, 5; Лк 3, 32
Авій	Абій	—	Лк 1, 5
Авіуд	Абіюд	—	Мф 1, 13
Авія	Абія	—	Мф 1, 7
Авіяфар	Абіятар	—	Мк 2, 26
Агаў	Агаба	Агаў	Дзн 21, 10
Агрыпа	Агрыпа	Агрыпа	Дзн 25, 13
Адам	Адам	Адам	Лк 3, 38; Рым 5, 14; 1 Кар 15, 22
Адзій	Адзій	—	Лк 3, 28
Азія	Азія	—	Мф 1, 9
Азор	Азор	—	Мф 1, 14

Акіла	Аквіл(а)	Акіла	Дзн 18, 2; Рым 16, 3; 1 Кар 16, 19; 2 Цім 4, 19
Алімпан	Алімпас	—	Рым 16, 15
Алфей	Алфей	Алфей	Мф 10, 3; Лк 6, 15; Мк 2, 14; Дзн 1, 13
Аляксандр	Аляксандр	Аляксандр	Мк 15, 21; Дзн 4, 6; 1 Цім 1, 20; 2 Цім 4, 14
Амінадаў	Амінадаў	—	Лк 3, 33; Мф 1, 4
Амон	Амос	Амон	Мф 1, 10
Амос	Амос	Амос	Лк 3, 25
Амплій	Ампліят	Амплій	Рым 16, 8
Ананія	Ананія	Ананій	Дзн 5, 3
Андронік	Андронік	Андронік	Рым 16, 7
Андрэй	Андрэй	Андрэй	Ін 12, 22; Лк 6, 14; Мк 1, 16; Дзн 1, 13; Мф 4, 18
Анісім	Анісым	Анісім	Кал 4, 9; Флм 1, 10
Аніcіфор	Анезіф	Аніcіфор	2 Цім 1, 16
Аніcіфор	Анезыф	Аніcіфор	2 Цім 4, 19
Анна	Анна	Анна	Ін 18, 13; Дзн 4, 6

Анна	Ганна	Анна	Лк 2, 36
Анціп	Антыпа	Анціп	Апак 2, 13
Апаліён	Апалліён	—	Апак 9, 11
Апалос	Апалёс	Апалос	1 Кар 1, 12; Ціт 3, 13
Апалос	Апалос	Апалос	Дзн 18, 24
Апелес	Апэлес	—	Рым 16, 10
Апфія	Апфія	Апфія	Флм 1, 2
Арам	Адмін	—	Лк 3, 33
Арам	Арам	—	Мф 1, 3
Арній	Арній	—	Лк 3, 33
Арфаксад	Арфаксад	—	Лк 3, 36
Архелай	Архелай	—	Мф 2, 22
Архіп	Архіп	Архіп	Кал 4, 17; Флм 1, 2
Арцём	Артэм	Арцём	Ціт 3, 12
Арцяміда	Артэміда	Арцяміда	Дзн 19, 24
Арыставул	Арыстабул	Арыставул	Рым 16, 10
Арыстарх	Арыстарх	Арыстарх	Дзн 19, 29; Кал 4, 10; Флм 1, 24
Арэта	Арэта	—	2 Кар 11, 32
Аса	Аса	—	Мф 1, 8
Асінкрыт	Асінкрыт	Асінкрыт	Рым 16, 14
Асір	Асір	Асір	Лк 2, 36; Апак 7, 6
Аўгуст	Аўгуст	Аўгуст	Лк 2, 1

Аўраам	Абрагам	Аўраам	Мф 22, 32; Мк 12, 26; Лк 1, 55; Ін 8, 58; Дзн 3, 13; Іак 2, 21; 1 Пят 3, 6; Рым 4, 1; 2 Кар 11, 22; Гал 3, 6; Яўр 2, 16
Ахаз	Ахаз	Ахаз	Мф 1, 9
Ахаік	Ахаік	—	1 Кар 16, 17
Ахім	Ахім	Ахім	Мф 1, 14
Ваал	Ваал	—	Рым 11, 4
Ваанергес	Баанергес	—	Мк 3, 17
Валаам	Валаам	—	2 Пят 2, 15; Апак 2, 14
Валак	Валак	—	Апак 2, 14
Ваоз	Баоз	—	Мф 1, 5; Лк 3, 32
Варава	Бараба	—	Мф 27, 16; Мк 15, 7; Лк 23, 18; Ін 18, 40
Варак	Барак	Варак	Яўр 11, 32
Варахій	Варахій	Варахій	Мф 23, 35
Варнава	Барнаба	Варнава	Дзн 4, 36; 1 Кар 9, 6; Гал 2, 1; Кал 4, 10
Варсава	Барсаба	Варсава	Дзн 1, 23

Варфаламей	Баўтрымей	Варфаламей, *разм.* Баўтарамей	Лк 6, 14; Мк 3, 18; Мф 10, 3; Дзн 1, 13
Варцімей	Бартымей	—	Мк 10, 46
Варыісус	Бар-Ісус	—	Дзн 13, 6
Васор	Басор	—	2 Пят 2, 15
Веліяр	Бэліяр	—	2 Кар 6, 15
Веньямін	Бэніямін	Веньямін	Рым 11, 1
Веньямін	Беньямін	*разм.* Бэньямін	Дзн 13, 21; Апак 7, 8
Вераніка	Бераніка	Вераніка	Дзн 25, 13
Гад	Гад	—	Апак 7, 5
Гаій	Гай	—	Дзн 19, 29; 3 Ін 1, 1; Рым 16, 23; 1 Кар 1, 14
Галіён	Галіён	—	Дзн 18, 12
Гамалііл	Гамалель	Гамалііл	Дзн 5, 34
Гаўрыіл	Габрыіл	Гаўрыіл	Лк 1, 19
Гедэон	Гедэон	Гедэон	Яўр 11, 32
Давід	Давід	Давыд	Мф 22, 45; 7Мк 2, 25; Лк 1, 27; Ін 7, 42; Дзн 1, 16; Рым 1, 3; 2 Цім 2, 8; Апак 5, 5
Дамар	Дамара	—	Дзн 17, 34

Данііл	Даніла	Данііл	Мф 24, 15; Мк 13, 14
Дзімас	Дэмас	—	Флм 1, 24; Кал 4, 14; 2 Цім 4, 10
Дзімітрый	Дымітр	Дзімітрый	3 Ін 1, 12
Дзімітрый	Дэметр	Дзімітрый	Дзн 19, 38
Дзіянісій	Дыяніз	Дзіянісій	Дзн 17, 34
Друзіла	Друзыла	—	Дзн 24, 24
Дыятрэф	Дыятрэф	—	3 Ін 1, 9
Ева	Ева	Ева	2 Кар 11, 3
Евер	Эбер	—	Лк 3, 35
Еводзія	Эвода	—	Флп 4, 2
Езякія	Езэхія	Езякія	Мф 1, 10
Елеазар	Эмазар	Елеазар	Мф 1, 15
Еліакім	Эліякім	—	Мф 1, 13; Лк 3, 30
Еліезер	Эліязэр	—	Лк 3, 29
Елісавета	Альжбета	Елісавет(а)	Лк 1, 5
Елісей	Елісей	Елісей	Лк 4, 27
Еліуд	Эліюд	—	Мф 1, 14
Елмадам	Эльмадан	—	Лк 3, 28
Емор	Хамор	—	Дзн 7, 16
Енос	Энос	—	Лк 3, 38
Енох	Генох	—	Іуд 1, 14
Енох	Энох	—	Лк 3, 37; Яўр 11, 5
Епафрадзіт	Эпафрадыт	—	Флп 4, 18

Епенет	Эпанет	—	Рым 16, 5
Ерм	Гермес	—	Рым 16, 14
Ермаген	Фермаген	Ермаген	2 Цім 1, 15
Ермій	Гермес	Ермій	Дзн 14, 12
Ермій	Ярмій	Ермій	Рым 16, 14
Еслім	Хеслій	—	Лк 3, 25
Есром	Эзром	—	Лк 3, 33 Мф 1, 3
Еўціх	Эўціх	Яўціхій, *разм.* Еўціх	Дзн 20, 9
Завулон	Забулон	Завулон	Мф 4, 15
Закхей	Захей	Закхей	Лк 19, 2
Зара	Зара	—	Мф 1, 3
Зарававель	Зарабабэль	Зарававель	Мф 1, 12; Лк 3, 27
Захарыя	Захарый	Захарыя	Мф 23, 35; Лк 1, 5
Зевядзей	Забядэй	—	Мф 4, 21; Мк 10, 35; Лк 5, 10; Ін 21, 2
Зеўс	Зеўс	—	Дзн 14, 13
Зілот	Руплівы	Зілот	Лк 6, 15; Дзн 1, 13
Зіна	Зэна	—	Ціт 3, 13
Іаан	Ян	Іаан	Мф 10, 2; Мк 1, 4; Лк 1, 13; Ін 1, 15; Дзн 1, 5; Гал 2, 9

Іаанан	Ян	—	Лк 3, 27
Іаанна	Яанна	Іаанна	Лк 8, 3
Іаафам	Ёатам	—	Мф 1, 9
Іаіль	Ёэль	Іаіль	Дзн 2, 16
Іаір	Яір	—	Мк 5, 22; Лк 8, 41
Іакаў	Якуб	Іакаў	Мф 13, 55; Мк 1, 19; Лк 1, 33; Ін 4, 5; Дзн 1, 13; Іак 1, 1; Іуд 1, 1; Рым 9, 13; 1 Кар 15, 7; Гал 1, 19; Яўр 11, 21
Іамврый	Ямбр	—	2 Цім 3, 8
Іанай	Яннай	—	Лк 3, 24
Іанан	Ёна	—	Лк 3, 30
Іаній	Яні	—	2 Цім 3, 8
Іарам	Ярам	—	Мф 1, 8
Іарым	Ярым	—	Лк 3, 29
Іарэд	Ларэт	—	Лк 3, 37
Іасафат	Язафат	—	Мф 1, 8
Іасія	Ісус	—	Лк 3, 29
Іасія	Іосія	—	Мф 1, 10
Іасія	Юзаф	—	Мф 27, 56; Мк 15, 40; Дзн 4, 36

Іасон	Ясон	Іасон, *разм.* Ясон	Дзн 17, 5; Рым 16, 21
Іезавель	Іезавель	Іезавель	Апак 2, 20
Іерамія	Ерамія	Іерамія	Мф 27, 9
Іефай	Ефта	—	Яўр 11, 32
Іеханія	Яхонія	—	Мф 1, 11
Ізраіль	Ізраіль	—	Мф 2, 20; Мк 12, 29; Лк 1, 16; Дзн 1, 6; 1 Кар 10, 18; 2 Кар 3, 7; Яўр 8, 8; Апак 2, 14
Ілія	Гэлля	Ілія	Лк 3, 23
Ілія	Ілля	Ілія, *разм.* Ілля	Мф 27, 49; Ін 1, 21; Мк 8, 28; Лк 1, 17
Імяней	Гіменай	Імяней	1 Цім 1, 20
Імяней	Гіменей	Імяней	2 Цім 2, 17
Іона	Ёна	Іона	Мф 12, 39; Лк 11, 29; Ін 1, 42
Іосіф	Ёзэх	Іосіф	Лк 3, 26
Іосіф	Юзаф	Іосіф	Мф 1, 16; Мк 15, 43; Лк 1, 27; Ін 6, 42; Дзн 1, 23; Яўр 11, 21; Апак 7, 8

Іоў	Ёў	Іоў	Іак 5, 11
Ір	Гер	—	Лк 3, 28
Ірад	Ірад	—	Мф 14, 1; Мк 6, 21; Дзн 4, 27; Лк 1, 5; Лк 3, 1
Ірадзіён	Ірадыён	Ірадзіён	Рым 16, 11
Ірадзіяда	Ірадыяда	Ірадзіяда	Мф 14, 3; Мк 6, 17; Лк 3, 19
Ісаак	Ісаак	Ісаак	Мф 22, 32; Мк 12, 26; Лк 3, 33; Рым 9, 7; Гал 4, 28; Яўр 11, 20; Дзн 3, 13
Ісаія	Ісая	Ісаія	Мф 3, 3; Лк 4, 17; Ін 1, 23; Мк 1, 2; Дзн 8, 28; Рым 10, 20
Ісаў	Ісаў	—	Рым 9, 13; Яўр 11, 20
Ісахар	Ізахар	—	Апак 7, 7
Іскарыёт	Іскарыёт	—	Мф 26, 14; Мк 3, 19; Лк 6, 16; Ін 6, 71
Ісус	Езус	Ісус	Мф 1, 1; Мк 1, 14; Лк 1, 31; Ін 1, 40

Ісус	Ёзуа	Ісус	Дзн 7, 45; Яўр 4, 8
Іуда	Ёда	—	Лк 3, 26
Іуда	Юда	—	Мф 1, 2; Лк 1, 39; Мк 3, 19; Ін 6, 71; Дзн 1, 13; Іуд 1, 1; Яўр 8, 8; Апак 7, 5
Іуст	Юст	Іуст	Дзн 1, 23
Іуст	Юстын	Іуст, *разм.* Юстын	Кал 4, 11
Ієсей	Ясей	Ієсей	Мф 1, 5; Лк 3, 32; Дзн 13, 22
Ієсей	Ясэй	Ієсей	Рым 15, 12
Каіафа	Каяфа	—	Мф 26, 57; Лк 3, 2; Ін 11, 49; Дзн 4, 6
Каін	Каін	—	Іуд 1, 11; Яўр 11, 4
Каінан	Каінам	—	Лк 3, 36
Кананіт	Руплівы	Кананіт	Мф 10, 4; Мк 3, 18
Карнелій	Карнель	Карнелій	Дзн 10, 1
Карп	Карп	Карп	2 Цім 4, 13
Карэй	Кор	—	Іуд 1, 11
Касам	Касам	—	Лк 3, 28

Кварт	Кварт	—	Рым 16, 24
Квірыній	Квірыній	—	Лк 2, 2
Кіфа	Кефас	Кіфа	Ін 1, 42
Кіфа	Кіф	Кіфа	1 Кар 3, 22; Гал 2, 9
Кіфа	Кіфа	Кіфа	1 Кар 1, 12
Кіс	Кіс	—	Дзн 13, 21
Клаўдзій	Клаўдзій	Клаўдзій	Дзн 11, 28
Клаўдзія	Клаўдзя	Клаўдзія, *разм.* Клаўдзя	2 Цім 4, 21
Клімент	Клеманс	Клімент	Флп 4, 3
Кляопа	Клеафас	Кляопа	Лк 24, 18; Ін 19, 25
Крыскент	Крэсцен	Крыскент	2 Цім 4, 10
Крысп	Крысп	—	Дзн 18, 8; 1 Кар 1, 14
Лазар	Лазар	Лазар	Лк 16, 20; Ін 11, 1
Лаіда	Лэя	Лаіда	2 Цім 1, 5
Ламех	Ламех	—	Лк 3, 36
Левій	Левій	—	Мк 2, 14; Лк 3, 24; Яўр 7, 5; Апак 7, 7
Лідзія	Лідыя	Лідзія	Дзн 16, 14
Лін	Лін	Лін	2 Цім 4, 21
Лісаній	Лізаній	—	Лк 3, 1
Лісій	Ліцый	—	Дзн 23, 26

Лот	Лот	Лот	Лк 17, 28; 2 Пят 2, 7
Лука	Лука	Лука	Кал 4, 14; Флм 1, 24; 2 Цім 4, 11
Луцый	Люцый	—	Дзн 13, 1; Рым 16, 21
Мааф	Маат	—	Лк 3, 26
Магдаліна	Магдалена	Магдаліна	Мф 28, 1; Мк 15, 40; Лк 8, 2; Ін 19, 25
Маінан	Мена	—	Лк 3, 31
Маісей	Майсей	Майсей	Мф 17, 3; Мк 1, 44; Лк 2, 22; Ін 1, 17; Дзн 3, 22; Іуд 1, 9; Рым 5, 14; 1 Кар 9, 9; 2 Кар 3, 7; 2 Цім 3, 8; Яўр 3, 2; Апак 15, 3
Малелеіл	Малялел	—	Лк 3, 37
Малх	Малх	—	Ін 18, 10
Манаіл	Мэнахем	—	Дзн 13, 1
Манасія	Манасес	—	Мф 1, 10
Марк	Марк	Марк	Дзн 12, 12; 1 Пят 5, 13; Кал 4, 10; 2 Цім 4, 11; Флм 1, 24

Марфа	Марта	Марфа	Лк 10, 38; Ін 11, 1
Марыя	Марыя	Марыя	Мф 1, 16; Мк 16, 1; Лк 8, 2; Ін 19, 25; Дзн 1, 14
Марыям	Марыя	—	Рым 16, 6
Матафій	Матафій	—	Лк 3, 25
Матафій	Матацый	—	Лк 3, 26
Матафай	Маттат	—	Лк 3, 31
Матфан	Маттан	—	Мф 1, 15
Матфат	Маттат	—	Лк 3, 29
Матфат	Матфат	—	Лк 3, 24
Матфей	Мацвей	Мацвей	Мф 9, 9; Мк 3, 18; Дзн 1, 13; Лк 6, 15
Матфій	Мацей	*разм.* Мацей	Дзн 1, 23
Мафусал	Матусал	—	Лк 3, 37
Мелеай	Мелій	—	Лк 3, 31
Мелхій	Мельхій	—	Лк 3, 24
Мелхій	Мэльхій	—	Лк 3, 28
Мелхіседэк	Меліхізэдэк	—	Яўр 5, 10
Мелхіседэк	Мельхізадэк	—	Яўр 7, 10
Мелхіседэк	Мельхізэдэк	—	Яўр 5, 6
Мікалай	Мікалай	Мікалай	Дзн 6, 5
Міхаіл	Міхал	Міхаіл, *разм.* Міхал	Іуд 1, 9; Апак 12, 7

Мнасон	Мнасон	—	Дзн 21, 16
Наасон	Наасон	—	Мф 1, 4; Лк 3, 32
Навум	Навум	Навум	Лк 3, 25
Нагей	Нагой	—	Лк 3, 25
Назарэй	Назарэец	Назарэй	Мф 26, 71; Дзн 2, 22
Назарэй	Назарэй	Назарэй	Мф 2, 23
Наркіс	Нарцыз	Наркіс	Рым 16, 11
Нафан	Натан	—	Лк 3, 31
Нафанаіл	Натанаіл	Нафанаіл	Ін 1, 45
Нахор	Нахор	—	Лк 3, 34
Нееман	Нааман	—	Лк 4, 27
Нефалім	Нафтал	—	Апак 7, 6
Нефалім	Нефталь	—	Мф 4, 15
Нігер	Нігер	—	Дзн 13, 1
Нікадзім	Нікадэм	Нікадзім	Ін 7, 50
Ніканор	Міканор	Ніканор, *разм.* Міканор	Дзн 6, 5
Німфан	Німфас	—	Кал 4, 15
Нірый	Нерый	—	Лк 3, 27
Нірэй	Нярэй	—	Рым 16, 15
Ной	Ной	Ной	Мф 24, 37; Лк 3, 36; 1 Пят 3, 20; 2 Пят 2, 5
Осія	Осія	—	Рым 9, 25

Павел	Павел	Павел	Дзн 13, 7; 2 Пят 3, 15; 1 Фес 1, 1; 2 Фес 1, 1; 1 Цім 1,1; 2 Цім 1, 1; Ціт 1, 1; Флм 1, 1; Рым 1, 1; 1 Кар 1, 1; 2 Кар 1, 1; Гал 1, 1; Флп 1, 1; Кал 1, 1
Пармен	Пармэн	Пармен	Дзн 6, 5
Патроў	Патроба	—	Рым 16, 14
Персіда	Пэрсіда	—	Рым 16, 12
Пётр	Кіф	Пётр	Гал 1, 18
Пётр	Пётр	Пётр	Мф 4, 18; Мк 3, 16; Лк 5, 8; Ін 21, 15; Дзн 1, 13; 1 Пят 1, 1; 2 Пят 1, 1; Гал 2, 8
Пілат	Пілат	Пілат	Мф 27, 13; Мк 15, 1; Лк 3, 1; Ін 18, 29; Дзн 3, 13; 1Цім 6, 13
Пір	Пір	—	Дзн 20, 4

Понцій	Понцій	Понцій	Мф 27, 2; Лк 3, 1; Дзн 4, 27; 1 Цім 6, 13
Порцый	Порцый	—	Дзн 24, 27
Прохар	Прохар	Прохар	Дзн 6, 5
Прыскіла	Прыска	Прыскіла	Рым 16, 3; 2 Цім 4, 19
Прыскіла	Прысцыла	Прыскіла	Дзн 18, 2; 1 Кар 16, 19
Публій	Публій	—	Дзн 28, 8
Пуд	Пуд	Пуд	2 Цім 4, 21
Рааў	Рахава	—	Іак 2, 25; Яўр 11, 31
Раваам	Рабаам	—	Мф 1, 7
Рагаў	Рагаў	—	Лк 3, 35
Рахава	Рахаб	—	Мф 1, 5
Рахіль	Рахіль	—	Мф 2, 18
Рода	Рода	—	Дзн 12, 13
Рувім	Рувім	Рувім	Апак 7, 5
Руф	Рут	—	Мф 1, 5
Руф	Руф	—	Мк 15, 21; Рым 16, 13
Рысай	Рэса	—	Лк 3, 27
Рэвека	Равека	Рэвека	Рым 9, 10
Рэмфан	Рамфан	—	Дзн 7, 43
Садок	Садок	—	Мф 1, 14
Сала	Салій	—	Лк 3, 35
Саламія	Саламея	Саламея	Мк 15, 40

Саламон	Саламон	Саламон	Мф 12, 42; Лк 11, 31; Дзн 7, 47
Салафііль	Салатыел	—	Мф 1, 12
Салафііль	Салафіел	—	Лк 3, 27
Салмон	Салій	—	Лк 3, 32
Салмон	Сальмон	—	Мф 1, 4
Самсон	Самсон	Самсон	Яўр 11, 32
Самуіл	Самуіл	Самуіл	Дзн 3, 24; Яўр 11, 32
Сапфіра	Сафіра	—	Дзн 5, 1
Сарна	Газэль	—	Дзн 9, 39
Сара	Сара	—	Рым 4, 19; 1 Пят 3, 6
Сарух	Сарух	—	Лк 3, 35
Сасіпатр	Сазыпатар	Сасіпатр	Рым 16, 21
Сасіпатр	Сапатар	Сасіпатр	Дзн 20, 4
Сасфен	Состан	Сасфен	Дзн 18, 17
Сасфен	Состэн	Сасфен	1 Кар 1, 1; Дзн 18, 17
Саул	Саул	—	Дзн 13, 21
Саўл	Саўл	—	Дзн 7, 58
Секунд	Сэкунд	—	Дзн 20, 4
Семеій	Самей	—	Лк 3, 26
Сергій	Сергій	Сергій	Дзн 13, 7
Сіла	Сіла	Сіла	Дзн 15, 27
Сілуян	Сільван	Сілуян	1 Фес 1, 1; 2 Фес 1, 1; 1 Пят 5, 12; 2 Кар 1, 19

Сім	Сэм	Сім	Лк 3, 36
Сіман	Сымон	Сіман	Мф 10, 2; Мк 1, 29; Дзн 1, 13; Лк 4, 38; Ін 1, 40; 2 Пят 1, 1
Сімяон	Сімяон	Сімяон	Лк 3, 30; Апак 7, 7
Сінтыхія	Сынтыка	—	Флп 4, 2
Сіф	Сэт	Сіф	Лк 3, 38
Скева	Скева	—	Дзн 19, 14
Стахій	Стахій	Стахій	Рым 16, 9
Сусанна	Зузанна	Сусанна	Лк 8, 3
Сцяфан	Стафан	Сцяпан	1 Кар 16, 15
Сцяфан	Стэфан	Сцяпан	1 Кар 1, 16
Сцяфан	Сцяпан	Сцяпан	Дзн 6, 5
Тавіфа	Табіта	Тавіфа	Дзн 9, 36
Трафім	Трафім	Трафім	Дзн 21, 29; 2 Цім 4, 20
Трыфена	Трыфэна	Трыфена	Рым 16, 12
Трыфоса	Трыфоза	—	Рым 16, 12
Тыверый	Тыберый	—	Лк 3, 1
Тыран	Тыран	—	Дзн 19, 9
Тэртул	Тэртул	—	Дзн 24, 1
Тэрцый	Тэрцый	—	Рым 16, 22
Уласт	Бласт	—	Дзн 12, 20
Урбан	Урбан	Урбан	Рым 16, 9
Урый	Урый	Урый	Мф 1, 6
Фадзей	Тадэвуш	Фадзей	Мк 3, 18; Мф 10, 3

Фалек	Фалек	—	Лк 3, 35
Фама	Тамаш	Фама	Мф 10, 3; Мк 3, 18; Дзн 1, 13; Лк 6, 15; Ін 11, 16
Фамар	Тамар	—	Мф 1, 3
Фануіл	Фануіл	—	Лк 2, 36
Фара	Тарый	—	Лк 3, 34
Фартунат	Фартунат	Фартунат	1 Кар 16, 17
Фарэс	Фарэс	—	Мф 1, 3; Лк 3, 33
Феафіл	Тэафіл	Феафіл	Лк 1, 3; Дзн 1, 1
Фелікс	Фэлікс	Фелікс	Дзн 23, 24
Фест	Фэст	—	Дзн 24, 27
Феўда	Тэод	—	Дзн 5, 36
Фіва	Фіва	—	Рым 16, 1
Фігел	Фігель	—	2 Цім 1, 15
Філімон	Філімон	Філімон	Флм 1, 1
Філіп	Піліп	Філіп	Мф 10, 3; Мк 3, 18; Лк 3, 1; Ін 1, 43; Дзн 1, 13
Філіт	Філет	Філіт	2 Цім 2, 17
Філолаг	Філолаг	—	Рым 16, 15
Флягонт	Флягонт	Флягонт	Рым 16, 14
Хлоя	Хлоя	—	1 Кар 1, 11
Хрыстос	Хрыстус	Хрыстос	Мф 1, 16; Мк 1, 1
Хуза	Хуза	—	Лк 8, 3

Цімафей	Цімафей	Цімафей	Кал 1, 1; 1 Кар 4, 17; 2 Кар 1, 1; 1 Фес 1, 1; 2 Фес 1, 1; Дзн 16, 1; Рым 16, 21; 1 Цім 1, 2; 2 Цім 1, 2; Флм 1, 1; Яўр 13, 23
Цімей	Тымей	Цімей	Мк 10, 46
Цімон	Тымон	Цімон	Дзн 6, 5
Ціт	Ціт	Ціт	2 Цім 4, 10; Ціт 1, 4; 2 Кар 2, 13; Гал 2, 1
Ціхік	Тыхік	Ціхік	Дзн 20, 4; Эф 6, 21; 2 Цім 4, 12; Кал 4, 7
Эмануіл	Эмануіл	Эмануіл	Мф 1, 23
Эней	Эней	—	Дзн 9, 33
Эпафрас	Эпафрас	Эпафрас	Кал 1, 7
Эпафрас	Эпафраз	Эпафрас	Флм 1, 23
Эраст	Эраст	Эраст	Дзн 19, 22; Рым 16, 24
Юлій	Юлій	Юлій	Дзн 27, 1
Юлія	Юлія	Юлія	Рым 16, 15
Юній	Юній	Юній	Рым 16, 7
Явул	Эўбул	Явул	2 Цім 4, 21
Яліма	Элім	Яліма	Дзн 13, 8
Яўніка	Яўніка	—	2 Цім 1, 5

СПІС СКАРАЧЭННЯЎ

СТАРЫ ЗАПАВЕТ

Пяцікніжжа Маісея	
Быціе	Быц
Выхад	Вых
Левіт	Лев
Лікі	Лік
Другазаконне	Друг
* * *	
Кніга Ісуса Навіна	Нав
Кніга Суддзяў ізраільскіх	Суд
Кніга Руфі	Руф
Першая кніга Царстваў	1 Цар
Другая кніга Царстваў	2 Цар
Трэцяя кніга Царстваў	3 Цар
Чацвёртая кніга Царстваў	4 Цар
Першая кніга Параліпаменон	1 Пар
Другая кніга Параліпаменон	2 Пар
Першая кніга Ездры	1 Езд
Кніга Нееміі	Неем
Другая кніга Ездры	2 Езд
Кніга Тавіта	Тав
Кніга Іудзіф	Іудзіф
Кніга Эсфір	Эсф
Кніга Іова	Іов
Псалтыр	Пс

Прытчы Саламона	Сал
Кніга Эклезіяста	Экл
Песня песням Саламона	Песн
Кніга Прамудрасці Саламона	Прам
Кніга Прамудрасці Ісуса, сына Сірахава	Сір
Кніга прарока Ісаіі	Іс
Кніга прарока Іераміі	Ір
Плач Іераміі	Плач
Пасланне Іераміі	Пасл Ір
Кніга прарока Варуха	Вар
Кніга прарока Іезекііля	Іез
Кніга прарока Данііла	Дан
Кніга прарока Осіі	Ос
Кніга прарока Іаіля	Іаіл
Кніга прарока Амоса	Ам
Кніга прарока Аўдзія	Аўдз
Кніга прарока Іоны	Іон
Кніга прарока Міхея	Міх
Кніга прарока Навума	Нав
Кніга прарока Авакума	Ав
Кніга прарока Сафоніі	Саф
Кніга прарока Агея	Аг
Кніга прарока Захарыі	Зах
Кніга прарока Малахіі	Мал
Першая кніга Макавейская	1 Мак
Другая кніга Макавейская	2 Мак
Трэцяя кніга Макавейская	3 Мак
Трэцяя кніга Ездры	3 Езд

Евангелле паводле святога Матфея	Мф
Евангелле паводле святога Марка	Мк
Евангелле паводле святога Лукі	Лк
Евангелле паводле святога Іаана	Ін
* * *	
Дзеянні святых Апосталаў	Дзн
Саборныя Пасланні Апосталаў	
Пасланне Іакава	Іак
Першае Пасланне Пятра	1 Пят
Другое Пасланне Пятра	2 Пят
Першае Пасланне Іаана	1 Ін
Другое Пасланне Іаана	2 Ін
Трэцяе Пасланне Іаана	3 Ін
Пасланне Іуды	Іуд
Пасланні Апостала Паўла	
Пасланне да Рымлянаў	Рым
Першае Пасланне да Карынфянаў	1 Кар
Другое Пасланне да Карынфянаў	2 Кар
Пасланне да Галатаў	Гал
Пасланне да Эфесянаў	Эф
Пасланне да Філіпійцаў	Флп
Пасланне да Каласянаў	Кал
Першае Пасланне да Фесаланікійцаў	1 Фес
Другое Пасланне да Фесаланікійцаў	2 Фес
Першае Пасланне да Цімафея	1 Цім
Другое Пасланне да Цімафея	2 Цім
Пасланне да Ціта	Ціт
Пасланне да Філімона	Флм
Пасланне да Яўрэяў	Яўр
* * *	
Апакаліпсіс (Адкрыццё святога Апостала Іаана Багаслова)	Апак

ГЕАГРАФІЧНЫЯ НАЗВЫ, НАСЕЛЕНЫЯ ПУНКТЫ, ЯКІЯ ЎПАМІНАЮЦЦА Ў НОВЫМ ЗАПАВЕЦЕ

Назвы аб'ектаў		Кароткія звесткі пра аб'ект	Месца ў кнізе
У дапрацаваным выданні	У ранейшых выданнях		
Авечыя *вароты*	Авечая сажалка	знаходзяцца ва ўсходняй сцяне Іерусаліма, на поўдзень ад іх ёсць купальня Віфезда	Ін 5, 2
Авілінея	Абілінея	сірыйская вобласць на захадзе ад Дамаска	Лк 3, 1
Адрыятычнае *мора*	Адрыятычнае *мора*	у часы Апосталаў пад гэтай назвай разумелі Міжземнае мора ад Крыта да Сіцыліі	Дзн 27, 27
Азія	Азія	спачатку назва невялікай Лідзійскай вобласці, потым — часткі свету	Дзн 2, 9; 1 Пят 1, 1; 1 Кар 16, 19; 2 Кар 1, 8
Азот	Азот	адзін з пяці галоўных філістымскіх гарадоў на ўсходнім беразе Міжземнага мора	Дзн 8, 40
Акелдама	Хакелдама	зямля, купленая за 30 сярэбранікаў, якія вярнуў Іуда першасвятарам	Дзн 1, 19
Александрыя	Александрыя	горад у Егіпце, названы імем Аляксандра Македонскага	Дзн 18, 24

Амфіпаль	Амфіпаль	горад еўрапейскай Турцыі паблізу вусця ракі Стрыман, былая сталіца Македоніі	Дзн 17, 1
Антыохія	Антыёхія	горад, доўгі час быў сталіцай Сірыі	Дзн 6, 5; Гал 2, 11; 2 Цім 3, 11
Антыпатрыда	Антыпатра	горад паміж Кесарыяй Палесцінскай і Іерусалімам	Дзн 23, 31
Апалонія	Апалонія	горад у Македоніі	Дзн 17, 1
Апіева *плошча*	*форум* Апія	месца, дзе Апостал Павел быў сустрэты хрысціянамі па дарозе ў Рым	Дзн 28, 15
Аравія	Аравія	Аравійскі паўвостраў у Заходняй Азіі	Гал 1, 17
Армагедон	Хар-Магедон	горад каля падножжа гары Кармэль	Апак 16, 16
Арымафея	Арыматэя	горад у Палесціне, з якога паходзіў Іосіф, што пахаваў Цела Ісуса Хрыста	Мф 27, 57; Мк 15, 43; Лк 23, 51; Ін 19, 38
Ас	Ас	горад і гавань у Мізіі на беразе Эгейскага мора	Дзн 20, 13
Аталія	Аталія	горад Памфіліі, бліз Пергіі, недалёка ад Міжземнага мора	Дзн 14, 25
Афіны	Афіны	горад пры Саронскім заліве, на ўсход ад Карынфа, заснаваны за 1500 гадоў да Н.Х.	Дзн 17, 15; 1 Фес 3, 1

Ахаія	Ахая Азія Ахея	невялікая краіна ў паўночнай частцы грэчаскага Пелапанеса	Дзн 18, 12; 1 Кар 16, 15; Рым 16, 5; 2 Кар 1, 1
Вавілон	Вавілон	сталіца Халдзеі, адзін са старажытнейшых і багацейшых гарадоў у свеце	Апак 18, 2; Мф 1, 11; Дзн 7, 43
Верыя	Бярэя	македонскі горад бліз гары Алімп	Дзн 17, 13
Віфавара	Бэтанія	мясцовасць за Іарданам, дзе прапаведаваў і хрысціў Іаан Хрысціцель	Ін 1, 28
Віфагія	Бэтфаг	невялікае паселішча на паўднёвым захадзе ад Елеонскай гары	Мф 21, 1; Мк 11, 1; Лк 19, 29
Віфанія	Бэтанія	паселішча на паўднёвым усходзе ад Елеонскай гары паблізу Іерусаліма	Мф 21, 17; Мк 11, 1; Лк 19, 29; Ін 11, 1
Віфезда	Бэтэзда	купальня паблізу Авечых варот у Іерусаліме	Ін 5, 2
Віфінія	Бітынія	вобласць у Малой Азіі, тут знаходзілася гара Алімп	Дзн 16, 7; 1 Пят 1, 1
Віфлеем	Бэтлеем	невялікі горад у Іудзеі, дзе нарадзіліся цар Давід і Гасподзь Ісус Хрыстос	Мф 2, 1; Лк 2, 4; Ін 7, 42

Віфсаіда	Бэтсайда	горад паблізу Капернаума і Харазіна, радзіма Апосталаў Андрэя, Пятра і Філіпа	Мф 11, 21; Ін 1, 44; Лк 9, 10; Мк 6, 45
Гадарынская ***краіна***	Гергезэнскі *край*	месца за Іарданам, на паўднёвым захадзе ад Тыверыяды, дзе Гасподзь вылечыў апантанага	Лк 8, 26; Мк 5, 1
Газа	Газа	адзін з пяці вядомых філістымскіх гарадоў, размяшчаўся на беразе Міжземнага мора	Дзн 8, 26
Галатыя	Галяцыя Галятыя	вобласць у Малой Азіі, назва паходзіць ад галаў і кельтаў, якія тут пасяліліся	1 Пят 1,1; Гал 1, 2; 2 Цім 4, 10; Дзн 16, 6
Галгофа	Галгофа	узвышша на паўночным захадзе ад Іерусаліма, недалёка ад горада, дзе быў укрыжаваны Ісус Хрыстос	Мф 27, 33; Мк 15, 22; Ін 19, 17
Галілейскае ***мора***	Галілейскае *возера*	возера ў Палесціне, называлася і морам і возерам	Мф 4, 18; Мк 1, 16; Ін 6, 1
Галілея	Галілея	краіна, паўночная частка Палесціны, дзе Гасподзь правёў Сваё дзяцінства і юнацтва	Мф 17, 22; Мк 1, 39; Лк 2, 4; Ін 1, 43; Дзн 10, 37
Гамора	Гамора	адзін з пяці гарадоў у даліне Сідымскай, знішчаны Госпадам серным агнём за грахі людзей	Мк 6, 11; Іуд 1, 7; Рым 9, 29

Генісарэцкае *возера*	Генісарэцкае *возера*	другая назва Галілейскага мора (возера)	Лк 5, 1
Генісарэцкая *зямля*	Генісарэцкая *зямля*	раўніна на заходнім баку Генісарэцкага возера, тут знаходзіўся горад Генісарэт	Мф 14, 34; Мк 6, 53
Гергесінская *краіна*	Гадарэнская *краіна*	вобласць, атрымала сваю назву ад горада Гергесы; тое, што і Гадарынская краіна	Мф 8, 28
Гефсіманія	Гетсіманія	мясцовасць паблізу Іерусаліма, па сведчанні Іаана Багаслова, гэта быў сад	Мф 26, 36; Мк 14, 32
Далмануфа	Дальманута	назва паселішча бліз Магдалы	Мк 8, 10
Далматыя	Далмацыя	гарыстая мясцовасць на ўсходнім беразе Адрыятычнага мора	2 Цім 4, 10
Дамаск	Дамаск	адзін са старажытнейшых гарадоў свету, сталіца Сірыі	Дзн 9, 2; 2 Кар 11, 32; Гал 1, 17
Дэкаполь	Дэкаполь	звычайна так называлі вобласць паўкалена Манасіі на ўсходзе ад Іардана	Мф 4, 25; Мк 5, 20; 7, 31
Дэрвія	Дэрбе	горад у Малой Азіі, у Лікаоніі, месца нараджэння Гаія і Цімафея	Дзн 14, 6; 20,4

Егіпет	Егіпет	краіна, якая мяжуе на поўдні з Эфіопіяй, на поўначы з Міжземным морам, на ўсходзе з Чырвоным морам, на захадзе з Сахарай	Мф 2, 19; Дзн 2, 10; Яўр 3, 16; Апак 11, 8
Елеон, Елеонская *гара*	Аліўная *гара*	адна з іўдзейскіх гор, знаходзіцца на ўсходзе ад Іерусаліма, аддзяляецца ад горада Кедронам	Мф 26, 30; Дзн 1, 12; Ін 8, 1; Мк 11, 1; Лк 19, 29
Енон	Аінон	месца, дзе хрысціў Іаан Хрысціцель	Ін 3, 23
Еўфрат	Эўфрат	рака, бярэ свой пачатак у Арменіі на паўночным баку гары Таўра	Апак 9, 14
Ефраім	Эфраім	горад на поўначы ад Іерусаліма, куды аддаліўся Гасподзь пасля ўваскрашэння Лазара	Ін 11, 54
Завулонавы *межы*	*межы* Забулона	частка Святой Зямлі, знаходзілася паміж Галілейскім возерам і Міжземным морам	Мф 4, 13
Іардан	Ярдан	рака, працякае ўздоўж усёй Палесціны і раздзяляе яе на дзве часткі	Мф 3, 6; Мк 1, 5; Лк 4, 1; Ін 1, 28 Ін 1, 28
Ідумея	Ідумея	краіна, у біблейскія часы складала невялікую паласу зямлі паміж пустыняй Сінь і Камяністай Аравіяй	Мк 3, 8

Іераполь	Гераполь	горад у Малой Азіі, у Фрыгіі; тут навучаў і прыняў пакутніцкую смерць святы Апостал Філіп	Кал 4, 13
Іерусалім	Ерусалім	старажытнейшы горад Запаветнай Зямлі, мяркуюць, што ён існаваў у часы Аўраама	Мф 21, 10; Мк 10, 32; Лк 2, 22; Ін 1, 19; Дзн 1, 4; Рым 15, 25; Гал 1, 17
Іерыхон	Ерыхон	горад, які ляжаў у межах зямлі калена Веньямінавага	Мф 20, 29; Лк 10, 46; Лк 10, 30; Яўр 11, 30
Ізраіль	Ізраіль	царства, утварылася ў выніку паўстання ў часы Раваама, сына і пераемніка Саламона	Мк 15, 32; Лк 2, 34; Ін 1, 31
Іконія	Іканія	сталіца старажытнай Лакаоніі, размешчана каля падножжа гары Таўр	Дзн 13, 51
Ілірык	Ілірыя	вобласць, знаходзілася ўздоўж узбярэжжа Адрыятычнага мора, на захадзе ад Македоніі	Рым 15, 19
Іопія	Яфа	адзін са старажытных гарадоў Азіі, размешчаны на пясчаным узвышшы; пазней атрымаў назву Яфа	Дзн 9, 36
Іспанія	Іспанія	у старажытнасці так называўся ўвесь Ібірыйскі, або Пірынейскі, паўвостраў, разам з Партугаліяй	Рым 15, 24

Італія	Італія	еўрапейская дзяржава, у якой у часы Госпада Ісуса Хрыста сталіцай быў горад Рым	Дзн 18, 2; Яўр 13, 24
Ітурэя	Ітурэя	вобласць на паўднёвым усходзе ад гары Ермон, праз яе праходзіла дарога з Дамаска ў Тыверыяду	Лк 3, 1
Іудзейская *пустыня*	Юдэйская *пустыня*	знаходзілася на паўднёвым усходзе Іудзеі, даходзіла да паўднёвага ўзбярэжжа Мёртвага мора	Мф 3, 1
Іудзея	Юдэя	паўднёвая частка Палесціны; часам пад словам Іудзея ў шырокім сэнсе падразумявалася ўся Палесціна	Мф 24, 16; Лк 1, 5; Мк 3, 7; Ін 4, 3; Дзн 2, 9
Калосы	Калосы	горад у паўднёва-заходняй частцы Фрыгіі на рацэ Лікус, бліз Лаадыкіі і Іераполя	Кал 1, 2
Кана Галілейская	Кана Галілейская	горад, дзе Гасподзь Ісус Хрыстос ператварыў ваду ў віно і дзе ён вылечыў завочна сына царадворцы	Ін 2, 1
Кападокія	Кападокія	вобласць у Малой Азіі, якая межавала з Кілікіяй на поўдні і ракой Еўфрат на ўсходзе	Дзн 2, 9; 1 Пят 1, 1

Капернаум	Кафарнаўм	горад на заходнім беразе Галілейскага мора, галоўнае і любімае месца знаходжання Госпада Ісуса Хрыста	Мф 17, 24; Мк 1, 21; Лк 4, 23; Ін 2, 12
Карынф	Карынф	горад Старажытнай Грэцыі, дзе Апостал Павел пражыў паўтара года і заснаваў Хрысціянскую Царкву	Дзн 18, 1; 1 Кар 1, 2; 2 Кар 1, 1
Кедрон	Цэдрон	ручай, паток, які працякаў паміж Іерусалімам і Елеонскай гарой і ўпадаў у Мёртвае мора	Ін 18, 1
Кенхрэя	Кенхра	усходняя гавань горада Карынфа; горад	Дзн 18, 18; Рым 16, 1
Кесарыя	Цэсарыя	горад у Палесціне, на ўсходнім беразе Міжземнага мора, пабудаваны Ірадам Вялікім	Дзн 10, 1
Кесарыя Філіпава	Цэзарыя Піліпава	горад у Палесціне паблізу гары Ермон, каля ўсходняга вытока Іардана	Мф 16, 13; Мк 8, 27; Дзн 8, 40
Кілікія	Кілікія	вобласць у паўднёва-заходняй частцы Малой Азіі, раздзялялася на дзве палавіны	Дзн 6, 9; Гал 1, 21
Кіпр	Кіпр	востраў ва ўсходняй частцы Міжземнага мора,паміж кілікійскім і фінікійскім берагамі	Дзн 4, 36

Кірынея	Кірэнія	мясцовасць у Лівіі, Афрыцы, названая так з-за свайго галоўнага горада	Дзн 2, 10
Клаўда	Каўда	невялікі востраў, знаходзіцца за 10 міль ад паўднёвай часткі вострава Крыт	Дзн 27, 16
Кнід	Кніда	карыйскі горад на паўвостраве Кнід з вялікай гаванню	Дзн 27, 7
Кос	Кос	назва невялікага вострава ў Эгейскім моры, супраць карыйскіх гарадоў Кніда і Галікарнаса	Дзн 21, 1
Крыт	Крыт	адзін з вялікіх астравоў Міжземнага мора	Дзн 27, 7; Ціт 1, 5
Лаадыкія	Ляадыцыя Ляадыкея	горад у Малой Азіі, у вобласці Фрыгіі, на рацэ Лік, заснаваны ў III ст. да Н.Х.	Кал 2, 1; Апак 1, 11
Ласея	Ласея	горад на паўночным баку вострава Крыт	Дзн 27, 8
Лівія	Лівія	назва краіны, якая ў старажытныя часы служыла для абазначэння ўсёй Афрыкі	Дзн 2, 10
Ліда	Ліда	горад непадалёку ад Іопіі, па дарозе ад Іерусаліма да Іопіі	Дзн 9, 32

Лікаонія	Лікаонія	вобласць Малой Азіі, межавала з Фрыгіяй, Ісаўрыяй, Кілікіяй і Галатыяй	Дзн 14, 6
Лістра	Лістра	горад, які наведаў святы Апостал Павел тры разы	Дзн 14, 6; 2 Цім 3, 11
Магдалінскія *межы*	*межы* Магедана	мясцовасць атрымала сваю назву ад горада Магдала, адкуль паходзіла Марыя Магдаліна	Мф 15, 39
Мадыамская *зямля*	Мадыянская *зямля*	пустынная мясцовасць на ўсходзе ад Чырвонага мора, славілася сваімі вярблюдамі	Дзн 7, 29
Македонія	Македонія	вобласць на поўначы Грэцыі, берагі яе амывалі Эгейскае і Адрыятычнае моры	Дзн 16, 9; Рым 15, 26; 1 Кар 16, 5; 2 Кар 1, 16
Меліт	Мальта	Меліт — другая назва вострава Мальта, які ляжыць у Міжземным моры на адлегласці 50 міль ад Сіцыліі	Дзн 28, 1
Месапатамія	Месапатамія	краіна паміж Тыграм і Еўфратам, была першым месцам жыцця людзей да і пасля патопу	Дзн 2, 9
Міліт	Мілет	горад у Малой Азіі за некалькі міль ад Эгейскага мора, недалёка ад вусця ракі Меандэр	Дзн 20, 15; 2 Цім 4, 20

Міры Лікійскія	Міры Лікійскія	партовы горад у Лікіі, у Малой Азіі, тут спыняўся на некаторы час карабель, на якім быў адпраўлены ў Рым Апостал Павел	Дзн 27, 5
Місія	Мізія	вобласць на паўночным захадзе Малой Азіі, на захадзе і поўначы амывалася Эгейскім морам і Гелеспонтам	Дзн 16, 7
Мітыліна	Мітылена	сталіца Лесбаса ў Малой Азіі, тут Апостал Павел быў па дарозе з Карынфа ў Іерусалім	Дзн 20, 14
Назарэт	Назарэт	горад у Галілеі, тут прайшло жыццё Госпада Ісуса Хрыста да Яго ўступлення на служэнне выратавання чалавецтва	Мф 2, 23; Мк 1, 9; Лк 1, 26; Ін 1, 45
Наін	Наін	горад, дзе Гасподзь наш Ісус Хрыстос уваскрэсіў сына наінскай удавы	Лк 7, 11
Неапаль	Неапаль	горад і порт у Стрымонскім заліве, недалёка ад горада Філіпы, на мяжы з Фракіяй	Дзн 16, 11
Нефалімавы ***межы***	*Межы* Нефталі	зямля Нефалімава знаходзілася на поўначы Палесціны, для яе ландшафту характэрны горы, даліны, узвышшы	Мф 4, 15

Нікапаль	Нікапаль	адзін са старажытных гарадоў, дзе Апостал Павел намерваўся правесці зіму	Ціт 3, 12
Ніневія	Ніневія	вялікі горад, знаходзіўся на ўсходнім беразе Еўфрата, заснаваны Асурам, сынам Сіма	Мф 12, 41; Лк 11, 30
Памфілія	Памфілія	правінцыя ці вобласць у Малой Азіі на поўначы ад Міжземнага мора паміж Кілікіяй, Лікіяй і Пісідыяй	Дзн 2, 10
Патара	Патара	горад у Малой Азіі, у Лікіі, некалі тут быў знакаміты храм Апалона	Дзн 21, 1
Патмас	Патмас	невялікі скалісты востраў, знаходзіцца на паўднёвым захадзе ад Самоса	Апак 1, 9
Паф	Пафас	горад на захадзе ад Кіпра, некалі славіўся пакланеннем багіні Венеры, каля Пафа быў ёй пабудаваны храм	Дзн 13, 6
Пергам	Пергам	горад упамінаецца ў Апакаліпсісе Іаанам Багасловам, тут была адна з сямі Асійскіх Цэркваў	Апак 1, 11
Пергія	Пэргія	галоўны горад Памфіліі ў Малой Азіі, яго наведаў упершыню Апостал Павел, калі пакінуў Паф	Дзн 13, 13

Пісідыя	Пізыдыя	вобласць у Малой Азіі на поўначы ад Памфіліі, сюды прыбыў Апостал Павел з Варнавам у час свайго першага падарожжа	Дзн 13, 14
Понт	Понт	адна з правінцый Малой Азіі, на поўначы амываецца Чырвоным морам	Дзн 2, 9; 1 Пят 1, 1
Пталемаіда	Пталемаіда	горад у Сярэднім Егіпце паміж Арсіноем і Гераклеопалем, славіўся ружавымі плантацыямі	Дзн 21, 7
Путэол	Путэол	горад Кампаны ў паўднёвай Італіі, на беразе Неапалітанскага заліва, тут спыняўся Апостал Павел па дарозе ў Рым	Дзн 28, 13
Рама	Рама	у Новым Запавеце горад называецца Арымафеяй (Мф 27, 57; Ін 19, 38), месцазнаходжанне яго дакладна не вызначана	Мф 2, 18
Родас	Родас	вялікі востраў у Леванце з горадам, які мае такую ж назву	Дзн 21, 1
Рыгія	Рэгія	горад на поўдні Італіі пры Месінскім праліве, каля яго праходзіў карабель, на якім плыў Апостал Павел	Дзн 28, 13

Рым	Рым	сталіца Рымскай імперыі, горад, размешчаны на берагах ракі Тыбр, на адлегласці 15 міль ад яе вусця	Дзн 2, 10; Рым 1, 7; 2 Цім 1, 17
Садом	Садом	старажытны горад, ляжаў у далі́не Іарданскай, знішчаны Госпадам за грахі людзей	Лк 10, 12; Мк 6, 11; Рым 9, 29; Апак 11, 8
Саламін	Саламін	старажытны горад у паўднёва-ўсходняй частцы вострава Кіпр, тут Апосталы Павел, Варнава і Іаан прапаведавалі слова Божае	Дзн 13, 5
Салім	Салім	так, мяркуюць, называлася месца, дзе быў заснаваны горад Іерусалім	Ін 3, 23
Салмон	Сальмон	мыс на востраве Крыт, каля якога праходзіў карабель з Апосталам Паўлам	Дзн 27, 7
Самарыя	Самарыя	так называлася вобласць або частка зямлі Ханаанскай з Галілеяй на поўначы і з Іудзеяй на поўдні	Лк 17, 11; Ін 4, 4; Дзн 1, 8
Самос	Самос	назва вострава ў Эгейскім моры і галоўнага горада вострава, тут нарадзіўся Піфагор	Дзн 20, 15

Самафракія	Самафракія	востраў у Эгейскім моры, назва азначае, што ён — фракійскі Самос у адрозненне ад іншага Самоса	Дзн 16, 11
Сардзіс	Сарды	горад у Малой Азіі, быў мітраполіяй старажытнага Лідзійскага царства, стаяў каля падножжа гары Тмолус	Апак 1, 11
Сарона	Сарона	пад гэтай назвай падразумяваецца не паселішча Сарон, а ўся раўніна Саронская, прылеглая да мора	Дзн 9, 35
Сарэпта	Сарэпта	горад у Фінікіі, знаходзіўся на беразе Міжземнага мора паміж Тырам і Сідонам, належаў да апошняга, таму і называўся Сарэптай Сідонскай	Лк 4, 26
Селяўкія	Селяўкія	прыморскі горад Сірыі, на беразе Міжземнага мора, на захад ад Антыохіі, каля вусця ракі Аронта	Дзн 13, 4
Сідон	Сідон	старажытны, багаты і вядомы фінікійскі горад, заснаваны, верагодна, сынам Ханаана	Мф 11, 22; Мк 3, 8; Лк 6, 17; Дзн 12, 20

Сілаам	Сілаам	крыніца ці вадаём Сілаамскі і тут жа купальня Сілаамская на паўднёва-ўсходнім баку Іерусаліма	Ін 9, 7-11
Сінай	Сінай	гара і пустыня Камяністай Аравіі, куды прыйшлі ізраільцы на трэці месяц пасля выхаду з Егіпта, на вяршыні Сіная быў дадзены яўрэям Закон ад Бога	Дзн 7, 30
Сіон	Сіёнская *гара* Сіён	адно з узвышшаў, дзе пабудаваны горад Іерусалім	Апак 14, 1; 1 Пят 2, 6; Рым 9, 33
Сіракузы	Сіракузы	багаты горад на ўсходнім беразе вострава Сіцылія, дзе спыняўся на тры дні Апостал Павел па дарозе ў Рым	Дзн 28, 12
Сірыя	Сірыя	у шыркім сэнсе значэння слова Сірыя прасціралася ад Міжземнага мора і ракі Кідна да Еўфрата і на поўнач да Аравіі і Егіпта	Мф 4, 24; Лк 2, 2; Гал 1, 21
горад **Сіхар**	*мястэчка* Сіхар	гэтым словам аба-значаецца Сіхем, але на самай справе Сіхем і Сіхар, паводле апісання падарожніка Борда, розныя мясціны	Ін 4, 5

Сіхем	Сіхэм	вядомы хананейскі горад у Самарыі, другая назва яго Сіхар	Дзн 7, 16; Ін 4, 5
Смірна	Смірна	іанійскі горад, адзін з найпрыгажэйшых у Леванце, на адлегласці 320 стадый ад Эфеса і на столькі ж ад марскога берага	Апак 1, 11
Тарс	Тарс	галоўны горад старажытнай Кілікіі і месца нараджэння Апостала Паўла	Дзн 9, 11
Траада	Траада	горад, які яшчэ мае назву Александрыя, або Траада-Александрыя, знаходзіўся ў Малой Азіі, недалёка ад старажытнай Троі, ад якой атрымаў назву	Дзн 16, 8; 2 Кар 2, 12; 2 Цім 4, 13
Трагілія	*назва адсутнічае*	горад на поўдні ад Эфеса, каля падножжа гары Мікалы ў Іоніі	Дзн 20, 15
Траханіцкая *зямля*	Траханіцкі *край*	гарыстая вобласць на ўсходзе ад Іардана, у час зямнога жыцця Госпада Ісуса Хрыста была пад уладай Філіпа	Лк 3, 1

Тыверыяда	Тыберыяда	палесцінскі горад на паўднёва-заходнім беразе Тыверыядскага возера, недалёка ад Назарэта і Капернаума	Ін 6, 23
Тыверыядскае *мора*	Тыверыядскае *возера*	гэта другая назва Галілейскага мора (возера)	Ін 6, 1
Тыр	Тыр	назва старажытнага фінікійскага горада, які неаднаразова ўпамінаецца ў Свяшчэнным Пісанні	Мф 11, 22; Мк 3, 8; Лк 6, 17; Дзн 12, 20
Фесалоніка	Фесалоніка	сталіца адной з прэтарыяльных абласцей Македоніі, знаходзіцца на паўночным беразе Саланікійскага заліва	Дзн 17, 1; Флп 4, 16; 1 Фес 1, 1; 2 Цім 4, 10
Фіатыр	Тыятыр Фіятыр	горад у Малой Азіі, размешчаны на вялікай раўніне каля невялікай ракі на паўднёвы ўсход ад Смірны	Дзн 16, 14; Апак 1, 11
Філадэльфія	Філадэльфія	горад у Малой Азіі, за 70 міль на ўсход ад Смірны, у старажытнасці горад называлі Малымі Афінамі	Апак 1, 11

Філіпы	Філіпы Піліпея	горад у Македоніі, вядомы ў старажытнасці пад назвай Крыніды, тут былі залатаносыя руднікі	Дзн 16, 12; Флп 1, 1; 1 Фес 2, 2
Фінік	Фэнікс	горад з прыстанню на паўднёвам беразе востраваКрыт	Дзн 27,12
Фінікія	Фінікія	вобласць Сірыйскага царства, дзе Тыр і Сідон былі галоўнымі гарадамі	Дзн 11,19
Фрыгія	Фрыгія	вялікая вобласць Малой Азіі з галоўнымі гарадамі Калосы, Лаадыкія і Іераполь	Дзн 2,10
Халдзея	Халдэя	азіяцкая краіна са сталіцай Вавілон, з-за гэтага яна называлася Вавілоніяй	Дзн 7, 4
Ханаанская *зямля*	*зямля* Канаан	зямля Ханаана — сына Хама, унука Ноя, жыхары вызначаліся ўменнем гандляваць, багаццем, адукаванасцю	Дзн 7,11
Харазін	Каразін	горад на беразе Галілейскага мора, недалёка ад Віфсаіды і Капернаума, Гасподзь часта наведваў гэты горад	Мф 11, 21; Мф 11, 21; Лк 10, 13;

Харан	Харан	мясцовасць і горад паміж рэкамі Еўфратам і Хаворам, дзе памёр і пахаваны Фара, бацька Аўраама	Дзн 7, 2
Хіос	Хіёс	адзін з астравоў у Эгейскім моры, дзе спыняўся на некаторы час Апостал Павел у час свайго апошняга падарожжа ў Іерусалім	Дзн 20, 15
Чырвонае *мора*	Чырвонае *мора*	доўгі вузкі заліў, які аддзяляе Аравію ад Егіпта і Азію ад Афрыкі	Дзн 7, 36; Яўр 11, 29
Элада	Грэцыя	так Грэцыя называлася Эладай у адрозненне ад Македоніі	Дзн 20, 2
Эмаус	Эмаўс	невялікае паселішча на паўночным захадзе ад Іерусаліма, тут пасля Свайго Уваскрэсення Гасподзь з'явіўся перад вучнямі	Лк 24, 13
Эфес	Эфес	малаазійскі горад, размешчаны на рацэ Каістры, каля яе вусця, тут Апостал Павел напісаў сваё І Пасланне да Карынфянаў	Апак 1, 11; Эф 1, 1; 1 Кар 15, 32

КАРОТКІ ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК

І калі Ісус быў у Віфаніі ў доме Сімана пракажонага і ўзляжаў за сталом, прыйшла жанчына з алавастравым флаконікам сапраўднага нарданавага міра, вельмі дарагога, і, разбіўшы пасудзіну, выліла Яму на галаву (Мк 14, 3).

Алавастр (Мф 26, 7) — род дробназярністага, шчыльнага каменю з пароды гіпсу, прыгоднага для розных алавастравых вырабаў. Сваю назву атрымаў ад Алебастравай гары і горада Алебастрон у Фівах, у Егіпце, цяпер гара мае назву святога Антонія. Старажытныя людзі ўжывалі алавастр для розных вырабаў, з яго рабілі вазы, урны, бутэлькі, флаконікі і інш. Для захавання духмяных мазей і міра выкарыстоўваліся алавастравыя бутэлечкі з вельмі вузкімі і доўгімі рыльцамі і наглуха закаркоўваліся. Жанчына, якая прыйшла ў дом Сімана з алавастравым флаконікам міра, разбіла яго, бо пасудзіны такія ў той час не адкрываліся, яны распаўсюджвалі свой пах праз порыстыя сценкі. Разбіўшы яго, яна выліла міра на галаву Госпаду (Мк 14, 3), каб выказаць гэтым сваю шчырую любоў да Яго. Шчодрасць такую і асудзілі некаторыя прысутныя, паколькі міра ў бутэлечцы было вельмі дарагім, і таго, што выліла жанчына за адзін раз, хапіла б на доўгія гады. Пазней грэчаскае слова *алавастр* атрымала назву *алебастр* (лац. alabastrum).

І ўбачыў я: калі зняў Ён шостую пячатку, то настала вялікае землетрасенне, і сонца стала чорным, як валасяніца, а месяц стаў скрыўленым зусім (Апак 6, 12).

Валасяніца (Апак 6, 12) — грубая тканіна цёмнага колеру, вырабленая з казінай шэрсці. З гэтай тканіны рабіліся мяшкі, а таксама адзенне, якое апраналі ў час жалобы. Часам у вялікай засмучанасці валасяніцы апраналі і на ноч (2 Мак 3, 19; 3 Цар 21, 27).

Нікога ў дарозе не вітайце (Лк 10, 4).

Вітацца ў дарозе (Лк 10, 4). Накіроўваючы Апосталаў для тлумачэння евангельскага вучэння, Ісус Хрыстос папярэджвае іх, каб яны ў дарозе нікога не віталі. Справа ў тым, што ва ўсходніх народаў прывітанні не выражаліся, як у нас, лёгкім паклонам ці поціскам рукі, а паклонамі зямнымі, абдымкамі, цалаваннем і выражэннем пры гэтым розных пажаданняў, і патрабавалася для падобных цырымоній шмат часу (Калі два Арабы аднолькавага рангу сустракаліся, то працягвалі адзін другому правую руку, але тут жа адымалі рукі і прыкладвалі іх да лба, потым працягвалі вітацца ўзаемнымі пацалункамі ў бараду, дзякавалі Богу за сустрэчу аднаго з другім і прасілі Усемагутнага аб працягу іх сяброўства; часам да 10 разоў паўтаралі яны цырымонію абдымкаў, поціскаў рук і інш. — *Barnes*). Асноўная думка гэтай парады Госпада заключалася ў тым, што справа вучняў, калі яны ішлі на пропаведзь, не павінна была затрымлівацца нічым. Яны павінны былі выконваць даручэнні хутка і не бавіць час на лішняе, у тым ліку і на працяглыя прывітанні, паколькі, павітаўшыся, загаварылі б пра тое, што не адпавядала

іх мэце падарожжа. Такім чынам, Апостал мог бы пераключыцца на звычайныя людскія адносіны, а гэта было непажадана.

Цар увайшоў, каб паглядзець на прысутных, і ўбачыў там чалавека, апранутага не па-вясельнаму (Мф 22, 11).

Вясельнае, святочнае адзенне (Мф 22, 11). Вясельнае адзенне на Усходзе прапаноўваў багаты гаспадар дома ўсім запрошаным гасцям. Ён патрабаваў, каб прыслугі кожнаму з прысутных дапамагалі апрануць яго. Для гэтага быў выдзелены адпаведны пакой. Слугі дапамагалі гасцям змяніць падарожнае, забруджанае пылам і потам адзенне на свежае, адпаведнага да свята колеру, і толькі тады праводзілі, ставілі перад гаспадаром дома, прадстаўлялі госця, а той паводле павагі да кожнага паказваў месца за сталом.

Ганебнае выгнанне з балю пагражала таму, хто адмаўляўся апрануць гэта адзенне ці хто б меў смеласць з'явіцца на ўрачыстасць у сваём падарожным (Мф 22, 12).

Пасля вяселля ці балявання госці вярталі ўрачыстае адзенне і апраналі сваё або шчодры гаспадар дому дараваў вопратку кожнаму ці некаторым з запрошаных гасцей на памятку.

Менавіта гэтыя [*ілжэпрарокі*] *на вашых вячэрах любові без боязі аддаюцца распусце, пасуць саміх сябе, бясплодныя восеньскія дрэвы, ссохлыя двойчы, без каранёў* (Іуд 1, 12).

Вячэра любові (1 Кар 11, 20) — калектыўная трапеза ў першынствуючай Царкве. Рыхтавалася з добраахвотных прынашэнняў веруючых. Яна звычайна бы-

вала пасля правядзення Еўхарыстыі. Ежу для вячэры любові папярэдне асвячалі ў час богаслужэння. Яна складалася звычайна з гародніны, рыбы, мясных і мучных вырабаў. Віно таксама не выключалася з прынашэнняў.

Вячэра любові звычайна пачыналася абмываннем рук і малітвай. У час яе спяваліся псалмы і іншыя свяшчэнныя песні, чыталіся і тлумачыліся тэксты са Свяшчэннага Пісання, а пры заканчэнні яе рабіўся грашовы збор для бедных, удоў, сірот і іншых няшчасных людзей. Усё заканчвалася малітвай і брацкім цалаваннем. Трэба заўважыць, што яўныя грэшнікі да вячэры не дапускаліся.

Вячэры любові ў першыя часы хрысціянства былі вельмі распаўсюджанымі ў Іерусаліме, Траадзе, Карынфе і інш. Святы Апостал Іуда ў сваім Пасланні, магчыма, на аснове ўласных назіранняў папярэджвае арганізатараў аб выбары ўдзельнікаў, каб такія вячэры любові не служылі месцам грэхападзення (Іуд 1, 12-13).

Яно [Валадарства Божае] падобнае на зерне гарчычнае, якое хтосьці ўзяў і пасадзіў у агародзе сваім. Яно выросла і стала вялікім дрэвам, такім, што нябесныя птушкі гняздзіліся ў галлі яго (Лк 13, 18).

Гарчычнае зерне (Мф 13, 31; Мк 4, 31; Лк 13, 19). Гарчыца — струкавая расліна з сям'і крыжакветкавых. Расце ў дзікім стане ў Егіпце і Палесціне, а таксама разводзіцца ў садах і агародах. Насенне гарчыцы па знешнім выглядзе вельмі малое і па сваёй драбнаце ўвайшло у прыказку. Калі яўрэі хацелі ахарактарыза-

ваць якую-небудзь рэч, казалі, што яна як зерне гарчычнае (Лк 17, 6). Словы прытчы (Лк 13, 18-19), дзе гаворыцца, што семя становіцца дрэвам, у галінах якога хаваюцца птушкі нябесныя, трэба разумець як вобразны выраз, уласцівы ўсходняй мове. Гарчычная расліна ў залежнасці ад клімату і глебы бывае рознай велічыні. Пры добрым надвор'і і на ўрадлівай зямлі дасягае вялікай вышыні і надзвычай шырока раскідае свае галіны.

Калі хто скажа на яго [*брата свайго*] *неразумны, дык яго пакарае геена вогненная* (Мф 5, 22).

Геена вогненная (не **прадонне**). Геена (яўр. даліна Енном) — назва глыбокага і вузкага яра на паўднёвым баку Іерусаліма, у якім пры Ахазе і Манасіі іудзеі-ідалапаклоннікі спальвалі сваіх дзяцей у гонар ідала Малоха.

Ідал Малох уяўляў сабой медную пустаполую статую з бычынай галавой і чалавечымі атрыбутамі, з працягнутымі ўперад і крыху апушчанымі рукамі, на якія ідалапаклоннікі кідалі ахвярованых яму сваіх дзяцей. Каб заглушыць жалобныя дзіцячыя крыкі, яны ігралі на музычных інструментах.

Цар Ісаія, вынішчаючы ідалапаклонства, апаганіў гэта месца: туды сталі выкідаць гарадскія нечыстоты, смецце, чалавечыя косці, трупы пакараных злачынцаў і дохлых жывёл. Для знішчэння смуроду і засцярогі ад інфекцыі ў гэтай даліне пастаянна гарэў агонь, таму тэрыторыю гэтую потым сталі называць месцам жаху і агіды. У пазнейшыя часы яр зрабіўся сімвалам вечных пакут, дзе не згасае агонь. У гэтым сэнсе часта сло-

ва *геена* ўжываецца Госпадам Ісусам Хрыстом ці само, ці са словам *вогненная* (Мф 5, 30). А прадонне — гэта бездань, бяздонне, прорва. Паколькі ў Беларусі шмат балот, то прадонне ўяўляецца, як гавораць у нашым народзе, чортавым вокам — вельмі глыбокім, бяздонным месцам на тонкай багністай дрыгве.

Таму ўсё, што вы сказалі ў цемры, пры святле будзе ўчутае, а што ў пакоі шапталі на вуха, будзе абвешчана на дахах (Лк 12, 3).

Дах (не **страха**) (Мф 10, 27). У жыллі яўрэяў, як і ўвогуле на Усходзе, дзякуючы сухому надвор'ю, дахі рабіліся плоскія, з рашоткамі па краях (Друг 22, 8), толькі сярэдзіна крыху ўзвышалася для сцёку дажджавой вады. Звычайна на дах вялі дзве лесвіцы: адна знутры дома, а другая прама з вуліцы (Мф 24, 17). Такімі дахамі карысталіся яўрэі па-рознаму. На даху шукалі прахалоды і свежага паветра (Дан 4, 26), у летні час спалі (1 Цар 9, 26), любілі там пагутарыць (1 Цар 9, 25), аддавацца сваім думам, разважанням (Вых 15, 3), з нагоды свят выконвалі розныя рэлігійныя абрады (Дзн 10, 9). Дахі служылі часам і для грамадскіх спраў (2 Цар 16, 22), між іншым, і для розных публічных аб'яў. А страха — гэта верхняя, звычайна саламяная, частка будынка, якая пакрывае яго і засцерагае ад атмасферных з'яў. *Бусел ... склаў гняздо на страсе.* Дубоўка. *З-за высокай разгацістай елкі выглядае страха хлява і калодзежны журавель.* Стрэхі беларускіх будынкаў двухсхільныя і прызначэнне іх у асноўным адрозніваецца ад прызначэння іудзей-

скіх дахаў. Так, напрыклад, на страсе нельга чалавеку спаць, адпачываць і інш. Таму ва ўсіх выпадках у тэкстах Новага Запавету замест слова *страха* ўжываецца слова *дах*.

Лягчэй вярблюду прайсці праз ігольнае вушка, чым багатаму ўвайсці ў Валадарства Божае (Мк 10, 25).

Ігольнае вушка (Мф 19, 24; Лк 18, 25). *Лягчэй вярблюду пралезці праз ігольнае вушка, чым ...* — гэта народны выраз іудзеяў, да гэтага часу яшчэ ўжываецца арабамі. Каб паказаць, што вядомая справа немагчыма ці надзвычай цяжка ажыццяўляецца, казалі, што хутчэй вярблюд або слон пралезе ў ігольнае вушка, чым тая падзея адбудзецца. Маем яшчэ адно паданне. У Палесціне была мясціна, дзе знаходзілася невялікая гара на адным з пешаходных шляхаў са своеасаблівай невысокай адтулінай, формаю, падобнай на ігольнае вушка. Чалавеку, каб прайсці (пралезці) скрозь яе, трэба было нізка схіліцца. А такія жывёлы, як вярблюды, прапаўзалі скрозь яе з вялікімі цяжкасцямі, перад гэтым стаўшы на калені.

Між іншым, некаторыя даследчыкі Евангелля лічаць, што пад вярблюдам трэба разумець не жывёлу, а тоўсты канат, які ўжываўся карабельшчыкамі пры кіданні якара для ўмацавання карабля. Але і ў тым і ў другім сэнсе імі толькі паказваецца немагчымасць ці незвычайная складанасць. Узнікае пытанне: навошта сказаў Ісус Хрыстос Сваім вучням, што цяжка ўвайсці ў Валадарства Нябеснае, калі яны былі бедныя і нічога не мелі? А гэта, як сцвярджаюць багасловы, для таго, каб навучыць Апосталаў не саромецца

сваёй беднасці і для таго, каб апраўдацца перад імі ў тым, што Ён раіў ім нічога не мець.

Няма любові большай за тую, калі хтосьці жыццё сваё аддае за сяброў сваіх (Ін 15, 13).

Любоў (1 Кар 13, 3-5; Мф 22, 36-40). Дзесяць Запаведзяў Гасподніх былі раздзелены на дзве скрыжалі, паколькі ў Запаведзях заключаюцца два віды любові, г. зн. любоў да Бога і любоў да бліжняга. Бліжнімі нашымі трэба лічыць усіх, бо ўсе — стварэнні адзінага Бога. Любоў трэба прыносіць у ахвяру бліжняму, і любоў да бліжніх трэба прыносіць у ахвяру Богу.

А Я кажу вам: не прысягайце наогул: ні небам, бо яно — прастол Божы; ні зямлёю, бо яна — падножжа нагам Яго (Мф 5, 34-35).

Прастол (Апак 7, 4) — узвышанае месца, на якое ўзыходзяць і садзяцца цары пры ўрачыстых аўдыенцыях. Прастолы рабіліся розныя, былі часам такія высокія, што на іх падымаліся па спецыльных ступеньках, і такія шырокія, што каля цара магла сядзець царыца ці сын цара. Прастол цара Саламона быў зроблены са слановай косці і ўпрыгожаны чыстым золатам. Слова прастол у Святым Пісанні ўжываецца і ў адносінах да Госпада Бога. *Неба — прастол Мой,* — кажа Гасподзь (Іс 66, 1). У некаторых хрысціянскіх храмах прастол — гэта высокі чатырохвугольны стол пасярод алтара, за якім свяшчэннаслужыцель адпраўляе набажэнства.

Потым Ён [Ісус Хрыстос] сказаў ім [Апосталам]: павінна збыцца ўсё, што напісана пра Мяне ў Законе Маісеевым, у прарокаў і псалмах (Лк 24, 44).

Псалом (не **псальма**) — натхнёная песня Давіда, адна са свяшчэнных песняў; псалмы, або Псалтыр, складаюць частку Старога Запавету Бібліі.

Псальма — гэта кант, сілабічная песня. Вытокі псальмаў з кніжнай сілабічнай паэзіі. У заходніх славян узніклі каля XII ст. пад назвай кант. У ВКЛ сустракаюцца з пачатку XVII ст. і звязаны з Уніяцкай Царквой. У XVIII ст. трапілі ў свецкае асяроддзе, з часам фальклярызаваліся і ўвайшлі ў калядныя, валачобныя, вясельныя, пахавальныя абрады беларусаў. Псальмы перакладаліся з лацінскай і польскай моў, але былі і арыгінальныя творы Сімяона Полацкага і інш. Аўтары часта пакідалі сваё імя ў акравершах. Часам выпускаліся асобныя зборнікі, напрыклад, адзін з такіх быў выдадзены ў 1790 г. у Пачаеве, у склад зборніка ўвайшло каля 250 песняў. Мова большасці псальмаў неаднародная. Адны песні пісаліся на старабеларускай мове, іншыя — на царкоўнаславянскай, часта дадаваліся польскія, беларускія ці ўкраінскія элементы.

Такім чынам, усяго ад Аўраама да Давіда было чатырнаццаць пакаленняў; ад Давіда да Вавілонскага перасялення — чатырнаццаць пакаленняў; ад Вавілонскага перасялення да Хрыста — чатырнаццаць пакаленняў (Мф 1, 17).

Радавод — гэта падлік продкаў па сыходнай пераемнай лініі, як у святога Матфея (Мф 1, 1-17), ці лі-

нii, што ўзыходзіць, як у святога Лукі (Лк 3, 23-38). У пісьменнікаў Усходу ўвогуле і, у прыватнасці, у іудзеяў было прынята пры апісанні жыцця якой-небудзь знакамітай асобы спасылацца на радаводную табліцу. Але, акрамя гэтага, евангелісты Матфей і Лука, змяшчаючы радавод Госпада, ставілі перад сабой яшчэ вельмі важную мэту — паказаць, што Ісус Хрыстос паходзіў менавіта ад тых асоб, якім дадзены быў запавет аб паходжанні ад іх Месіі. Такім чынам, змяшчэнне радаводу Госпада Ісуса Хрыста з'яўляецца выдатным пераходам ад Старога Запавету да Новага.

Тады першасвятар разарваў адзенне сваё і сказаў: зневажаеш Бога (Мф 26, 65).

Разарваць адзенне сваё (Мф 26, 65; Мк 14, 63). Разрыванне адзення свайго было ў іудзеяў выражэннем вялікага смутку, жалю, наракання, бяды. На аснове Бібліі (4 Цар 18, 37) пераконваемся, што першасвятары маглі раздзіраць адзенне сваё толькі тады, калі чулі зневажанне Бога. Забарона ім раздзіраць адзенне сваё (Лев 10, 6; 21, 10) адносілася, верагодна, толькі да выражэння гэтым звычайнага смутку, бяды, і прытым не дазвалялася раздзіраць адзенне, у якім адбывалася богаслужэнне.

Ісус адказаў [*укрыжаванаму разбойніку*]: *праўду, праўду кажу табе: сёння будзеш са Мною ў раі* (Лк 23, 43).

Рай (2 Кар 12, 2-4; Лк 23, 42-43 Быц 2, 8). Гэта слова персідскага паходжання і азначае *сад*. Так названа выдатнае жыллё першага чалавека, апісанае ў кнізе

Быціе. Рай, у якім жылі першыя чалавекі, быў для цела матэрыяльным як бачанае шчаслівае месца для жыцця, а для душы — духоўным як месца зносін з Богам. Раем называецца і тое блажэннае жыллё небажыхароў і праведнікаў, якое атрымаюць яны пасля Страшнага суда Божага.

Потым [*Ісус*] *сказаў ім* [*слугам*]: *цяпер зачарпніце* [*віно*] *і нясіце распарадчыку вяселля. Яны панеслі* (Ін 2, 8).

Распарадчык вяселля (не вясельны сват) быў асобай, прызначанай сачыць за слугамі і назіраць за ўсім парадкам балю. На ім, між іншым, ляжаў абавязак спрабаваць віно, каб вызначыць яго якасць і прыгоднасць для частавання прысутных гасцей. Такім чынам, распарадчык балю спрабаваў віно, утворанае Госпадам з вады на вяселлі ў Кане Галілейскай (Ін 2, 9-10). Сват — гэта асоба, якая сватае жаніху нявесту ці нявесце жаніха. *Ехаць у сваты. Добры сват раней, чым пасватаць дзяўчыну хлопцу, уведае, што за яна, які характар мае, у людзей распытае.* Пальчэўскі. У іудзеяў, у нашым разуменні, сватання і сватоў не было. У іх жаніх і нявеста прызначаліся адзін аднаму са згоды бацькоў. Гэты выбар праводзілі бацькі з ранніх гадоў дзяцей, хоць сапраўдны шлюб адбываўся па дасягненні нявестай паўналецця, г. зн. 12-гадовага ўзросту. Абрад заручын праводзіўся за год і больш да вяселля і замацоўваўся дамовай у вуснай або пісьмовай форме. З гэтай нагоды нявесце ўручалася сярэбраная манета пры сведках. Ад заручын да шлюбу нявеста ўжо лічылася законнай жонкай свайго жаніха (Мф 1, 19-20). Таму

паколькі абрад шлюбу ў Іудзеі адрозніваўся ад нашага беларускага, то больш правільна замест спалучэння *вясельны сват* ужыць спалучэнне *распарадчык вяселля.*

І ў тую хвіліну яны [вучні Ісуса Хрыста] зразумелі, што Ён казаў асцерагацца не хлебнай закваскі, а вучэння фарысеяў і садукеяў (Мф 16, 12).

Садукеі (Мф 16, 12) — іудзейская секта, часта ўпамінаецца ў Новым Запавеце. Паводле іудзейскіх паданняў, пачатак яе ідзе ад Садока, старшыні сінедрыёна з III ст. да Н. Х. Па іншых, больш верагодных паданнях, трэба разумець першасвятара Садока часоў цара Саламона і што менавіта ад яго нашчадкаў ідзе садукейства. Садукеі вучылі, што для чалавека няма ні вечнага жыцця, ні вечных мук, ні вечнай асалоды. Яны адмаўлялі наяўнасць анёлаў, злых духаў і будучае ўваскрашэнне памерлых (Мф 22, 23; Дзн 23, 8). Садукеі ўслаўлялі толькі знешнюю сілу, былі за сувязь з язычнікамі, дапускалі пранікненне язычніцкай культуры. Такое вучэнне не было распаўсюджаным, але ў ліку садукеяў было шмат багатых і ўплывовых людзей. Яны, як правіла, узначальвалі сінедрыён. Разам з фарысеямі яны выступалі супраць Ісуса Хрыста.

Жыла ў Іопіі адна вучаніца, якую звалі Тавіфа, што азначае сарна. Была яна вельмі добрая і шчодра давала міласціну (Дзн 9, 36).

Сарна (не **газель**) (Дзн 9, 36). У розных выданнях імя Тавіфа перакладаецца па-рознаму: то газель, то сарна. Высветлім, што абазначаюць гэтыя словы. Га-

зель — гэта від антылопы з рагамі ліpападобнай формы. Водзяцца антылопы ў саваннах — прыродных зонах трапічных стэпаў, размешчаных абапал экватара. А сарна — горная каза з невялікімі рагамі. Паколькі Іудзея — гэта не трапічны стэп, не саванна, то мы аддалі перавагу другому варыянту перакладу — сарна.

А Ён [Ісус Хрыстос], абярнуўшыся, сказаў Пятру: прэч з вачэй Маіх, сатана! ты Мне перашкода, бо думаеш не па-божаму, а па-чалавечы (Мф 16, 23).

Сатана (1 Пар 21, 1; Мф 16, 23) — яўрэйскае слова, азначае ўвогуле праціўніка і ворага. У Свяшчэнным Пісанні назва гэта адносіцца да д'ябла, які з'яўляецца начальнікам злых духаў, ворагаў Божых, спакуснік і згубіцель душ чалавечых. Ужытае слова ў Евангеллі паводле Святога Матфея азначае тое сатанінскае спакушэнне, пад уздзеянне якога падпаў Апостал Пётр.

Убачыўшы народ, Ісус узышоў на гару. І калі Ён сеў, падышлі да Яго вучні Яго (Мф 5, 1).

Сесці, навучаць седзячы (Мф 5, 1; 13, 1; 26, 55; Лк 5, 3). У іудзеяў быў звычай праводзіць навучанне седзячы. *Ісус адразу пайшоў на гару Елеонскую, але на досвітку зноў прыйшоў у святыню. Увесь народ сыходзіўся да Яго, і Ён сеў і навучаў іх* — чытаем у Евангеллі паводле Іаана (Ін 8, 1-2).

Як толькі настаў дзень, сабраліся старэйшыны народа, архісвятары і кніжнікі і загадалі прывесці Яго [Ісуса Хрыста] у сінедрыён свой (Лк 22, 66).

Сінедрыён (Мф 5, 22; Мк 14, 55; Лк 22, 66; Ін 11, 47; Дзн 4, 15). Пад гэтым словам трэба разумець вярхоўны суд, які складаўся з іудзеяў, што знаходзіліся ў Іерусаліме. Усяго ўваходзілі ў склад сінедрыёна 72 члены пад старшынствам першасвятара. Гэта былі людзі пераважна з фарысейскіх і садукейскіх сект, выбіраліся падачай галасоў ці пры дапамозе жэрабя. Старшынёй быў першасвятар, без яго нічога не вырашалася (Ін 11, 47; Дзн 5, 21). Месцам сходу, паводле меркавання талмудыстаў, была зала пры Іерусалімскім храме, але ў некаторых выпадках збіраліся ў доме першасвятара (Мф 26, 3; Ін 8, 24). Пасля разбурэння Іерусаліма сінедрыён ужо не быў судом, а школай ці вучылішчам Закону. Апошнім кіраўніком сінедрыёна быў Гамалііл V, пасля яго смерці ў 425 г. апошні след гэтай установы знік. Суду сінедрыёна належалі важнейшыя справы народа, менш значныя пытанні вырашаліся ў ніжэйшых судах. Патрабаванні Закону павінны былі выконваць усе, нават цары. Без дазволу сінедрыёна, напрыклад, цар не меў права пачынаць вайну. Да заваёвы Іудзеі рымлянамі сінедрыёну належала права жыцця і смерці чалавека, але потым улада была абмежавана. Ён меў права асуджаць на смерць, але на выкананне прыгавору патрабаваўся дазвол рымскага правіцеля (Ін 18, 31).

Былі ў ім [у месцы ў Скініі, якое мае назву Святое Святых] залатая пасудзіна з маннаю, посах Аарона, які заквітнеў, і Скрыжаль Запавету (Яўр 9, 4).

Скрыжалі Запавету (Вых 24, 12; 2 Кар 3, 3; Яўр 9, 4). Пад назвай разумеюцца дзве каменныя дошкі, на якіх Самім Госпадам было напісана Дзесяць Запаведзяў Закона Божага. Чатыры першыя запаведзі, напісаныя на адной дошцы, змяшчаюць у сабе пазнанне і паважанне Сапраўднага Бога, а астатнія шэсць, напісаныя на другой, заключаюць у сабе абавязкі да бліжняга. Дзесяць Запаведзяў, ці запаветаў, Закона Божага раздзелены на дзве скрыжалі і азначаюць тое, што ў іх заключаюцца два віды любові, г. зн. любоў да Бога і любоў да бліжняга.

А таму, як праз аднаго чалавека грэх увайшоў у свет, а праз грэх — смерць, дык такім чынам смерць перайшла на ўсіх людзей, бо ўсе зграшылі (Рым 5, 12).

Смерць (Рым 5, 12). Смерць бывае дваякая: цялесная і духоўная. Цялесная смерць заключаецца ў тым, што цела застаецца без душы, якая ажыўляла яго, а духоўная ў тым, што душа пазбаўлена ласкі Божай, якая ажыўляла яго вышэйшым духоўным жыццём. Душа таксама можа памерці, але не так, як памірае цела. Цела, калі памірае, губляе пачуцці і разбураецца. А душа, калі памірае з грахом, губляе духоўнае святло, радасць і ласку, яна не разбураецца, не знішчаецца,

а застаецца ў стане цемры, смутку і пакут. Смерць увайшла ў свет праз грэх нашых прабацькоў. Усе людзі нарадзіліся ад Адама, заражанага грахом, і самі грашаць. Як з заражанай крыніцы цячэ забруджаная вада, так ад роданачальніка, заражанага грахом і таму смертнага, натуральна адбываецца заражэнне грахом і таму смертнае патомства.

Аднойчы Ісус у суботу праходзіў сярод палёў са збажыною. А вучні Яго, адчуваючы голад, сталі зрываць каласы і есці (Мф 12, 1).

Субота (Ін 9, 14). Гэтым словам называецца сёмы дзень тыдня, у які іудзеі пад страхам нават смяротнага пакарання павінны былі пакідаць усякую працу, прысвячаючы ўвесь час гэтага дня для адпачынку. Святкаванне суботы павінна было нагадваць яўрэям стварэнне свету і вызваленне з Егіпта. Суботні дзень, як і ўсе святочныя дні яўрэяў, пачынаўся і заканчваўся вечарам, ад вечара пятніцы да вечара суботы. Строгасць суботняга адпачынку забараняла нават распальваць вогнішча для прыгатавання ежы, стравы неабходна было гатаваць за дзень да суботы. Так, па меркаванні фарысеяў, парушальнікам суботняга спакою быў той, хто ў суботу, праходзячы міма засеянага поля, зрываў некалькі каласоў і еў; таксама той, хто аказаў бы ў гэты дзень дапамогу хвораму, а разам з тым і сам, хто ачуняў, калі б ён, устаўшы на ногі, нёс з сабой пасцель, на якой ляжаў (Мф 12, 1-2). Такія парушальнікі маглі быць пакаранымі.

Ён [Ісус Хрыстос] сказаў ім [Апосталам]: нічога не бярыце ў дарогу: ні кія, ні падарожнай торбы, ні хлеба, ні грошай; таксама не бярыце дзвюх вопратак (Лк 9, 3).

Торба (Лк 9, 3; Мк 6, 8). Ролю торбы ў апостальскі час выконваў шырокі пояс, які па шырыні складваўся ўдвая і насіўся адтулінай зверху. Такі пояс быў неабходным элементам вопраткі, разам з тым выконваў функцыю торбы, кашалька. Ён унутры быў пусты, у яго праз верхнюю адтуліну ўкладваліся грошы, іншыя каштоўныя рэчы. Часам гэты пояс быў падзелены на часткі, якія маглі замыкацца спецыяльным ключыкам. Такія паясы насілі ў многіх усходніх краінах. Праз стагоддзі ў Беларусі ткаліся падобныя слуцкія паясы.

І калі настаў час, Ён [Ісус Хрыстос] узлёг за стол і Апосталы з ім (Лк 22, 14).

Узляжаць за сталом (не **сядзець** за сталом) (Мф 15, 35; Мк 8, 6; Лк 22, 14 і інш.). У даволі старажытны перыяд часу іудзеі садзіліся за стол (Быц 27, 19), але затым яны ўвялі звычай за сталом узляжаць. А гэта значыць, што гаспадары і госці звычайна садзіліся паўлежачы, схіліўшыся на левы локаць, карыстаючыся пры ядзе галоўным чынам толькі правай рукой. Відавочна, што пры ўзляжанні за сталом усякі прысутны лёгка мог схіліць сваю галаву да грудзей другога, як, напрыклад, і святы Іаан Багаслоў на Тайнай Вячэры ўзляжаў, прытуліўшыся да грудзей Ісуса Хрыста (Ін 13, 23). За іудзейскімі абедамі і вячэрамі жанчыны ніколі не прысутнічалі.

А калі ён [Іаан Хрысціцель] бачыў, што да хрышчэння прыходзяць многія з фарысеяў і садукеяў, казаў ім: род змяіны! хто сказаў вам, як пазбегнуць гневу, што надыходзіць (Мф 3, 7).

Фарысеі (Мф 3, 7) — вядомая іудзейская секта, якая ўзнікла пасля Вавілонскага палону. Назва паходзіць ад яўрэйскага слова, што абазначае *аддзяленне, адлучэнне.* Фарысеі строга стаялі за рэлігійную і нацыянальную самабытнасць іудзейства, схіляліся перад Законам Маісея і лічылі яго адзінай нормай сапраўднай веры і праведнага жыцця. Фарысеі прытрымліваліся розных дробных абрадаў, за што іх строга выкрываў Гасподзь і, вядома, яны спрыялі правядзенню суда над Ім. У адрозненне ад садукеяў, фарысеі веравалі ў Бога, ва ўваскрашэнне цела і ў наяўнасць анёлаў, духаў. Хоць некаторыя з іх сталі паслядоўнікамі Хрыста, аднак па сутнасці сваёй фарысейства было варожае Хрысціянству.

Другі раз адышоўшыся, Ён [Ісус Хрыстос] маліўся вось так: Ойча Мой! калі не можа Мяне абмінуць чаша гэта і Я павінен выпіць яе, нехай будзе воля Твая (Мф 26, 42).

Чаша (не **келіх**). Чаша (грэчаскае слова) — адна са свяшчэнных пасудзін у форме паўшар'я, у царкоўным жыцці ўжываецца са старажытных часоў. Для Скініі святога храма, напрыклад, чаша была зроблена з золата, выкарыстоўвалася для курэння фіміяму перад Госпадам і называлася яшчэ кадзільніцай, або кадзі-

лам. У час пасля Н. Х. асвячонымі чашамі карыстаюцца падчас Святой Літургіі, у правядзенні Святога Сакраманту — Прычашчэння. А **келіх** (ням. Kelch) — вялікая, звычайна высокая чарка, чара; абазначае назву пасудзіны і колькасць напітку, што можа змясціцца ў такой пасудзіне.

П'ю за першага сына
Келіх поўны, як вока. Бялевіч.

Келіх, кілішак ужываецца пераважна ва ўсіх сферах свецкага жыцця: вяселляў, застолляў, прыёмаў і ўрачыстых абедаў.

Чаша ўжываецца пераважна ў сакральным, царкоўна-касцельным значэнні і лёсавызначальных перажываннях. Кажуць: Гасподзь дапусціў, даў мне скаштаваць, надпіць з чашы гора.

Ойча Мой! калі гэта можліва, няхай абміне Мяне чаша гэта (Мф 26, 39).

Потым пачуў я гучны голас са святыні, які казаў семярым Анёлам: ідзіце і выліце сем чашаў гневу Бога на зямлю.

І пайшоў першы, і выліў сваю чашу на зямлю» (Адкр 16, 1-2)

Чаша ў руцэ Госпада (Пс 74, 9). (Не келіх).

Вавілон быў залатою чашаю ў руцэ Госпада (Іер 51, 7).

Я зраблю Іерусалім чашаю для ўсіх навакольных народаў (Зах 12, 2).

Цар Вальтазар зрабіў вялікае баляванне для тысячы вяльможаў.., загадаў прынесці залатое і срэбнае начынне, у тым ліку і чашы, якія вынес са святыні Іерусалімскай яго бацька Навухаданасар, каб мог піць з іх віно сам і кожны з яго вяльможаў, іх жонкі і наложніцы. У той самы час з'явіліся пальцы рукі чалавечай, якія пісалі насупраць лампады на тынку сцяны царскага палаца (Дан 5, 1-3, 5).

У нашых народаў (рускіх, украінцаў, беларусаў і інш.) існуюць розныя назвы: келіх, чарка, стакан, шклянка, бакал, фужэр, стопка, кілішак, але слова **чаша** ўзнёслае, патаемна-сакральнае і ўжываецца толькі ў Святым Пісанні, Святой Літургіі і ў Божым храме.

Спешна пайшлі яны [*пастухі*]
і знайшлі Марыю, Іосіфа і Немаўля,
Якое ляжала ў яслях (Лк 2, 16).

Яслі (не **жолаб**) — кармушка для жывёлы ў выглядзе адкрытай скрынкі або рашоткі, нахілена прымацаванай да сцяны. [*Каня*] *вабіў да сябе цёплы хлеў з яслямі, поўнымі мурожнага сена.* Новікаў. А **жолаб** — гэта:

1. Прадаўгаватае паглыбленне, выдзеўбанае ў дрэве або камені, а таксама прыстасаванне падобнай формы з дошак, ліставога жалеза і інш. для сцёку вадкасцей або перасыпання чаго-небудзь. *Па жолабе паліўся залаты чыгун.* Карпаў.

2. Прадаўгаватае паглыбленне ў грунце, па якім сцякае што-небудзь.

Унь там рачулка срэбрам літым
Бяжыць па жолабе размытым. Колас.

3. Карыта, у якое закладваецца корм жывёле.

Капейка зноў пачаў хваліць і кабылу, і жолаб, у якім Міхась абмешваў вотруб'ем сечку. Брыль.

АРФАГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК

А

* абе́дня *ж.*
* абкла́д *м.*
* аблачэ́нне *н.*
* адве́нт *м.*
акаджа́ць
акалі́т *м.*
* ака́фіст *м.*
акрама́цыя *ж.*
* алта́р *м.*
* а́льба *ж.*
* амбо́н *м.*
амі́кт *м.*
а́мпулка *ж.*
анамне́з *м.*
* антыфо́н *м.*
* апо́стальскі
ардына́рый *м.*
* арна́т *м.*
* архідыя́кан *м.*
архідыяканá́т *м.*
* архідыяцэ́зія *ж.*
архіепа́рхія *ж.*
* архіепі́скап *м.*
* архіпа́стыр *м.*
аўгусці́нскі
* аўгусці́нцы
* афіцыя́л *м.*

Б

* базіліка *ж.*
* базыльяне
* базыльянскі
балдахі́н *м.*
* баніфра́тры
* беатыфіка́цыя *ж.*
* бенедыкці́нскі
* бенедыкці́нцы
* бернардзі́нскі
* бернардзі́нцы
* бі́скуп *м.*
* бі́скупства *н.*
біяэ́тыка *ж.*
* благаслаўле́нне *н.*
* благаслаўлёны

В

ваты́ўны
* віка́рый *м.*
* вы́спаведаны
* вы́спаведацца
* вы́спаведаць

Г

* габі́т *м.*
гамі́лія *ж.*
* гаспіталье́ры
го́стыя *ж.*

градуа́л *м.*
грэмія́л *м.*
гумера́л *м.*

Д

даксало́гія *ж.*
* дактара́т *м.*
далма́тыка *ж.*
* дамініка́нскі
* дамініка́нцы
* дарано́сіца *ж.*
* дзе́янне *н.*
* дыя́кан *м.*
дыяканат *м.*
дыя́канства *н.*
дыяцэ́зія *ж.*
дыяцэзія́льны
дэканат *м.*

Е

* евангеліярый *м.*
* ева́нгелле *н.*
* езуі́ты
* езуі́цкі
епітым'я *ж.*
* еўхарыстычны
* еўхары́стыя *ж.*
ефа́р *м.*

І

* іааніты
іаані́цкі
* іера́рх *м.*
іерархічны
* імша́ *ж.*
імша́л *м.*
інвака́цыя *ж.*
* інтэ́нцыя *ж.*

К

* кадзі́ла *н.*
* кадзі́льніца *ж.*
кадзі́льны
кале́кта *ж.*
* камеду́лы
* каментатар *м.*
камунітарны
каму́нія *ж.*
* кананіза́цыя *ж.*
кананічны
канвенту́альны
кангрэга́цыя *ж.*
* кано́н *м.*
* кано́нік *м.*
кансекрава́ны
кансекрава́ць
кансекра́цыя *ж.*
ка́нтар *м.*
кантэмпля́цыя *ж.*
канцэлебра́нт *м.*
канцэлебра́цыя *ж.*
канцэлебру́ючы
ка́па *ж.*
* капітул *м.*
* кармелі́ты
карпара́л *м.*
* кацярынкі
кле́нчыць

ко́мжа *ж.*
* ку́рыя *ж.*

Л

* лампада *ж.*
лампа́дны
* ле́ктар *м.*
* ле́кцыя *ж.*
лекцыяна́рый *м.*
* літургі́чны
* літургі́я *ж.*
* ліцэнцыя́т *м.*

М

* мартыралО́г *м.*
марыя́не
ме́нса *ж.*
міністра́нт *м.*
міса́л *м.*
* му́чанік *м.*

Н

навэ́нна *ж.*
начы́нне *н.*
не́шпар *м.*

П

* падсве́чнік *м.*
пали́й *м.*
па́лла *ж.*
папяльцо́вы
пара́мент *м.*
партыкуля́рны
* па́стар *м.*
* па́стырскі
* Па́сха
пасха́л
патэ́на
* пія́ры
плювія́л
* празеліт *м.*
* празелітызм *м.*
* працэ́сія *ж.*
* про́башч *м.*
прэзбіта́р *м.*
прэзбітэ́рый *м.*
прэфа́цыя *ж.*
псалміст *м.*
* псало́м *м.*
* псальма *ж.*
псальміст *м.*
пурыфера́рый *м.*
пурыфіка́тар *м.*
пу́шка *ж.*

Р

* рахі́ты
* ружа́нец *м.*
ружанцо́вы
* рэгу́л *м.*
рэ́ктар *м.*
* рэліква́рый *м.*
* рэлі́квія *ж.*
* рэлятывізм *м.*
рэля́цыя *ж.*
рэспансары́йны

рэспансо́рны
* рэспансо́рый *м.*
* рэцыта́цыя *ж.*

С

са́кра *ж.*
* сакра́льны
* сакра́мант *м.*
сакрамента́рый *м.*
* сакрамента́льнасць *ж.*
* сакрамента́льны
сакра́рый *м.*
* сакры́стыя *ж.*
сакрыстыя́н *м.*
санктуа́рый *м.*
* секве́нцыя *ж.*
* секулярыза́цыя *ж.*
секулары́зм *м.*
сігнату́рка *ж.*
* сіно́д *м.*
* служы́цель *м.*
* стальні́ца *ж.*
сту́ла *ж.*

Т

* табернакль *м.*
тра́ктус *м.*
трынітарны
* трэ́бнік *м.*
турыфера́рый *м.*
* тэалагі́чны
* тэало́гія *ж.*
тэ́ка *ж.*

Ф

* фарысе́й *м.*
* францыска́нскі
* францыска́нцы

Х

хара́льны
* хару́гва *ж.*
хары́зма *ж.*
* харызматы́чны

Ц

* цырыманія́л *м.*
* цырыманія́льны
* цыстэрцыя́нцы (о)
цэлебрава́ць
цэлебра́цыя *ж.*

Ш

* шары́ткі

Э

эклезія́льны
эксцэле́нцыя *м.*
* экуменізм *м.*
экумені́чны
эмбалізм *м.*
эміне́нцыя *м.*
* энцыкліка *ж.*
эпікле́за *ж.*

Я

* я́гнец *м.*
* яле́й *м.*

СЛОВЫ І ЗВАРОТЫ ВЕТЛІВАСЦІ

Прывітанні

Хвала Ісусу Хрысту! — словы, якімі вітаюцца хрысціяне пры сустрэчы са знаёмымі на працягу сутак. Адказ: **На векі вечныя!**

Хрыстос Уваскрэс! — словы, якімі вітаюцца хрысціяне на Вялікдзень і пры сустрэчы са знаёмымі на працягу Велікоднага перыяду. Адказ: **Сапраўды Уваскрэс!**

Добрай раніцы! або **Добрая раніца!** — прывітальныя словы пры сустрэчы са знаёмымі і незнаёмымі раніцай.

Добры дзень! або **Дзень добры!** — прывітальны зварот пры сустрэчы са знаёмымі і незнаёмымі раніцай або ўдзень.

Прывітанне! — зварот да блізкага знаёмага чалавека пры сустрэчы.

Вітаю Вас! — прывітальны зварот да каго-небудзь са знаёмых пры сустрэчы або выказванне віншавання ў сувязі з якім-небудзь урачыстым выпадкам.

Віншую Вас! або **Сардэчна віншую Вас!** — зварот да каго-небудзь з выпадку дня нараджэння або ў сувязі з дасягненнем якіх-небудзь поспехаў, перамог.

Добры вечар! — прывітальныя словы пры ўваходзе да каго-небудзь у хату вечарам або ўвогуле пры сустрэчы вечарам.

Як жывяце? або **Як маецеся?** — зварот пасля прывітання пры пачатку размовы са сваякамі і добра знаёмымі.

Як Ваша здароўе? або **Як сябе адчуваеце?** — зварот пры сустрэчы са знаёмым, якога працяглы час не бачыў або які нядаўна хварэў.

Звароты

Ваша Святасць! Святы Ойча! — зварот да Папы.

Ваша Свяцейшаства! — зварот да праваслаўнага Патрыярха.

Ваша Высокапраасвяшчэнства! — зварот да праваслаўнага Мітрапаліта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі.

Ваша Эміненцыя! — зварот да Кардынала.

Ваша Эксцэленцыя! — зварот да Архібіскупа, да Біскупа.

Паважаны Уладыка! — зварот да Біскупа, Архібіскупа, Мітрапаліта (праваслаўнага, каталіцкага і ўніяцкага).

Ксёндз-дэкан! — зварот да святара якому даручана духоўная апека над дзесяцю ці некалькімі святарамі і іх парафіямі.

Ваша Прападобіе! — зварот да праваслаўнага дэкана, заслужанага святара, якому даручана духоўная апека над дзесяццю ці некалькімі святарамі і парафіямі.

Ксёндз-пробашч — зварот да пробашча парафіі.

Ксёндз Антоній! — зварот да ксяндза.

Айцец Уладзімір! — зварот да праваслаўнага святара.

Ксёндз-дыякан — зварот да дыякана.

Ксёндз-клерык — зварот да алюмна (студэнта) вышэйшай духоўнай семінарыі.

(Паважаны, глыбокапаважаны) пан (з указаннем пасады або прозвішча) — а) зварот да грамадзян іншых краін; б) форма ветлівага звароту ў Польшчы.

Паважаны (глыбокапаважаны) спадар (паважаная спадарыня) (з указаннем пасады або прозвішча) — ветлівы афіцыйны зварот, пісьмовы або вусны, да якой-небудзь службовай асобы.

Дарагі (любы) дружа! — сардэчны пісьмовы або вусны зварот да блізкага сябра.

Дзядзька або **цётка** (з указаннем імя, прозвішча або без іх) — зварот вучня да старэйшага ў бытавых абставінах.

Просьбы

Калі ласка! — словы, якія ўжываюцца пры дзеясловах для выражэння ветлівай просьбы, напрыклад: **Дапамажыце, калі ласка! Дазвольце, калі ласка!**

Зрабіце ласку! або **Будзьце ласкавы!** — ветлівая просьба выканаць што-небудзь, аказаць якую-небудзь паслугу.

Словы падзякі

Дзякуй Вам! — выказванне падзякі каму-небудзь за паслугу.

Вельмі (шчыра) удзячны Вам! — больш цёплая форма выказвання падзякі за чыю-небудзь дапамогу, асаблівую ўвагу, паслугу.

Запрашэнні

Сардэчна запрашаем! — пісьмовае або вуснае запрашэнне зайсці, увайсці куды-небудзь, наведаць каго-небудзь.

Калі ласка (заходзьце, сядайце, частуйцеся і інш.) — ветлівае запрашэнне, дазвол выканаць названае дзеянне.

Дазвольце Вас запрасіць (на вальс, у тэатр, на выставу і інш.) — зварот да таго, каго запрашаюць.

Не забывайце нас! або **Не забывайце пра нас! Наведвайце нас часцей!** або **Наведвайцеся часцей!** — зварот пры развітанні да сваякоў, блізка знаёмых, якія далёка жывуць або рэдка наведваюцца.

Пажаданні

З Богам! — развітальнае пажаданне гаспадара таму, хто адыходзіць, або гаспадару да таго, хто адыходзіць.

Заставайцеся здаровы! Будзьце (бывайце) здаровы! або **Добрага Вам здароўя!** — развітальнае пажаданне пры адыходзе з дому сяброў, знаёмых і ўвогуле пры развітанні.

Усяго добрага (найлепшага)! Шчасліва! Шчаслівай дарогі! або **Ідзіце з Богам** ці **Ідзіце здаровы!** — развітальнае пажаданне гаспадара таму, хто адыходзіць.

Да скорай (хуткай) сустрэчы! або **Да спаткання! Да пабачэння!** — словы, якія кажуць на развітанне, калі хочуць падкрэсліць жаданне зноў пабачыцца.

Шчасліва вярнуцца! — пажаданне таму, хто адпраўляецца ў вялікую дарогу або ад'язджае на доўгі час.

Шчасці Вам Божа! Шчасці Божа! Адказ: **Дзякуй!**

Спакойнай (добрай) ночы! або **Дабранач! Спакойна адпачыць!** — развітальнае пажаданне пры адыходзе з дому знаёмых, позна вечарам у сям'і.

Хлеб-соль! або **Хлеб ды соль!** — пажаданне гаспадарам, калі яны абедаюць дома. Адказ: **Дзякуй!**

Смачна есці! Смачнага! — пажаданне знаёмым, блізкім, калі яны абедаюць (снедаюць, вячэраюць) паза домам. Адказ: **Дзякуй!**

Богпомач! Памагай Бог! Спор у працы! або **Спору ў працы! Дапамажы вам Божа!** — пажаданне таму, хто працуе. Адказ: **Дзякуй!**

Скорай (хуткай) папраўкі! або **Скарэй (хутчэй) папраўляйцеся!** — пажаданне хвораму пры развітанні.

На здароўе! — адказ-пажаданне гаспадара таму, хто дзякуе за яду, пачастунак.

Вялікі расці! — пажаданне малому дзіцяці за паслугу.

Прабачэнні

Даруйце (прабачце, прабачайце), калі ласка! — так просяць прабачэння ў таго, каму прычынілі непрыемнасць, каго патурбавалі і інш.

Не крыўдуйце! — прабачэнне за малапрыемныя, але справядлівыя словы.

Няма за што! — словы, якімі адказваюць на падзяку, або **Калі ласка!**

Прабачце, калі што не так! — а) словы, якімі адказваюць гаспадары на падзяку госця; б) словы, якімі просяць прабачэння за магчымыя недахопы ў выкананай рабоце, у якой-небудзь дзейнасці і інш.

Віншаванні

З Нараджэннем Хрыстовым!
З Божым Нараджэннем!
Са Святам Божага Нараджэння!
З Раством Хрыстовым!
З Божым Нараджэннем і Калядамі!
Са Святам Божага Нараджэння і Калядамі!
З Нараджэннем Хрыстовым і Калядамі!
З Раством Хрыстовым і Калядамі!

БЕЛПОШТА

БЕЛПОЧТА

Настоятелю костела
Св. Симона и Св. Елены
ксендзу-магистру
Владиславу Завальнюку

Уважаемый ксендз-магистр!

Сердечно поздравляем Вас с великим христианским праздником Рождества Христова и Новым годом! Желаем Вам здоровья, Божией помощи в служении на благо паствы белорусской земли, любви, мира, процветания и благополучия.

Республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта» ежегодно выпускает продукцию к таким светлым праздникам, как Рождество Христово и Пасха.

Просим Вас оказать помощь в вопросе правильности написания на белорусском и русском языках поздравительных текстов на открытках и почтовых конвертах к указанным праздникам.

Заранее Вам признательны за сотрудничество.

Генеральный директор Ю. А. Комар

Агульныя ўводзіны да Рымскага Імшала. — Мн., 2004.

Архітэктура Беларусі. Нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце: У 4-х т. — Мн., 2005—2007.

Архітэктура Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. — Мн., 1993.

Бардовіч А. М. і інш. Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы. — Мн., 2000.

Баханькоў А. Я. і інш. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. — Мн., 1998.

Беларуская анамастыка: Зб. артыкулаў. — Мн., 1985.

Беларуская анамастыка: Зб. артыкулаў. — Мн., 1992.

Беларуска-рускі слоўнік: У 3-х т. Пад рэд. К. К. Атраховіча. — Мн., 2003.

Беларуская мова. — Opole, 1998.

Беларуская мова: Энцыклапедыя. — Мн., 1994.

Беларуская энцыклапедыя: У 18-ці т. — Мн., 1996—2004.

Беларускі фальклор: Хрэстаматыя. Пад рэд. П. Глебкі. — Мн., 1969.

Біблія Тысячагоддзя — «BIBLIA TYSIACLECIA» W PRZEKŁADZIE Z JĘZYKÓW ORYGINALNYCH PALLOTTINUM POZNAŃ — WARSZAWA 1991.

Библия: Книга Священного Писания Ветхога и Нового Завета с параллельными местами и приложениями. М., 2006.

Бірыла М. В. Беларускія антрапанімічныя назвы ў іх адносінах да антрапанімічных назваў іншых славянскіх моў. — Мн., 1963.

Бірыла М. В. Беларуская антрапанімія. — Мн., 1966.

Бірыла М. В. Беларуская антрапанімія. — Уласныя імёны, імёны-мянушкі. — Мн., 1966.

Булыка А. М. Слоўнік іншамоўных слоў: У 2 т. — Мн., 1999.

Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя ў 2 т. — Мн., 2006—2007.

Гістарычны слоўнік беларускай мовы: Вып. 1—27. — Мн., 1982. — 2007.

Глубоковский Н. Н., доктор богословия. Библейский словарь. Мн., 2007.

Граматычны слоўнік дзеяслова: А—Я. — Мн., 2007.

Дыялектны слоўнік Брэстчыны. — Мн., 1989.

Кушнярэвіч А. М. Культавае дойлідства Беларусі XIII—XVI стст. — Мн., 1993.

Лазука Б. А. Слоўнік тэрмінаў: Архітэктура, выяўленчае мастацтва. — Мн., 2001.

Лакотка А. І. Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры. — Мн., 1993.

Лемцюгова В. П. Antroponimia I — Imiona. «Słowiańska onomastyka». Encyklopedia. G.I. — Warszawa-Kraków, 2002. S. 339—347.

Лемцюгова В. П. Антрапаніміка. Уласнае імя // Беларуская мова. Энцыклапедыя. — Мн.: Беларуская энцыклапедыя, 1994. с. 37—40; 574—575.

Лемцюгова В. П. Беларуская айканімія. — Мн., 1970.

Лемцюгова В. П. Украінска-беларускі слоўнік. — Мн., 1980.

Лучыц-Фэдарэц І. І. Народная словатворчасць. — Мн., 1979.

Мальдзіс А. І. Францыск Скарына як прыхільнік збліжэння і ўзаемаразумення людзей і народаў. — Мн., 1988.

Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння. — Мн., 1994.

Пытанні білінгвізму і ўзаемадзеяння моў. — Мн., 1981.

Русско-белорусский словарь: В 3-х т. Под ред. Я. Коласа, К. Крапивы, П. Глебки. — Мн., 1993.

Святое Евангелле паводле Лукі. На чатырох мовах: грэчаскай, славянскай, рускай і беларускай. — Мн., 2003.

Слоўнік асабовых уласных імён. Уклад. М. Р. Суднік. — Мн., 2005.

Слоўнік беларускай мовы. Пад рэд. М. В. Бірылы. — Мн., 1987.

Слоўнік беларускіх гаворак паўночназаходняй Беларусі і яе пагранічча: У 5-ці т. — Мн., 1979—1986.

Слоўнік гаворак цэнтральных раёнаў Беларусі: У 2-х т. Пад рэд. Е. С. Мяцельскай. Т. 1. — Мн., 1990.

Слоўнік мовы Скарыны, т. 3: Анамастыка і тапаніміка. — Мн., 1994.

Сцяшковіч Т. Ф. Слоўнік Гродзенскай вобл. — Мн., 1983.

Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы. Пад рэд. М. Р. Судніка і М. Н. Крыўко. — Мн., 2002.

Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: У 5-ці т. Пад рэд. К. К. Атраховіча. — Мн., 1977—1984.

Требник. — М., 2004.

Тураўскі слоўнік: У 5-ці т. Уклад. Крывіцкі А. А. і інш. — Мн., 1982—1987.

Усціновіч А. К. Антрапанімія Гродзеншчыны і Брэстчыны XVI—XVIII стст. — Мн., 1975.

Францыск Скарына і яго час: Энцыклапедычны даведнік. — Мн., 1988.

Церашчатава В. В. Старажытнабеларускі манументальны жывапіс XI—XVIII стст. — Мн., 1986.

Цітова А. І. Асацыятыўны слоўнік беларускай мовы. — Мн., 1981.

Цыхун А. А. Скарбы народнай мовы Гродна. — Гродна, 1993.

Шакун Л. М. Значэнне царкоўнаславянскай мовы ў развіцці беларускай літаратурнай мовы. — Мн., 1958.

Шкраба І. Слоўнік беларускай безэквівалентнай лексікі. — Мн., 1994.

Этымалагічны слоўнік беларускай мовы, І—XI т. — Мн., 1978.

Янкова Т. С. Дыялектны слоўнік Лоеўшчыны. — Мн., 1982.

Яскевіч А. Абранне вечнасці. — Мн., 1999.

ВОДЗЫЎ
пра кнігу ксяндза Уладыслава Завальнюка «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі»

Кніга «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі» — надзвычай актуальная, духоўна багатая і ўсебакова ўзважаная. У ёй арганічна спалучана зямное і нябеснае, яе змест выкладзены даступна і пераконліва, а таму чытаецца з надзвычайнай цікавасцю і карысцю.

Хочацца выказаць салідарнасць з пазіцыяй аўтара ў пытанні перадачы ўласных імёнаў Святога Пісання на беларускую мову.

Безумоўна, спецыфіка рэлігійнага анамастыкона вымагае асобнага падыходу, адрознага ад агульнанароднага. Свецкі анамастыкон — прадукт працяглага гістарычнага развіцця і не можа не падпарадкоўвацца законам жывой мовы, не адлюстроўваць гістарычных трансфармацый іменалагічнай формы. Анамастыкон жа рэлігійных твораў павінен захоўваць «дух і літару» Свяшчэннага Пісання, а значыць абавязкова, наколькі гэта магчыма, не траціць сувязі з пісьмовымі канонамі.

Абсалютная большасць уласных імёнаў у рэлігійных тэкстах мае іншамоўнае (пераважна грэчаскае) паходжанне. Пры іх пісьмовым афармленні неабходна кіравацца прынцыпам, прынятым для перадачы запазычанных онімаў, а менавіта прынцыпам транслітарацыі (палітарнай перадачы). Узорамі зыходных формаў павінны служыць кананічныя напісанні імёнаў у грэчаскай мове — першакрыніцы. Выбар варыянтаў напісання з ліку наяўных, на нашу думку, трэба ажыццяўляць паводле ступені іх блізкасці да кананічных узораў.

Найбольш частотныя гукавыя чаргаванні ў розных рэдакцыях рэлігійных тэкстаў праявіліся ў парах: *в/б* (*Авраам/ Абрам*); *ф/т* (*Фама/Тамаш*); *нуль гука/г* (*Анна/Ганна*). Першыя з іх (на *в, ф, нуль гука*) адносяцца да так званых рэйхлінавых формаў і адлюстроўваюць «усходнюю» моўную арыентацыю. Другія (на *б, т, г*) — да так званых эразмавых або «заходніх» формаў, якія прыйшлі ў беларускую мову праз заходняе пасрэдніцтва — лацінскае, нямецкае, польскае. Калі зыходзіць з крытэрыю адпаведнасці/неадпаведнасці пісьмовым канонам і ступені блізкасці да арыгінальнай грэчаскай формы, то за ўзорныя трэба прымаць «усходнія», найбольш кананічныя напісанні (*в, ф, нуль гука*). Падвоеныя зычныя ў запазычаннях у беларускай мове не захоўваюцца (*Адзій, Апелес, Матафія*).

Галоўны навуковы супрацоўнік
ДНУ «Інстытут мовы і літаратуры
імя Якуба Коласа і Янкі Купалы
НАН Беларусі», доктар
філалагічных навук, прафесар *(подпіс)* В. П. Лемцюгова

P.S. Я ў захапленні ад Вашай ідэі і зместу Вашай кнігі, глыбокапаважаны Айцец Уладыслаў! Гэта тое, чаго нам вельмі не хапае. Упэўнена, што Вашы задушэўныя, мудрыя, гарачыя словы растопяць лёд нават самых заледзянелых душ. Бог Вам у дапамогу. І мы заўсёды да Вашых паслуг.

З павагай В. П. Лемцюгова

РЭЦЭНЗІЯ
на рукапіс кнігі ксяндза Уладыслава Завальнюка «Родная мова ў духоўным жыцці Беларусі»

Такое выданне, дзе даюцца ўзважаныя тэрміналагічна-лексічныя рэкамендацыі для ўжытку пры перакладзе на беларускую мову Святога Пісання, у першую чаргу Евангелля, даўно патрэбна. І не толькі для перакладчыкаў, але і для работнікаў выдавецтваў, сродкаў масавай інфармацыі, выкладчыкаў, студэнтаў, простых вернікаў. Таму выхад такога, па сутнасці, першага аргументаванага даведніка трэба толькі вітаць.

Станоўчыя якасці будучага выдання на відавоку. Але ўсё ж на двух прынцыповых момантах хачу спыніцца.

Першы — гэта імкненне да збліжэння ў лексіцы і тэрміналогіі да іншых хрысціянскіх канфесій, найперш да праваслаўя (наколькі гэта мага). Ідэальна было б, каб тэрміналогія тут стала б агульнанацыянальнай. Але паколькі адрозненні ўсё ж існуюць аб'ектыўна, таму тут важна зрабіць першы крок насустрач. І гэты крок, наколькі можна меркаваць па рукапісе, зроблены. Прытым па-хрысціянску прымірэнчы, канструктыўны.

Другі — гэта арыентацыя аўтара на найбольш аўтарытэтныя нацыянальныя ўзоры. Найперш гэта энцыклапедычныя выданні, у якіх таксама выкарыстаны вялікі назапашаны вопыт. Гэта дазволіць прапановы ксяндза Уладыслава Завальнюка выкарыстоўваць у самых розных сферах — як агульнанацыянальныя.

І адначасова аўтар правільна робіць, што выносіць свае прапановы на абмеркаванне. Гэта дазволіць у многіх выпадках выбраць лепшы варыянт.

Канкрэтныя заўвагі і прапановы зроблены рэцэнзентам непасрэдна ў рукапісе. Аднак некаторыя з іх патрабуюць больш дэталёвага тлумачэння.

Стар. 141. З трох прапанаваных тэрмінаў аддаю перавагу **небаўзяццю**, паколькі ён найлепш перадае сутнасць падзеі, найбольш зразумелы для ўсіх колаў вернікаў.

Стар. 142. Можа, не варта супрацьпастаўляць царкоўна-славянскія і лацінска-польскія традыцыі?

Стар. 148. Я цалкам за слова **Які. Каторы** гучыць не па-беларуску.

Стар. 175. Слову **перадайце** можа яшчэ быць сінонім **перакажыце**.

Стар. 179. Аддаю перавагу слову **вернік**.

... Стар. 184. Я за слова **літанія**.

... Стар. 187. Мусіць, усё ж **крыжаўздзвіжанне** без літары **з** этымалогія слова будзе незразумелай...

Стар. 196. З двух прапанаваных слоў аддаю перавагу **хрышчэнню**.

Стар. 200. **Жыд** яўна не падыходзіць. Але апрача слова **яўрэі** ёсць яшчэ больш падыходзячае **габрэі**.

... Стар. 208. Фразу «Канфесіянальная прыналежнасць Скарыны» прапаную замяніць на больш дакладную: «Вакол канфесіянальнай прыналежнасці Скарыны вядуцца спрэчкі». Справа ў тым, што яшчэ перад вайной бернардзінец Ян Кантак, які меў у сваіх руках многія адсутныя сёння дакументы, напісаў у сваёй саліднай манаграфіі, прысвечанай ордэну бернардзінцаў, што аднымі з першых у Полацку пасля прыбыцця туды з Вільні бернардзінцаў, заснавання імі касцёла ў гонар святога Францішка Асізскага і кляштара «прыняла каталіцкае хрышчэнне сям'я Скарынаў». Там жа будучы першадрукар вучыўся, напэўна ж, лаціне.

Стар. 209. Скарына найперш пачуваў сябе хрысціянінам.

Стар. 225. **Святатацтва** лепей замяніць беларускім: **блюзнерства**.

Стар. 227. «**Чалавек**» лепей замяніць на «**чалавеча**».

Стар. 237. Падвоеных зычных у беларускіх варыянтах імёнаў і прозвішчаў трэба пазбягаць.

Напісання «**С. Полацкага**» трэба пазбягаць. «**Сімяон**» — гэта манаскае імя.

«**Імені**» лепш замяніць на «**імя**».

Астатнія, больш дробныя заўвагі і пытанні зроблены непасрэдна ў тэксце. У выпадку, калі прапанаваны варыянт праўкі неабавязковы, эквівалентнае слова ўпісваецца зверху, а ранейшае не закрэсліваецца.

У цэлым зробленыя заўвагі носяць прыватны характар і іх лёгка ўлічыць. Тым болей, што ў многіх выпадках робіцца проста выбар з двух прапанаваных аўтарам варыянтаў.

Доктар філалагічных навук,
прафесар *(подпіс)* Адам Мальдзіс

Мінск, 1 жніўня 2008 года

АНКЕТА

У кнізе «Агульныя ўводзіны ў Рымскі Імшал» (Рым, 2002) сказана, што пры перакладзе Святога Пісання, у час набажэнства **«належыць карыстацца мовай, якая адпавядае разуменню вернікаў»**, **«павінна ўжывацца мова ўзнёслая і літаратурная»** і разам з тым **сэнс перакладу** на нацыянальную мову цалкам **«павінен адпавядаць першаснаму лацінскаму тэксту»** (п. 392 с. 112).

У сувязі з тым, што пры першым перакладзе літургічных тэкстаў, Святога Пісання на беларускую мову ў 90-х гадах былі дапушчаны некаторыя недакладнасці, ужыванне паланізмаў і паколькі з 1 верасня 2010 г. у нашай краіне ўступаюць у сілу адзіныя новыя правапісныя нормы,

ці згодны Вы, каб мова набажэнства, Святой Імшы, заняткаў у нядзельнай школе, іншай пазакласнай работы з моладдзю пры храме **адпавядала літаратурным нормам беларускай мовы, якую вывучаюць нашы дзеці ў школах, якой карыстаюцца пры паступленні ў ВНУ, іншыя навучальныя ўстановы?**

Так, я _____

_____

Не, я _____

_____

Просім указаць сваю прафесію, подпіс і дату.
Наш адрас: 220050, Мінск, вул. Савецкая, 15.
Касцёл Святога Сымона і Святой Алены.

СВЯТОЕ ЕВАНГЕЛЛЕ І ПРАБЛЕМЫ ПЕРАКЛАДУ НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ

МАТЭРЫЯЛЫ
навукова-практычнай канферэнцыі
па абмеркаванні перакладу Святога Евангелля
на сучасную беларускую літаратурную мову

Духоўна-асветніцкае выданне

СВЯТОЕ ЕВАНГЕЛЛЕ
І ПРАБЛЕМЫ ПЕРАКЛАДУ НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ

Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі
па абмеркаванні перакладу Святога Евангелля
на сучасную беларускую літаратурную мову

Мінскі касцёл Святога Сымона і Святой Алены
13 снежня 2008 г.

Пад рэдакцыяй: *У. Завальнюка, М. Прыгодзіча*
Карэктар — *В. Раманцэвіч*

Падпісана ў друк 25.01.2010. Фармат 60×84/16. Папера афсетная.
Гарнітура SchoolBook. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 20,1.
Улік.-выд. арк. 12,7. Тыраж 50 экз. Заказ 3576.

Рымска-Каталіцкая парафія Святога Сымона і Святой Алены
Вул. Савецкая 15, г. Мінск, 220050.
тэл. 200-44-15; 200-56-32; факс. 200-55-61.
www.churchminsk.by, e-mail: church_minsk@nsys.by
ЛВ 02330/0552916 ад 8.06.2010 г.

Надрукавана с гатовага арыгінал-макету ў друкарні УП "Услуга"
ЛП 02330/0150474 ад 25.02.2009 г.
Вул. Кульман, 2, к. 306, 220013, г. Мінск

ISBN 978-985-6652-43-4

СВЯТОЕ ЕВАНГЕЛЛЕ

ПРАБЛЕМЫ ПЕРАКЛАДУ НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ